# ГО ЛАС ПАК АЛЕ ННЯ СВА БО ДЫ

# ГОЛАС ПАКАЛЕННЯ СВАБОДЫ

POŁACKIJA ŁABIRYNTY

Полацкія лабірынты
Połackija łabirynty
Беларусь – Варшава – Беларусь
2025

Аўтар інтэрв'ю, рэдактар і стваральнік канцэпцыі кнігі: Сяргей Сашук
Прадмова: Таццяна Нядбай
Карэктура: Алеся Мярэжка
Вокладка і графічная канцэпцыя: Pan P.
Вёрстка: S.K.

Фота: з асабістага архіва герояў кнігі, а таксама аўтарства
Віялеты Саўчыц, Генадзя Верацінскага, Яраслава Бекіша і інш.

«Голас пакалення свабоды» – васямнаццаць гутарак з інтэлектуаламі, праваабаронцамі, журналістамі і творцамі, якія сталі сведкамі і ўдзельнікамі перамен у Беларусі апошняга паўстагоддзя. Іх словы адкрываюць глыбіню асабістага досведу і паказваюць фармаванне новай грамадзянскай свядомасці. Кніга створана як цэласны аповед, дзе індывідуальныя гісторыі складаюцца ў агульны партрэт пакалення.

Copyright © Сяргей Сашук, тэкст, 2025
Copyright © Таццяна Нядбай, прадмова, 2025
Copyright © Pan P., афармленне, 2025
Copyright © Полацкія лабірынты, 2025
Copyright © Беларускі ПЭН, 2025

Полацкія лабірынты
Połackija łabirynty
Беларусь – Варшава – Беларусь, 2025

Электроннае выданне
ISBN 978-83-68460-05-6

# Змест

*Таццяна Нядбай.*
Свабода – не дазвол. Гэта выбар 5

**I. ДУМАЦЬ БЕЛАРУСЬ**

*Уладзімір Мацкевіч.*
Без грамадзянскай супольнасці не трымаецца ні праўда, ні ўлада 12

*Валерый Карбалевіч.*
Нашая гісторыя – як люстэрка: у ім і параза, і шанец 34

*Аляксандр Класкоўскі.*
Журналістыка – не толькі рамяство. Гэта выпрабаванне і ціскам, і свабодай 54

*Андрэй Завадскі.*
Самакіраванне – гэта супрацьяддзе страху. Яно пра самастойнасць і гонар 76

*Аляксандр Гарцуеў.*
Гэта час, у якім мастацтва – злачынства. Антыказка. Сюр. Мусім пакінуць Залюстрэчча 98

*Максім Жбанкоў.*
Жыццё як жыццё, траўматычна прыўкраснае 118

**II. ЗАХАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ**

*Наталья Дулина.*
Даже в тюрьме я оставалась свободной 138

*Тамара Мацкевіч.*
Народны код дэмакратыі – жыць па-людску: з розумам, павагай і без паноў над галавой 156

*Ирина Сухий.*
Не вернем в Беларусь демократию – не сохраним ни себя, ни Беловежскую пущу 178

*Аляксандр Капуцкі.*
Ад вузенькай сцежкі да Вялікага Гасцінца 200

*Зося Кустава.*
Нават калі дарога назад доўгая, след усё адно вядзе дадому 218

*Уладзімір Вялічкін.*
Твая ўласная свабода ўмоўная, калі побач топчуць правы іншых 238

## III. РАСКАЗАЦЬ БЕЛАРУСЬ

*Алег Груздзіловіч.*
Пісаў пра здзекі. Прайшоў турму. І даказаў: свабоду не зламаць 262

*Зоя Белахвосцік.*
Жыць тэатрам – вялікі дар. Але яшчэ большы – жыць без тэатральнасці 282

*Любоў Лунёва.*
Улада, што баіцца свабоды, аўтаматам выбірае дубінку 300

*Сяргей (Сяржук) Сыс.*
Чалавек без пярчынкі – нібы верш без рытму 320

*Віктар Марчук.*
Лічба можа замяніць паперы, але давер не заменіць нішто 338

*Генадзь Верацінскі.*
Калі фотакадр – імгненне, то фатограф не яго цень, а сведка гісторыі 354

## Свабода – не дазвол. Гэта выбар

Кожнае пакаленне, якое перажывае вялікую несправядлівасць, мае ўласны голас. Не гучны лозунг, не рыторыку часу – а голас, які немагчыма зблытаць ні з чыім іншым. Складзены з тысяч асабістых інтанацый: з ціхага супраціву, з нязручных пытанняў, з унутранага перакanання «так больш нельга».

Гэтая кніга – пра такіх людзей. Яны нараджаліся ў розныя гады, служылі ў савецкай арміі, гадавалі дзяцей, ставілі спектаклі, лячылі, выкладалі, рабілі газеты, фатаграфавалі, збіралі грыбы, выходзілі на плошчы, хавалі самвыд у шуфлядах, супраціўляліся несправядлівасці і страху. Яны не лічылі сябе героямі – і ўсё ж сталі імі.

Час не любіць дэталяў. Таму заўзята сцірае эмоцыі і драбніцы нашага жыцця, укладаючы яго ў сціслыя біяграфіі, ператвараючы ў лаканічны дакумент. Біяграфіі папярэднічаюць кожнай з васямнаццаці гутарак гэтай кнігі. Дакументуюць найноўшую гісторыю краіны праз лёсы. І гэта шыкоўнае інфармацыйнае палатно.

Але вага фактычных звестак шматкроць узрастае, калі глядзім на іх праз оптыку душы і ацэнку мінулага тымі сюжэтамі, згадкамі, што не ўпісваюцца ў формулы шаблоннага даведніка.

Пашпартная дакладнасць стартавага радка «Год нараджэння: 1955» атрымлівае глыбіню, калі з першых слоў размовы даведваемся, што будучы палітычны аналітык вучыўся пры святле газавай лямпы, бо ў вёсцы пад Мінскам не было электрычнасці, а будучы філосаф пабачыў свет у Сібіры, бо туды выслалі ягоных бацькоў, каб пазбавіць радзімы…

Дзве жанчыны ў эксперыментальным гадавальніку дасягнулі шалёнага прарыву ў селекцыі свіней, і вось адна атрымлівае зорку Героя Сацыялістычнай Працы, а другая – масавы ордэн. Чаму так? Бо разнарадка… І да таго ж, бацька жанчыны-заатэхніка прапаў на фронце без вестак: для ўладаў гэта цёмная гісторыя, таму вось так…

Але героі і гераіні кнігі не пагадзіліся марнаваць свой час на «разнарадку». Згаданы вышэй бацька даслаў з фронту адзін усяго ліст: «Стаю пад кулямі, як пад дажджом. Беражы дзяцей». Годны дух з такім не змірыцца, ён мусіць адваяваць сваё права жыць па-людску. Па-беларуску. І кожны і кожная на сваім месцы, у сваёй прафесіі, сваіх гарадах і вёсках, інстытутах і заводах крок па кроку разбуралі тое, што скарала іхную волю і пярэчыла ўяўленням пра справядлівасць.

Вось яшчэ некалькі сюжэтаў:
*...Не захацеў «праўды па разнарадцы» і паставіў бунтарскі спектакль «Не мой» паводле нязручнай партызанскай аповесці Адамовіча...*
*...Пераклаў тэхнічную дакументацыю завода на беларускую мову: начальнікі ў ступары, а дзявацца ім ужо няма куды...*
*...Разам з паплечнікамі тройчы прымушаў засядаць Мінскі гарсавет, які ўрэшце здаўся і перайменаваў вуліцу Горкага ў Багдановіча...*

Гэтыя васямнаццаць выкаранялі чужое не толькі са сваіх жыццяў. Рабілі гэта для незалежнай Беларусі. Вялікімі ўласнымі высілкамі і стратамі.

*...Складвалася цяжка: жыццё пад прыцэлам... І сям’я распалася. Але і праз шэсць гадоў, у 2020-м, былую жонку цягалі на допыты. З-за мяне...*
*...Страх накрыў так моцна, што я нават плакала... Але праз пару дзён адпусціла – і перастала баяцца...*
*...Не заўсёды да хаты можна дабрацца, чатыры разы на год затрымлівалі «проста так» або выкрадалі са збіццём і мехам на галаве...*

Героі кнігі маюць выразныя твары і моцныя галасы. Яны не губляюцца ў натоўпе і не хаваюцца за агульнымі словамі.

Праз лёсы гэтых людзей, падрабязнасці іх штодзённасці, праз тое, як яны думалі, выбіралі і дзейнічалі, бачныя цана

і ўпартасць, з якіх складалася новая беларуская рэальнасць. Тут не проста гісторыі асобаў, а прыклады таго, як грамадства вучылася самастойна думаць, браць адказнасць і гаварыць ад уласнага імя. Як беларусы пачалі ўспрымаць сябе не савецкімі статыстамі гісторыі, а яе аўтарамі. Як краіна намацвала сябе нанова – праз сумневы, памылкі, рашучасць і веру.

Мы называем іх пакаленнем свабоды не таму, што яны жылі ў свабодзе. А таму, што яны яе выбіралі – у час, калі выбар быў небяспечным. Кожны з іх – асобная гісторыя пра тое, як нараджаецца асабістая годнасць і як яна ўплывае на лёс краіны.

Гэта кніга не пра палітыку. Яна пра чалавечую стойкасць. Пра тое, як беларусы розных пакаленняў захоўвалі Беларусь у сабе, калі іх ад яе адразалі. Як вучыліся гаварыць тое, што лічаць праўдай, калі ім тлумачылі, што лепш маўчаць. Як думалі і дзейнічалі, калі сістэма патрабавала толькі паслухмянасці. Як рабілі сваё з пачуцця адказнасці і сумлення. З перакanання, што свабода пачынаецца на з лозунгаў, а з асобы, здольнай быць сабой нават тады, калі за гэта караюць.

Некаторыя постаці сталі шырока вядомымі, іншыя заставаліся ў цені, але ўпарта працягвалі: гаварыць, ствараць, тлумачыць, збіраць людзей вакол ідэі адказнасці і годнасці. Менавіта з такіх слоў і ўчынкаў пастутова вырасла грамадзянская супольнасць.

Яны катэгарычна не лічаць сябе асаблівымі. Раз за разам даводзяць: іх гісторыя пачалася значна раней – з бацькоў і дзядоў, якія перажылі вайну, страты і страх, а потым узнялі Беларусь з попелу. Бацькі будавалі гарады, дзеці адбудоўвалі дух. І калі адны вярнулі зямлі жыццё, то другія вярнулі сэнс: Беларусь можа быць вольнай.

Пакаленне свабоды – не адна генерацыя, а пераемнае дыханне некалькіх. Ад бацькоў, якія будавалі Беларусь з каменю і поту,

да дзяцей, што будуюць яе з любові, слова і салідарнасці. І цяпер, калі сотні тысяч беларусаў раскіданыя па свеце, гэтая сувязь стала яшчэ мацнейшай. Мы раз’яднаныя геаграфіяй, але аб’яднаныя памяццю і адказнасцю. Свабодай не на дзяржаўны загад, а з унутранага перакананння і памкнення.

Той подых свабоды, які мы адчулі ў 2020 годзе, часта параўноўваюць з адчуваннем свабоды ў 1990-я, якое натхніла людзей і дазволіла ператрываць дзесяцігоддзі несвабоды і задушлівай дыктатуры. Яны працягвалі штодня рабіць тыя справы, якія набліжалі нас да 2020-га.

Кніга – пра шлях да свабоднай Беларусі. Пра тое, як гісторыя не спыняецца. Як людзі захоўваюць годнасць нават у няволі. Як ідэя свабоды пераживае любую дыктатуру.

Кожная размова ў гэтым томе – не проста ўспамін пра мінулае, але і сведчанне для будучыні. Памяць пра час, калі на адным баку стаялі дубінкі, ізалятары і страх, а на другім – чалавечы голас. Голас, які можна заглушыць, але немагчыма перамагчы.

Гісторыі герояў нібы хвалі, якія адна за адной набягаюць і разбураюць усё, што здавалася непераадольным і непахісным. Як дождж, што кропля за кропляй ажыўляе зямлю. Ён не толькі змывае, але і дае жыццё. Гэта дождж новай беларускай вясны.

Фармальна героі кнігі – лаўрэаты прэміі «Голас пакалення свабоды», але мы ўсведамляем, што людзей, якія заслугоўваюць гэтага прызнання, значна больш. Прэмія сёлета мела магчымасць разглядаць толькі тых, хто жыве ў вымушанай эміграцыі ў Польшчы, Літве і Чэхіі (але і яны не ўсе змаглі ўдзельнічаць). Мы выдатна разумеем, што асобы, годныя ўганаравання, ёсць і ў іншых краінах, і – асабліва – у Беларусі.

Таму мне хочацца верыць, што і сёлетняя прэмія, і гэтая кніга – толькі першы крок у працяглай гісторыі належнага ўшанавання прадстаўнікоў Пакалення свабоды і іх дзейнасці. Наш абавязак – супрацьстаяць цэнзуры, што вычышчае імёны і дасягненні

гэтых людзей з наратываў найноўшай гісторыі Беларусі, і гэта ў лепшым выпадку. У горшым – зневажае і хлусіць пра іх як пра тых, хто нібыта шкодзіць краіне. Нашая агульная задача – зрабіць іх імёны чутнымі і бачнымі, а іх даробак належна ацэненым і адчувальным падмуркам для сённяшняй дзейнасці. Паказаць, што ён не сышоў у пясок, а стаў урадлівай глебай, на якой вырастаюць новыя героі і новыя ініцыятывы.

Мы сабралі гэтыя размовы, каб вярнуць у публічную прастору тое, што ў ёй мусіць быць: гісторыю беларускага гонару, адказнасці і выбару. З іншага боку, кніга «Голас пакалення свабоды» – не манумент і не рэквіем. Гэта размова, якая не мусіць перапыняцца. Бо краіна будуецца не толькі ўрадамі і канстытуцыямі, але і людзьмі, што маюць голас.

Гэтыя людзі тут. Іх галасы – перад вамі.

*Таццяна Нядбай,*
*паэтка, праваабаронца, старшыня Беларускага ПЭНа*

Частка I

# ДУМАЦЬ БЕЛАРУСЬ

# УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ



Фота: Я. Бекіш

*Нарадзіўся 14 траўня 1956 года ў Чарамхове (Іркуцкая вобласць, Расія).*

*З сям'і беларускіх ссыльных, якія ў 1966 годзе вярнуліся на радзіму.*

*Атрымаў адукацыю ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, у 1980-х гадах стала ўдзельнічаў у працы Маскоўскага метадалагічнага гуртка Г. Шчадравіцкага. Асновай усёй далейшай дзейнасці стаў СМД-падыход, для якога падмуркам любога*

*дзеяння мусіць быць мысленне, а крытэрам слушнасці мыслення – практыка.*

*У перыяд распаду СССР актыўна залучыўся ў трансфармацыйныя працэсы, спалучаючы філасофскую працу з практыкай сацыяльных інавацый. Распрацаваў праграму культурнай палітыкі, сімвалічнай тэзай якой стала «Думаць Беларусь».*

*Апублікаваў кнігу «Беларусь: вопреки очевидности», шэраг аналітычных і публіцыстычных артыкулаў, скіраваных на запуск працэсаў дэсаветызацыі, беларусізацыі, еўрапеізацыі.*

*Удзельнічаў у стварэнні шэрагу палітычных ініцыятыў, шмат працуе ў кірунку рэформы адукацыі.*

*Пасля няўдалай спробы дыялогу грамадска-палітычных сіл у канцы 1990-х напісаў вострапалемічную кнігу «Вызывающее молчание».*

*Займаўся развіццём грамадзянскай супольнасці, праводзіў арганізацыйна-дзейнасныя гульні, ініцыяваў стварэнне кансорцыума «ЕЎраБеларусь» і Беларускай нацыянальнай платформы грамадзянскай супольнасці, пісаў публіцыстычныя артыкулы і вёў аўтарскія праекты на пляцоўках незалежных СМІ. У 2009 годзе запусціў праграму стварэння «Лятучага ўніверсітэта» як прасторы сучаснага мыслення і адукацыі.*

*У падзеях 2020 года ўдзельнічаў і як філосаф, і як грамадзянін, намагаўся перавесці сітуацыю супрацьстаяння і гвалту ў сітуацыю грамадска-палітычнага дыялогу. 4 жніўня 2021 года быў арыштаваны, у зняволенні трымаў галадоўку, патрабуючы адкрытага суда. У чэрвені 2022 года быў асуджаны на пяць гадоў зняволення, прызнаны палітвязнем.*

*11 верасня 2025 года быў вызвалены з турмы і прымусова высланы ў Літву. Працягвае інтэлектуальную і грамадскую дзейнасць, застаючыся адным з галоўных галасоў беларускай думкі – чалавекам, які змагаецца за свабоду краіны і годнасць мыслення як такую.*

Уладзімір Мацкевіч

# Без грамадзянскай супольнасці не трымаецца ні праўда, ні ўлада

## Рух праз сустрэчы і навучанне – не ў інстытуцыях, а ў асобаў

*– Вы нарадзіліся ў Іркуцкай вобласці, у сям'і беларусаў, высланых у Сібір. Як гэтая прастора: холад, выгнанне, чужыннасць – паўплывала на вашае адчуванне свабоды і несвабоды? Ці можна сказаць, што філасофія лёсу пачалася яшчэ там, у ссылцы?*

– Мая філасофская гісторыя – наўрад ці. Але дысідэнцкая – так. Адчуванне непрыняцця савецкай улады, недаверу да яе заклалася з дзяцінства. Беларусы ў ссылцы трымаліся разам: сустракаліся на святы, хадзілі адно да аднаго, размаўлялі. Я, малы, усё гэта слухаў. Тое маўклівае сведчанне несправядлівасці фармавала свядомасць. Можна сказаць, тады і быў выхаваны для далейшай працы – у шырокім, грамадзянскім сэнсе.

*– Наступны этап – Гродна, Ленінград, Вільня: розныя інтэлектуальныя школы, розныя атмасферы. Што было найважнейшым: сустрэчы з асобамі эпохі, розныя традыцыі ці, можа, сама жорсткасць савецкай адукацыі?*

– Я не лічу, што атрымаў дрэнную адукацыю. Наадварот, факультэт псіхалогіі ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце быў вельмі прасунуты. Паступіў туды пасля арміі. Не без цяжкасцяў, але хутка ўвайшоў у рытм. А да трэцяга курса ўжо расчараваўся. Псіхалогія, якая зачаравала яшчэ ў школе, пачала здавацца абмежаванай. Пацягнула да філасофіі. Але галоўнае – не прадмет, а людзі. Я шукаў сваё: хадзіў на лекцыі выбітных мысляроў, слухаў, у каго было чаму вучыцца.

*– І знайшлі свайго настаўніка?*

– Так. Георгій Пятровіч Шчадравіцкі. Пазнаёміўся з ім праз студэнцкія канферэнцыі, трапіў на семінар у Маскве. Гэта было глыбокае захапленне. Вучнем стаў пазней, гадоў праз

дзесяць. Але менавіта ён сфармаваў у мяне разуменне мыслення як дзеяння.

А далей – Вільня. Трапіў туды праз накіраванне. На завод радыёвымяральнай апаратуры № 555. Адпрацаваў восем месяцаў і… Размеркаванне скасавалі. Не далі допуск на вайсковае прадпрыемства.

*– З-за паходжання, сібірскага мінулага бацькоў?*

– Думаю, хутчэй, з-за маёй студэнцкай актыўнасці. Несанкцыянаваныя дыскусіі, сябры, якія не ўпісваліся ў камсамольскую сістэму. Напэўна, быў пад наглядам.

*– І тады сустрэча з доктарам Аляксейчыкам?*

– Складаны чалавек, з рэпутацыяй, якая выклікала спрэчкі. Але ён, на маю думку, быў найглыбейшым знаўцам савецкага чалавека. Разумеў сутнасць «саўка» як псіхалагічнага тыпу. Шмат чаму ў яго навучыўся… Потым наступныя настаўнікі: Юла Воаглад з Эстоніі, Юрый Лотман – яго выкінулі з Ленінграда, і менавіта ў Тарту адкрыў тады іншую школу мыслення.

Мой падыход, філасофія дзеяння, складаўся з таго, што ўзяў у іх. Такі вось рух праз сустрэчы і навучанне – не ў інстытуцыях, а ў асобаў.

## Палітыкі не знайшлі апірышча ў грамадзянскай супольнасці

*– Калі філасофія стала палітыкай? Як вы адчулі сябе публічным чалавекам, адказным перад грамадствам?*

– Гэта адбывалася паступова. Я жыў у Латвіі з 1987 па 1992 год: фінал перабудовы, развал Саюза. Падтрымліваў Народны фронт Латвіі, меў сяброў у мясцовых колах, нават запрасілі дарадцам у Міністэрстве нацыянальных пытанняў першага ўрада незалежнай Латвіі. Але не адчуваў яе сваёй зямлёй.

## ДУМАЦЬ БЕЛАРУСЬ

Сапраўдная публічнасць пачалася, калі свядома вырашыў вярнуцца ў Беларусь. Хацеў гэтага даўно, але не складалася. І толькі ў 1994-м усё супала. Я прыехаў ужо сталым чалавекам – падрыхтаваным і гатовым уключыцца ў грамадскае жыццё.

*– Адразу ў эпіцэнтр: перадвыбарную кампанію Станіслава Шушкевіча. Далей – першыя спробы самастойнага палітычнага дзеяння, новыя структуры, новыя ідэі. Як вы памятаеце гэты час? Калі ў Беларусі з’явілася магчымасць сапраўднага палітычнага самавыяўлення?*

– Час надзеі і памылак. Я адчуў урэшце, што БНФ з Пазняком не мае перспектывы. Не з-за асоб, а з-за стратэгіі. Грамадства не ўспрымала гэты стыль палітыкі. Уключаны ў аналітыку, бачыў патрэбу ў іншым падыходзе.

У 1995 годзе, пасля выбараў у Вярхоўны Савет 13-га скліканння, у кабінеце Пятра Марцава, галоўнага рэдактара «Белорусской деловой газеты», сабралася група: Алег Манаеў, Павел Данейка, Юрый Дракахруст, Міхал Залескі, Канстанцін Злотнікаў. І пачалі дыскутаваць. Так паўстала ідэя новай партыі.

За лета мы яе стварылі. Аб’яднаная грамадзянская партыя – гэта дзве ў адной: АДПБ і людзі Васіля Шлындзікава. Прыйшлі да нас і з «Народнай згоды»: Карпенка, Ганчар, пазней Лябедзька. Партыя пачала імкліва набіраць палітычную вагу. Але хутка замкнулася на парламенцкай працы, страціла кантакт з нізамі. І я паступова адышоў.

*– Не хацелася быць у сістэме без імпульсу?*

– Так. Андрэй Саннікаў, Пётр Марцаў, Віктар Івашкевіч, Зміцер Бандарэнка і я задумалі платформу грамадзянскай салідарнасці, «Хартыю’97». Першы зварот падпісалі сто дваццаць вядомых людзей: інтэлектуалаў, палітыкаў, журналістаў. Гэта быў моцны знак таго, што ў краіне яшчэ ёсць энергія дзеяння.

*– Чым, на ваш погляд, адрозніваюцца партыйцы і эндэашнікі?*

– Пасля перавароту 1996 года ў Беларусі фактычна знік Вярхоўны Савет. Партыі страцілі сэнс як інструмент уплыву. Энергію трэба было пераносіць у шырокі грамадскі рух – у недзяржаўныя арганізацыі. Але ўзнікла праблема: актывісты НДА кіраваліся еўрапейскай устаноўкай «па-за палітыкай». І партыйцы ж раўніва, з насцярогай казалі: «Не лезьце ў палітыку – гэта наша справа!»

У выніку разрыў. І менавіта ён не даў магчымасці стварыць масавы рух. Асамблея НДА, якую запачаткавалі тады, была добрым, але непаслядоўным крокам. Страх палітызацыі – вось што перашкодзіла. Палітыкі не знайшлі апірышча ў грамадзянскай супольнасці – і страцілі сувязь з грамадствам. Гэта і ёсць адна з галоўных прычын слабасці нашай апазіцыі.

## Рух яркі, магутны, але – без трывалага каркасу

*– Ці варта вініць у згасанні грамадзянскіх сіл не толькі рэпрэсіі, але і ўнутраную стомленасць, раскол?*

– Безумоўна. Гэта матрыца некалькіх фактараў. Але як практык, а не толькі філосаф, скажу: калі паўстала ініцыятыва «Усходняе партнёрства», я прапанаваў стварыць Нацыянальную платформу грамадзянскай супольнасці Беларусі. Пад крылом гэтай еўрапейскай праграмы. Каб наш узровень удзелу – грамадскі, грамадзянскі – быў не дадаткам, а паўнавартасным партнёрам дзяржаўнага ды парламенцкага ўзроўню. Бо без гэтага краіна не мае ні балансу, ні дыхання. І мы ўсё яшчэ не навучыліся дыхаць поўнымі грудзьмі.

Мая ідэя палягала на тым, каб у адпаведны момант (такі, як мы бачылі ў 2020-м) у Беларусі ўжо існавала дзеяздольная структура грамадзянскай супольнасці, арганізацыйна і ідэйна аб'яднаная. Структура, здольная стаць апорай палітычнага працэсу, а не яго спадарожнікам.

*– Але многія лідары грамадзянскай супольнасці таго часу ўсё яшчэ баяліся палітызацыі як агню.*

– Калі я тры гады быў каардынатарам платформы, мяне пастаянна абвінавачвалі: «Занадта палітызуеш!». У выніку выбары 2015 года сталі, па сутнасці, беззмястоўнымі, нават ганебнымі. Таму патэнцыял платформы згасаў: павольна, незаўважна. І калі прыйшоў 2020-ы, мы не мелі нічога такога.

І ўсё пачалося нанова – але ўжо зусім іншымі людзьмі: з бізнес-мысленнем і піяр-энергіяй. Іх моц была ў камунікацыі, у тэхналогіях прасоўвання, але ніяк не ў палітычнай волі і не ў арганізацыйных структурах. Хоць за некалькі месяцаў здолелі стварыць яркі, магутны рух, аднак без трывалага каркасу. А Нацыянальная платформа – якая магла быць асновай – не прыняла ўдзелу, страціўшы гнуткасць і ініцыятыву.

Асобныя людзі ўдзельнічалі, але як структура яна не працавала. Таму адбылося так, як адбылося.

## Паміж рафінаваным мысленнем і практыкай прорвы няма

*– Дзе, на ваш погляд, мяжа паміж мысленнем як тлумачэннем – і мысленнем як канструктарам рэальнасці? Хто вы сёння: стратэг, мадэратар, правакацыйны інтэлектуал – ці ўсё разам?*

– Я і тут абапіраюся на свайго настаўніка, Георгія Пятровіча Шчадравіцкага, стваральніка мыслядзейнаснай метадалогіі. Быў яго вучнем, а пасля стаў працягам. Калі пыталі, што гэта такое, метадалогія, адказваў: практычная філасофія. Спосаб вырашаць арганізацыйныя і дзейсныя праблемы праз напружанне мыслення, праз глыбокае даследаванне рэчаіснасці.

Таму я не тэарэтык у чыстым выглядзе. Я метадолаг, які бачыць у мысленні інструмент дзеяння. Спалучэнне тэорыі і практыкі – вось у чым сутнасць. Яно дае магчымасць злучыць найвышэйшыя ўзроўні думання – навуковага, філасофскага –

з арганізацыйнай працай у любой сферы: адукацыі, вытворчасці, палітыцы.

Палітыкай метадолагі пачалі займацца позна, пасля смерці заснавальнікаў. І супольнасць, на жаль, раскалолася ідэйна: частка пайшла ў бок «русского мира», частка – у праеўрапейскім дэмакратычным кірунку. Так было і ў мяне: выбраў гэты другі шлях і пачаў развіваць метадалогію ў Беларусі.

Я не бачу супярэчнасці паміж рафінаваным мысленнем і практыкай. Калі нешта ў маіх дзеяннях выглядае як правакацыя, дык гэта іншае: вынік аналітычнай працы, пошук адказу на выклік рэчаіснасці.

*– Іранізаванне вашых апанентаў – праблема мовы ці гарызонту? Ці мусіць публічны інтэлектуал зніжаць планку – або, наадварот, падымаць сваю аўдыторыю?*

– Нападкі ішлі з розных бакоў. Нават мае сябры-філосафы казалі, што я займаюся мітуснёй, не вартай філосафа. Так казаў Валянцін Акудовіч, так цвярдзіў Ігар Бабкоў, так бубнелі акадэмічныя людзі з БДУ. Але былі і тыя, хто далучаліся. Павел Баркоўскі, потым філосафы з ЕГУ: Уладзімір Фурса, Таццяна Шчытцова. Яны зразумелі, што гэта не вычварэнне, а грамадзянская пазіцыя філосафа.

Мы шмат у чым зусім не піянеры-першапраходцы – маем перад сабой перадкультурныя прэцэдэнты. Успомнім 1968 год: філасофія і грамадзянскі рух ішлі поруч. Фуко, Сартр, Маркузе ў Парыжы, Патачка і Гавэл у Празе, Янаўх і фонд «Хартыі 77»… Гэта не дзіўна, калі філосафы ідуць у грамадства, прыносяць свае падыходы, хай яны і не заўсёды лёгкія для большасці.

Калі гэта зразумелі мае калегі, калі мы атрымалі падтрымку ад філосафаў з іншых краін (таго ж Гінтаўтаса Мажэйкіса з Коўна), польскіх інтэлектуалаў, людзей «Салідарнасці» (Яцэка Кураня, Адама Міхніка) – стала відавочна: праблема не ў метадзе, а ў няспеласці беларускай філасофіі, якая толькі шукала свой голас.

## Трэба быць не фальклорнай, а сучаснай еўрапейскай нацыяй

*– Спроба зазямліцца: у беларускай прасторы ёсць месца для інтэлектуала-стратэга? І якія ўмовы дазваляюць мысляру не толькі тлумачыць шлях, але і задаваць рытм дзеяння?*

– Без фальшывай сціпласці скажу: у 1990-я я не бачыў вакол сябе дзеячаў, здольных пацягнуць такую задачу. Але ўжо з'яўляліся маладыя навукоўцы, якія фактычна стварылі беларускую філасофскую мову. Вельмі важны момант, бо філасофія прарастае з мовы. І таму існуюць толькі тыя школы, што маюць сваю нацыянальную мову: нямецкая, англійская, французская…

У 1990-я не было ні рускай, ні беларускай філасофіі – яе належала ствараць. Раней гэтым займаліся Ігнат Канчэўскі (Абдзіраловіч), а ў наш час – Акудовіч, Дубавец, іншыя. Мы пачалі нанова: праз дыскусіі, праз стварэнне «Беларускай думкі дзесяцігоддзя», праз супольныя тэксты руска- і беларускамоўных аўтараў.

Гэта рухалася марудна, але стварала падмурак. На жаль, да 2020 года не паспелі стаць уплывовым інтэлектуальным цэнтрам, здольным паўплываць на грамадскія працэсы. Бо не мелі ні рэсурсаў, ні часу.

*– Калі звесці ваш падыход да формулы, то якія ключы вы назвалі б?*

– Мая формула простая: культурная палітыка. Гэта і філасофскі, і арганізацыйна-практычны падыход. Ён складаецца з дзвюх трыяд.

Першая – этапы працэсу: дэсаветызацыя, беларусізацыя, еўрапеізацыя.

Без поўнай дэсаветызацыі мы не можам набыць беларускую ідэнтычнасць – не толькі моўную, але і эканамічную, культурную, грамадзянскую.

Затым ідзе беларусізацыя – як неабходны крок у свеце глабалізацыі, каб утрымаць сябе як нацыю.

І толькі пасля гэтага – еўрапеізацыя, уваход у вялікі дыялог цывілізацый як самастойны суб’ект.

*– Беларусы лёгка асімілююцца, на вачах уліваюцца ў іншыя культуры…*

– Гэта нашая сіла і слабасць адначасова. Але каб нас пачулі, мусім быць не фальклорнай, а сучаснай еўрапейскай нацыяй. Як той турэцкі астраном у «Маленькім прынцы»: пакуль хадзіў у шараварах, яго ніхто не слухаў; апрануў еўрапейскі строй – і свет пачуў.

Таму формула мая такая: дэсаветызацыя – беларусізацыя – еўрапеізацыя. Толькі так можна стаць паўнавартасным удзельнікам еўрапейскага і сусветнага цывілізацыйнага працэсу.

*– Дарэчы, вы калісьці сказалі, што ўсё патрэбнае для перамен умяшчаецца, ізноў жа, у тры словы. Якія?*

– Універсітэт, партыя, газета. Але гэта толькі найменні.

«Універсітэт» – фактычна ўся сфера адукацыі.

«Газета» – сродкі масавай інфармацыі, медыя, камунікацыя.

А «партыя» – арганізаваныя палітычныя сілы, здольныя ўзяць на сябе адказнасць не толькі за дэкларацыі, але і за кіраванне тымі складанымі працэсамі, пра якія казаў вышэй.

Я настойваў, каб гэтая праграма (можа, і не ў маёй тэрміналогіі, але па сутнасці) трапіла ў праграмныя дакументы Аб’яднанай грамадзянскай партыі, «Хартыі’97», а потым і Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. З «Хартыяй» нават атрымалася зрабіць нешта рэальнае, дзякуючы Юрасю Хадыку і Андрэю Саннікаву.

*– Таму стварылі пры ёй Народны ўніверсітэт?*

– Мэта была ў аднаўленні супольнасці філаматаў і філарэтаў. Ужо на новым узроўні, у гонар тых славутых асоб, што дзейнічалі перад закрыццём Віленскага ўніверсітэта. Тады ж з’явіўся і свой сродак масавай інфармацыі, сайт «Хартыя’97». Мы выкарыстоўвалі радыё, інтэрнэт – усё, што магло працаваць. Але як палітычны суб’ект арганізацыя так і не адбылася, праграму прынялі толькі часткова. Гэта ўсё вартае асобных артыкулаў і кніг.

## Беларусь 1990-х: дыктатура на ўздым, апазіцыя – на спад

*– Беларусі 1990-х і 2020-х – які наш галоўны страчаны шанец?*

– Краіна не скарысталася рэальным шанцам на палітычную і культурную трансфармацыю. Многія ўсё валяць на Лукашэнку, але ён з’явіўся толькі напрыканцы 1993 года – фактычна з-за слабасці Шушкевіча. Той не наважыўся агучыць антыкарупцыйны даклад, падрыхтаваны менавіта для яго. Каб не пакрыўдзіць уплывовых людзей, перадаў дакумент Лукашэнку. І калі ўчорашні дырэктар саўгаса з сіпатым голасам апынуўся на тэлебачанні, то ўмомант стаў выбухова папулярным. Джын коркам вылецеў з бутэлькі.

Але галоўная параза здарылася яшчэ раней – у 1992 годзе: тады фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце не здолела дамагчыся новых выбараў.

*– І ўсё засталося ў руках старога парламента.*

– Мы дажылі да прэзідэнцкай кампаніі з савецкім парламентам – камуністычным, баязлівым. Дэпутаты палохаліся ўласнага ценю. Нават рашэнні аб сімволіцы і незалежнасці прымаліся толькі са страху. Маленькая фракцыя БНФ змагла гэта правесці, але не дамаглася перавыбараў. І вось

з таго моманту ініцыятыва пачала сплываць. 1992–1994 гады знізілі ўплыў Фронту да мінімуму. Новыя сілы не з’явіліся, мы атрымалі паразу.

*– Калі скласці галасы за Пазняка і Шушкевіча, ці магла быць перамога?*

– Не. Максімум удзел у другім туры. Але і для гэтага трэба было дзейнічаць рашуча, а ніхто не хацеў браць ініцыятыву. Потым прыйшоў 1996-ы, і там ужо трэба казаць пра недальнабачнасць некаторых палітыкаў, у тым ліку Ганчара.

*– У чым менавіта яго памылка?*

– 15 лістапада лукашэнкаўская гвардыя захапіла Цэнтрвыбаркам, якім кіраваў Віктар. Ён не паклапаціўся пра супрацію. Хоць сілы яшчэ меліся: «Белы легіён», рэшткі БЗВ Статкевіча, актыўная моладзь… Можна было абараніць Цэнтрвыбаркам, але гэтага не зрабілі. Потым пачаўся збор подпісаў за імпічмент, і ўсё зноў развалілася.

*– Вы былі ўнутры гэтых падзей?*

– Меў пропуск у Вярхоўны Савет як памочнік дэпутата. Памятаю, спытаў у Ганчара: а што, як не хопіць аднаго-двух галасоў? Ён адказаў: «Усё пад кантролем!» Дзе там… Некаторыя дэпутаты хаваліся па кабінетах, не прыйшлі ў залу. Гэта недаравальная нядбайнасць і неразуменне сур’ёзнасці моманту. Потым Ціхіня і Шарэцкі не вытрымалі маскоўскага дэсанту Чарнамырдзіна – і вось і канчатковая параза.

*– Вы часта кажаце, што 1996 год мог стаць беларускім Майданам.*

– Калі б тады, у ноч на 26 лістапада, Ганчар, Лябедзька, Багданкевіч ды іншыя ўпусцілі людзей з плошчы ў будынак Вярхоўнага Савета, гэта надало б мужнасці дэпутатам і не дазволіла Маскве перагнуць іх. Але ўсе баяліся вуліцы, іх пужаў натоўп. Лябедзька потым пачаў арганізоўваць шэсці, толькі ўжо позна.

*– Маханне кулакамі пасля бойкі?*

– Хоць насуперак абставінам маглі злучыць парламенцкую фракцыю з вуліцай і перамагчы. Але ўпусцілі сваё: дыктатура пайшла на ўздым, апазіцыя – на спад.

Палітыка, калі яна сапраўдная, патрабуе дакладнай стратэгіі. Трэба разумець, дзе ты, у наступе ці ў абароне. А ўсе паводзілі сябе так, быццам перамагаюць, хоць насамрэч – прайгравалі.

*– Цяпер, на ваш погляд, у беларускай дыяспары адбываецца нешта іншае?*

– Тое самае: ілюзія руху, але без разумення рэчаіснасці.

*– І гэта не адзіны прапушчаны момант?*

– Былі яшчэ дзве падобныя сітуацыі: у 2006 і 2010 гадах, калі можна было даць сапраўдны бой дыктатуры. Можа, не перамагчы, але хаця б узмацніць пазіцыі. А вось 2020 год – гэта ўжо зусім іншы ўзровень.

## Плылі прыгожа, з імпэтам, але без мэты – ад плота да абеду

*– У чым галоўная памылка 2020 года?*

– Народная энергія, вулічная і магутная, спатыкнулася аб адсутнасць суб’ектаў, здольных ператварыць выбух у доўгі рух. Гэта, можа, спрошчана, але дакладна. І тут трэба гаварыць пра стратэгію – пра тое, што Ленін сфармуляваў як «сёння рана, заўтра позна».

*– Што маеце на ўвазе?*

– Першыя два тыдні пасля 9 жніўня – вырашальныя. Тады трэба было браць уладу, хаця б часткова, і ўсталяваць двоеўладдзе. Але не знайшлося каму наважыцца. Бабарыка не планаваў перамогі – яго тэкст пасля арышту паказаў, што чалавек рыхтаваўся да паразы і марыў пра партыю, а не ўладу.

Ціханоўская таксама не рвалася да перамогі. Латушка далучыўся позна. Апазіцыйныя партыі адсунулі, бо піяршчыкі штаба іх баяліся.

*– І ўсё гэта нагадвала схему трох светаў, якую вы апісалі ў сваёй кнізе «Глабальнае пацяпленне пасля халоднай вайны».*

– Так. Беларусь падзяляецца на тры светы.

Першы – глабальны: людзі, якія маюць рэсурсы, кампетэнцыі, міжнародныя сувязі.

Другі – нацыянальны: людзі, якім не ўсё роўна, што будзе з Беларуссю.

Трэці – лакальны: тыя, хто жывуць дробнымі, дваровымі клопатамі.

Дык вось сапраўдныя перамены маглі адбыцца толькі тады, калі б спалучыліся глабальныя магчымасці з нацыянальнай воляй. Але гэтага не адбылося.

Паразумеліся першы і трэці свет… Блогеры ўзнялі масы людзей з лакальнымі інтарэсамі, і яны пайшлі за Бабарыкам, часткова за Цапкалам, Калеснікавай, Знакам ды іншымі лідарамі штаба. А вось прафесійныя палітыкі падцягнуліся пасля таго ўжо, як асноўныя падзеі скончыліся. У выніку масавы ўздым без галавы. Людзі хлынулі на вуліцы, цяклі па праспектах, але без мэты – ад плота да абеду, як кажуць.

*– Захапленне рухам без разумення кірунку?*

– Менавіта. Паўмільёна махаюць сцягамі, размаўляюць міжсобку, радуюцца таму, што могуць быць разам, усе смелыя… Але курсу ніхто не ведае. Маршыруюць без мэты. Без суб’екта, які накіроўвае, арганізоўвае, трансфармуе энергію ў стратэгію.

Вось чаму паўтараю: нельга грэбаваць нават тым, што прыдумаў Ленін, хоць і лічу яго людаедам, заснавальнікам таталітарызму. Але як стратэг ён быў выбітны. Умеў бачыць момант, калі трэба дзейнічаць, і не прапускаў яго.

## Люстэрка-2020: вайну без генштаба не выйграць

*– Вы некалі сказалі: «Беларусы мусяць навучыцца глядзець на сябе без ілюзій». Калі зазірнуць у люстэрка 2020 года, каго і што там бачым?*

– Народ, які ўразіў сам сябе. Велізарную здольнасць да салідарнасці. Гатоўнасць ахвяраваць – грашыма, працай, маёмасцю, часам нават жыццём. Гэта быў сапраўдны цуд. І ён не ўзяўся з нічога. Быў досвед салідарнасці падчас ковіду, калі грамада вырашала тое, што дзяржава не магла. Кідалі працу, бізнес, каб дапамагчы іншым. І гэтая энергія перацякла ў 2020 год.

*– Вялікая салідарнасць праяўлялася і, напрыклад, у 2014-м, падчас захопу Крыма Расіяй…*

– Беларусы сапраўды моцна дапамагалі ўцекачам з Данбаса, арганізоўвалі дабрачынныя ініцыятывы, як, напрыклад, рабіў Стрыжак. Гэта паказвае, што патэнцыял салідарнасці ў нас велізарны. Але тады, у 2020-м, не было галавы. І людзі не хацелі яе мець. Яны казалі: «Мы самі, без лідараў, без кіраўніцтва пераможам». Наіўная ілюзія…

Таму што вайну без генеральнага штаба не выйграць. У любой сітуацыі канфлікту патрэбны суб’ект, здольны прымаць рашэнні. Гэта можа быць адна асоба або група, але не базар, не дыскусійны клуб. Жнівень дваццатага патрабаваў арганізацыі стачак, вываду на вуліцы заводаў, стварэння эканамічнага ціску. Як у 1991 годзе гэта рабілі прафсаюзы Быкава, Аліевай, іншых. Але нічога падобнага не адбылося. Прафсаюзы былі бюракратычныя, без волі да дзеяння.

*– І нават аб’яднаны штаб Ціханоўскай не стаў такім цэнтрам сілы?*

– Не. Замест таго, каб стварыць калектыўны суб’ект з некалькіх чалавек, якія маглі б дзейнічаць як «галоўны штаб», нарадзілі

Каардынацыйную раду з сарака асобаў. Людзі гэтыя здольныя пагаварыць, але не дзейнічаць. Ні ідэй, ні волі, ні гатоўнасці да перамоў. Мы маглі б тады, як мінімум, усталяваць двоеўладдзе, абвясціць Ціханоўскую прэзідэнткай і праз перамовы дамагацца рэальных вынікаў. Але ўсё сышло ў сімвалы і заявы.

Тут дарэчы згадка пра венесуэльскую сітуацыю з Гуайдо і Мадура.

Першы правёў сімвалічную інаўгурацыю, яго прызналі ЗША, але ўлады так і не атрымаў. Бо без суб’екта, без апоры гэта немагчыма.

Мы маглі б прэтэндаваць на двоеўладдзе, як здарылася ў Польшчы падчас круглага стала.

Але замест стратэгічнага падыходу гучалі наіўныя лозунгі: «З Лукашэнкам не будзе перамоў, хай сыходзіць!» Ён сам ніколі не сыдзе. Яго можна адхіліць толькі праз сілу ці праз перамовы. І ў жніўні 2020 года такая магчымасць мелася цягам двух тыдняў. Але не знайшлося таго, хто б за яе ўзяўся.

*– Праблема захоўваецца і цяпер? З таго боку – суб’ект ёсць. З гэтага – няма…*

– Мы раз’яднаныя, высвятляем, хто галоўны, сварымся нават паміж сабой, як у адной сям’і. І галоўнае – губляем паразуменне паміж тымі, хто ў краіне, і тымі, хто за мяжой. Большасць беларусаў унутры супраць рэжыму, але прыдушаныя. Тут, за мяжой, можам дзейнічаць, але балбочам значна больш.

*– Як аднавіць паразуменне паміж дзвюма часткамі нацыі?*

– Перш за ўсё – жыць без ілюзій. Не трэба думаць, што ўсе могуць выйсці пад аднымі лозунгамі і сцягамі. Мы розныя, і гэта нармальна. Але на пэўны час трэба кансалідавацца – не праз кансэнсус, калі ўсе думаюць аднолькава, а праз кампраміс. Кансалідацыя на падставе ўзаемнай павагі, гатоўнасці

прыглушыць свае амбіцыі і пачуць іншых. Не адзінадумства, а адзінадзеянне.

## Турма – інструмент страху, а не справядлівасці

*– У 2020 годзе вы маглі з’ехаць, але засталіся. Потым у турме абвясцілі галадоўку. Што хацелі сказаць гэтым сабе, іншым?*

– Калі мяне папярэдзілі пра пагрозу, я ведаў, што магу з’ехаць за Карбалевічам, Класкоўскім, Чалым, Шрайбманам. Але я застаўся. Па-першае, маральна не мог інакш. Я крытыкаваў Пазняка, калі ён эміграваў; крытыкаваў тых, хто пакінуў Беларусь пасля 2010-га. Як пасля гэтага сам мог зрабіць тое ж самае? Стоп-сігнал – маральная мяжа.

*– А другая прычына?*

– Я ведаю, што бывае з палітычнай эміграцыяй. Яна дэградуе. Мастакі і пісьменнікі могуць адаптавацца ў іншай краіне, але палітыкі – не. Я не хацеў апынуцца ў гэтым стане, у сварках і разбурэнні знутры. Я вырашыў заставацца дома, тут маё месца і мой голас. Але ўлады не стрымаліся: праз тры месяцы пасля ордара мяне затрымалі.

*– І таму галадоўка стала спосабам прымусіць сістэму адказаць?*

– Рэальна стаміўся ад бяздзейнасці следства. Паўгода на Валадарцы без тлумачэнняў, без руху ў справе. Я не мог націснуць словамі, таму вырашыў прабіць учынкам. Абвясціў галадоўку, і толькі тады нешта зварухнулася. Справа пачала рухацца, хоць пазней і дадалі яшчэ два артыкулы. Гэта мой спосаб прымусіць сістэму адказаць.

*– Пасля вызвалення вы заявілі: «Турма як інстытут мусіць быць адмененая». Што вы мелі на ўвазе? Якую мадэль правасуддзя бачыце замест існай: аднаўляльную, тэхналагічную, камунітарную?*

– Турма – рэштка сярэднявечча. Яна не перавыхоўвае, а толькі разбурае чалавека. Гэта не інструмент выпраўлення, а механізм

ізаляцыі. Мы мусім перайсці да сістэмы, дзе пакаранне не выкідае чалавека з жыцця, а бярэ яго ў працэс далучэння да грамадскіх нормаў. Праз працу, праз адказнасць, праз адкрытасць перад грамадствам. Гэта можа быць камунітарнае правасуддзе, дзе чалавек аднаўляе шкоду не праз пакуту, а праз дзеянне і карысць для іншых.

Але галоўная праблема нават не ў адсутнасці эфектыўнасці, а ў антыгуманнасці самога інстытута. Турма – прастора, дзе чалавек трапляе ў супольнасць, якая нявечыць душу, калі ў яго няма ўнутранага стрыжня. Там разбураюцца сувязі, годнасць, здольнасць да даверу.

Часта паўтараюць: зняволенне нікога не робіць лепшым. Я згодны: лепшым – не робіць. Але і ў горшага яна не ператворыць таго, хто мае сілу духу і свядомасць. Аднак сам прынцып – бесчалавечны.

Турма – інструмент страху, а не справядлівасці. І я ўпэўнены: грамадства здольнае жыць без яе, калі навучаецца адказнасці замест помсты. Вось у чым сапраўдная трансфармацыя правасуддзя – маральная, не толькі тэхналагічная.

Калісьці, пры адсутнасці іншых сродкаў барацьбы са злачынствам, можа, зняволенне і было адэкватным інструментам. Але сёння – не.

*– Бо тэхналогіі змянілі старыя парадкі? Тыя сталі перажыткам мінулай эпохі?*

– Мы жывём у свеце, дзе шмат чаго можна кантраляваць, не пазбаўляючы чалавека свабоды: паўсюль камеры, алгарытмы распазнавання твараў, электронныя бранзалеты, GPS-назіранне. І таму няма патрэбы кідаць людзей у замкнёную прастору, дзе пануюць прыніжэнне, насілле, дэградацыя. Хто не стварае рэальнай пагрозы грамадству: карупцыянеры, дробныя махляры, нарказалежныя, – могуць адбываць пакаранне на волі. Пад наглядам, але без адрыву ад жыцця. Так яны пазбягаюць уплыву крымінальнага свету і захоўваюць чалавечнасць.

*– Але грамадства складана пераканаць у гэтым.*

– Безумоўна. Людзям цяжка прыняць, што правасуддзе можа існаваць без турмаў. Хоць калісьці надзвычай марудна прымалася таксама ідэя адмены смяротнага пакарання. Але нідзе гэта не адбывалася праз рэферэндум, як у нас, а заўсёды праз рашэнне парламентаў, праз волю эліт. Так і тут: трэба пачынаць тлумачыць, чаму турма – сярэднявечча, чаму цывілізаваны свет мусіць шукаць іншыя формы адказнасці. Магчыма, я толькі паспею пачаць гэтую размову, але ўжо бачу людзей, гатовых падхапіць ідэю.

*– Вы кажаце пра гэта зусім не з пазіцыі філасофскай, тэарэтычнай…*

– Адсядзеў больш за чатыры гады і ведаю, пра што гавару. У мяне, напэўна, больш права казаць пра гэта, чым у тых, хто разважае з боку. Бо турма – гэта пра знішчэнне годнасці. І яе немагчыма мадэрнізаваць: можна даць вязням тэлевізары, інтэрнэт, лепшую ежу, але сутнасць не зменіцца. Турма застанецца турмой. Месцам, дзе чалавека пазбаўляюць чалавечнасці. Здзек, які нельга апраўдаць ні мараллю, ні законам.

## Маліўся па некалькі разоў: раніцай, вечарам, пры натхненні – і днём…

*– А што дапамагала вам пераносіць гэты здзек? Ці была вера часткай вашай унутранай апоры?*

– Безумоўна. Хоць раней я не быў узорным, дбайным вернікам – у царкву хадзіў нерэгулярна, маліўся рэдка… А ў турме ўсё змянілася. Гэта час, калі малітва стала адзіным суразмоўцам, адзінай магчымасцю захаваць сябе. Я маліўся па некалькі разоў: раніцай, вечарам, пры натхненні – і днём… Сапраўдны малітоўны марафон. І менавіта ён утрымліваў мяне ў раўнавазе.

*– Як няма вакол людзей, што падзяляюць твае каштоўнасці, вера замяняе чалавечы кантакт?*

– Калі я толькі трапіў у магілёўскую турму, палітвязняў там было літаральна некалькі чалавек, нас не зводзілі разам. Было цяжка без размоў, без падтрымкі. Але калі молішся, размаўляеш з Богам, то адчуваеш, што не адзін. Потым палітвязняў стала больш, мы пачалі сустракацца ў камерах, і гэта вярнула магчымасць нармальнага чалавечага кантакту. Але вера ўсё роўна заставалася галоўнай сілай.

*– Якую менавіта сілу яна вам давала?*

–Унутраную, духоўную. Калі чалавек не мае веры, ён лёгка губляе волю. Бо турма штодня выпрабоўвае цябе: вытрымаеш ці зломішся? А вера тлумачыць: пакуты – не канец, нават калі цябе прыніжаюць, бо існуе праўда, вышэйшая за ўсё зямное.

*– Вера – гэта не пра абрад, не пра царкву, не пра правілы?*

– Гэта ўнутраны дыялог з Богам. Ты не пытаешся: «Чаму я тут?» Ты ўсклікаеш: «Навошта я тут?!» Вось што дае сэнс.

*– Тут няма агульнага з прапаведніцтвам?*

– Не, я не святар, не місіянер. Але дакладна ведаю: калі не трымацца за нешта вышэйшае, за ідэю, за Бога – не вытрываеш. Бо там, у клетцы, няма нічога, акрамя сцен і сябе. І ў гэтай клетцы ты мусіш знайсці прастору для душы. Мая вера стала маім паветрам, маёй мовай знешняга свету, маёй надзеяй, што чалавек застаецца чалавекам нават у зняволенні.

*– Якое пасланне вы пакінулі б тым, хто жыве сёння і думае пра заўтра?*

– Не буду цытаваць Біблію – вера занадта асабістая для гэтага. Але калі казаць пра зямное, то я веру ў Беларусь.

У народ, які вытрымаў тысячу гадоў выпрабаванняў і не страціў сябе. У 2020 годзе ўсе ўбачылі: мы – людзі. Купала калісьці заклікаў «людзьмі звацца» – гэта было патрэбна ў яго час. А цяпер – не. Мы ўжо – людзі.

І тое, што нас чакае, – гэта свабода. Асабістая і нацыянальная.

Нашая адказнасць сёння ў тым, каб не страціць наступныя пакаленні, не перадаць ім свайго расчаравання.

Мы не здабылі свабоды, гэта горкая праўда. Але павінны зрабіць усё, каб яны яе мелі. Мы яшчэ нічога не страцілі. Трэба проста сканцэнтравацца і прыняць выклік часу.

Беларусь мусіць стаць часткай сям'і свабодных народаў.
І я ўпэўнены: стане.

# ВАЛЕРЫЙ КАРБАЛЕВІЧ



Фота з асабістага архіва В. Карбалевіча

*Нарадзіўся 28 студзеня 1955 года. Беларус.*

*Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1978). Кандыдат гістарычных навук.*

*Выкладчык Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (1978–1983).*

*Скончыў аспірантуру Белдзяржуніверсітэта (1983–1986).*

*Дацэнт Беларускага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта (1986–1995).*

*З 1993 года – эксперт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных ініцыятыў «Усход-Захад» (з 1998-га – аналітычны цэнтр «Стратэгія»).*

*Палітычны аглядальнік газеты «Свободные новости» / «СНплюс. Свободные новости плюс» (1997–2023).*

*З 1999 года – палітычны аглядальнік «Радыё Свабода».*

*Удзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці Беларусі з часоў перабудовы. Быў адным са стваральнікаў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (1990), Аб'яднанай грамадзянскай партыі (1995).*

*Друкавацца ў СМІ пачаў з 1990 года. Аўтар некалькі тысяч публікацый, прысвечаных розным праблемам унутранай і замежнай палітыкі Беларусі.*

*Аўтар кнігі «Александр Лукашенко. Политический портрет», выдадзенай па-руску (2010), па-французску (Le satrape de Biélorussie: Alexandre Loukachenko, le dernier tyran de l'Europe, 2012), па-польску (Aleksandr Łukaszenko. Portret polityczny, 2013).*

*У 2012 годзе атрымаў прэмію імя Герда Буцэрыюса «Свабодная прэса Усходняй Еўропы».*

*Працягвае працаваць палітычным аглядальнікам «Радыё Свабода». Дае каментары розным беларускім незалежным медыя і замежным СМІ.*

*Сябра Рады БАЖ па медыяэтыцы.*

ВАЛЕРЫЙ
КАРБАЛЕВІЧ

# НАШАЯ ГІСТОРЫЯ – ЯК ЛЮСТЭРКА: У ІМ І ПАРАЗА, І ШАНЕЦ

## У чаканні параду лафетаў жыццё на месцы не стаяла, дэкарацыі мяняліся на вачах

*– Калі гаварыць мовай паліталогіі, кожны чалавек праходзіць праз працэс сацыялізацыі. Згадайце першыя ўрокі (сямейныя, вясковыя, студэнцкія), што сфармавалі вас і прывялі ў выніку да паліталогіі.*

– Майму пакаленню выпала жыць у вельмі розных эпохах: Савецкі Саюз, позняя брэжнеўшчына – час так званага развітога сацыялізму, глухі застой. Вось на што выпала сацыялізацыя маёй асобы. Тады здавалася – гэта назаўсёды... Калі нібыта запраграмаваны на бессмяротнасць генсек усё ж памёр, мы глядзелі трансляцыю ўрачыстага пахавання і разважалі: што будзе далей? Брэжнева не стала, але вунь колькі клонаў за ім, прыйдуць яны – і сістэма працягне існаваць...

*– Ну, да параду лафетаў на Краснай плошчы трэба было яшчэ дажыць...*

– Так, бо маё жыццё пачалося яшчэ ў 1955-м, у Кастрамской вобласці Расіі.

*– Год глыбока сімвалічны: пасля Сталіна Хрушчоў падмяў партыю, Маленкоў страціў урад – яго адцясніў Булганін. Маналіт даў наступную трэшчыну, і гэта ўжо выглядала як прадвесце будучых зрухаў... Але вернемся да вытокаў: дык вы рускі?*

– Бацькі-беларусы паехалі туды на заробкі: спакусілі паўночныя каэфіцыенты. А наагул тата – шафёр са Старобінскага раёна (цяпер Салігорскага), маці – настаўніца з суседняга, Слуцкага. Два гады пражылі там і вярнуліся назад, у Беларусь, ужо са мной. Таму маё дзяцінства і юнацтва – гэта Случчына. Неяк зацікавіўся палітыкай і таму зусім не выпадкова паступаў на гістфак БДУ. Старт не ўдаўся: не прайшоў конкурсу. Адпрацаваў год у будаўнічым упраўленні і з другой спробы паступіў. Універсітэт скончыў з чырвоным дыпломам.

*– І нягледзячы на гэта – размеркаванне ў глыбінку, Горацкую сельгасакадэмію?*

– Пяць гадоў на ўсходзе Магілёўшчыны. Потым ужо была мэтавая аспірантура ў сталіцы і дзесяць гадоў у Беларускім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі, цяпер гэта Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт.

*– Выкладалі гісторыю КПСС?*

– Назва курса мянялася з генеральнай, як тады жартавалі, лініяй партыі: у перабудову гэта ўжо была «палітычная гісторыя», а далей – «гісторыя Беларусі», у адпаведнасці са зменамі палітычных працэсаў.

*– Інстытут і акадэмія рыхтавалі кадры для сяла, фармавалі будучую рэгіянальную інтэлігенцыю. Але ці былі сярод гэтых людзей «пазасістэмныя» або проста здольныя на іншую свядомасць?*

– Вы пра грамадзянскую рэфлексію? Калі гаварыць шчыра, то вясковая эліта таго часу – спрэс людзі сістэмы, яе частка. Да пачатку гарбачоўскай перабудовы нейкіх прыкметных зменаў у свядомасці не бачыў.

*– І гэта парадокс, бо сама вёска ў шасцідзясятыя – сямідзясятыя мянялася вельмі імкліва!*

– Я застаў яшчэ тыя часы, калі ў калгасе жалі хлеб сярпамі. І адначасова літаральна на маіх вачах адбываўся шалёны працэс паўсюднай механізацыі… Калі пайшоў у школу, у пасёлку яшчэ не было электрычнасці! Урокі рабіў пры карасінавай лямпе. Але на раз-два тэхнічны скачок, стартавала ўрбанізацыя: школьнікам бачыў перапоўненую людзьмі вёску, а дзесьці ўжо ў сямідзясятыя гады – адыход моладзі, старэнне.

*– Знікненне вёскі – не толькі сацыялагічны працэс, але і маральная з’ява: абвальваецца лад жыцця, слабее здольнасць людзей гуртавацца, быць разам.*

– Вось гэта менавіта ці не самае важнае: разам з абязлюджваннем вёскі пачала знікаць і яе актыўнасць. Раней былі мастацкая самадзейнасць, канцэрты, спаборніцтвы. А калі сталі з’язджаць, амаль усё гэта знікла. Затое мацавалася ўсведамленне, што калгас – нешта зусім адсталае… Адсюль і новая хваля міграцыі ў пошуках лепшага жыцця. Тыя, хто заставаўся, звычайна проста не мелі рэсурсу на іншы выбар.

*– Што адрознівала вясковую свядомасць ад гарадской: не ў бытавых, а ў маральных каардынатах? Яны мелі розныя ўяўленні пра працу, годнасць?*

– На мой погляд, розніца ў ментальнасці слаёў тагачаснага грамадства была малаадчувальная – я не стаў бы гаварыць пра нейкі велізарны разлад. Хіба што аграрны сектар трохі больш кансерватыўны. Напрыклад, у перабудову наш інстытут найбольш супраціўляўся пераменам. І студэнты, і выкладчыкі. Вясковая інтэлігенцыя не вельмі замарочвалася ідэалогіяй: людзі вырашалі асабістыя праблемы і спрабавалі ўладкавацца ў жыцці так, каб лепш жылося, мець нейкія даброты.

Вялікая палітызацыя ўсяго савецкага грамадства пачалася толькі тады, калі Гарбачоў аб’явіў, што застой – гэта не норма, а хвароба, таму трэба нешта мяняць, ладзіць.

## Пасля ідэалагічнай контратакі – пагромны артыкул «Пена на хвалі перабудовы»

*– У савецкай сістэме было шмат спакус і чырвоных сцяжкоў, каб заставацца ў бяспечнай нішы выкладчыка кананічнай гісторыі. Што прымусіла парушыць баланс і перайсці ў зону рызыкі, да публічнага аналізу сучаснасці? Гэта асабісты выбар – ці энергія той эпохі?*

– Гэта наўпрост звязана з новымі гістарычнымі працэсамі: пачаткам перабудовы, з’яўленнем галоснасці і так далей.

Я, як і шмат хто, эвалюцыянаваў разам з грамадствам. З’явілася пэўная свабода, магчымасць нешта адкрыта ацэньваць, аналізаваць, рабіць высновы. Раней ты не мог дазволіць сабе такое.

Умомант паўсталі грамадскія арганізацыі, якія тады называліся нефармальнымі. Бо ініцыяваліся знізу, самастойна, а не з дазволу ўлад, як было дасюль. Пачалі ўзнікаць і новыя медыя – з’явіўся канал для трансляцыі ўласнай думкі.

*– То-бок стартавы пункт вашай «найноўшай гісторыі» – гэта не выключна асабістыя абставіны біяграфіі, а тэктанічны грамадскі зрух?*

– Так, сукупнасць, проста лавіна падзей. Найперш рытм і пульс часу адчуваўся ў маскоўскай прэсе, якая рэзка крытычна ацэньвала гісторыю савецкага ладу і камуністычнага рэжыму.

*– Памятаеце нейкую публікацыю, што пераламала думку і навуковага асяродку, і асабіста вас?*

– Напрыклад, артыкул Гаўрыіла Папова ў часопісе «Наука и жизнь», дзе ён упершыню ў савецкай перыёдыцы раскрытыкаваў адміністрацыйную сістэму, а не толькі сталінізм. Ад часоў XX з’езду лічылася, што яна ў нас добрая – дрэнны Сталін, які ўсё і загубіў. І вось прагучала зусім іншае, глыбейшае. Пад агонь трапіў і Ленін. То-бок, пад сумнеў была пастаўлена сама аснова савецкай ідэалогіі, на якой будаваўся ўвесь камуністычны лад. З гэтага пачалася шырокая крытыка сістэмы ў цэлым.

Менавіта тады ў Мінску з’явіліся першыя самастойныя гурткі нефармалаў. З нетраў якіх вырас «Сучаснік». Я стаў адным з яго пачынальнікаў. Спачатку збіраліся на кватэры, а неўзабаве выйшлі на публічныя дыскусіі.

*– Спроба вырвацца з савецкай арбіты і стварыць уласную прастору думкі… Гэта была першая школа свабоды – ці ўсяго толькі ілюзія альтэрнатывы?*

– Мы былі тады групай інтэлігенцыі з ухілам у дысідэнцтва: мае добрыя знаёмыя, аднакурснікі Віктар Чарноў і Міша Пліско, таксама Рома Якаўлеўскі… Падчас сустрэч сур'ёзна абмяркоўвалі перажытае і выклікі. Паступова да дыскусій далучаліся новыя людзі, таму пачалі шукаць зручнае, годнае месца. Урэшце Леў Крывіцкі нечакана выбіў пакой у Доме палітасветы. Народ цягнула туды як магнітам.

*– І доўга працягвалася вольніца?*

– Дыспуты мелі такі моцны рэзананс, што ўлады дзеля адлупу даволі хутка мабілізавалі выкладчыкаў з Вышэйшай партыйнай школы… Ідэалагічная контратака праваліласяі, і тады ў прэсе з'явіўся славуты пагромны артыкул «Пена на хвалі перабудовы».

Пачалі разбірацца: а хто ж замуціў гэты працэс? Дацэнт кафедры гісторыі КПСС! Усчаўся вялізны скандал: разбіралі па костачках на партыйным сходзе… Сакратар парткама выклікаў мяне з Чарновым і рэзюмаваў: «Ну, вось, разумныя хлопцы – а сапсавалі кар'еры на ўсё астатняе жыццё».

Намнога пазней мне давялося пабачыць спецыяльную пастанову бюро ЦК КПБ, дзе згадвалася маё прозвішча, далей партыйным арганізацыям рассылалі аб'ектыўку з біяграфіяй і высновай: гэта якраз адзін з тых, хто разбурае камуністычную партыю.

Аднак прайшло зусім мала часу – і ўрэшце сістэма рухнула.

*– То-бок вы можаце назваць сябе дэмакратам першай хвалі?*

– Я сказаў бы інакш: наш клуб «Современник» стаў адной з першых формаў грамадзянскай супольнасці яшчэ ва ўмовах камуністычнага рэжыму.

*– Давайце прыгадаем яшчэ колькі заўважных структур той пары. Хай з другой сферы, але таксама былі на слыху «Талака», «Тутэйшыя»…*

– Яны арыентаваліся найперш на нацыянальную ідэю – запачаткавалі тагачасны беларускі нацыяналізм, з якога

неўзабаве нарадзіўся Беларускі народны фронт, а далей – шэраг сацыял-дэмакратычных арганізацый. Так што гэты працэс адбываўся з розных бакоў.

А ліберальная плынь грунтавалася на грамадзянскіх, палітычных свабодах. Нацыянальная ідэя нас тады не вельмі натхняла.

*– Як браць вашае крыло, варта згадаць і «Дэмакратычную платформу».*

– Так, у значнай ступені менавіта там былі вытокі Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі. Я спрычыніўся да яе стварэння ў 1990 годзе, яшчэ да распаду Савецкага Саюза. Але калі стала ясна, што гэта рэальная сіла, якая набліжае разбурэнне чырвонай імперыі, многія, нават з ліку лідараў, адышлі ўбок. Некаторым не падабалася арыентацыя на еўрапейскі выбар, на Захад. Гаворачы сённяшняй мовай, палітычныя прыхільнікі рускага свету з’явіліся ўжо тады.

*– Ці можна сказаць, што савецкая ідэалагічная машына, якая гадамі трымала людзей у адной матрыцы, раптам страціла апору – бо без страху і прымусу яна не мела ні веры, ні сэнсу?*

– Калі з’явілася рэальная палітычная канкурэнцыя, ранейшыя звыклыя структуры паказалі сваю неканкурэнтаздольнасць і проста пачалі развальвацца. Бо ўвогуле не былі гатовыя да палітычнай барацьбы, змагання за свае ідэі. І кампартыя, і камсамол, і прафсаюзы капітулявалі амаль без бою. Сітуацыя амаль люстэркава нагадвае тое, што адбылося ў 2020-м. Створаныя ўладам арганізацыі ў момант вострага палітычнага крызісу проста знікаюць з арэны. Бо існавалі для іншага.

*– Для фасаднасці?*

– Дзеля кантролю важнейшых сфер грамадскага жыцця. Аднак кантраляваць – гэта не змагацца.

## Новы час – новыя гульцы, функцыя якіх – экспертыза

*– Трансфармацыі былі і ў дэмакратычным полі: нешта хутка адмірала, аднак умомант з’яўлялася новае… У 1993-м журналіст, адзін з першых беларускіх палітолагаў Анатоль Майсеня стварыў нацыянальны цэнтр стратэгічных ініцыятыў «Усход-Захад» і запрасіў вас. Што гэта быў за момант: асабістая кар’ерная дарога – ці ўваход у зусім новае поле, дзе фармаваліся першыя правілы грамадзянскай супольнасці?*

– Гэта новая рэальнасць. Майсеня заўважыў маю актыўнасць у незалежных медыя з каментарамі пра палітычныя працэсы і падзеі, прапанаваў супрацоўніцтва. Цэнтр хутка развіваўся, набываў вагу. Мы праводзілі многа канферэнцый, якія станавіліся даволі важнымі падзеямі грамадска-палітычнага жыцця. У тым ліку з удзелам кіраўніка Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча, віцэ-прэм’ераў, міністра замежных спраў, генералаў з Міністэрства абароны, навукоўцаў і заходніх палітыкаў… Цэнтр рэальна ўплываў сваімі даследаваннямі на грамадска-палітычныя працэсы ў краіне.

Даходзіла да кур’ёзнага: менавіта гэта эфектыўнасць раздражняла некаторых нашых апанентаў з апазіцыйнага ж лагера. Маўляў, калі да нас так ахвотна ходзяць чыноўнікі, значыць, «Усход-Захад» праўладны! Вунь, у выніку рэалізаваная тая ідэя, другая… Яны лабісты бюракратыі, апарата Кебіча, ату іх!

*– Эфектыўнасць заўсёды выклікае рэўнасць. Але што глыбейшае хавалася за псеўдакрытыкай?*

– Калегі прагледзелі момант: не зразумелі, што новы час вывеў на інфармацыйны экран новых гульцоў, функцыя якіх – экспертыза. Гэта была нечаканая з’ява: людзі без уладных рычагоў, затое з глыбокімі ведамі і нестандартнымі меркаваннямі сталі ўплывовымі. Пачалося з Масквы – там шэраг

спецыялістаў у галіне эканомікі, палітыкі, сацыялкі з дапамогай СМІ сталі фактычна заканадаўцамі моды ў розных важных сферах.

Апроч таго самага Папова, можна згадаць такіх знакамітых асоб эпохі, як Аганбегян, Абалкін, Шаталін…

У перыяд краху Савецкага Саюза і пачатку дзевяностых гадоў незалежнай Беларус мы трапілі ў трэнд. Навуковая экспертыза стала важным чыннікам, які ўплываў на грамадска-палітычныя працэсы і свядомасць грамадства. Тады вялізнымі накладамі выходзілі газеты і часопісы, людзі чыталі запоем, ці не суткамі слухалі і глядзелі жывыя трансляцыі важных дыскусій.

*– Але сёння той інстытут упаў «ніжэй плінтуса»: што яго збанкрутавала? Ці толькі злая дзяржаўная воля?*

– Яна моцна прыклалася да працэсу. Але адзначу таксама іншае: развіццё тэхналогій камунікацыі з грамадствам прывяло да таго, што «экспертныя» ацэнкі пачалі гучаць ці не ад любога з кінакамерай або мікрафонам і камп’ютарам. Прафанізацыя і папулізм – з кожнага кута. Попыт на хуткія, простыя адказы знішчыў глыбіню аналітыкі, а ў пэўным сэнсе нават і інстытут экспертызы.

*– Затое яго важкі голас «ацанілі» ўлады…*

– Як толькі Лукашэнка стаў прэзідэнтам, то пачаў змаганне з аналітычнымі цэнтрамі як уплывовай часткай апазіцыі. Пасля 1996-га завялі крымінальную справу супраць нас. Давялося зачыняцца і ствараць структуру пад новым брэндам – аналітычны цэнтр «Стратэгія».

*– У той момант ваша дзейнасць ужо выходзіла за межы легальнага поля. Ці можна было заставацца па-за палітыкай у краіне, дзе ўлада дэманстрацыйна ламала правілы?*

– «Малады» прэзідэнт на адным з паседжанняў аб’явіў, што апазіцыя атрымлівае грошы з-за мяжы праз тры цэнтры:

фонд Сораса, Чарнобыльскі фонд Грушавога і нас, грэшных. Гэта якраз супала з гібеллю Анатоля Майсені… Пачалася эпоха татальных «зачыстак».

*– Дзе яе першы паваротны пункт?*

– Канешне ж, рэферэндум 1996 года. Ён цалкам змяніў канстытуцыйную архітэктуру, зрабіў дзяржаву суперпрэзідэнцкай. «Плебісцыт» прайшоў у абсалютна неправавым полі. Спецыялісты ў галіне канстытуцыйнага права назвалі яго хутчэй дзяржаўным пераваротам, які запачаткаваў стварэнне класічнага аўтарытарызму Аляксандра Лукашэнкі.

*– Якім інструментарыем умацоўваўся новы палітычны парадак? Што гадамі заставалася пастаянным у гэтым працэсе, нягледзячы на змену гістарычных дэкарацый?*

– Рэпрэсіі. Сістэмнае знішчэнне ўсіх інстытутаў, здольных ствараць альтэрнатыву, ад аналітычных цэнтраў да незалежных медыя і НДА. Яны не зніклі цалкам, але былі загнаныя ў рэзервацыі, без рэальнага ўплыву на палітычныя рашэнні. Гэта класіка аўтарытарызму. А сёння, пасля 2020-га, мы ўжо маем сітуацыю таталітарызму.

## Выбары-94: індустрыяльнае рэха – ці вясковы кансерватызм?

*– Часта гавораць: першая фаза была шмат для каго досыць ліберальнай з-за так званага сацыяльнага кантракта: улада дае стабільнасць і мінімальны дабрабыт, грамадства расплачваецца маўчаннем. Гэта прыгожая схема – ці паліталагічная фікцыя?*

– Ужо ў самім паняцці «сацыяльны кантракт» схаваны падман. Хутчэй абстрактны паліталагічны канструкт, чым рэальнасць. Маскіроўка таго, што насамрэч адбываецца. Дзякуючы чаму Лукашэнка сапраўды абапіраўся не толькі на рэпрэсіі,

але, у пэўным сэнсе, і на падтрымку створанай ім сацыяльнай мадэлі жыцця.

У пэўны час «генеральны канструктар» стаў нават прэтэндаваць на тое, што яна – узор для іншых, а не проста мясцовая з'ява. Маўляў, гэта альтэрнатыва посткамуністычнай трансфармацыі.

Але насамрэч яе сутнасць – у танным расійскім газе і нафце «ў абмен на пацалункі». За «пацалункі інтэграцыі» Беларусь атрымлівала частку расійскай энергетычнай рэнты. Гэта давала пэўны эканамічны рост. Але ён тычыўся ўсёй постсавецкай прасторы, не толькі Беларусі ды Расіі. Лукашэнка ўпісаўся ў гэты трэнд і выцыганіў пэўныя дывідэнды: людзі былі гатовыя трываць аўтарытарныя метады, бо «жылося трохі лепш».

*– У такой мадэлі цэнтральнай фігурай заўсёды становіцца першая асоба. Выпадку Беларусі вельмі пасуе ўсім вядомае «дзяржава – гэта я».*

– У любым персаналісцкім рэжыме, якіх у свеце шмат было, ёсць і будзе, ад першай асобы сапраўды залежыць вельмі шмат. Гэтая фігура будуе дзяржаву па сваім вобразе і падабенстве, шые касцюм пад сябе. Лукашэнка насамрэч вельмі моцна ўплывае на палітычныя працэсы. Згадайце 2020 год. Я думаю, пад ціскам паслявыбарных пратэстаў шмат хто з дыктатараў пайшоў бы ў адстаўку. А беларускі – узяў у рукі аўтамат, паддзеў бронежылет і сказаў, што будзе абараняць сваю ўладу да канца…

*– Вы напісалі кнігу пра яго, склалі адзін з самых дакладных партрэтаў Лукашэнкі. Якія рысы стылю, псіхалогіі, мадэлі кіравання былі відавочныя ўжо ў 1994 годзе? І што прагледзелі аналітыкі, медыя, выбарцы?*

– Ён вельмі ўдала трапіў у трэнд расчаравання рэформамі. Большасць насельніцтва ўспрымала няпросты працэс як бязладдзе, хаос і нават анархію. А былы дырэктар саўгаса «Гарадзец» цвёрда паабяцаў: «Я навяду парадак і вярну тое, што вы страцілі». Савецкі досвед, які яшчэ быў жывым, падаўся шмат каму выратавальным.

*– А новыя грамадзянскія плыні, палітычныя інтэлектуалы – што, вы проста збоку назіралі за ростам уплыву папулісцкага палітыка? Чаму не здолелі данесці свае ідэі? Ці сапраўды паміж элітай і электаратам існавала прорва?*

– Лукашэнка спекуляваў на грамадскіх настроях і сапраўды рэальна перамог на адзіных у Беларусі дэмакратычных прэзідэнцкіх выбарах. Варта прызнаць: у змаганні з апазіцыяй, іншымі інстытутамі накшталт Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага суда ён абапіраўся на народную падтрымку.

*– Дык маё пытанне пра іншае: чаму інтэлектуалы, дэмакраты не дагрукаліся да народнай свядомасці?*

– Бо яна супраціўлялася пераменам, якія мы, апаненты Лукашэнкі, падтрымлівалі. Невыпадкова Алесь Адамовіч назваў Беларусь «антыперабудовачнай Вандэяй».

*– Але чаму так здарылася?*

– Бо з гледзішча грамадскага развіцця часы індустрыяльнай рэвалюцыі ў 1950–1970 гадах былі для Беларусі вельмі паспяховымі. Тэмпамі ўрбанізацыі рэспубліка істотна апярэджвала не толькі іншыя рэгіёны Савецкага Саюза, але і шмат якіх дзяржаў свету. Мільёны беларусаў з вёскі пераехалі ў гарады, атрымалі тут добраўпарадкаваныя (на тагачасныя меркі) кватэры, якасць іх жыцця парадкава палепшылася – аргумент вельмі моцны. І ўсё гэта адбывалася цягам аднаго-двух пакаленняў. На вачах людзей, якія ў 1994-м стаялі ў чэргах да урнаў з выбарчымі бюлетэнямі.

Калі Гарбачоў аб’явіў, што да яго быў перыяд застою і справы ў дзяржаве дрэнь, беларусы яго не зразумелі! Бо памяталі машэраўскі час як найлепшы ў сваім жыцці. Таму і не падтрымалі заклікаў да рэформаў. Лукашэнка ўхапіў гэты настрой – прапанаваў вярнуць «страчанае золата» савецкага мінулага. Прыцягальнае абяцанне для электарату.

*– Традыцыйна гэтая сітуацыя найчасцей трактуецца ў іншым рэчышчы: маўляў, выбар-94 – вынік беларускага сялянскага*

*кансерватызму. А вы акцэнтуеце ўвагу на інерцыі папярэдняга сацыяльна-эканамічнага разгону. Груба кажучы, сказала сваё рэха нечувана маштабная індустрыялізацыя БССР?*

– Менавіта так. Калі сталінская індустрыялізацыя адбывалася гвалтоўна і спадарожнічала хутчэй пагаршэнню жыцця, то пасляваенная беларуская – наадварот, падымала. Да таго ж, у нас не было такой карупцыі, як у іншых рэгіёнах СССР. Ну і харызматычны лідар – Машэраў. З ім таксама атаясняліся перамены да лепшага.

Таму БНФ не атрымаў такой падтрымкі, як у Балтыі ці ва Украіне. У комплексе гэта моцна ўплывала і на фармаванне нацыянальнай ідэі. Таму папулярнасць БНФ, напрыклад, была не такой, як у Народных фронтаў іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза, Балтыі і Украіны.

Кансерватызм беларускага грамадства вызначыў і выбар 1994 года, і наступныя гады развіцця краіны.

## Грамадзянская супольнасць: ад пустыні да эміграцыі

*– Калі ў Беларусі пачалі ўзнікаць першыя НДА, фонды, незалежныя рэдакцыі і партыі, ці было адчуванне, што гэта нешта большае за лакальныя праекты, нешта, што можа стаць падмуркам новай краіны?*

– Патэнцыял быў відавочны. Бо старыя структуры распадаліся, грамадска-палітычная прастора нагадвала пустыню. На гэтым фоне трэба было ствараць новае.

Фармаванне грамадзянскай супольнасці – вельмі важны элемент сучаснага грамадства. А ў нашым варыянце яна проста не мела прасторы для манеўру. Бо дэмакратычны працэс у Беларусі аказаўся вельмі кароткі, хутка згарнуўся. Таму і рост гэтай нішы быў жорстка абмежаваны. Напрыклад, завязваўся

на падтрымку замежных фондаў, а не на айчынных фінансавых суб’ектаў.

*– Доўгія гады адсутнасці рэальных выбараў, жорсткі прэсінг, выжыванне на грантах – гэта пра паступовае вычарпанне супольнасці? У складаных варунках яна мела пэўную стратэгію – ці варта казаць хіба пра нейкае рэактыўнае існаванне?*

– На жаль, апошняе. Кожная структура займалася ўласным выжываннем і сваімі вузкімі мэтамі. Агульнай стратэгіі – «праз грамадзянскую супольнасць пабудуем дэмакратычную Беларусь» – не адчувалася. Я думаю, хтосьці пра гэта марыў, але ў цэлым усе займаліся сваім. У аўтарытарнай сістэме інакш і быць не магло: яна блакуе, тармозіць нармальнае развіццё і грамады, і дзяржавы.

Дагэтуль у Беларусі не распаліся да канца ранейшыя таталітарныя структуры. На прадпрыемствах рэзка ўзмацніліся паўнамоцтвы і роля намеснікаў кіраўнікоў па ідэалогіі, а самі працоўныя калектывы цяпер не толькі гаспадарчыя суб’екты, але і палітычныя адзінкі.

*– А ці можна сказаць, што падчас кароткай дэмакратычнай хвалі грамадзянскі сектар вырастаў нібыта ў «паралельную Беларусь» – альтэрнатыву савецкім палітычным інстытутам?*

– У пэўным сэнсе так. Кампартыю і камсамол адсунуў час, але не адбылося прыватызацыі. Дзяржаўны сектар застаўся дамінантным. Эканамічная сістэма выжыла, і гэта вельмі моцна абмяжоўвала новыя грамадзянскія інстытуты.

*– З мінулых – у цяперашнія актуаліі: што з грамадзянскай супольнасцю ў выгнанні? Ці здольная яна ўплываць на будучыню краіны?*

– Пазатэрытарыяльная Беларусь, грамадзянская супольнасць у эміграцыі – гэта ўжо рэальная з’ява. Яна створана і дзейнічае. Але праблемы вельмі сур’ёзныя.

Найперш – пытанне ўплыву на ўнутрыпалітычнае жыццё. З аднаго боку, у эпоху інтэрнэту нават з эміграцыі ён значна мацнейшы і шырэйшы, чым у савецкія часы. Але ўсё роўна рэальныя сцэнары перамен будуць разгортвацца ўнутры Беларусі. Што атрымаем у выніку, ніхто не скажа. Тут вялізную ролю адыгрываюць знешнія геапалітычныя фактары. Яны ўскладняюць і прагнозы, і дзейнасць.

## 2020: каго/што разбіў ідэальны шторм

*– А што здарылася з намі ў 2020-м? Адкуль грамадзянскі выбух, які аднолькава прагледзелі і ўлада, і грамадзянская супольнасць? Чым гэта абумоўлена?*

– Тут магу трошкі пахваліцца. У 2019 годзе прайшлі парламенцкія выбары. І тады на круглых сталах я казаў: упершыню за час кіравання Лукашэнкі колькасць ягоных праціўнікаў стала большай за армію прыхільнікаў. Мяне дружна крытыкавалі: адкуль ты гэта ўзяў?! Адказваў шчыра: не ведаю, дзе і як гэта выстраліць, але сітуацыя электаральных сімпатый змянілася.

І грымнула ўсяго праз год. Тады склалася тое, што называецца ідэальным штормам: супалі адразу некалькі найважнейшых чыннікаў.

Ковід: драматычная сітуацыя з абсалютна непрафесійнай рэакцыяй уладаў.

Рэальная альтэрнатыва на выбарах: адразу Цапкала, затым Бабарыка…

У выніку людзі з рознымі палітычнымі ідэалогіямі, поглядамі аб’ядналіся ў адным: хто заўгодна, толькі не ён!

*– Гэта значыць, класічны беларускі кансерватызм усё ж даў збой?*

– Рэч была ў іншым: у грамадскіх працэсах, якія сфармавалі сярэдні клас. І ён захацеў рэальна ўплываць на палітыку,

грамадства памкнулася стаць палітычным суб’ектам, а не аб’ектам. Мы даспелі да рэальнага права выбіраць, а не толькі галасаваць на фіктыўных выбарах.

*– А якая роля грамадзянскай супольнасці? Нібыта незаўважна, а насамрэч – як «крот гісторыі», яна рыхтавала глебу?*

– Так, грамадзянская супольнасць шмат чаго зрабіла. Але з усіх яе інстытуцый я хутчэй вылучыў бы незалежныя медыя. Менавіта яны адыгралі вырашальную ролю ў крытычнай сітуацыі. Улады празявалі з’яўленне інтэрнэту, які разбурыў традыцыйную манаполію на інфармацыю. Недзяржаўныя сайты, форумы, пляцоўкі захапілі, падпарадкавалі сабе бескантрольную лічбавую прастору. І пачалі дыктаваць грамадскі парадак дня. Так ці інакш паслугамі TUT.by, іншых рэдакцый і блогераў карысталася большая частка насельніцтва. У вертыкалі проста не зразумелі перамены сітуацыі, недаацанілі значэння і магчымасцяў новых медыя. У прыватнасці таму, што сам Лукашэнка не жыве ў сеціве, не карыстаецца камп’ютарам – ён не зразумеў палітычнага эфекту сучасных камунікацый.

Што да грамадзянскай супольнасці ў цэлым, то ва ўсёй велічы яна паўстала хутчэй ужо ў саміх падзеях 2020 года. Уражвае, напрыклад, велізарная колькасць раённых, дамавых, прафесійных чатаў… А фенаменальная роля тэлеграм-каналаў?

*– 100-тысячныя, 200-тысячныя, паўмільённыя дэманстрацыі не маглі не ўражваць. Але ці не была гэта найперш маральная супольнасць, супраць зла, без выразных палітычных мэтаў?*

– У той надзвычай палітызаванай атмасферы любая праблема набывала палітычнае адценне. І фальсіфікацыя выбараў, і «прыбіранне» з марафону Ціханоўскага, Цапкалы з Бабарыкам, і збіццё людзей, і шмат якіх іншых чыннікаў… Усё гэта вылілася менавіта ў палітычны пратэст. Усё ператваралася ў працэсе і рабілася часткай палітыкі.

*– Вярнуся да трыгерных суб'ектаў – Бабарыкі і Цапкалы. Можа, апладысменты ім – гэта ўсё ж старая беларуская мара пра «моцную руку гаспадарніка» на чале краіны?*

– Так, у нацыянальнай свядомасці глыбока сядзіць устаноўка: кіраўнік павінен быць гаспадарнікам, мець эканамічны досвед. Такія людзі нібыта лепш адчуваюць патрэбы народа, могуць хутчэй рэалізаваць свае абяцанні.

*– Гэтую тэорыю падводзіць прыклад Ціханоўскай!*

– Тут зусім іншае: пасля разгону Лукашэнкам усіх рэальных супернікаў людзі так раззлаваліся, што прагаласавалі за яе – жанчыну, якая ўвогуле не мела ніякага палітычнага і гаспадарчага досведу. Гэта было галасаванне не за Ціханоўскую – яно было супраць Лукашэнкі.

*– А можна сказаць інакш: гэтак адстойвалі права на годнасць, на ўласны свабодны выбар: мы – людзі, не быдла, нам надакучыла, мы хочам жыць інакш!*

– Можна і ў такім рэчышчы разважаць. Тым больш, Ціханоўская казала: «Я не збіраюся кіраваць – я проста хачу правесці свабодныя выбары».

Але ў Беларусі прафесія палітыка ўвогуле не ўспрымаецца сур'ёзна. Лідар партыі – гэта нібыта гульня. А вось кіраўнік банка ці Парка высокіх тэхналогій – іншая рэч, яго бачаць як рэальнага чалавека справы. І гэта звязана з тым, што ў нас фактычна не было досведу сапраўдных дэмакратычных выбараў.

*– А ці не адгалосак гэта ўсё яшчэ таго поспеху Беларусі, калі эканоміка расла і гаспадарнікі здаваліся героямі?*

– Абсалютна. Дзяржаўны сектар і цяпер складае каля паловы ўсёй эканомікі. Таму кіраўнік дзяржавы – гэта найперш «гаспадар». І таму Лукашэнка па сёння ездзіць па калгасах і заводах, публічна вучыць мясцовых начальнікаў. Гэта частка яго палітычнага тэатра і апеляцыя да электарату.

*– Паводле законаў жанру вяртаюся да таго, з чаго мы пачалі. Вы шмат гадоў былі выкладчыкам. Уявім сітуацыю: чарговая лекцыя пра найноўшы перыяд нашага быцця перад заўтрашнімі гісторыкамі і палітолагамі. Што вы ім сказалі б у падсумаванне? Якую максіму? На што параілі б звяртаць увагу, як быць, як жыць і як ацэньваць сітуацыю?*

– Сябры, беларуская дзяржаўнасць вельмі маладая – ёй толькі 35 гадоў. Яшчэ не склаліся дакладна ні ідэалагічная, ні палітычная, ні эканамічная мадэлі. Гэта ўсё толькі фармуецца. Таму роля чалавечага фактару ў нас значна большая, чым у краінах са стабільнай сістэмай. Мы з вамі можам уплываць на сённяшнія працэсы ў Беларусі нашмат мацней. Вось і заклікаю: смялей далучайцеся, уплывайце, шукайце свой, наш беларускі лад!

# АЛЯКСАНДР КЛАСКОЎСКІ



Фота з асабістага архіва А. Класкоўскага

*Нарадзіўся 12 верасня 1958 года ў вёсцы Новы Двор Мінскага раёна.*

*Прафесійна працуе ў журналістыцы з 1979 года.*

*Узначальваў папулярныя дэмакратычныя выданні часоў перабудовы: усесаюзны часопіс «Парус» (наклад – 1 млн), газету «Знамя юности» (800 тыс.).*

*На пачатку 1990-х стаў намеснікам галоўнага рэдактара «Народнай газеты», якая была ў той час прагрэсіўным выданнем, адстойвала ідэі дэмакратыі, незалежнасці, правоў чалавека.*

*У 1994 годзе разам з Людмілай Класкоўскай напісаў біяграфічную кнігу «Станіслаў Шушкевіч. Пуцявіна лёсу: партрэт палітыка, навукоўца, чалавека».*

*Болей за два дзесяцігоддзі працаваў у першай незалежнай беларускай інфармацыйнай кампаніі БелаПАН. Доўгі час быў там кіраўніком аналітычных праектаў.*

*У 2002 годзе стаў адным з распрацоўшчыкаў праекта і галоўным рэдактарам першай беларускай інтэрнэт-газеты Naviny.by (даччынага выдання БелаПАН). Рэгулярна публікаваў у ёй артыкулы з аналізам палітычных падзей, крытыкай рэжыму Аляксандра Лукашэнкі.*

*Некалькі гадоў выкладаў курс «Майстар-класы сучаснай журналістыкі» ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце. Пад эгідай Беларускай асацыяцыі журналістаў, «Прэс-клуба Беларусь», іншых арганізацый дэмакратычнай супольнасці правёў шмат трэнінгаў для журналістаў. Аўтар некалькіх брашур пра журналісцкае майстэрства.*

*Пасля разгрому БелаПАН у 2021 годзе выехаў за мяжу, стаў адным са стваральнікаў інфармацыйнага агенцтва «Позірк», якое працягвае місію БелаПАН.*

*Цяпер – палітычны аналітык «Позірку», рэгулярна піша для яго артыкулы.*

*Лаўрэат прэміі імя Герда Буцэрыюса «Свабодная прэса Усходняй Еўропы» 2014 года. Неаднаразовы лаўрэат конкурсу БАЖ «Вольнае слова».*

АЛЯКСАНДР КЛАСКОЎСКІ

# ЖУРНАЛІСТЫКА – НЕ ТОЛЬКІ РАМЯСТВО. ГЭТА ВЫПРАБАВАННЕ І ЦІСКАМ, І СВАБОДАЙ

## Калі «Знаменка» пісала пра чалавека з перабудовачнымі поглядамі, ён амаль аўтаматычна станавіўся дэпутатам

*– Вы зайшлі ў прафесію акурат тады, калі савецкая медыясістэма трашчала па швах, а знутры прабіваўся новы тып прэсы. Якім быў рэальны газетны фонд перабудовы? Складана ўкручваліся новыя стандарты ў яшчэ не трухлявы савецкі каркас?*

– Тады беларускія медыя выразна расслаіліся, нават палярызаваліся. Адны падтрымалі перабудову, іншыя трымаліся рэакцыйных пазіцый. Да першых варта аднесці «ЛіМ», «Чырвонку», «Моладзевую газету», нечакана дэмакратызавалася партыйная «Звязда». У 1990–1991-м з'явіліся ўжо «Белорусский рынок», «Прессбол», «Свабода», «Свободные новости», «Народная газета», недзяржаўныя рэгіянальныя СМІ – новая хваля. Але большая частка партыйнай і мясцовай прэсы заставалася на захавальных пазіцыях.

Вырашальным чыннікам была, напэўна, смеласць рэдактараў і камандаў. У «ЛіМе», скажам, гэта асоба Анатоля Вярцінскага: ён зрабіў з шэрага, рэтушаванага выдання жывую грамадска-палітычную газету. Тады кожны журналіст, кожная рэдакцыя бралі столькі свабоды, на колькі адважваліся.

*– Вы трапілі ў «Знамя юности», дзе сабралася плеяда моцных аўтараў: акулы, як Павел Якубовіч, магі пяра, як Лілія Брандабоўская, рыцары слова, як Юрый Вельтнер. Пры гэтым галоўны рэдактар – зусім малады. Як выглядаў эксперымент знутры? Ці было адчуванне, што частка калег глядзіць зверху? Ці, наадварот, перабудова абнуляла і ўзрост, і пасады?*

– Гэта было ўжо маё другое прышэсце ў рэдакцыю пасля «Звязды» і часопіса «Парус». Пачынаў там яшчэ студэнтам: супрацоўнічаў, публікацыі лічыліся прэстыжнымі. «Знаменка» нават у застойныя гады заставалася жывой, крыху фрывольнай газетай, з лёгкім крамольным духам. У параўнанні з партыйнымі органамі дыхала жыццём.

Потым прапанавалі пайсці зменным сакратаром. Праца, папраўдзе, сабачая, бо трэба было не толькі маляваць макеты, але і дваццаць разоў на дзень бегаць у цэх друкарні, секчы хвасты матэрыялаў, сачыць за наборам, камандаваць вярстальшчыкамі. Тэхналогія была тады фактычна гутэнбергаўская.

І сапраўды: вакол зубры журналізму. Напрыклад, Павел Якубовіч быў для мяне амаль што богам. Загадчык аддзела фельетонаў і спорту, ён умеў пісаць і востра, і вобразна. Думаю, Лукашэнка як аматар футболу таксама зачытваўся ягонымі рэпартажамі. Можа, гэта і паўплывала ў далейшым на прызначэнне Якубовіча галоўрэдам «Советской Белоруссии».

*– Яго вострыя матэрыялы сталі феноменам савецкага часу: вакол, мабыць, не было нікога падобнага ў харызме і папулярнасці. І што – народная слава не закруціла галаву?*

– Ды не: мелі з ім таварыскія адносіны. Ён кантактны, без фанабэрыі, заўжды з гумарам. Была традыцыя: калі пачыналі друкаваць заўтрашні нумар, зменны сакратар прыносіў сігнальны экзэмпляр, і на яго выстаўлялася бутэлька. Дык нярэдка гаманілі за ёй і з Якубовічам. Такія вось нефармальныя семінары таксама шмат давалі.

І калі праз некалькі гадоў я вярнуўся ў рэдакцыю, мяне ўжо ведалі. Калектыў на той час заўважна памаладзеў, аднак я працягнуў абнаўленне: прыняў на працу Алеся Ліпая, Віталя Цыганкова, Алега Груздзіловіча. Апошні, дарэчы,

прыйшоў з камсамолу, куды занесла толькі дзеля кватэры, але хацеў сапраўднай журналісцкай працы.

*– Газета дыхала свабодай і маладосцю: адзін з паказчыкаў фенаменальнага поспеху – наклад даходзіў да 800 тысяч. А што старая гвардыя, у яе адкрылася другое дыханне?*

– Яскравы прыклад – Галіна Айзенштат: раней непрыкметная загадчыца сельгасаддзела раптам стала баявой публіцысткай, пачала супрацоўнічаць з «Радыё Свабода», «Свободными новостями».

Неймаверны для журналістыкі час: мы ўсе адчулі сябе асобамі. А да таго дзесяцігоддзямі журналістаў вучылі быць выключна прываднымі пасамі партыі. І раптам – магчымасць самім фармаваць грамадскую думку, уплываць на яе. Калі самая папулярная газета пісала пра чалавека з перабудовачнымі поглядамі, ён амаль аўтаматычна станавіўся дэпутатам. Бо «Знамя юности» тырчэла ці не з кожнай перапоўненай прэсай паштовай скрыні. У шапіках чарговы нумар расхоплівалі як гарачыя піражкі.

*– Дагэтуль некаторыя калегі, якія тады трапілі ў вялікую палітыку, пра гэта памоўчваюць…*

– Факт, што роля СМІ ў кароткую адлігу была выключна вялікая. Народ прагна глытаў прэсу, што загаварыла голасам перабудовы. Медыя актыўна паўплывалі на тое, каб у Вярхоўным Савеце XII склікання з’явілася дэмакратычная фракцыя.

## Журналістыка – не толькі энергія, крэатыў, але і арганізацыя. Як і ў футболе: парадак б’е клас

*– Тады ж абвастрылася спрэчка: хто мае права быць журналістам і рэдактарам? Напіралі*

*на інтэлект, грамадзянскі тэмперамент, казалі, што не трэба ніякай адмысловай адукацыі, галоўнае – талент.*

– Я не пагаджаўся. Так, журфак быў ідэалагізаваны, але ён даваў падмурак: мову, літаратуру, жанравую тэхналогію, даваў паняцце пра рэжысуру газетнай паласы, арганізацыю працы рэдакцыі.

*– Стваралі і ўзначальвалі новыя (ды і старыя) рэдакцыі не толькі журналісты: у СМІ той пары актыўна ішлі з розных прафесій. Многае з народжанага неўзабаве памірала. Часта бясслаўна і непрыкметна. Былі прыклады, калі газеты бралі на сябе вядомыя пісьменнікі, публіцысты. Згадаем Сямёна Букчына, Анатоля Казловіча, Васіля Якавенку. Майстры слова, мысляры, байцы. Але і ў іх не атрымалася! У чым тут загваздка?*

– Газета – гэта заўсёды сплаў творчасці, арганізацыі і адказнасці. Рэдактар мусіць быць і менеджарам, і тэхнолагам, і трохі бізнесоўцам. Вось чаго не ставала некаторым пісьменнікам, якія ўзяліся за выданне перыёдыкі. Што ўжо казаць пра інжынераў ці аграномаў, якія стваралі свае выданні.

Ну і потым, згадайце масавае захапленне менавіта перабудовачнай публіцыстыкай. Усе адчулі сябе карыфеямі. У «Знамени юности» таксама ўвёў аўтарскую рубрыку: «Я думаю так». І адразу ўзнікла чарга з ахвотных напісаць менавіта ў яе: выказацца, выгукнуць сваё меркаванне пра набалелае. Не заўжды глыбока, насамрэч. Таму аднойчы правёў жорсткую лятучку: «А хто будзе пісаць заметкі, рэпартажы?» Карацей, сталі аднаўляць баланс.

Аператыўнай, навіновай журналістыкі якраз бракавала тым жа газетам Букчына, Якавенкі… З гэтага перыяду вынес выснову: журналістыка – не толькі энергія, крэатыў, пафас, але і арганізацыя. Як у футболе: парадак б’е клас. То-бок трэба,

каб кожны гулец ведаў сваё месца, а ягоныя функцыі ў гэтай машыне мусяць быць даведзены да аўтаматызму.

*– Як гэта стасавалася з папярэднім досведам працы ў «Парусе», дзе асноўнае – якраз публіцыстыка, аналітыка, мастацкія жанры, а не інфармацыя; густ і творчасць, а не хуткасць? Цяжка перабудоўваць сябе, калі трапляеш з такой школы ў газетную штодзённасць?*

– Часопіс – гэта магчымасць няспешна працаваць над тэкстамі, шліфаваць іх. Добрая школа любові да трапнага, выверанага слова – я дасюль надаю гэтаму шмат увагі. У пэўнай ступені займаюся перфекцыянізмам, каб кожны сказ быў адточаны. Прытым што ў анлайнавым выданні, канешне, кожная секунда дарагая.

*– Гісторыя «Паруса» – нібы асобны раздзел у беларускай перабудовачнай журналістыцы. Быў шэрым ведамасным бюлетэнем – стаў модным, уплывовым, сваім часопісам для маладзі ўсёй краіны. Што за дзіва? У чым сакрэт ператварэння?*

– Склалася ўнікальная каманда: Барыс Пастарнак, Яфім Шур, Аляксандр Росін, Валянцін Маслюкоў, Ірына Паўлючык… Яны зрабілі з пасрэднага бюлетэня сапраўдную цукерку. Паводле легенды (а можа, так і было), калі на чарговым нудным пасяджэнні ў Мінску сакратару ЦК КПСС Ягору Лігачову выпадкова трапіў у рукі нумар, ён, пагартаўшы, сказаў: «Выдатнае выданне, давайце зробім усесаюзным».

І вось мяне, маладога-перспектыўнага, прызначылі галоўным рэдактарам. Тады была такая перабудовачная кадравая палітыка: прасоўваць маладзейшае пакаленне. Сітуацыя дыскамфортная: трэба камандаваць, а вакол асы, якія ўжо на хвалі поспеху. Здараліся непаразуменні, цёркі, але ў выніку знаходзілі агульную мову. Часопіс-феномен: мільён асобнікаў, чытацкія лісты мяхамі. Мы ламалі табу:

пісалі пра рок-музыку, нефармалаў, тых, каго партыя лічыла сумнеўнымі персанажамі. Паказвалі, што гэта нармальныя маладыя людзі, якім проста надакучыў шэры стыль жыцця, яго зарэгламентаванасць.

Я і сам пісаў на крамольныя тэмы: напрыклад, пра ідэю незалежнасці саюзных рэспублік. Пасля той публікацыі прыходзіў чалавек з КДБ, але абышлося. Гарбачоў разгарнуў палітыку галоснасці, нас пабойваліся ўжо чапаць.

*– Вам тады даводзілася часта ездзіць у Маскву, эпіцэнтр журналісцкай і палітычнай высокай моды. Якія ўрокі дала гэтая школа?*

– Гэта праўда: перабудова кіпела там. Асабліва запомніўся выступ сакратара ЦК КПСС па ідэалогіі Аляксандра Якаўлева, шэрага палітычнага кардынала, які, гавораць, і Гарбачова натхніў на перабудову. Тады ён казаў такія рэчы, што сам у канцы зазначыў: «Артадоксы мяне за гэта, напэўна, разапнуць».

Дадому вяртаўся з дакладным разуменнем, чаму Алесь Адамовіч назваў нашую рэспубліку «Вандэяй перабудовы». І калі мясцовыя ідэолагі пачыналі пясочыць за вострыя тэксты ці Галоўліт (орган цэнзуры) да нечага чапляўся, то я адбіваўся спасылкамі на Маскву, на «свежы вецер перабудовы».

## У дэмакратаў той хвалі быў і пэўны дагматызм. Магчыма, празмерна педалявалася пытанне мовы

*– Наступная прыступка – «Народная газета». Ці была яна ўзорам сучаснай журналістыкі? Як праходзіла эвалюцыя?*

– Па шчырасці, узбіваліся на новае з цяжкасцю. Хапала стракатасці, не абыходзілася без жаўцізны. На паверхню якраз выплылі экстрасэнсы, народныя лекары,

розныя «цудатворцы»… Побач з імі, на суседніх палосах – святары, якія лаялі варажбу і хэлаўіны. Вучыліся на ўласных памылках, набівалі гузы… Недзе перагіналі, але менавіта так спасцігалі навуку, як спалучыць сур’ёзнае і займальнае, набраць наклад без прымусовай падпіскі.

*– Яшчэ ўчора ўсё проста: ты камсамолец – падпісваешся на камсамольскае выданне, камуніст – на партыйнае, у прафсаюзе – на прафсаюзнае…*

– А цяпер чытача трэба заваёўваць. Мы рабілі гэта праз жывыя рэпартажы з сапраўднага парламента, праз вострую публіцыстыку, праз зварот да праблем ды інтарэсаў простых людзей.

Многія ўспрымалі «Народную» як «нацдэмаўскае» выданне. І сапраўды, Зянон Пазняк, іншыя дэпутаты-бээнэфаўцы, вобразна кажучы, нагой адчынялі дзверы ў рэдакцыю, прыносілі свае артыкулы. Публікацыя Пазняка пра расійскі імперыялізм выклікала проста шалёны выбух. Мора захаплення, але абурэння – ці не акіян: публікацыю катэгарычна не прынялі многія кансерватыўныя дэпутаты, навечна савецкія чытачы, нават частка самой рэдакцыі! Але цяпер бачна, што Пазняк глядзеў далёка наперад, вызначыў сутнасць імперскай Расіі надзіва дакладна.

*– І тым самым адначасова шмат у чым пахаваў сваю палітычную перспектыву. Электарат не дараваў такой жорсткай непрымірымасці да «братняй Расіі». Масы не прынялі тую шчырую нелюбоў, палічылі зняважай «русского мира».*

– Сапраўды, гэта была драма БНФ. Спачатку – велізарны ўздым, натхненне, мітынгі, поўныя пляцы людзей. А потым – абвал. Людзі стаміліся ад палітычнага вэрхалу, ад дэфіцыту і шалёнага росту цэн. Прапаганда спекулявала на цяжкасцях жыцця і безупынна звальвала адказнасць на апазіцыю: «Пазняк – фашыст». І гэта дзейнічала.

Ну і ў апазіцыйнай практыцы, скажам шчыра, быў пэўны дагматызм. Магчыма, занадта педалявалася моўнае пытанне. Тэма далікатная, а падавалі яе радыкальна, без уліку псіхалогіі мас. Капіявалі прыбалтыйскія народныя франты, рабілі стаўку на, умоўна кажучы, этнічны нацыяналізм, хаця ў беларусаў нацыянальная самасвядомасць была не на тым узроўні. У выніку папуліст Лукашэнка перайграў сваіх галоўных праціўнікаў на эмоцыях. На жаль.

*– Калі працэс дэмакратызацыі ляснуўся, усе абвінавацілі Лукашэнку. І справядліва. Ён хутка задушыў тую кволую дэмакратыю, што паспела нарадзіцца ў першай палове дзевяностых. У тым ліку – журналісцкую супольнасць. Але хіба не было і яе ўласных памылак? Унутранай слабасці?*

– Памятаю першую прэс-канферэнцыю «маладога прэзідэнта»: ён патэтычна сказаў, што «ад сёння» беларуская прэса можа пачувацца свабоднай. Але зусім хутка, пасля славутай гісторыі з белымі плямамі (прэзідэнтура выразала з газет даклад дэпутата Сяргея Антончыка пра карупцыю ў Лукашэнкавым атачэнні), паздымаў рэдактараў, пачаўся пераслед незалежных выданняў.

Але, канешне, не ставала і карпаратыўнай салідарнасці, бо журналістаў раскалолі, прэса палярызавалася. Саюз журналістаў заставаўся кансерватыўнай структурай з савецкім мысленнем. Такая арганізацыя не магла адстойваць ні нашыя прафесійныя правы, ні свабоду слова. А Беларуская асацыяцыя журналістаў, БАЖ, узнікла толькі ўвосень 1995 года, калі ўлада ў краіне перацякала ў адны рукі. Мы спазніліся, слабасць цэхавых, прафесійных структур вельмі паўплывала на лёс прэсы.

*– Улада зацвярджалася, прэса страчвала свабоду. Але вы самі тады былі ў цэнтры падзей, літаральна ў жывым эфіры гісторыі. Як гэта – на Беларускім тэлебачанні размаўляць са Станіславам Шушкевічам?*

– Гэта былі не пастановачныя эфіры, а рэальныя жывыя лініі: тэлефоны ў студыі, нікім не кантраляваныя званкі, нязручныя вострыя пытанні – напрыклад, пра адсутнасць тавараў, павышэнне цэн на хлеб, хоць за гэта адказваў не спікер Шушкевіч, а прэм’ер Кебіч.

А ў кулуарах я пераконваў фактычнага кіраўніка Беларусі: «Станіслаў Станіслававіч, трэба раздзяржаўліваць прэсу». Тады ж усе выданні заставаліся органамі ведамстваў і камітэтаў. Што за гэтым стаяла, добра адчуў на сабе: у 1991 годзе камсамол элементарна зняў з пасады галоўнага рэдактара «Знамени юности»: сабраўся пленум, пастанавілі, што «газета здрадзіла ідэалам» – і пераламалі выданню хрыбет.

Дык вось, тлумачу Шушкевічу: «Паглядзіце на Маскву – там ужо ўсе медыя свабодныя. У Францыі, адкуль толькі вярнуўся, увогуле няма дзяржаўных СМІ!» Здзівіўся: «Няўжо?» Нават гэты дэмакратычны дзеяч не ўсведамляў значэння медыйнай рэформы. А каб тады зрабілі яе хаця б часткова, Лукашэнку было б цяжэй захапіць інфармацыйнае поле. Увесь палітычны сюжэт мог скласціся іначай.

## Наверсе цяпер учорашнія маргіналы, бяруць рэванш за сваю нікчэмнасць. Гэта бальшавіцкі феномен: хто быў нічым…

*– Калі не рамантызаваць журналістыку тых гадоў, то і ў залатую пару хапала пустаты – так званых пёраў ветру і пустых чарнілiц. Гэта непазбежнасць, калі побач глыбінныя і павярхоўныя тэксты?*

– Галавакружэнне ад свабоды. Людзі п’янелі ад такога павароту. І тэксты былі часам «п’яныя». Таму і цяпер паўтараю: журналістыка не толькі творчасць – гэта адначасова

і вытворчасць. Час моцна падвысіў прафесійную адукацыю, але яго не хапіла, каб замацаваць пройдзенае…

*– У гісторыі журналістыкі 1990-х шмат, без перабольшання, рыцарскіх імёнаў: вашыя калегі ішлі без страху, нарываліся на суды, дубінкі, штрафы, закрыцці, але не ламаліся. У 2025-м шмат іншага, асабліва ў дзяржаўнай прэсе. Сёння тут поўна звычайных фактычна наймітаў, салдатаў пяра… Адкуль павылазіў ваяўнічы прапагандызм? Чаму буяе?*

– Дык рыба гніе з галавы. Вынік антыадбору, які вядзе рэжым. Лукашэнка выцягнуў наверх тых, хто ў іншай сітуацыі быў бы на ўзбочыне, сярод маргіналаў.

Гэта нагадвае бальшавіцкі феномен: хто быў нічым, той стаў усім. Людзі з крыўдамі за сваю колішнюю нібыта недаацэненасць цяпер не проста ўхваляюць адыёзную палітыку патрона, а выплюхваюць і ўласныя невылечныя комплексы. Яны бяруць рэванш за сваю некампетэнтнасць, адчуванне нікчэмнасці. Помсцяць тым, хто сапраўды таленавіты і ўмее думаць яскрава, крэатыўна.

Лукашэнка зняў не толькі юрыдычныя бар’еры, калі няма сэнсу судзіцца за паклёп ці хлусню, але і маральную планку. Ордэны, медалі, прэміі сыплюцца на самых адвязаных, кшталту Азаронка. Такія цяпер у фаворы. Гэта іх зорны час. Ёсць, праўда, і цынікі: яны не вераць у ідэалогію, але бачаць, што на грубай прапагандзе можна зрабіць кар’еру. Мне смешна, калі іх пасквілі называюць аўтарскай журналістыкай. Аўтарская – насамрэч пра талент, стыль, уласную думку, а не пра вывяржэнне лаянкі.

*– Згадваю ваш успамін пра раптоўны ўзлёт Галіны Айзенштат. Гадамі пісала пра тое, як прыгожа квітнее рапс, а потым перабудова, выпадковая нататка пра палітыку ў яблычак – і чалавек становіцца зоркай. Зараз вярнулася вандэйная сітуацыя з гэткім самым эмацыйным напружаннем:*

*час зорак антыдэмакратыі і антыбеларускасці. Іхняе слова патыхае цемрашальствам, як некалі радкі Айзенштат дыхалі надзеяй. Прэтарыянцы дзяржаўнай журналістыкі заслугоўваюць увагі да сябе?*

– Калі параўноўваць, розніца відавочная. Нават савецкая сістэма апошняга часу была мякчэйшая, разумнейшая. Яна інтэгравала таленавітых людзей. Успомнім Генадзя Бураўкіна: чалавек нацыянальнага духу быў на чале радыё і тэлебачання. Калі ставілі «Тутэйшых» і ў фінале на сцэне Купалаўскага, побач з галоўным партыйным штабам, узнімаўся бел-чырвона-белы сцяг, ён, наменклатуршчык па мерках кар’еры і пасады, сказаў мне (сядзелі побач у зале): «Саша, здаецца, нашая бярэ». Нашая – гэта пра ўздым беларушчыны.

У кіраўніцтве былі людзі, здольныя на ўнутраны супраціў. Паэт Сяргей Законнікаў, напрыклад, працуючы ў аддзеле культуры ЦК КПБ, абараняў Васіля Быкава. Сістэма ўсё ж старалася абапірацца на таленты, хоць і ў пэўна вызначаных межах.

Цяпер усё інакш: на паверхню выходзяць самыя злосныя, самыя цынічныя. Прапаганда стала абсалютна амаральнай прафесіяй, пры гэтым яе тэхнічнае ўзбраенне магутнае як ніколі. І таму яна такая небяспечная: талент без сумлення – разбуральная рэч.

Прапагандысцкія войны ўвогуле мастацтва старажытнае. І заўжды ў іх свае ландскнехты ці прэтарыянская гвардыя былі патрэбныя. Мы бачым, што зрабіла прапаганда ў Расіі: нацыя фактычна атручаная шавінізмам, «крымнашам» і гэтым усім шалёным пафасам перавагі. Таму не варта лічыць агітпрап нечым прымітыўным ці нядзейсным.

*– Калі падсумоўваць эвалюцыю журналістыкі ад перабудовы да сёння, то сапраўды яна дала магутны імпульс творчай смеласці. Але ці хапала інстытуцыйнага падмурка: прафесійных кодэксаў, этычных нормаў, самарэгуляцыі?*

– Гэта нашая традыцыйная слабіна, якая асабліва абвастрылася з прыходам інтэрнэту. Я сам сотні разоў станавіўся ахвярай плагіяту, грубага і бессаромнага. Звяртаюся да рэдактара: «Вы мой тэкст перадрукавалі без спасылкі, без згадкі пра аўтара!» – чую ў адказ: «Дык жа з інтэрнэту!»

Калі абралі ў праўленне БАЖ, быў адным з ініцыятараў кампаніі «За якасную журналістыку». Мы спрабавалі прышчапіць стандарты, змагацца з крадзяжом кантэнту. Але нават кодэкс этыкі прайшоў не адразу: рэдактары супраціўляліся. Толькі на наступным з’ездзе яго ўдалося ўхваліць.

*– Для многіх выданняў нязручна: патрабаванні жорсткія, а перапісванне чужога – амаль звыклая рэч…*

– Так, стандарты ўкараняліся няпроста. З’явіўся сайт Mediakritika.by, яго вяла Яніна Мельнікава. Я там быў сталым аўтарам, разбіраў прафесійныя хібы калег. Гэта была няўдзячная місія: журналісты – даволі вузкая карпарацыя, амаль што ўсе між сабой знаёмыя, і ставала крыўдаў. Не ўсе разумелі, што крытыка – таксама клопат аб прафесіі. Але паступова прагрэс ішоў. І БАЖ у гэтым сэнсе адыграў вялікую ролю.

## Гісторыя пра тое, як у мінскім аэрапорце затрымалі Барыса Нямцова з грашыма «на рэвалюцыю», запачаткавала анлайн-рэпартажы

*– Наступны паварот біяграфіі – БелаПАН і Naviny.by. Гэта ўжо іншая журналістыка: сетка сувязяў, школа экспертызы, аналітыкі, адказнасці. Новы выклік?*

– Заснавальнік абодвух праектаў Алесь Ліпай – паэт, рамантык па натуры, меў выключнае адчуванне журналісцкай прафесіі. Ён зразумеў яшчэ напачатку дзевяностых, што трэба будаваць

інфармацыйнае агенцтва паводле заходніх узораў, як Reuters або Associated Press. Ніякай публіцыстычнай экзальтацыі, толькі факты, верыфікацыя, аддзяленне інфармацыі ад каментароў.

Мы стараліся працаваць паводле сусветных стандартаў навіновай і аналітычнай журналістыкі. Гэта нялёгка. Людзі з газет, прывыклыя да разгорнутасці і эпітэтаў, мусілі ламаць сябе, вучыцца пісаць каротка, суха, дакладна. Але справіліся, хутка сталі на ногі.

Ад пачатку імкнуліся манетызаваць кантэнт – яшчэ калі і самога тэрміна гэтага не ведалі. Прадавалі інфармацыю: падпісчыкамі былі амбасады, міжнародныя арганізацыі, іншыя выданні. Чаму быў попыт? Усе ведалі: калі БелаПАН напісаў – значыць, гэта праўда, гэта дакладна.

*– Калег здзіўляла нават памяшканне рэдакцыі: адкрытая прастора, замест кабінетаў, дзе можна было папіць чаю ці нават драмануць, – вялікі ньюзрум: усе разам працуюць і абменьваюцца інфармацыяй. Нешта зусім новае для Беларусі.*

– Рэдактар мог на месцы правесці імправізаваную нараду, хутка вырашыць пытанне, скіраваць рэпарцёра. Гуртом раіліся, як лепей падаць навіну, прыдумвалі трапны загаловак. Не ўсім падабалася, не ўсе вытрымлівалі, хтосьці сыходзіў: маўляў, не па мне – інфармацыйная казарма, вайсковая дысцыпліна…

Але парадак, хуткасць, узаемадзеянне – усё гэта неўзабаве стала нормай. У пэўны момант Алесь загарэўся ідэяй стварыць Naviny.by – першую ў Беларусі паўнавартасную інтэрнэт-газету. Разам думалі над канцэпцыяй, потым мне было прапанавана стаць галоўным рэдактарам.

Чарговыя першаадкрыцці – спасцігалі магчымасці віртуальнай рэчаіснасці: анлайнавыя рэпартажы, імгненная рэакцыя, новы тэмп.

Памятаю, прыляцеў у Мінск Барыс Нямцоў, яго затрымліваюць у аэрапорце. Нібыта вёз чамаданчык з пачкамі долараў. Маўляў,

50 тысяч баксаў на рэвалюцыю. Правакацыя спецслужбаў? Нешта яшчэ? Наш рэпарцёр Сяргей Пульша разгублена тэлефануе: няма пра што пісаць, меркаваная гутарка з Нямцовым зрываецца, трэба вяртацца ў рэдакцыю ні з чым. «Стоп-стоп, заставайся і расказвай пакрокава, што адбываецца!»

І пачалі: «Нямцоў затрыманы, яму шыюць справу». Выстаўляем на сайт па два-тры сказы ў рэжыме рэальнага часу: хто і куды павёў расійскага апазіцыянера, што кажуць службовыя асобы… Так ламаліся газетныя шаблоны, уяўленні пра закончаны тэкст. З'явіўся зусім іншы ўзровень аператыўнасці. Далей ён стаў нормай.

*– Аналітыка, экспертыза змушаюць часцей перасякацца з дзейнасцю грамадзянскай супольнасці. Калі ўзнікае тэма правоў чалавека, экалогіі, адукацыі, журналіст апынаецца побач з актывістамі. У вашым выпадку гэта хутчэй сітуацыі сінергіі, супрацы – ці проста тактычныя супадзенні?*

– Я ніколі не быў грамадскім актывістам (калі не лічыць таго, што рабіў у БАЖы). Перакананы, што журналістыка і актывізм мусяць быць паасобку. Калі СМІ пачынаюць служыць нейкай сіле, арганізацыі, палітычнай ці ідэалагічнай, яны страчваюць аб'ектыўнасць, непрадузятасць.

Так, гэта звычайная рэч, што ў аўтара, рэдакцыі ёсць грамадзянская пазіцыя, але яна не можа дамінаваць над прафесійным абавязкам.

Аднак з трэцім сектарам я актыўна супрацоўнічаў у плане адукавання: вёў трэнінгі, семінары для актывістаў розных арганізацый. Напрыклад, для «Зялёнай сеткі», іншых ініцыятыў, рухаў, што хацелі развіваць свае сайты. Ім часта бракавала прафесійнасці: тэксты агітацыйныя, спрошчаныя ці вузкаспецыяльныя. Вось і вучыў рабіць якасны медыйны прадукт. Так узнікала натуральная сінергія: мы, людзі са СМІ –

як настаўнікі, яны – як новыя камунікатары грамадзянскай супольнасці.

*– І ўсё ж: як медыя застацца незалежнымі, калі грамадства чакае, што яны будуць яго абаронцамі? І як не трапіць у сваю вежу са слановай косткі?*

– Галоўная супярэчнасць палягае ў адносінах паміж медыя і дзяржавай, яе бюракратычным апаратам. Нават у дэмакратычных краінах палітыкі спрабуюць шыхтаваць медыя. Паглядзіце на каманду Трампа. Гэта праблема так ці іначай вострая ва ўсім свеце. Што тычыцца стасункаў з грамадскасцю, тут ужо ўсё ў руках журналістаў.

Трэба быць папулярнымі, але не папулісцкімі: вельмі тонкая мяжа… Сёння лёгка спакусіцца на клікбейт, на крыклівы загаловак. Бывае, на YouTube нейкія мае каментары, інтэрв’ю падаюць пад шапкамі кшталту «Шок: Класкоўскі размазаў па сценцы дыктатара». Хоць я проста раскладаў па палічках той ці іншы палітычны сюжэт. Гэты загаловачны лямант – цяжкая хвароба эпохі лайкаў.

## Калі зло называецца злом, гэта ніякі не агітпрап, а маральная пазіцыя

*– Такім чынам, 1990-я – эпоха адкрыццяў, а 2020-я – выпрабаванняў. Эмоцыі праз край, інфармацыйныя цягнікі перапоўнены болем і абурэннем. Ці ўдалося нашай журналістыцы не ператварыцца ў механізм дэмакратычнай прапаганды і агітацыі? Або тое пераўтварэнне непазбежнае?*

– Гэта праблема была вастрэйшай менавіта раней, калі панавала барыкаднасць, захапленне палітычнай барацьбой. А да апошняга крызісу найболей папулярныя беларускія медыя падышлі болей сталымі, дамінаваў ужо прафесійны падыход. Хоць асобныя рэдакцыі мелі мянушку «БТ наадварот».

То-бок усё тая ж кінжальная прапаганда. Тая ж звышзадача спляжыць палітычнага праціўніка.

А БелаПАН ці, напрыклад, TUT.by вызнавалі іншы стыль. Хаця не адмахваліся ад вострых, небяспечных тэм.

У 2020-м мы паказвалі, як велізарныя натоўпы выходзілі на вуліцы, – і тым самым разбуралі міф прапаганды пра «купку наркаманаў і прастытутак». Распавядалі, як людзей збівалі ў засценках. Калі зло называецца злом, гэта ніякі не агітпрап, а маральная пазіцыя.

Я ганаруся калегамі: былі ў літаральным сэнсе на перадавой, траплялі ў пастарункі, і ніхто не здрадзіў прафесіі, нават калі ўсё навокал развальвалася. Вытрымлівалі планку: верыфікавалі, аддзялялі факты ад эмоцый.

Проста рабілі сваю працу – і за гэта нас абвясцілі «экстрэмістамі». Шэраг маіх калег атрымалі доўгія тэрміны зняволення. Мы патрапілі «пад раздачу», сталі мішэнямі менавіта за тое, што выконвалі прафесійную місію.

*– Выйсці з такой калатнечы без страт – немагчыма. Што згубіла журналістыка пасля ўдару? Маю на ўвазе не толькі лёсы, а і прафесійныя страты: напрыклад, страту аўтарства. У пэўны момант ананімізацыя – абарона, але ці не ператвараецца яна далей ужо ва ўнутраную цэнзуру?*

– Я заўжды скептычна ставіўся да ананімнасці ці да псеўдонімаў: бачыў, што часта так хаваецца халтура або паклёп, наезд на некага. Аўтар адчувае, што робіць нядобрае, і таму шыфруецца.

Але пасля 2020-га сітуацыя рэзка змянілася, журналістаў сталі сістэмна пераследаваць у крымінальным парадку. Нават калі нехта ў змушанай эміграцыі, дома засталіся сваякі. Ды і за мяжой, як вядома, рэжым стараецца дастаць сваіх палітычных ворагаў. Таму цалкам разумею амаль татальную

ананімнасць. Хаця мушу прызнаць, што яна не спрыяе прафесійнаму майстэрству.

*– А як гэта адбілася на вас асабіста?*

– З аднаго боку, калі выступаеш з адкрытым забралам, то гэта робіць табе імя, стымулюе якасць. Абы-што пісаць сорамна. З іншага боку – за гэта мусіш расплачвацца: цяпер я ў спісе «ўдзельнікаў экстрэмісцкага фармавання», нават у Расіі абвясцілі ў вышук. Але гэта мой выбар.

*– Калі б сёння ствараўся медыястандарт для перыяду крызісу, што варта ўключыць у яго абавязкова?*

– Першым пунктам запісаў бы: «Мець запасную пляцоўку».

Гэта вынік нашага жорсткага, пакутлівага досведу. Шэраг рэдакцый, у тым ліку і нашая, аказаліся без сайтаў-люстэркаў, без рэзервовых сервераў. Прыходзілі сілавікі, канфіскоўвалі ўсё – і кантэнт знікаў.

Цяпер відавочна: трэба прадугледжваць самае горшае. Час такі, што правілы журналістыкі, як і вайсковыя статуты, пішуцца крывёю. Тыя медыя, што загадзя мелі запасны аэрадром у Літве ці Польшчы, перажылі эміграцыю лягчэй. А іншыя пачыналі з нуля: без тэхнікі, без базы, без ладнай часткі каманды. І ўсё ж многія адрадзіліся. Гэта было выпрабаванне, але і ўрок.

*– Вы цяпер па-за домам, працуеце ў «Позірку». Што для рэдакцыі азначала перанесці рытм, стандарты, экспертаў у новую рэальнасць?*

– Па сутнасці, гэта была напачатку рэінкарнацыя БелаПАНа ў выгнанні. Збольшага тыя ж людзі, той жа лад мыслення, той жа прафесійны код. Цяпер мы пайшлі далей, папоўнілі шэрагі, але захоўваем традыцыі: аператыўна і ўсебакова інфармаваць пра падзеі, аналітычна тлумачыць, што адбываецца ў Беларусі і вакол яе.

Па многіх параметрах давялося цалкам перабудавацца. Самае цяжкае – страта кантактаў унутры краіны. Мы не можам больш працаваць «у гушчы падзей». Давялося асвоіць жанр завочнай журналістыкі, болей дбаць пра бяспеку інфармацыі, абарону сайта, карпаратыўных звестак. Гэта цяжка, але неабходна. Цяпер аднолькава важна як пісаць, так і берагчы людзей.

*– Але ж у такіх умовах парушаецца сама аснова прафесіі – сувязь з чытачом. Як яе кампенсаваць? Чым падмяняецца жывое дыханне аўдыторыі?*

– Не ўсё цалкам страчана. Беларусы навучыліся абыходзіць блакады: карыстаюцца VPN, чытаюць нас праз люстэркі, тэлеграм-каналы, знаходзяць у сацыяльных сетках. Кожны журналіст мае асабістыя кантакты ў Беларусі. Побытавыя размовы, асабістыя сведчанні – гэта жывая сувязь «з зямлёй». Таму адчуваем нерв краіны, нават калі пішам з Вільні ці Варшавы.

Памятаю, як у часы Брэжнева слухаў «варожыя галасы». Гэта былі ў нейкім сэнсе нашыя папярэднікі. І хоць яны шмат гадоў жылі ў эміграцыі, мы прагна лавілі хвалі. Бо гучала інфармацыя, якая замоўчвалася камуністычнай прэсай. Сёння сітуацыя паўтараецца: у дзяржаўных медыя праўды не знайсці. Мы запаўняем прастору, дзе прапаганда маўчыць або хлусіць.

*– Пасля ўсяго перажытага, усіх страт і перамог : што застаецца ў сэрцы? Журналістыка для вас цяпер – прафесія, служэнне, місія?*

– Не столькі рамяство, хоць і гэта важна, колькі лад жыцця.

Немагчыма быць журналістам з васьмі раніцы да пяці вечара, з перапынкам на няспешны абед. Бо падзеі не ведаюць перапынкаў. Я, напрыклад, даведаўся пра вызваленне партыі палітвязняў, калі быў на роварнай вылазцы за горадам. Дык ляцеў да кампа з алімпійскай хуткасцю. Матэрыял атрымаўся ў літаральным сэнсе з колаў. Так што нашая справа –

гэта аголены нерв, баявая гатоўнасць, мужнасць называць рэчы сваімі імёнамі.

І калі ўжо казаць патэтычна, то нечага дасягаеш толькі тады, калі журналістыка становіцца тваім жыццём, місіяй. Так, яна атручвае. Але гэта атрута з салодкім смакам свабоды.

# АНДРЭЙ ЗАВАДСКІ



Фота з асабістага архіва А. Завадскага

*Нарадзіўся 23 красавіка 1962 года ў Мінску.*

*Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, спецыяльнасць – тэхналогія оптыка-электроннага прыборабудавання. Працаваў інжынерам-тэхнолагам зборачнай вытворчасці на Мінскім механічным заводзе БелОМА, інжынерам-тэхнологам аптычнай вытворчасці ў канструктарскім бюро дакладнага электроннага машынабудавання НВА «Планар».*

*З 1984 года далучыўся да моладзевай суполкі «Беларуская майстроўня». У 1985 годзе быў сярод заснавальнікаў*

*і ў першым складзе таварыства «Талака». Блізка пазнаёміўся з Вінцуком Вячоркам, Віктарам Івашкевічам, Алесем Бяляцкім, Анатолем Сысам, Міколам Купавам і шмат кім яшчэ.*

*У 1989 годзе ўваходзіў у групу падтрымкі Аляксандра Дабравольскага, які ў красавіку таго года быў абраны дэпутатам З'езду народных дэпутатаў СССР.*

*У чэрвені 1989 года ўдзельнічаў у працы Першага з'езду Беларускага Народнага Фронту ў Вільні.*

*У сакавіку 1990 года быў абраны праз спісы Беларускага Народнага Фронту дэпутатам Мінскага гарадскога Савета XXI склікання. Фракцыя БНФ «Дэмакратычная плынь» у Мінскім гарсавеце мела больш за 60 дэпутатаў.*

*У ліпені 1993 года далучыўся да дзейнасці асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі», якую працягваў амаль 30 гадоў, да прымусовай ліквідацыі фонду ў жніўні 2021 года. Браў удзел у падрыхтоўцы і рэалізацыі больш як 100 праектаў, якія спрыялі грамадзянскаму ўдзелу на мясцовым узроўні.*

*У 1997 годзе паступіў у Беларускі інстытут правазнаўства, які скончыў у 2002-м са спецыяльнасцю «Юрыст гаспадарчага права». У 2003–2012 гадах працаваў там, сумяшчаючы з выкладаннем юрыдычных дысцыплін у шэрагу беларускіх ВНУ, а таксама ў «Народным універсітэце», ЕГУ, «Лятучым універсітэце» і іншых (выкладае да сённяшняга часу).*

*Эксперт, трэнер і кансультант у галіне мясцовага самакіравання, грамадзянскага ўдзелу на мясцовым узроўні, развіцця недзяржаўных аб'яднанняў і падвышэння патэнцыялу іх дзейнасці, а таксама развіцця грамадзянскай супольнасці.*

АНДРЭЙ
ЗАВАДСКІ

# САМАКІРАВАННЕ – ГЭТА СУПРАЦЬЯДДЗЕ СТРАХУ. ЯНО ПРА САМАСТОЙНАСЦЬ І ГОНАР

## Гарачы студзень халоднай зімы 1991-га

*– Спадар Андрэй, давайце адразу ў гарачы пункт: вы апынуліся ў Вільні, калі савецкае войска спрабавала знішчыць літоўскую незалежнасць. Выпадковасць? Лёс?*

– 11 студзеня 1991 года, у пятніцу, Анатолю Гурыновічу, намесніку старшыні Мінгарсавета, патэлефанавалі некалькі дэпутатаў Віленскага самакіравання: ці можа прыехаць нехта з мінскіх дэпутатаў – каб стаць сведкам таго, што адбываецца ў сталіцы Літвы? Анатоль зрабіў некалькі званкоў і ўжо раніцою ў суботу Георгій Куневіч, Міраслаў Кобаса, Уладзімір Дабравольскі і я рушылі ў дарогу. Цягніком дабраліся да першай літоўскай станцыі «Кяна». И стоп: савецкія вайскоўцы занялі дыспетчарскія пункты і спынілі рух, таму далей – на спадарожным легкавіку.

*– Вільню тады заціснулі спецпадраздзяленні КГБ «Альфа», дэсантнікі і танкісты. Гэта не настрашыла гараджан?*

– Наадварот: людзі будавалі барыкады для абароны дзяржаўных установ, якія напярэдадні пачалі захопліваць аўтаматчыкі. Увесь дзень у сталіцу з рэгіёнаў дабіраліся літоўскія патрыёты. Аўтобусы аточвалі парламент колам, як яшчэ адзін рубеж абароны.

Дзень мы правялі спачатку ў віленскай мэрыі, потым сустрэліся з дэпутатамі і чальцамі літоўскага ўраду. Ужо вечарам, калі сцямнела, амаль да апоўначы былі на барыкадзе, што з’явілася на праспекце Гедзімінаса.

А ноччу пачалася савецка-камуністычная атака: захоплены радыёкамітэт на Канарскага, тэлевежа ў Караліншках, дзе загінула Ларэта Асанавічуце і яшчэ больш за 10 чалавек. Там і тут гучалі стрэлы, выбухі танкавых гармат. Але народ цёк па вуліцах на машынах і пешшу, каб абараніць сваю законную ўладу. Людзі ачаплялі танкі, спявалі гімн і патрыятычныя песні,

расплачваліся раненнямі і жыццямі – гэта быў урок годнасці, які немагчыма забыць.

А 6-й раніцы 13 студзеня па радыё выступілі прадстаўнікі так званага камітэта нацыянальнага выратавання. Стала зразумела, што адбываецца камуністычны путч. Мы кінуліся ў будынак гарадскога самакіравання, каб пачуць сапраўдную інфармацыю і ацаніць пагрозы. Пад'ехаў яшчэ адзін мінскі дэпутат, Алесь Суша. Ён меў відэакамеру, пачалі здымкі гарачых падзей.

Ізноў былі шматлікія сустрэчы, імкнуліся сабраць як мага больш переканаўчай інфармацыі. Зрабілі нават інтэрв'ю з верхаводамі путчыстаў. Потым яно фігуравала ў абвінавачанні іх судовай справы. Я з будынку самакіравання быў на сувязі са Станіславам Шушкевічам, Аляксандрам Дабравольскім. Анатоль Гурыновіч, які праводзіў на плошчы Леніна бестэрміновы мітынг у падтрымку свабоды Літвы, агучваў мае тэлеграмы – у выніку мінчукі валодалі самай аператыўнай інфармацыяй.

*– А 14 студзеня Мінгарсавет сабраўся на чарговую сесію?*

– Здараюцца ж часам у жыцці дзівосныя супадзенні! Мы якраз падаспелі, таму пасяджэнне пачалося з інфармацыі пра віленскія падзеі. У выніку 110 дэпутатаў Мінгарсавета прагаласавалі за падтрымку законнага ўрада Літвы і выказаліся супраць путчыстаў. Ганаруся сваімі калегамі: не было ніводнага голасу «супраць»! Толькі 10 чалавек устрымалася і некалькі ўвогуле не галасавалі.

Гэта першы такі выпадак адкрытай падтрымкі незалежнай Літвы ў Савецкім Саюзе ў сувязі з крывавымі падзеямі 13 студзеня.

## Савецкія назвы сыходзілі цяжка – нібы высялялі не літары, а прывідаў

*– Але вашае развітанне з СССР пачалося, відаць, з іншых падзей? Хай і не такіх гучных, затое знакавых?*

– Прарыў з Беларусі савецкай у новую незалежную Беларусь – не скачок у адзін момант, а крок за крокам, пад'ём за пад'ёмам. За дэпутацкай парой, напрыклад, мне пашчасціла далучыцца да нялёгкай, але цікавай працы: вяртання сталіцы гістарычных назваў вуліц.

Ізноў жа ў 1991-м, але ў траўні, падчас чарговай паездкі ў Літву, я прапанаваў Ігару Чарняўскаму, старшыні дэпутацкай камісіі культуры і захавання гістарычнай спадчыны, заняцца мінскай тапанімікай. Рэакцыя класічная: «Ты сказаў – сам і рабі». Ну, што ж: сабраў групу спецыялістаў, у чэрвені падрыхтавалі праект больш як з трыццаці гістарычных назваў цэнтральных вуліц, зацвердзілі яго на дэпутацкай камісіі і перадалі ў выканкам.

Першымі, але толькі 9 снежня 1991 года, прынялі рашэнні па галоўных тагачасных сімвалах: плошча Леніна стала плошчай Незалежнасці, Ленінскі праспект – праспектам Францішка Скарыны.

*– Савецкія назвы сыходзілі цяжка – нібы высялялі не літары, а прывідаў. Памятаеце, хто і як бараніў, напрыклад, вуліцу Горкага?*

– Менавіта так: калі дайшлі да яе, пачаліся такія баталіі! Дарэчы, усё адбывалася ў дзень стогадовага юбілею паэта чыстае красы. Мінгарвыканкам тройчы галасаваў і двойчы не мог сабраць большасці за яго – усё тармазіла кіраўніца спраў выканкама Людміла Валодзькіна. Зламаць супраціў чыноўнікаў, у большасці сваёй далёкіх ад культуры, дэпутатам удалося толькі тады, калі ў Оперным тэатры ўжо пачаўся

ўрачысты вечар да стагоддзя нашага нацыянальнага генія. У велічэзнай зале ўдзельнікі вечара ведалі, якое пытанне разглядаецца, таму з надзеяй і насцярожанасцю чакалі, чым урэшце скончацца дэбаты.

Як толькі рашэнне ўрэшце было прынята, я літаральна вылецеў з залы, схапіў таксоўку, прымчаўся ў тэатр, накідаў на аркушы спіс прынятых рашэнняў і праз кулісы перадаў запіску міністру культуры. Той – Шушкевічу, Шушкевіч – Гілевічу. Ніл Сымонавіч выйшаў на сцэну і абвясціў: «Радасная навіна! Толькі што прынята рашэнне: вуліца Горкага становіцца вуліцай Максіма Багдановіча!» Усе ўскочылі, крыкі, апладысменты, слёзы. Тая ж рэакцыя залы была яшчэ двойчы – на плошчу Незалежнасці і праспект Францішка Скарыны.

*– Момант, калі гісторыя вярталася дадому?*

– Так, але вяртанне з доўгага падарожжа рэдка бывае лёгкім. У 1993-м вярнулі вуліцы Кальварыйскую (раней Апанскага), Ракаўскую (Астроўскага), Гарадскі вал (Урыцкага), Раманаўскую Слабаду (Рэспубліканскую).

Змагаліся за іншыя гістарычныя назвы: Дамініканская, Койданаўская, Алеся Гаруна, Вацлава Іваноўскага, Глеба Мінскага, Падгорная, Гарбарная, Шпітальная, Францішканская. Але зацятыя саветчыкі адных абвінавачвалі ў калабарацыі, іншых – у непажаданай сімволіцы. Рухалася са скрыпам.

Тым не менш гэта быў моцны, энергічны рух. Мы будзілі горад яго гісторыяй. Бо калі вуліцы называюцца роднымі імёнамі, месца пачынае гаварыць сваёй мовай і з безаблічнага ператвараецца ў жывы Мінск, які памятае, хто ён. Калі нарадзіўся, адкуль выйшаў. Вельмі рады яшчэ адной вернутай назве, што шмат год чакала свайго часу, – вуліцы Зыбіцкай, якая сёння стала культавым месцам для маладых ды не толькі маладых мінчукоў.

Дапамагаў я ў гэтым плане і жыхарам Калодзішчаў: збіраў успаміны пра старыя тапонімы, агітаваў – і ў выніку там з’явіліся назвы Ліпавая Калода, Казіная Сцежка. Жывыя сведчанні народнай памяці.

## Адам араў, а Ева прала, і дзе ж тады была дзяржава?

*– Сказанае пра горад можна пераадрасаваць і вам: якімі сцежкамі ішлі да сваёй сённяшняй вуліцы?*

– Бацька – фізік, вучыўся разам са Станіславам Шушкевічам, мелі доўгую ўзаемную павагу. Маці – хімік, лаўрэатка Дзяржаўнай прэміі. Хоць і не беларуска, але настолькі адчувала Беларусь, што пісала вершы па-беларуску. Адзін з іх, прысвечаны Пагоні, надрукавалі ў «Літаратуры і мастацтве» якраз перад рэферэндумам 1995 года – такім моцным быў. Гэта яе выказванне вернасці нашай зямлі.

У кватэры заўсёды гучалі «Голас Амерыкі», BBC, «Нямецкая хваля». Мы чулі, што ёсць іншы свет, дзе можна гаварыць і слухаць без страху. Моцна ўплывала. А побач жыў Юрый Хадыка – вялікі інтэлектуал, выдатны навуковец, таленавіты даследчык беларускай культуры і маральны арыенцір, адзін з галоўных стваральнікаў Фронту. У яго доме я праводзіў у дзяцінстве шмат часу разам са старэйшым сынам Юрыя Віктаравіча, сваім аднагодкам Аляксеем, слухаў людзей, якія думалі свабодна, гаварылі смела. Вось яна, школа грамадзянскасці.

*– Падаецца, у такой школе галоўны ўрок гучыць проста, але моцна: «Зрабі сам». Самакіраванне, якім вы пазней заняліся, – гэта калі чалавек, грамада бяруць на сябе тое, чаго дзяржава не здолела толкам зрабіць. З чаго пачалося?*

– Сімвалам можна лічыць Лошыцкі парк: адзін з першых прыкладаў, калі грамадскія ініцыятывы здолелі паўплываць на рашэнні ўлады. Мы ўпершыню адчулі, што не падпарадкоўваемся, а ўдзельнічаем. Ініцыюем.

*– А дзе старт у больш шырокім, гістарычным сэнсе?*

– Тут, зразумела, ідзём ад Адама і Евы. Калі перафразаваць словы англійскага філосафа XIV стагоддзя Джона Бола да ролі мясцовага самакіравання, то можна сказаць: «Адам араў, а Ева прала, і дзе ж тады была дзяржава?» Чалавецтва на тысячагоддзі апярэджвае дзяржаву з яе бюракратычнымі інстытуцыямі праз суцэльнае мясцовае самакіраванне. І ў Беларусі заўсёды было імкненне да гэткага падыходу: ад «капы» вясковай супольнасці і «веча» ў горадзе да магдэбургскага права, якім, з розных ацэнак, карысталіся ў нас да 110 населеных пунктаў… Лошыца стала для сучаснікаў новай рэальнасцю гаспадарання: людзі абаранілі сваю прастору, вярнулі гарадскую спадчыну.

*– Давайце не так хутка: калі Адам араў, то вы гістарычна і юрыдычна, па крупінках збіралі і пеставалі лошыцкую зямлю, паказалі яе гораду як вялікую каштоўнасць.*

– Дарэчы, некаторыя беларускія гісторыкі лічаць, што менавіта там, а не ў цэнтры Мінска, адбылася славутая бітва на Нямізе. Парк поўны цікавостак і сімвалаў, але яго ў канцы васьмідзясятых і пачатку дзевяностых пачалі расцягваць па кавалках: нейкі інстытут, калгас, новыя бізнесмены… Ніякага парадку, хаос, бруд.

Я прыйшоў да старшыні тады яшчэ Ленінскага райвыканкама: трэба адсекчы  выпадковых арандатараў, зрабіць адну юрыдычную асобу, перадаць зямлю ўпраўленню культуры. Той развёў рукамі: «Паперы гэтых гаспадароў сапраўды спрэс ліпавыя, але яны іх маюць! А ў цябе пакуль нічога няма».

*– І тады – паходы па дакументы, за права і праўду. Ці не парадокс: ваяваць з горадам дзеля яго ж карысці?*

– Самакіраванне – не лозунг, а паслядоўная прадуманая праца. Вось мы і зрабілі праект рэстаўрацыі, сабралі ўсё пад адным дахам, нават новага дадалі: забралі законнае ў калгаса, які прысабечыў частку тэрыторыі. Цяжкія, часам камічныя бойкі з паперамі, але маем вынік: парк адрадзіўся. Цяпер ён мае выгляд, можа, і не такі, як задумвалася, але зусім не запушчаны кут, а годнае месца для адпачынку. Людзі ходзяць, дыхаюць, радуюцца прыгажосці – ужо перамога.

## Не танчыць і пляскаць у ладкі пад чыюсьці дудку, а – паважаць сябе, слухаць сумленне

*– Рэстаўрацыя парка як мадэль эфектыўнасці грамадзянскай ініцыятывы: з хаосу – лад, з абыякавасці – супольнасць. Ці не тады ўпершыню адчулі, што народная талака можа быць не проста формай працы, а спосабам самавыяўлення і самакіравання?*

– Значна раней: з сярэдзіны 1980-х, калі пачалі з'яўляцца розныя нефармальныя аб'яднанні. У Беларускую майстроўню мяне прывёў Аляксей Хадыка. Там пазнаёміўся з Вінцуком і Арынай Вячоркамі, Віктарам Івашкевічам, Сержуком Вітушкам, Анатолем Сысам ды шмат яшчэ з кім.

У 1984–1985 гадах усе, хто жадаў, дапамагалі ў рэстаўрацыі Траецкага прадмесця. Па суботах браліся за сякеры, рыдлёўкі і малаткі, чысцілі сцены, рамантавалі дахі. Гэта была сапраўдная, жывая талака, якая збірала людзей, што прагнулі вярнуць Мінску яго сапраўднае аблічча.

Неяк прыехала тэлегрупа, і я ўпершыню трапіў у кадр: не як герой, а проста адным з многіх, хто не сядзіць дома. Рэальна адчувалася: робім нешта сапраўднае.

Там і тады ў Траецкім у снежні 1985 года мы стварылі адно з першых нефармальных маладзёвых аб’яднанняў «Талака» на чале з выдатным дзеячам беларускага адраджэння Сержуком Вітушкам.

Так сталася, што да тэхнічнай адукацыі дадалася юрыдычная, пачаў выкладаць канстытуцыйнае, адміністрацыйнае і муніцыпальнае права – восем дысцыплін у розныя гады. Але ўнутры ўсё яшчэ заставалася талакоўскае пачуццё адказнасці.

*– А калі юрыдычнае перарасло ў патрэбу разумець, як усё працуе не на паперах, а ў жыцці? Што трэба, каб закон пачаў ператварацца з прадмета выкладання ў інструмент самакіравання?*

– Патрабавалася напрацаваць і спалучыць увесь свой досвед: тэхнічны, юрыдычны, дэпутацкі. Я меў досвед працы экспертам у камісіях Вярхоўнага Савета, удзельнічаў у шматлікіх праектах, завязаных на мясцовы актывізм. У асветніцкім грамадскім аб’яднанні «Фонд імя Льва Сапегі» мы спрабавалі пераасэнсаваць сутнасць улады.

*– Гэта значыць – павярнуць яе да рэалій? Тэорыю, «правільную» вечную рыторыку ў будзённасць? І якой атрымалася гэтая формула?*

– Простай. Калі чалавек прачынаецца раніцай, ён думае не пра глабальныя праблемы, а – ці цурчыць вада ў кране, ці грэюць батарэі, ці чыста ў дварах. Арганізацыя годнага жыцця і ёсць сапраўдная дзейсная палітыка.

*– Вы прачыталі безліч лекцый пра гарадское самакіраванне, спасылаліся на традыцыі магдэбургскага права. Калі перакласці гэты сімвалічны код на XXI стагоддзе, што ў ім жывое, а што засталося прыгожым вобразам?*

– Найперш трэба памятаць базавую выснову з даўняга досведу: чалавек – самастойная і самакаштоўная асоба. Ён мусіць

не танчыць і пляскаць у ладкі пад дудку дзяржавы, а паважаць сябе і рабіць тое, што падказвае сумленне.

Сёння ў Беларусі ўсё, здаецца, працуе: тралейбусы ходзяць, храмы адкрыты, крамы поўныя. Але жыцця няма. Яго падмяніў страх. Людзі запалоханыя, нават калі гэтага не ўсведамляюць. І пакуль яны жывуць у такім стане, не могуць быць гаспадарамі свайго лёсу.

Самакіраванне – гэта супрацьяддзе ад страху. Усведамленне сваёй самастойнасці і гонару. Я часта кажу: у птушкі два крылы. Адрэзалі адно – узлёту не пабачыць. Тое ж і з грамадствам: дзяржаўная ўлада – гэта крыло, другое – мясцовае самакіраванне. Без яго грамадства падае, губляе раўнавагу.

*– Калі б сёння з'явілася магчымасць вылечыць птушку, з чаго варта пачынаць? Якія паўнамоцтвы вяртаць гораду?*

– Перш за ўсё – права самастойнага рашэння. Без узгаднення зверху, без спушчаных планаў. Гэта можа здавацца дробяззю, але менавіта з яе пачынаецца адказнасць.

Бывае, самакіраванне даводзяць і да абсурду: у 1990 годзе савет Маскоўскага раёна Мінска абвясціў паветраную прастору над раёнам сваёй уласнасцю і запатрабаваў дазвол на пралёт самалётаў. Але ў гэтым быў і гумар, і сімптом: людзі хацелі кіраваць самі, нават няўмела.

У кожным горадзе свае ўмовы: жыццё ў Шабанах не тое, што ва Уруччы; Віцебск адрозніваецца ад Брэста і надвор'ем, і ментальнасцю. Універсальны закон для ўсіх не працуе. Але сённяшняе заканадаўства Беларусі ўсё роўна стрыжэ пад адзін грэбень. Няма люфту, бракуе самастойнасці.

## Сістэма прыгібу знішчае адказнасць

*– Тады лагічнае, заземленае: дзе пачынаецца рэальная незалежнасць мясцовай улады?*

– У фінансах. Трэба не замыкаць усё на цэнтр, а даць тэрыторыям дыхаць. У ЗША яшчэ ў 1970-х большасць насельніцтва жыла ў малых гарадах і прыгарадах, бо там добрыя ўмовы, эканоміка і самастойнасць. Людзі мелі выбар, дзе жыць, чым займацца. А ў нас кожны год знікае каля сотні вёсак. Сапраўдная катастрофа!

Каб спыніць гэта, трэба развіваць малыя мясціны праз прадуманую эканамічную палітыку: падатковыя льготы, магчымасці для бізнесу, стварэнне камфортнага сацыяльнага асяроддзя. Без гэтага абязлюджванне працягнецца.

Сённяшняя сістэма – піраміда: адміністрацыйная, тэрытарыяльная і фінансавая. Пакуль парламент не зацвердзіць дзяржаўны бюджэт, вобласці не могуць прыняць свае; калі марудзяць яны – топчуцца на месцы раёны; спяць гэтыя – чэзнуць сельсаветы. Хоць паводле закону кожны павінен мець самастойнасць. А на практыцы – поўная залежнасць ад тых, хто стаіць вышэй. Сістэма прыгібу, а не адказнасці. І яе трэба мяняць.

*– Калі сістэма выбудавана на падпарадкаванні, дзе знайсці карані самастойнасці? У ведах, досведзе, у маральнай аснове? Хто дапамог зразумець сутнасць калектыўнай практыкі адказнасці?*

– Гэта калектыўны вопыт. У Фондзе імя Льва Сапегі мы працавалі разам з Георгіем Куневічам, Міраславам Кобасам, Алесем Жучковым і дзясяткамі экспертаў. Хтосьці цяпер у Беларусі, хтосьці за мяжой, таму не буду называць усіх.

Пераймалі досвед калег з Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Чэхіі, Венгрыі. У 2001 годзе я сустрэўся ў Кракаве з Ежы Рэгульскім, адным з бацькоў польскага самакіравання. Ён сказаў: «Мы пачалі рыхтаваць рэформу за 25 гадоў да таго, як яе здолелі рэалізаваць». Людзі вучыліся,

стваралі праграмы, рыхтавалі кадры, пераконвалі грамадства. І калі ў 1989-м з’явілася магчымасць, рэформа мясцовага самакіравання стала першай і самай паспяховай у Польшчы.

Так і нам трэба рабіць: рыхтавацца сёння, нават калі яшчэ няма спрыяльнага моманту. Ствараць схемы, вучыць людзей, трымаць ідэю жывой. Бо калі дзень прыйдзе, мусяць быць гатовыя тыя, хто ведае, як зрабіць усё правільна.

*– Вы шмат гадоў супрацоўнічалі з еўрапейскай асацыяцыяй мясцовай дэмакратыі ALDA, іншымі замежнымі арганізацыямі. Што вынеслі з гэтага досведу?*

– Напрыклад, пачалі ладзіць конкурсы малых ініцыятыў: з усёй Беларусі – па паўтары сотні заявак кожны раз. Людзі прапаноўвалі свае ідэі, праекты, спосабы палепшыць жыццё ў двары, на вуліцы, у горадзе. Не заўсёды маглі дапамагчы, але той факт, што яны хацелі рабіць нешта важнае самі, вельмі паказальны. І гэта не штучная з’ява, а натуральнае жаданне ўзяць адказнасць за сваё.

Ці возьмем 2020 год: паўстаўанне дваровых супольнасцяў – ізноў жа бачым зародак самакіравання ў дзеянні. Да іх ніхто звонку не прыходзіў, каб загадваць або раіць. Выключна мясцовая ініцыятыва, разуменне таго, што патрэбна менавіта зараз, вось тут, на гэтым пятачку горада. Яны самі ўпарадкоўвалі свой свет.

## Філасофія аўтарытарызму сканцэнтравана ў пытанні «Хто даручыў?!»

*– Дэпутаты і эксперты, якія прайшлі школу БНФ і мелі практычны муніцыпальны досвед, стварылі ў 1992-м Фонд імя Льва Сапегі. Дзіўна нават, што вы далучыліся пазней, праз год…*

– Затое застаўся там на тры дзесяцігоддзі! Але як без жартаў, то варта згадаць, чаму наогул узнікла аб'яднанне. Людзі з розных куткоў: Мінска, Віцебска, Магілёва, Гродна, Брэста, з невялікіх гарадоў і нават пасёлкаў – зразумелі, што паасобку нічога не зварухнуць. Прабіваць сцежку да рэформаў можна толькі разам. Гэта не ілюзія і не манілаўшчына: тады яшчэ былі надзеі на сапраўдныя перамены ў мясцовым самакіраванні. Праўда, неўзабаве зразумелі, што падтрымліваць трэба ўжо не рэформы, а сам дух дэмакратыі.

А прыпазніўся, бо якраз гудзела праца ў Лошыцкім парку. Калі прыйшоў, спачатку дапамагаў у арганізацыйных справах, але ўсё часцей адчуваў цягу да адукацыі. Я хацеў, каб людзі разумелі сутнасць самакіраванне не як юрыдычнага тэрміна, а як жыццёвага інструменту. Не падараваць людзям рыбу, а даць ім вуду і навучыць ёй карыстацца.

*– Памятаеце момант, калі фонд стаў для вас не працай, а прысягай?*

– Хоць бы такі. У верасні 1993 года прыехаў у Санкт-Пецярбург на адпаведнае пасяджэнне Асамблеі краін СНД. І ўбачыў, што справай самакіравання займаюцца тысячы людзей на самым высокім узроўні. Не хобі, не дзіцячая гульня, а сур'ёзная, стратэгічная справа. Вярнуўся ў Мінск перакананым: вось мой шлях.

Іншы выпадак. У 2001 годзе Вярхоўны суд Беларусі пастанавіў, што Фонд імя Льва Сапегі «не мае права займацца мясцовым самакіраваннем, бо тут сфера адказнасці дзяржавы». Цалкам абсурдная фармулёўка: мы гаворым пра незалежнасць мясцовай улады, а нам у адказ зусім безапеляцыйна – гэтым можа займацца толькі дзяржава.

Вельмі блізкі да Лукашэнкі Міхаіл Мясніковіч аднойчы сустракаўся з нашым кіраўніком Міраславам Кобасам

і спытаў: «А хто вам наогул даручыў займацца мясцовым самакіраваннем?»

*– У пытанні пра «даручыў» фактычна ўся філасофія аўтарытарызму. Як вы адчулі гэты момант: забаронай дзейнічаць – ці перакананнем, што дзейнічаць варта якраз мацней?*

– Шок і выклік, пасля якога яшчэ больш умацавалася перакананне: мусім змагацца. Не здаліся…

Але былі ў сістэме і выключэнні.

Я не магу не згадаць Мечыслава Грыба. Заўсёды адкрыты, з цвярозым, глыбокім унікненнем у праблемы. Гэты чалавек тонка разумее сэнс самакіравання і падтрымлівае ідэю, што ўлада мусіць ісці знізу, а не зверху.

*– Тады яшчэ трохі пра чыноўнікаў, толькі з нізоў вертыкалі. Неўзабаве фонд пачаў прасоўваць еўрапейскую ідэю бюджэту ўдзелу. І, здаецца, яна сапраўды спрацавала, нават у нашай негасціннай палітычнай рэальнасці. Як удалося дагрукацца да нізавой улады?*

– У розных краінах гэта працуе па-рознаму. Ёсць мадэль, калі некалькі працэнтаў фінансавання выносяцца на грамадскае абмеркаванне: людзі самі вырашаюць, што для іх важнейшае: дзіцячая пляцоўка, спартыўная зала ці рамонт парка.

І ёсць іншы падыход, бліжэйшы мне: калі хаця б адзін працэнт бюджэту перадаецца грамадзянам без указанняў, на што яго траціць. Людзі вызначаюць прыярытэты і рэалізуюць праекты праз свае ініцыятывы, арганізацыі, бізнес або мясцовыя супольнасці. Сапраўдная школа даверу.

Дык вось, нават у зацуглянай Беларусі, дзе ўсё цяжка, шмат якія мясцовыя ўлады былі гатовыя далучыцца, дадаць свае сродкі, бо разумелі: калі людзі самі ўдзельнічаюць, яны і ахоўваюць,

і падтрымліваюць тое, што стварылі. Гэта тады не чужое, а – іх уласнае.

*– Відаць, уражваў і эканамічны эфект ад такіх практык?*

– Безумоўна. У Еўропе пераразмеркаванне ў парадку дэцэнтралізацыі часткі задач з вярхоў на мясцовы ўзровень прыносіць эканомію да 30 %. Калі перанесці на беларускія маштабы – размова пра мільярды. Бо людзі, якія займаюцца справай самі, робяць яе хутчэй, танней і з душой.

Такія рэчы не знішчаюць дзяржаву, як любяць казаць прапагандысты, а ўмацоўваюць. Гэта як у сям'і: як усе толькі чакаюць указанняў ад бацькі, справа стаіць. А калі кожны бярэ частку адказнасці – дом жыве, багацее.

## Гэта не сучасная эканоміка, а феадалізм у новай форме

*– Тут сітуацыя «відавочнае – неймавернае»: хоць плюсы літаральна на далоні, эксперты сцвярджаюць, што сёння мясцовая ўлада ў Беларусі – не самакіраванне, а форма дзяржаўнай адміністрацыі. Дыягназ дакладны?*

– Абсалютна. Мясцовыя выканкамы – як шчупальцы велічэзнага дзяржаўнага васьмінога. Усё спускаецца зверху. І пакуль няма выразнага падзелу, пра які мы гаварылі, нічога не зменіцца.

Дзяржава не мусіць апускацца ніжэй за пэўны ўзровень, не мусіць прызначаць мясцовых кіраўнікоў, адмяняць іх рашэнні, кантраляваць дробязі. З іншага боку, саветам не варта адрывацца ад выканаўчых структур. Сёння выканкамы амаль не падпарадкоўваюцца ім – так бы мовіць, прыклад паспяхова рэалізаванага абсурду ў дзяржаўнай практыцы. Рашэнні прадстаўнічых органаў мусяць выконвацца тымі, хто адказвае перад людзьмі, а не перад начальствам у рэгіёнах і Мінску.

Код цяперашняй дзяржаўнай несвабоды якраз у піетэтнасці вертыкалі.

*– Пра тое, што ў дацкім каралеўстве не ўсё ладна, ведаюць многія. А як выглядае нармальная працоўная мадэль мясцовай улады ў вашым разуменні?*

– У прапанаванай намі рэформе галоўнае, каб быў адзін цэласны комплекс, дзе прадстаўнічая і выканаўчая ўлада дзейнічаюць разам, а не супраць адна адной.

Выканкам мусіць быць тэхнічнай інстанцыяй, якая выконвае рашэнні савета, а савет – прадстаўнічым органам грамадзян. І ніхто не ціснe адно на аднаго: абласны ўзровень не ўмешваецца ў базавы, базавы – у першасны. Як у медыцыне: паліклініка, шпіталь і кардыяцэнтр маюць розныя задачы, але не перашкаджаюць адно аднаму. Галоўнае, каб адказнасць адчувалі не перад прэзідэнтам і не перад дзяржавай, а перад грамадзянамі. Без гэтага не пабачыць ні даверу, ні справы.

*– Але з вашага досведу відаць, што дзяржава не любіць такіх ініцыятыў. У 2006 годзе вам не працягнулі арэнду. Насамрэч скасоўвалася не дамова на памяшканне – тут была прыхаваная спроба выціснуць фонд з публічнай прасторы?*

– Тады, перад мясцовымі выбарамі, ціснулі мэтанакіравана. Некаторых экспертаў нават пакаралі за ўдзел у нашых праграмах. А пасля ў 2020-м «Советская Белоруссия» сцвярджала, што пад нібыта чыстым, белым, пушыстым Фондам імя Льва Сапегі хаваюцца ўсе «ворагі народа»: «Вясна», Хельсінкскі камітэт, іншыя. Мы, маўляў, вяршыня айсберга. Вось якія фантазіі нараджаюцца ў галовах дзяржаўных прапагандыстаў. Яшчэ адзін доказ, што яны баяцца нават не палітыкі, а ведаў, адукацыі, ініцыятывы народа.

*– Калі глядзець на дзейнасць фонду як на падручнік удзелу грамадзян у самакіраванні, што з яго перайшло ў практыку?*

– Шмат. Не ўсё можна называць публічна, каб не падстаўляць людзей, але ёсць месцы ў Смаргонскім і Ашмянскім раёнах Гродзенскай вобласці, у чарнобыльскіх раёнах Гомельшчыны і Магілёўшчыны, дзе людзі і ў сённяшніх умовах працягваюць дзейнічаць самастойна. Нават без грантаў і падтрымкі. Проста таму, што зразумелі сэнс і эфектыўнасць такой актыўнасці. Маем цяпер не проста «праект», а лад жыцця – мыслення і дзеяння.

Варта толькі даць людзям празрыстую мэту, мінімальныя паўнамоцтвы – і яны пачынаюць дзейнічаць. Але дзяржава, наадварот, часта ўсяляк перашкаджае. У 2021 годзе некаторыя праекты прымусова спынілі ўжо на стадыі рэалізацыі. Арганізацыям загадвалі самаліквідавацца замест таго, каб падтрымаць іх і скончыць задуманае. Гэта – чорная справа лап улады, якая душыць уласную краіну.

*– Вы працавалі і з рэгіёнамі, і з Мінскам. Дзе прасцей пусціць карані самакіраванню: у малым горадзе – ці ў мегаполісе?*

– У невялікіх гарадах і пасёлках. Там людзі ведаюць адно аднаго, ёсць старшыя па вуліцах і кварталах, можна хутка данесці думку, абмеркаваць і вырашыць праблему разам. А пры большым маштабе важную ролю граюць мікрараённыя і дваравыя супольнасці. Чалавек жыве ў сваёй прасторы, і менавіта там ён гатовы дзейнічаць. У сталіцы, як і ў любым мегаполісе, самакіраванне пачынаецца з пад’езда, з двара.

*– Якія элементы еўрапейскай мадэлі вы лічыце жыццёва неабходнымі для Беларусі ўжо цяпер?*

– Пачынаць варта не з выбарнасці, а з дэцэнтралізацыі. Пакуль дзяржаўная ўлада ўмешваецца ва ўсе сферы, ад адукацыі да ЖКГ, – нічога не зменіцца. Яна мусіць займацца знешняй палітыкай, фінансамі, бяспекай. А мясцовая ўлада – адукацыяй, сацыяльнымі справамі, культурай, гарадскім

добраўпарадкаваннем. Як толькі правядуць такую мяжу, можна казаць і пра выбар кіраўнікоў, і пра празрысты бюджэт.

У Польшчы, напрыклад, самы багаты не ваяводскі, а гмінны ўзровень, бо менавіта там узнікае большасць праблем і патрэб. А ў нас усё наадварот: абласныя органы атрымліваюць 49 % сродкаў, раённыя – 50 %, а сельсаветы – толькі адзін працэнт. За яго нельга вырашыць анічога. Таму ніжнія і ходзяць пад каўпаком тых, хто вышэй. Гэта не сучасная эканоміка, а феадалізм у новай форме.

## Калі няма рэальнага самакіравання, тады грамадзянская супольнасць – фікцыя

*– Каб вам даручылі напісаць маніфест гарадоў ці канстытуцыю мясцовага самакіравання, якія тры прынцыпы зрабілі б непарушнымі?*

– Мы даўно спрабавалі зрабіць гэта. Першы варыянт канцэпцыі рэформы мясцовага самакіравання Фонд імя Льва Сапегі падрыхтаваў у 1996 годзе і перадаў у Вярхоўны Савет. Прадстаўляць яе вызваўся Генадзь Карпенка, але здарыўся рэферэндум, спроба імпічменту, разгром парламента – і ўсё спынілася. Тут як зімовая рэчка, што цячэ пад ільдом: яшчэ тады прапісаныя прынцыпы застаюцца нязменнымі.

Першы – падзел паўнамоцтваў паміж дзяржавай і самакіраваннем.

Другі – адказнасць перад грамадзянамі, а не перад зверху прызначанай уладай.

І трэці – эканамічная самастойнасць, бо без фінансавай незалежнасці няма свабоды ні палітычнай, ні маральнай.

А зараз – трошкі сімвалічных супадзенняў або нават знакаў.

Апошняя рэдакцыя дакумента з'явілася ў 2023 годзе. І літаральна ў той дзень, калі завяршалі працу над тэкстам, да мяне прыйшлі сілавікі і пачалі канфіскоўваць тэхніку. Такім вось чынам і завяршыўся чарговы этап працы, якая заняла тры дзесяцігоддзі.

У гэтай канцэпцыі мы заклалі галоўнае – субсідыярнасць. То-бок кожны вышэйшы ўзровень улады існуе толькі для падтрымкі ніжэйшага, а не для камандавання ім. Першы, мясцовы, – галоўны. Базавы дапамагае яму. Абласны – базаваму. А дзяржава – толькі дапаўненне да ўсіх. Інакш кажучы, чалавек – гаспадар сваёй тэрыторыі. Ён не шрубка ў сістэме, а суб'ект, што мае права вырашаць, як жыць сваёй супольнасці.

*– Колькі законаў трэба змяніць, каб гэта запрацавала?*

– Больш за трыццаць. Ад Кодэкса аб адміністрацыйным кіраванні да шэрагу спецыяльных законаў аб формах самакіравання і мясцовых ініцыятывах. Частку трэба дапоўніць, частку – напісаць нанова. Велізарная праца, але ўжо ідзе, у тым ліку дзякуючы маім калегам у Беларусі і за мяжой. Працуем праз анлайн-сувязь, без аплаты, на грамадскіх пачатках, але з адчуваннем адказнасці. Бо ведаем: гэта прынясе карысць. Калі не сёння, то паслязаўтра.

*– У кабінетах чыноўнікаў заўжды вісяць партрэты, ад Леніна да Лукашэнкі, а часам і нейкія «мудрыя» цытаты ў рамачках. Які лозунг ці афарызм, на вашую думку, пасуе будынкам гарсаветаў будучай Беларусі? Што замест «светлага вобраза правадыра»?*

– Я напісаў бы вельмі простыя словы: «Вы – гаспадары свайго горада. Не бойцеся быць гаспадарамі!»

Можа, камусь гэта думка падаецца надакучлівай тэорыяй, але толькі не мне. Перакананы: калі ў краіне няма рэальнага права на самакіраванне, тады ў ёй адсутнічае і грамадзянская супольнасць. Гэта непадзельныя рэчы.

# ДУМАЦЬ БЕЛАРУСЬ

Каб Беларусь стала сапраўднай еўрапейскай дзяржавай, трэба вярнуць людзям гэтае права. Права быць гаспадарамі сваёй зямлі. Без яго ўсе размовы пра дэмакратыю і роўнасць з Еўропай – пустыя словы.

# АЛЯКСАНДР ГАРЦУЕЎ



Фота з асабістага архіва А. Гарцуева

*Нарадзіўся 15 чэрвеня 1959 года ў вёсцы Сухары Магілёўскага раёна.*

*Бацькі – вясковыя настаўнікі. У вольны час займаліся мастацкай самадзейнасцю: спявалі ў хоры, ігралі ў самадзейных спектаклях, бацька добра валодаў некалькімі музычнымі інструментам. Сын таксама пачаў удзельнічаць у імпрэзах, цікавіцца літаратурай і мастацтвам.*

*Выбар будучай прафесіі быў перадвызначаны яшчэ ў раннім дзяцінстве.*

## ДУМАЦЬ БЕЛАРУСЬ

*У 1976 годзе з першай спробы паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (БДТМІ) на акцёрскае аддзяленне, у майстэрню вядомага тэатральнага педагога А. Бутакова.*

*Пасля сканчэння БДТМІ ў 1980 годзе быў запрошаны ў трупу тэатра імя Янкі Купалы.*

*У 1982–1983 гадах праходзіў тэрміновую службу ў арміі, пасля зноў вярнуўся ў трупу Купалаўскага тэатра*

*Сыграў мноства роляў. Паступова стаў разумець, што больш зацікаўлены рэжысёрскай прафесіяй. Спачатку паспрабаваў паставіць самастойна некалькі спектакляў, а ўжо пасля атрымання рэжысёрскай адукацыі ў Маскве ў 2000 годзе афіцыйна зрабіўся рэжысёрам-пастаноўшчыкам тэатра імя Янкі Купалы.*

*Сярод шматлікіх узнагарод на розных айчынных і міжнародных тэатральных фестывалях вылучае адну, якая вызначыла мастацкія прыярытэты і далейшы творчы лёс. Гэта званне лаўрэата Першай нацыянальнай тэатральнай прэміі ў 2011 годзе за спектакль «Не мой» у Купалаўскім тэатры (паводле аповесці Алеся Адамовіча).*

*У 2012 годзе ўзначаліў Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі (РТБД).*

*Адначасова быў дацэнтам Акадэміі мастацтваў.*

*У 2015 годзе атрымаў ганаровае званне Заслужанага дзеяча мастацтваў.*

*У 2021 годзе быў звольнены з пасады мастацкага кіраўніка РТБД за актыўную грамадзянскую пазіцыю.*

*Паколькі ў Беларусі атрымаў забарону на прафесію, мусіў перабрацца ў Польшчу, дзе працягвае прафесійную дзейнасць у трупе Вольных Купалаўцаў.*

АЛЯКСАНДР
ГАРЦУЕЎ

# ГЭТА ЧАС,
# У ЯКІМ МАСТАЦТВА –
# ЗЛАЧЫНСТВА.
# АНТЫКАЗКА.
# СЮР.
# МУСІМ ПАКІНУЦЬ
# ЗАЛЮСТРЭЧЧА

## За Саюзам уся культура была «ідэйнай», апроч эстрады. Вось там чысценька – адно каханне…

– Бацькі – сельскія настаўнікі. Я нарадзіўся ў магілёўскай вёсцы Сухары, але пажыў і ў Гродзенскай вобласці сярод «палякаў», і на Брэстчыне. Карані пусціў, лічы, па ўсёй Беларусі.

Тата вельмі хацеў, каб я таксама пайшоў у школу. У мяне яшчэ дзве старэйшыя сястры, але ніводную яму не ўдалося скіраваць па сваіх слядах. Дзяўчаты атрымалі тэхнічную адукацыю, а мяне цягнула ў іншае. Можа, таму, што ўся сям'я ўдзельнічала ў самадзейнасці. Сёстры, напрыклад, добра спявалі.

*– На маёй памяці вёскі тады жылі цяжка, але з песнямі і танцамі ў клубах. Класныя канцэрты ладзілі, па дзве-тры гадзіны. І смяяліся, і пляскалі людзі сваім родным артыстам… Жыццё бруіла з таго, што моладзі вельмі шмат. Ці не ў кожнай сям'і – па трое дзяцей. Калі толькі адно, дык ужо выключэнне: удава або разведзеная.*

– З той вясковай весялухі і села ў галаве: зрабіцца акцёрам! Больш ні пра што нават не марыў. Паехаў у Мінск і адразу паступіў. Іншым разам бываюць такія цуды. Хаця цяпер усведамляю: неймаверная выпадковасць. Вельмі хутка я зразумеў, што ў прафесіі, на якую пайшоў вучыцца, амаль нічога не цямлю. Мабыць, нейкія здольнасці меў, але што такое тэатр, акцёрства, разумеў слаба. Дзякуй Богу, Аляксандр Іванавіч Бутакоў нешта тады разгледзеў ува мне. Зямля яму пухам. Усе мае педагогі, дарэчы, ужо памерлі: нікога не засталося…

*– А да Мінска вы прайшлі традыцыйныя прыступкі: школьныя тэатры, драмгурткі?*

– У Гродне быў самадзейны тэатр, так і называўся: Народны. Пры Палацы тэкстыльшчыкаў, у самым цэнтры горада. Мы вельмі ганарыліся.

*– Хто гэтыя вечаровыя артысты? Студэнты, моладзь, людзі сталага веку?*

– Я быў яшчэ старэйшым школьнікам, а яны – дарослыя, разумныя, цікавыя. Напрыклад, доктар, які абагаўляў літаратуру. Дагэтуль памятаю: перакур, стаіць ля сцэны і чытае Караткевіча, прычым на рускай мове. Беларускі варыянт празяваў, не паспеў купіць. Пасмяяліся трохі з гэтага, але менавіта ён адкрыў мне Уладзіміра Сямёнавіча.

*– Можна, угадаю тую кнігу? «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»...*

– Ну вядома, яна! Вось так, праз подступы да сцэны, мне адкрываўся свет. А яшчэ былі сярод нас вадзіцель аўтобуса, дзяўчаты з камвольнага камбіната, тэлевядоўца...

*– Зноў пацыганю: і, напэўна, мясцовыя настаўнікі?*

– Праўда. Народ ад дваццаці да пяцідзесяці гадоў. А кіраваў знакаміты ў Беларусі рэжысёр Гільварг. Ягоны тэатр сярод самадзейных лічыўся найлепшым. Гэта былі 1970-я. І, па шчырасці, прафесійныя трупы часта адставалі – нават Гродзенскі абласны драматычны.

*– А якія п’есы бралі? Савецкія, «ідэйныя»? Ці мы сёння дарэмна ўяўляем той час суцэльна запалітызаваным?*

– Не, не дарэмна. Так яно і было, проста тады гэта неяк не ўспрымалася ў палітычным кантэксце. А цяпер бачу: мастацтва або падмянялася, або шчыльна апекавалася ідэалогіяй. Памятаю, іграў галоўную ролю ў п’есе кшталту «Плацце для выхаднога дня» – пра рабочага хлопца, яго лёс, пра простых заводскіх людзей. Ідэалогія чыстай вады!

Яна не прысутнічала хіба толькі ў музыцы. Тады з’явіліся першыя савецкія вакальна-інструментальныя ансамблі, і там было чысценька, усё пра каханне. А тэатр і кіно – нафталінавыя, «правільныя». І ўсё ж не скажу, што гэта заўсёды дрэнныя спектаклі ці кепскія фільмы. Пры ўсёй апецы існавалі

Тэатр на Таганцы, «Сучаснік» у Маскве, БДТ у Ленінградзе. І ў кінематографе з'яўляліся цікавыя, неадназначныя фільмы: Таркоўскі, раннія Канчалоўскі і Міхалкоў. Я нават дзівіўся: як пра такое і так можна рабіць? Хто дае на гэта дазвол і грошы?

*– Мы адставалі ад Масквы, але ў Мінску таксама былі прарывы?*

– Безумоўна. Вазьміце Купалаўскі, тэатр Раеўскага. Ці рэжысёра ТЮГа Мірoненку – выдатнага, хоць і рана памерлага рэжысёра. Былі і ў нас творчыя выбухі. Увесь Мінск хадзіў у ТЮГ напрыканцы сямідзясятых. Хапала спектакляў-з'яў, класных фільмаў пра людзей. Яны дадаткова выраслі ў вачах гледачоў яшчэ і з-за фону абсалютна заідэалагізаванага мастацтва.

## Аднойчы наступае момант страху, а жыць хочацца. І не кожны застаецца чалавекам

*– У інстытуце ідэалагічны кантроль адчуваўся? Ці хавалі студэнты піpацкую свабоду мыслення?*

– Тэатральна-мастацкі быў своеасаблівым аплотам дысідэнцтва. Мы адрозніваліся нават знешне ад студэнтаў палітэха ці радыётэхнічнага. Без вайсковай кафедры, таму хадзілі валасатымі, пад апошні піск моды. Стараліся апранацца вольна, гаварыць свабодна. На бульбе перасякаліся з іншымі атрадамі і дзівіліся, якія яны арганізаваныя, «ідэйныя». Заўсёды камсорг, якога пабойваліся… А ў нас – вольніца. Трохі дурнаватая, але вольніца. І ў выніку людзі выраслі свабоднымі.

*– Хоць ігралі ў спектаклях савецкага духу?*

– Не заўсёды! Пры ўсім абавязковым матэрыяле працавалі і на добрай беларускай літаратуры. Для дыпломнага спектакля выбралі Быкава.

*– Паводле якой аповесці?*

– Гэта была кампазіцыя нашага кіраўніка, Бутакова. Склеіў яе з некалькіх быкаўскіх твораў. Назва звычайная, увагі

не прыцягвала – «Ішла вайна», але там меўся выразны брэхтаўскі выхад на гледача. Мы як бы размаўлялі з сучаснай публікай – і нас разумелі.

*– У чым сутнасць фінальнага інстытуцкага маніфеста?*

– Даводзілі, што вайна – не проста бяда чалавечая, а выпрабаванне на дух. Аднойчы наступае момант, калі становіцца страшна, а жыць хочацца, і не кожны здольны застацца чалавекам. Вось пра гэта, а не пра «гераізм савецкага народа». Аляксандр Іванавіч ведаў, што ставіў, – сам франтавік.

*– Ліха наглядзеўся… А вы разважалі пра павароты тэмы гераізму, патрыятызму? Каб адсунуцца ад тых, якія былі паўсюль навокал, у «правільных» работах…*

– Такія былі і застаюцца.

Нядаўна ў інтэрнэце трапіліся фота пра мінскае падполле. Немцы вядуць дзяўчат і хлопцаў з шыльдамі на шыях. Жахлівая смерць праз некалькі крокаў, а яны рэальна горда глядзяць наўкол. Гэтыя людзі з савецкай і беларускай гісторыі бяруць мяне не сваёй верай у камунізм, а сумленнасцю перад выбарам, сваёй годнасцю і сваім, скажам так, чалавечым зместам. На здымках – праўда чалавечая. Хаця гэта і страшна, і балюча, але мноства-мноства людзей у розных складаных сітуацыях выбіраюць права застацца чалавекам.

Вось пра што той спектакль. Выпускны…

*– Пасля яго – адразу ў Купалаўскі. Вельмі важны перыяд вашай творчасці. Памятаеце, як прыходзілі на легендарную сцэну?*

– Роўненька 45 гадоў таму – 14 верасня 1980 года – стаў часткай трупы. Якраз адзначалі 60-годдзе тэатра. Усе на сцэне. Мяне і Віктара Манаева – новенькіх, толькі з інстытута – папрасілі пашукаць лаўкі, бо не ўсім хапала месцаў…

А ўжо праз тры тыдні, 4 кастрычніка, ішла «Паўлінка». І раптам з'яўляецца дырэктар, Мікалай Яроменка (старэйшы): «Машэраў

загінуў у аўтакатастрофе...» Глядзім на ЦК, а там усе вокны гараць, хоць дзявятая вечара.

Вось так пачалося маё жыццё ў тэатры. Дарэчы, атрымаў ад яго запрашэнне, сам бы не наважыўся, хаця мроіў пра тую сцэну з Гродна і раней.

*– Якім было стаўленне творчай інтэлігенцыі да асобы тагачаснага першага сакратара? Кім ён выглядаў на фоне сённяшняга кіраўніка Беларусі, для якога культурная дзея нумар адзін – «Славянскі базар»?*

– Па водгуках, да нас заглядваў часцяком, пры тым спантанна. Без помпы, але з двума ахоўнікамі. Аднойчы сам стаў сведкам, калі ўсе нечакана зашушукалі: Машэраў у зале! У яго была ложа справа. Ціха зайшоў, прысеў, глядзіць. А якраз закрывалі спектакль паводле п’есы Андрэя Макаёнка «Пагарэльцы» – рэч з такім трошкі антысталінскім адценнем. Яна з’явілася годам раней і нарабіла шораху: кажуць, нават думалі здымаць Раеўскага. Спектакль харошы, з добрымі ролямі, аднак – скандал. Дайшло да Машэрава, вось і вырашыў разабрацца сам.

*– І які прысуд? Пагарэлі ці ацалелі?*

– Цытую: «А што вы прысталі? Добры спектакль. Вельмі добры». Усё: пытанне закрыта. Валерый Мікалаевіч застаўся на сваім месцы, з якога ўсё жыццё яго здымалі.

*– Ясна, што думалі ў трупе пасля такога візіту. А ў цэлым разумелі неадназначнасць Машэрава? Вось жа Купалаўскі тэатр, а набірае абароты русіфікацыя...*

– Не, задумаліся праз дзесяцігоддзе. А тады гэтага чалавека проста вельмі паважалі, а многія і шчыра любілі. Як жа інакш, калі хадзілі чуткі, што наш будынак – гістарычны! – хацелі знесці, а ён забараніў. Хоць трохі ніжэй Нямігу знішчылі... Аднак тое не супастаўлялася. Бачылі не руіны, а яго зорачку на стылёвым пінжаку, цанілі інтэлігентнасць.

*– Калі ў маю армейскую службу заходзіла размова пра Беларусь, хлопцы з розных краёў абавязкова ўсклікалі: «О, ваш Машэраў!» – «Што наш Машэраў?» Сэнс адказу: сапраўдны, а не бутафорскі Герой Савецкага Саюза, плюс усіх падкупляла ягоная ўсмешка. У адрозненне ад іншых партыйных бонзаў, у ім не бачылі бронзы. Што скажаце на гэта як актор і рэжысёр?*

– Тут феномен галівудскага кінагероя. З густам апранаўся, добрыя манеры. Ведаў: як белазуба ўсміхаешся, будзеш больш падабацца. Ну і – зорачка. Адна, а не чатыры, як у Брэжнева. Што да тэатра… Ведаеце, Сталін таксама любіў глядзець мхатаўскія «Дні Турбіных». І якія загады падпісваў назаўтра раніцай? А Машэраў жыў у іншай эпосе і насамрэч быў абаяльным чалавекам.

Дарэчы, у маю – больш познюю – службу Беларусь для салдат звычайна асацыявалася ўжо з «Песнярамі».

## «Не мой»: праўда не па разнарадцы

*– Вы ігралі і рамантычных маладых герояў, і людзей складаных характараў. Якая роля стала паваротнай у разуменні сцэны?*

– Няма такога ў маім жыцці, каб во сёння разам, умомант усё зразумеў – і пайшоў рабіць інакш. З часам я проста па вушы ўлюбіўся ў сваю прафесію. А прафесія гэта, скажу так, – тэатр. За дзесяць гадоў працы акцёрам паступова ўсвядоміў, што мне мала проста выконваць нейкія ролі.

Памятаю, яшчэ ў інстытуце казалі: «Гарцуеў, табе трэба ў рэжысуру», – а я ў позу: «Ніколі! Хачу быць акцёрам». Грэшны, кляўся ў гэтым. І яшчэ кляўся, што ніколі не сяду за руль аўтамабіля. Абедзве клятвы парушыў…

*– Падсмейваліся, што слабак?*

– Ды дурныя клятвы! Зрабіўся рэжысёрам, бо захацеў хлеба творчасці ў шырокім маштабе. Хлеба мадэлявання сітуацыі,

выбару матэрыялу, акцёраў, ідэй, музыкі… Захацелася ўсёй гэтай тэатральнай свабоды. Якая дазваляе выкарыстаць цалкам тваю Богам дадзеную палітру – эмацыйную, інтэлектуальную. Дзяліцца сваім з другімі.

*– Рэжысёру без адукацыі ніяк?*

– Спачатку думаў, што хопіць адчутага праз сыгранае. Паставіў тры ці чатыры рэчы і зразумеў: усё ж трэба падвучыцца.

*– Чаму не хапіла практычнай школы?*

– Не ставала ўзроўню мыслення, філасофскага асэнсавання рэчаіснасці. Бракавала глыбокіх ведаў прафесіі. Не хацелася быць тым «класным хлопцам», які проста ўмее хутка маляваць. Майстэрства трэба набіраць, пакуль яшчэ не зусім стары.

*– Вучыліся не толькі ў Маскве, але і дома?*

– Напрыклад, у Раеўскага. І ў Пінігіна, які хоць і равеснік, але тады быў наперадзе.

А Масква – гэта перш за ўсё новы ўзровень прафесійнасці. Я паспеў паразмаўляць і паназіраць за працай Захарава, Хейфеца, Ганчарова. Асабліва важнымі сталі ўрокі Леаніда Яфімавіча Хейфеца. Родам з Мінска, дзяцінства правёў у гета, вельмі любіў і паважаў Беларусь.

*– Ён падтрымліваў сувязі з радзімай?*

– Некалькі разоў прыязджаў у Купалаўскі, рабіў пастаноўкі. Чалавек са школай Станіслаўскага ў чыстым выглядзе, маскоўская школа ў найлепшым сэнсе. Масква і Ленінград у XX стагоддзі былі тэатральнай Мекай, цэнтрам развіцця і прыцяжэння тэатральнай культуры Еўропы і свету. Што б хто ні казаў, але я памятаю трыумф гастроляў МХАТа і Малога тэатра ў Амерыцы.

*– Неўзабаве вы ўразілі Мінск спектаклем «Не мой» паводле кнігі Алеся Адамовіча. На думку крытыкаў – напэўна, самая моцная і кранальная пастаноўка пра вайну. Вынік: Нацыянальная*

*тэатральная прэмія, высокая рэжысёрская слава. У чым феномен поспеху той працы? Як здабытая слава паўплывала на мастацкую смеласць і глыбіню?*

– Здаецца, гэта адзіны выпадак, калі пераможцу не прызначала міністэрства, а выбірала галасаваннем сотня з лішнім прафесіяналаў. І калі ў сямі намінацыях спектакль атрымаў пяць статуэтак, чыноўнікі абурыліся. З іхнай логікі, усе мусяць мець славу: трошкі Бабруйск, трошкі Пінск, трошкі Магілёў… Бо «очань харошая» наша сінявокая Беларусь у цэлым! Астатнія таксама «харашо работаюць», а не толькі Купалаўскі!

Я вельмі рады, што ў маім жыцці здарылася такая вось праўда – не па разнарадцы.

Хоць сапраўды, знешне тады шмат чаго змянілася: прызначылі мастацкім кіраўніком Тэатра беларускай драматургіі, пачалі размаўляць з паважлівасцю… Але ведаеце што? Я ж унутры застаўся той самы. Не адкрыў у сабе нічога новага. Проста ў нейкі момант мяне заўважылі, вось і ўсё. А я працягваў рабіць спектаклі, якія адчуваў сэрцам, болем, сваёй эмацыйнасцю.

*– Не зусім пагаджуся: звычайна лаўры ўмацоўваюць веру ў сябе, дадаюць энергіі. Або, наадварот, служаць дурную службу – кайф спыняе развіццё… Што ў вашым выпадку?*

– Мне стала лягчэй. Упэўніўся: трэба быць самім сабой. І нікога не капіраваць. Ёсць такое паняцце: тэатральная мода. З'яўляецца модны рэжысёр (напрыклад, Кірыл Сярэбранікаў), і пад яго пачынаюць малаціць спектаклі. Я заўсёды мучыўся гэтай праблемай. Бачыў: у капіравальшчыкаў нічога не атрымліваецца. Толькі тады маеш шанец быць зразуметым, калі гаворыш тое, што сам адчуваеш, а не перадзіраеш у кагосьці. Тут вялікага адкрыцця няма, але праблема як была, так і засталася.

*– Што да тэмы моды, дык яна выяўляецца і ў выбары выкліку. Выклік – гэта п'еса. На якой спыніцца? Касяк плыве вунь*

*у тым кірунку, а табе не хочацца. І што тады? Спрацоўвае інтуіцыя?*

– Важная не мода: тут дарэчы іншае – актуальнасць. Гэта можа быць і не сучасная п’еса, але калі яна раптам пачынае пульсаваць во цяпер, то і стане выбарам. Няхай гэта будзе Шэкспір – абы з тэмай, што адгукаецца сённяшняму дню.

Аднак маем на ўвазе нюансы. Ёсць цяпер так званы дакументальны тэатр. Раней называлі публіцыстычным. П’есы для яго пішуцца метадам вербацім [ад лац. verbatim – даслоўна] – выкарыстоўваюцца неадрэдагаваныя словы і рэальныя жыццёвыя маналогі ва ўсёй іх прыгажосці і «безобразии». Цікава, але скажу шчыра – не маё. Я не хачу ісці ў чысты дакументалізм. Для мяне тэатр усё ж фантазія, жыццё духу, а не проста выклад фактаў. Ён не факталогія, а жыццё чалавечай душы. Таму актуальнасць можна знайсці і ў Дастаеўскага, і ў Караткевіча, які памёр амаль паўстагоддзя таму.

– *У гэтым сэнсе, напэўна, цікавыя інтэрпрэтацыі «Караля Ліра» рознымі трупамі, школамі.*

– Ну, вось што ў ім несучаснага? Бацька і тры дачкі. Абсалютна сённяшняя гісторыя. Яна паўтараецца тысячаразова: здрада, вернасць, боль, адказнасць. Вечная тэма. Пытанне толькі ў тым, як паставіць. Можна зрабіць махрова, а можна так, што да слёз. Таму «Кароль Лір» – вельмі сучасная гісторыя. У ёй амаль няма палітыкі, але – сям’я, адносіны, чалавечыя сутыкненні. Тое, што назаўсёды.

А калі мы цяпер у Варшаве, даводзіцца выбіраць матэрыял, максімальна акрэслены сённяшнім днём. Бо мы ў чужой краіне, іграем для беларускай публікі. Яе не так і шмат, яна вярнулася з-за кратаў, уцякла ад рэпрэсій. І людзі прыходзяць не проста паслухаць беларускую мову – хочуць убачыць тое, што ім баліць. Таму ў рэпертуары «Зэкамерон» і «Экстрэмісты», фантазійныя «Гусі-людзі-лебедзі» па Бахарэвічу. Але ўсё – пра Беларусь.

*– І адначасова вы – не дакументальны тэатр? Хіба тут няма адгалоску той плыні?*

– Усё ж ёсць водгук… Што да Цімафеевай, што да Знака – абедзве рэчы ў абсалютна публіцыстычным, дакументальным рэчышчы. Мы нават баяліся спачатку, што яны крыху пра адно і тое ж, але выйшла па рознаму. «Экстрэмістаў» паставіў я, «Зэкамерон» – польскі рэжысёр Войцех Урбаньскі.

## Яны не ідыёты. Сволачы – так, але зусім не дурні…

*– Тэма выбару духу ў часы не толькі савецкія, але і лукашэнкаўскія: хочаш паставіць тое, што гаворыць з табой, але яно не стасуецца з пазіцыяй сістэмы. Як даводзілася абараняць сваё, свабоду мастацтва?*

– Я кіраваў дзесяць гадоў. Амаль дзевяць першых ставіў тое, што хацеў: ішло гладка. Цэнзура была, але такая – інтэлігентная, мяккая… П'есы беларускіх аўтараў прымалі без праблем. Можа, з нейкімі хмыканнямі, але без забароны. Усё змянілася пасля выбараў. Тады і пачалося: «Гэтага нельга ставіць… І той выпаў з абоймы…». Здымалі нават пастаноўкі, зробленыя яшчэ ў час адлігі. Закрылі «Сірожу» Чарняўскай, «Тры Жызэлі» Курэйчыка, «Доктара Рауса» Марціновіча. Па чарзе.

А як мяне звольнілі, наагул адны навіны: «Гэты спектакль закрыты. І гэты. І гэты…» Рэпертуар амаль не застаўся.

*– А ранейшае гладкае стаўленне апарату да вас – ад прыязнасці? Ці проста «такі час»?*

– Магчыма, і ад прыязнасці таксама. А можа, усё прасцей: мала хто пнуўся паказваць свой звярыны твар. Бо хочацца выглядаць інтэлігентна. Прыходзілі, выклікалі і «раілі»: «Вось гэтае слова прыбярыце, вось тое…» Напрыклад, калі ставіў «Не мой» у Купалаўскім, папрасілі выкінуць эпізод, дзе партызаны

здымаюць гадзіннік і боты з героя. Гэта было ў Адамовіча, ён усё падрабязна апісваў. Але я прыслухаўся, каб не закрылі ўвесь спектакль.

Дробныя вымушаныя хітрасці дазвалялі захоўваць галоўнае. П’есу вярталі з міністэрства цалкам у чырвоных «указіўках» – «паправіць». Для прыліку нешта карэктаваў у пары месцаў, паказваў і чуў: «Ай, херня, хай ідзе». Час, калі яшчэ трапляліся «добрыя дзядзькі».

*– Нават у чыноўнікаў жыве ўяўленне пра тэатр як маральную інстытуцыю – і гэта іх нейк стрымлівае?*

– Яны ж вучыліся ў інстытутах, ім казалі, што тэатр – гэта культура, што гэта добра. Не думаю, быццам вымацюкаецца, як пачуе словы «спектакль», «пастаноўка»… Яны ж «нармальныя» і проста хочуць, каб тэатр быў «харошы», каб працаваў, але не «буяніў». Доўгае рэха савецкай сістэмы. У сямідзясятыя гады шмат яркіх тэатраў працавала, але нікога не саджалі. Хіба што Любімава, але ўжо ў пераломны час. Астатніх паўшчуваюць, яны рэзкія словы прыбяруць у маналогах-дыялогах герояў – і ўсё. Так і трымалася, пакуль не прыйшлі іншыя часы. Мяне проста звольнілі, без тлумачэння, проста сказалі: «Спасіба, дасвіданне».

*– Не дзіва: грамадзянская пазіцыя проста на сцэне, як у той лазні: бяры голенькага!*

– Ад мяне іншага стаўлення не дачакаліся б, даўно раскусілі… Хоць апошні год выбіраў максімальна нейтральныя п’есы. Напрыклад, французскую «Вецер шуміць у таполях» – пра трох старых. Каб толькі дазволілі. Але і яе падазрона чыталі: «А гэта, калі яны абараняюць сваю пляцоўку – тут не пра Беларусь, якая адстойвае незалежнасць?» – «Вы што, звар’яцелі?» – адказваю.

Прыйшлі на прэм’еру: палітыкі сапраўды не ўбачылі. Затое закалола іншае: у фінале трое здымаюць кіцелі – і двое ў белых сарочках, адзін у бардовай. Прысуд: «Вы паставілі

бел-чырвона-белы фінал!» Прыйшлося перашываць шмаццё. Ну, вось так. У іхнага страха вочы звышпільныя.

*– Бачаць нават тое, чаго няма?*

– Менавіта. Але спектакль ідзе дагэтуль. Там няма палітыкі, ёсць стаўленне да жыцця. Гэта была мая апошняя пастаноўка.

Прыдумаў такі цікавы прыём: зрабіў два акцёрскія склады – маладых і пажылы. Гэта не кіно пра Бонда, таму загадаў: «Не змешваць!» Бо старэйшая тройка – рэалістычная, а другая – з элементамі буфанады, постмадэрнізму. Пасля мяне маладых звольнілі. І цяпер ідзе адзін варыянт… Такая гісторыя.

*– Угляданне ў бытавыя сюжэты, дэталі, дробязі, вышукванне «схаваных пагроз» – новая оптыка «культурных» чыноўнікаў?*

– Не хацеў бы рабіць з іх дурняў. Яны не ідыёты. Сволачы – так, але зусім не дурні. Гэта савецкі светапогляд, перанесены ў сёння. Цяпер ідзе сутыкненне дзвюх цывілізацый – еўрапейскай і азіяцкай. Разлом па Беларусі і Украіне. Альбо цывілізацыя, альбо антыцывілізацыя. І калі служыш апошняй, то робіш усё, каб было менавіта вось так, «па-партыйнаму». Па-ўсходняму.

Мне здаецца, большасць у такіх умовах гібка прыслужваюць не ад сваіх, насамрэч, перакананняў, а за грошы. Людзі часта маладушныя: дзе плацяць, там і ўгодліва мітусяцца. А калі дэкарацыі памяняюцца, скажуць, як у дзевяностыя: «Я быў у партыі, каб хутчэй разбурыць таго монстра». Такое ўжо чуў і, спадзяюся, яшчэ пачую.

## Мы не хацелі палохаць уладу, але і сябе не маглі схаваць. Вось сцягі з мовай і паплылі па праспектах

*– Вы ўсё жыццё на беларускамоўных сцэнах: Купалаўскай, РТБД. Як выглядае канкурэнцыя з рускімі тэатрамі? Беларуская публіка дзялілася паводле моўнага прынцыпу?*

– Добрае пытанне. Ніхто ніколі не задаваў. Але такое сапраўды ёсць.

У Мінска – асаблівы феномен: залы заўсёды перапоўненыя і, здаецца, публіка цягнецца да беларускай мовы. Але хочаш паставіць на ёй спектакль у іншым горадзе, адхрышчваюцца як ад бяды: «Не-не-не!»

У сталіцы – традыцыя, аўра, публіка. Хапае людзей, якім не важна, на якой мове, галоўнае, каб быў акт мастацтва. Калі яго няма на беларускай сцэне, але ёсць на рускай, яны пойдуць туды.

А ў абласцях, паўтару, гісторыя наадварот: «На трэці спектакль ніхто не прыйдзе, калі ён па-беларуску». Такая праўда.

*– Патлумачце сітуацыю. Вось рэгіёны, дзе яшчэ зусім нядаўна калі не беларуская мова, дык дыялект. Здавалася б, там мусяць цягнуцца да свайго, яно бліжэйшае. А ўсё наадварот. Сталіца, куды шмат рускіх панаехала – на МАЗ, МТЗ, «Інтэграл»… Але яны не перабілі цікавасці тутэйшых да роднага слова. Хаця, па ідэі, магло быць інакш. Чаму так стала?*

– Нядаўна да мяне трапіла карта Беларусі першай паловы XX стагоддзя. Нібыта ўсё і так ведаў, але калі раней пазнанае ўбачыў разам на адным аркушы – валасы дыбам. Беларусь 1919 года – гэта вузкая палоска зямлі з Мінскам, Слуцкам, можа, з Бабруйскам, з некалькімі Старымі Дарогамі. На поўначы – Плешчаніцы, і на гэтым – варожая з усіх бакоў мяжа. Вось і ўся першая савецкая Беларусь.

Заходняя частка паланізаваная: Гродна, Брэст, Івацэвічы. Усходняя – далучаная пазней: Віцебскі і Магілёўскі рэгіёны сталі Беларуссю толькі ў 1924 годзе. Да таго тут была Расія. Мой бацька, магілёвец, паводле карты нарадзіўся ў ёй. Яшчэ горш – Гомельшчына: яе далучылі толькі ў 1926-м.

Вось і атрымліваецца: Беларусь, якая была ў пачатку XX стагоддзя, – толькі вузкая палоска зямлі, дзе людзі

гаварылі па-беларуску. А далей – альбо русіфікаваныя, альбо паланізаваныя гарады. Цяпер, дарэчы, таксама рускамоўныя.

Калісьці ў Гродне ў шасцідзясятых гадах я чуў польскую мову, але ні разу – беларускай. У Брэсце таксама: вайсковы гарадок, казармы, рускае пасяленне. Гомель – абсалютна ўкраінска-рускі. Я там ставіў спектаклі на беларускай мове – ведаю, што кажу. Прыйшлі, паглядзелі – і ўсё. Морды крывыя, гавораць з акцэнтам, але гэта акцэнт не беларускай, а рускай мовы.

Бацька казаў: «Мы беларусы́», з націскам на апошні склад.

*– Як трактары́...*

– Тут мой боль. Калі гэта і не адказ на пытанне, то ўсё ж праўда. Самы беларускамоўны горад у Беларусі – Мінск. Вось маё цвёрдае перакананне.

*– Вы шмат гадоў пражылі ў Купалаўскім тэатры, дзе гучала Мова. І апісалі, што было па-за яго межамі. А потым – 2020 год. Вуліцы, на якіх яшчэ ў савецкі і лукашэнкаўскі час можна было пачуць роднае слова хіба ў кавярнях, а ў крамах за яго зыркалі спадылба... І раптам беларуская – ключом, кодам, сцягам, лозунгам для ўсяго горада. Чым была гэтая трансфармацыя? Чаму мова, якой саромеліся, раптам стала пазнакай свайго?*

– Я не палітык. Але скажу, як адчуваю. На пачатку пратэстаў не было бел-чырвона-белых сцягоў. Гэта нібы дамоўлена: мы проста супраць гвалту.

*– Так, напачатку выходзілі з белымі стужачкамі.*

– Як і прасілі. Але ўсё раней схаванае ўнутры вырвалася вонкі, бо мелася патрэбнасць у знаку супраціву. Людзі не хацелі палохаць уладу, але і не маглі схаваць сябе. І вось сцягі пайшлі праз увесь Мінск. Так і з мовай адбылося. Гэта ўсё натуральна, нібы дыханне.

## Атмасфера быдляцтва – гэта калі кажуць, што ты нікому не патрэбны, а ты ў адказ маўчыш

*– Добра. Тады – дух Купалаўскага тэатра за мяжой. Ці патрэбнае для гэтага адчуванне нейкага міфічнага Мінска?*

– Патрэбнае адчуванне радзімы. Без яго нікуды. Можна пражыць усё жыццё ў эміграцыі, але калі асімілюешся – забудзешся, хто ты. І тады ўжо не беларус. А калі застаешся прадстаўніком беларускай нацыі – то ёсць і Мінск, і Беларусь. Нельга адрэзаць сябе ад таго, што адбываецца там. І я ўпэўнены: стане дома як трэба – шмат хто вернецца.

*– Вы калісьці сказалі, што ў выгнанні тэатр становіцца гучаннем нацыі. Ці можа ён быць не толькі ўспамінам, але і будучыняй беларускай сцэны?*

– Мы жывём. Цяжка – і фінансава, і маральна. Але жывём. І не вяртаемся да старога рэпертуару. Мы не настальгуем, не іграем бясконца «Тутэйшых» ці «Паўлінку». Гэта ўсё добра, але трэба ісці далей. Мы шукаем новае гучанне ў сучаснай літаратуры. Калі мы назвалі сябе Вольнымі Купалаўцамі, – гэта адказнасць, а не проста назва. Мы не тэатр у звыклым сэнсе – мы група. Проста група Вольных Купалаўцаў. Свядомы выбар.

Радзіма – не пусты гук. Можа, гэта гучыць пафасна, але з узростам пачынаеш гаварыць тое, што сапраўды думаеш.

*– Калі вы кажаце пра новыя пастаноўкі – напрыклад, «Плошчу Перамогі» паводле Бахарэвіча, то як было працаваць над ёй на чужой зямлі?*

– Цяжкасці тут толькі тэхнічныя. Бо ніхто не прыходзіць правяраць, што ты робіш, нікому не трэба здаваць спектакль. Адно ўнутраны кантроль.

Ведаеце, можа, нават і правільна – мець цэнзара ўнутранага. Бо калі глядзіш, як некаторыя рускія зоркі тут, у цэнтры Еўропы,

на сцэне паўтары гадзіны мацюкамі крыюць… Ну, можна ўсё, але не ўсё трэба! Ёсць сцэна, ёсць жанчына на ёй, ёсць людзі ў зале. Мо я старамодны, але павінен быць межавы густ.

*– Аднак хамства і грубасць становяцца звыклымі: «пераможцы-2020» вярнулі краіну ў стан змарнелага калгаса. Беларусь быдлее? Адступае нават элементарная культура?*

– Не разумею, калі разумны чалавек гаворыць па-чалавечы, а потым раптам сыпле нецэнзурным. Гэта збівае ўспрыманне. Рэжым выцягнуў людское быдляцтва на святло, сфармаваў асяроддзе, дзе яму лёгка пачувацца нормай.

Памятаю сустрэчу Лукашэнкі з кінематаграфістамі: «Вас нету. Без вас мы пражывём». І яны сядзелі, патупіўшы вочы. Вось гэта і ёсць атмасфера быдляцтва: калі кажуць, што ты нікому не патрэбны, а ты маўчыш. І ўсё наша жыццё нібы выкінутае. «Вас нету» – вось дзе сутнасць.

*– Тады яшчэ адно пытанне. Калі «нас няма», то ці ёсць сёння сэнс ставіць тое, што калісьці забаранялася? Ці ёсць драматургі, творы, якія чакалі свайго часу?*

– Ёсць, але я не ведаю шмат. У Макаёнка, акрамя яго калгасных п’ес, заставалася нешта, што так і не пабачыла сцэны. У Усевалада Краўчанкі шмат ненадрукаванага. У Аляксея Дударава таксама былі рэчы, якія ён пісаў да лепшых часоў.

А цяпер новая хваля драматургаў. Іх мала хто ведае, але яны ёсць. Я бачу іх тэксты ў інтэрнэце – таленавіта, гэта ўжо іншая драматургія, другое пакаленне. Заўтрашні дзень. Таму я спакойны: у беларускага тэатра ёсць будучыня.

*– Калі з’явіцца магчымасць працаваць у Беларусі, то што б вы паставілі і дзе?*

– Ну, альбо ў Купалаўскім, альбо ў РТБД. Як карта ляжа. Адно дакладна – у беларускамоўным тэатры. А пастаўлю нешта з таго,

што ёсць у нашым сённяшнім рэпертуары: «Гусі-людзі-лебедзі», можа, «Плошчу Перамогі»… Мне здаецца, зараз не трэба вяртацца да пройдзенага даўно.

Бо цяпер на дварэ іншы час. Вось днямі адкрыў: я, мы, усе купалаўцы, – у расійскім вышуку па крымінальнай лініі. Якая метафара эпохі: акцёры – у спісе крымінальнікаў! Залюстрэчча, сон розуму. Чаго такога натварыў акцёр ці рэжысёр, што яго трэба шукаць з сабакамі па ўсім свеце? Слова сказаў? Гэта антыказка. Сюр. Не думаў, што дажыву датакога… І сапраўды, як кажуць, ад сумы і ад турмы не заракайся.

– *Цкуюць, што паганага не нарабіў?*

– Бо мусіў стаць падонкам, мукавозчыкам, азаронкам. Як не – вінаваты. Вось і ўся логіка.

– *А што для вас засталося святлом?*

– Тое мноства людзей з якасцямі, якіх, здаецца, у мяне самім няма. Годных, з верай, сумленных. Якія любяць радзіму і не баяцца нічога. Я такога ніколі не бачыў. Хіба што ў кнігах Быкава. А цяпер сустрэў у жыцці.

І таму я веру ў будучыню сваёй радзімы. Бо светлых людзей многа. І яны не дадуць Беларусі загінуць. Не дадуць прапасці. Калі Бог ёсць, ён не дазволіць гэтага.

Вось мой пазітыўны фінал.

# МАКСІМ ЖБАНКОЎ



Фота: В. Саўчыц

*Культуролаг, кінааналітык, медыяэксперт, культурны актывіст, выкладчык, журналіст.*

*Нарадзіўся ў Мінску 19 студзеня 1958 года.*

*Скончыў філасофскае аддзяленне БДУ, аспірантуру, абараніў дысертацыю. Спецыялізаваўся ў метадалогіі навуковага пазнання. Займаўся Новым часам, трансфармацыяй масавай свядомасці ў XVI–XVII стагоддзях. Выкладаў філасофію.*

*Стваральнік і вядоўца шэрагу аўтарскіх тэле- і радыяпраграм на «Радыё Свабода», «Радыё Рацыя», тэлеканале «Белсат», на якіх працаваў у 2004–2018 гадах.*

*Журналіст-фрылансер, рэгулярны калумніст і культурны аналітык рэсурсаў journalby.com, budzma.by, nmnby.eu (2005–2021).*

*Загадчык адзела культуры «Белорусской деловой газеты» (2003–2006).*

*Кіраўнік аддзялення журналістыкі Беларускага калегіюма (2013–2016).*

*Дацэнт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (2007–2014).*

*Стваральнік і вядоўца паэтычна-музычнага праекта Beat Cafe (2018–2019).*

*З 2008 года – рэгулярны аўтар аналітычнага выдання «Беларусский ежегодник».*

*З 2015 года – супрацоўнік сеткавага выдання «Белорусский журнал».*

*У 2020–2023 гадах – кіраўнік аналітычнай групы Беларускай рады культуры.*

*Выдаў дзве кнігі даследчыцкіх артыкулаў: «No Style. Белкульт между Вудстоком и “Дажынками”» (2015) і «SloMo. Хатняя крытыка культурнага дызайну» (2021).*

*Аўтар і вядоўца YouTube-праекта «ШокингКульт» (з 2021).*

*Аўтар і вядоўца YouTube-праекта «Сто год беларускага кіно» (з 2024).*

*Аўтар серыі аналітычных лонгрыдаў «Глюконат нации. Введение в новую культурную ситуацию» для рэсурсу reform.news (2025).*

*Сузаснавальнік, рэдактар і аўтар выдавецтва «Мяне Няма» (з 2023).*

*У студзені 2025 года сеткавыя каналы Максіма Жбанкова (Telegram, Facebook, Instagram) і YouTube-канал «ШокингКульт» прызнаны ў Беларусі «экстрэмісцкімі матэрыяламі».*

*У сакавіку 2025 года абвешчаны ўдзельнікам «экстрэмісцкага фарміравання».*

МАКСІМ
ЖБАНКОЎ

# ЖЫЦЦЁ ЯК ЖЫЦЦЁ, ТРАЎМАТЫЧНА ПРЫЎКРАСНАЕ

## Беларусь дзевяностых: ад кірмашу савецкіх абломкаў да эстэтычнай рэвалюцыі

*– Калі мы ўспамінаем беларускія дзевяностыя, паўстае спакуса бачыць іх або як сапраўднае нацыянальнае адраджэнне, або як хаатычны кірмаш на абломках імперыі, дзе падвальны постмадэрн і фэйсбучны фальклор зрабіліся галоўнымі сімваламі эпохі. А чым яны былі для вас?*

– Не столькі глабальным пераломам, колькі асабістай трансфармацыяй. Усё, што адбывалася з краінай, адгукалася перадусім ува мне.

Я – чалавек позняга савецкага пакалення, народжаны ў 1958-м. Мы былі падрыхтаваныя да калапсу імперыі: бачылі яе спарахнеласць і жылі ў стане таталітарнай несвабоды, дзе адзінай прасторай выратавання заставалася культура. Заходні рок-н-рол, клубнае кіно, самвыд, перакладная літаратура – яны фармавалі ідэнтычнасць. Гэта быў мой прыватны дысідэнцкі праект, дзе ўсё рабілася самотна і па-за межамі гучных супольнасцяў.

*– Але ж у той час у Беларусі ўжо існавала альтэрнатыўная музыка, інтэлектуальныя колы, вулічныя маніфестацыі. Як яны ўспрымаліся вамі?*

– Я бачыў маршы пад бел-чырвона-белымі сцягамі, углядаўся ў грозныя бэтээры на перакрыжаваннях. Але для мяне гэта выглядала хутчэй спектаклем, а не асабістай барацьбой. Я жыў у сваёй аўтаномнай дысідэнцыі, інтуітыўнай і эмацыйнай. І толькі праз сяброўскія сувязі з беларускамоўнай інтэлектуальнай супольнасцю пачаў адчуваць: слухай, а гэта ж таксама і пра цябе!

*– Хто ў той суполцы стаўся асабліва важным?*

– Канешне, гэта былі Валянцін Акудовіч, Ігар Бабкоў, Алесь Анціпенка… Потым калегі з «Радыё Свабода» і незалежнай

прэсы. Нечакана для сябе аднойчы зразумеў: мае найлепшыя сябры – спрэс беларускамоўныя. І ўсе апантаныя ідэяй новага нацыянальнага дызайну.

Гэта вабіла мяне перадусім як мастацкі праект, як эстэтычная рэвалюцыя. «Народны альбом», які я ўпершыню пакаштаваў тады, зачапіў не якасцю гуку, а прыгожай шчырасцю, кранальнай эстэтыкай.

*– То-бок вашая беларускасць прыйшла праз эстэтыку, а не праз палітыку ці філасофію?*

– Так. Я не ішоў да яе праз Абдзіраловіча або палітычныя лозунгі. Для мяне ўсё гэта адкрылася праз стыль мыслення, мастацкую сугучнасць і асабістыя кантакты. Там, дзе не было ні афіцыйнай свабоды, ні моцнай дзяржаўнай ідэі, паўставала ўласная зона адкрытасці – зона свабоды, якой не існавала больш нідзе. І гэта было пачаткам маёй асабістай беларусізацыі.

## Новае неба: па-за сцягамі, у прасторы душы

*– Каб зразумець асабістую трансфармацыю, давайце коратка: чым вы займаліся яшчэ перад дзевяностымі?*

– Шараговы савецкі выкладчык філасофіі. Скончыў філасофскае аддзяленне БДУ, трапіў у аспірантуру, абараніў дысертацыю. Універсітэт быў фабрыкай ідэалагічных праграмістаў, школай бюракратычнай думкі. Але я абраў іншы папулярны ў той час варыянт – сышоў у метадалогію навуковага пазнання. Займаўся Новым часам, трансфармацыяй масавай свядомасці ў XVI–XVII стагоддзях. Гэта мая ўнутраная рэзервацыя, прастора аўтаномнага мыслення, дзе не патрабавалася штодзень спасылацца на чарговы з’езд партыі.

*– Фактычна вы жылі ўнутры савецкай сістэмы, але шукалі формы партызанскай аўтаноміі?*

– Менавіта. І калі ў дзевяностых я сустрэўся з беларускай інтэлектуальнай супольнасцю – праз працу ў фондзе Сораса, праз

Беларускі калегіюм, праз «Свабоду» – мая асабістая дысідэнцыя сустрэлася з іх мадэлямі аўтаномнага існавання. Так, гэта была культура меншасці, культура ніш. Але яна бачылася неймаверна прыгожай і прывабнай. Нават не маючы дасканалай беларускай мовы, я адчуваў сябе ў ёй сваім чалавекам. Тутэйшым. Бо гэта было новае неба, якое адкрылася не праз колеры дзяржаўных сцягоў, а праз іншае вымярэнне экзістэнцыйнай незалежнасці.

*– Вы казалі пра філасофскае аддзяленне як кузню ідэалагічных кадраў. А сутыкаліся самі калі-небудзь з гэтымі «рэальнымі ідэолагамі»? З тымі, хто фармаваў правілы гульні і кантраляваў студэнцкае жыццё?*

– У мяне маці працавала ў Інстытуце філасофіі, яна іх ведала. Я ж бачыў толькі тое, чым жыў наш факультэт. І мы дакладна ведалі: побач заўсёды прысутнічае чалавек з органаў. Ён мог быць памочнікам дэкана, нібыта простым дзячком, але ўсе разумелі: дзядзька сочыць.

На аддзяленні філасофіі разам з намі вучыліся замежнікі: кубінцы, палякі, гэдээраўскія немцы. І вось у пачатку васьмідзясятых, калі ў Польшчы ўжо існавала «Салідарнасць», у нас цалкам спантанна паўстала сціплая студэнцкая ініцыятыва: напісалі зварот у дэканат, сабралі подпісы, патрабавалі дробных пераменаў у арганізацыі вучобы. Аднак той ліст прачытаўся як ідэалагічная дыверсія. Адразу сказалі: «Гэта палякі, гэта знешні ўплыў, агентура!» Пачалася сапраўдная аблава на ініцыятараў. Некаторых выгналі з універсітэта, аднаго тэрмінова забралі ў войска. Ён пасля хацеў аднавіцца, але адмовілі. І хлопец скончыў жыццё самагубствам: выкінуўся з шостага паверха галоўнага корпуса БДУ наўпрост на плошчу Леніна.

*– Што вынішчала кісларод студэнцкай атмасферы, якая, наадварот, мусіла шалёна бурліць жыццём?*

– Менавіта нязменная прысутнасць чагосьці цёмнага, варожага, небяспечнага. Ціск афіцыйнага жыцця з нязменнай патрэбай дэманстратыўнай лаяльнасці.

А ў новым інтэлектуальным асяроддзі, куды я трапіў пасля сыходу з БДУ ў 1994-м, не было той варожасці і недаверу. Людзі, натуральна, сабраліся вельмі розныя: з уласнымі амбіцыямі і забабонамі, авантурысты і балбатуны, мысляры і махляры, мудрацы ды прайдзісветы. Але гэта выглядала нармальнай жывой супольнасцю. У параўнанні з карцінай агульнага заняпаду афіцыёзу ды безнадзейным існаваннем у закладніках мёртвай імперыі, беларуская суполка была сапраўдным прыстанкам, утульным і камфортным. І хоць я разумеў, што яна мала здольная змяніць агульную карціну, для мяне асабіста гэта было крокам наперад, цалкам новым вымярэннем асабістага руху.

## Калегіюм як фабрыка новых сэнсаў

*– Але ў вашым коле былі асобы, якія стаялі блізка да практычнай апазіцыйнай дзейнасці. Напрыклад, Анціпенка, які разам з вамі працаваў у фондзе Сораса. Або Суша, што падтрымліваў «Народны альбом» і іншыя праекты. Вы гэта абмяркоўвалі, адчувалі ўплыў гэтых сувязяў?*

– Суша – гэта не толькі «Народны альбом», але і «Святы вечар», і «Я нарадзіўся тут». Усё тут важна, але для мяне асабіста палітыка заставалася нецікавай. Я не бачыў там свайго месца. І сыходзіў у калекцыянаванне дзіўных станаў свядомасці. Маёй палітыкай заставалася электрычная шыза.

*– А Беларускі калегіюм, гэтая ўнікальная з’ява ў нашай гісторыі: якая яго роля? І хіба яго можна атэставаць апалітычным?*

– Ён паўстаў пасля знішчэння фонду Сораса. І суполка, якая была вакол Анціпенкі, Акудовіча, Бабкова, сышлася ў новым фармаце. Місія Калегіюма палягала зусім не ў адкрытым палітычным

супраціве – гэта ўжо было немагчыма. Яна заключалася ў стварэнні новых механізмаў свядомасці. Адукацыйны праект фармаваў новыя сэнсы, новыя тэрміны, новыя інтэлектуальныя канцэпты. Фактычна невялікая арганізацыя працавала хіба як нацыянальная акадэмія, бо за кожным напрамкам там стаяла важкая культурная традыцыя і моцны хаўрус.

*– Гэта нешта кшталту «вынаходніцтва беларускасці»?*

– Так. Камуністычная ідэалогія памерла і пакінула татальную пустэчу. У яе ўвайшлі мы, вынаходзячы беларускую думку, беларускую філасофію. Даводзілі, што па-беларуску можна мысліць крытычна і кайфова. Можна перакладаць французскіх постмадэрністаў – і яны не толькі нічога не страцяць, а наадварот, набудуць новыя сэнсы. Гэта была тэрыторыя, дзе ўсё ствралася наноў, ад музыкі да філасофіі. І адсутнасць адзінага цэнтра рабіла працэс магутным выбухам: рок-музыка, часопіс «Фрагмэнты», Калегіюм, экранныя ініцыятывы, выдавецкія праграмы – усё працавала паралельна і ў розных вымярэннях. Паўставала матрыца сэнсаў постсавецкай нацыі.

*– Каб паказаць маштаб, можна прывесці лічбы? Колькі прайшло праз лекцыі і дыспуты Калегіюма? Хто з выпускнікоў стаў вядомымі асобамі?*

– Прасцей назваць тых, хто абмінуў нас. Напрыклад, практычна ўся сучасная школа перакладу заходняй літаратуры ў Беларусі – людзі з семінара Хадановіча пры Калегіюме. І гэта толькі адзін прыклад.

*– Выходзіць, тут не проста месца навучання, а пункт перамены свядомасці? Школа новага мыслення, якая праз асобаў стварала цэлы культурны кантынуум?*

– Праект будаваўся як жывая суполка. Суплёт асобаў. У літаратурна-філасофскім кірунку працаваў Акудовіч, у медыйным – мы з Анціпенкам, у перакладчыцкай майстэрні – Хадановіч. Вакол кожнага гуртаваліся адмысловыя сябрукі.

Кожны прыносіў свае мадэлі, свае бачанні. І з гэтага суплёту асобаў паўставала новая інтэлектуальная рэчаіснасць. Новая культурная сітуацыя.

## Кайфовая беларускасць і новыя тэрыторыі

*– Фактычна вы транслявалі прынцыпова іншае стаўленне да нацыянальнай культуры. Як гэта выглядала?*

– Мы займаліся трансляцыяй неакадэмічнага, несавецкага, некамуністычнага стаўлення да нацыянальнай думкі, традыцыі, культуры. Гэта была тэрыторыя закладання новай краіны і новай культуры. І тая энергетыка заражала: мы падсаджвалі моладзь на кайфовую беларускасць. Хаця насамрэч яны самі да гэтага далучаліся – траплялі да нас і хутка пачыналі пісаць уласныя тэксты, рабіць праекты.

*– Можаце назваць людзей, якія менавіта вось праз такое асяроддзе пачалі сваю дарогу?*

– Канешне. На журфаку ў мяне вучыліся нябожчык Аляксей Стрэльнікаў – выбітны тэатральны крытык, Паша Свярдлоў, які потым руліў у «Еўрарадыё», Сяргей Будкін, кіраўнік Беларускай рады культуры… І гэта толькі некалькі прозвішчаў. А яшчэ хтосьці далучаўся проста як вольны слухач. Былі невялікія групы, чалавек па дваццаць. Але – найлепшыя, самыя зацікаўленыя. Тыя, каму не хапала дзяржаўнай адукацыі. Мы прапанавалі іншыя мадэлі існавання, навыкі аналізу, перспектывы творчасці. І яны далей ішлі ўжо па-за межамі Калегіюма, але першасны імпульс атрымлівалі ў нас.

*– Вы працавалі адкрыта – ці ўсё ж асцярожна, у цяню?*

– Лепш было не свяціцца. Усё, што рабілі, магло выглядаць небяспечным для ўлады. Калі я працаваў у фондзе Сораса, то добра ведаў: нас слухаюць. Размаўляеш па тэлефоне – праз дзве секунды чуеш характэрны шчаўчок. Сувязь перабіваецца,

потым зноў аднаўляецца. Калега аднойчы нават не вытрымаў і ў трубку крыкнуў: «Таварыш маёр, дайце дагаварыць!» Гэта была натуральная рэальнасць: усе разумелі, што за табой сочаць, цябе могуць прыціснуць. Таму мы працавалі партызанскім спосабам. Ён і ратаваў. Да такіх маленькіх філасофскіх суполак лапы ўлады не дацягваліся. Быў шанец – і мы яго выкарысталі.

*– Якія напрамкі сталі найбольш істотнымі?*

– Працавалі аддзяленні філасофіі/літаратуры, найноўшай гісторыі, журналістыкі. І мы не проста агучвалі тэмы – мы стваралі іх.

Не было філасофскага слоўніка – пасля нас ён з'явіўся.

Не было перакладаў найноўшай актуальнай літаратуры – пасля нас яны былі.

Не існавала поля новай журналістыкі – пасля нас яно паўстала.

Мы фактычна былі падмуркам, на якім потым узвяліся амаль усе значныя праекты беларускай культуры.

*– Праз працу Калегіюма выхавалася цэлае пакаленне, якое неўзабаве пачало рабіць сваё.*

– Менавіта. І гэта адбывалася ў сітуацыі, калі афіцыйная культура памерла. А мы прыносілі новыя словы, новыя формы і новыя сэнсы ў месца, дзе спрабавала пасяліцца пустэча.

## «БелГазета», «БДГ» і школа – дыспут дыялогаў пра культуру

*– А як вы асабіста прыйшлі да аналізу культурнага поля?*

– Калі пачаў пісаць аналітычныя тэксты. Да таго быў меламанам і кінаманам, ладзіў з калегамі ў Палацы прафсаюзаў паказы замежных фільмаў разам з амбасадамі. Патрэбна было піярыць іх у незалежнай прэсе, я пачаў пісаць. Спачатку пра кіно, потым пра музыку, літаратуру. І раптам убачыў: адбываюцца вялікія

перамены, выдатныя справы, прыйшла свежая генерацыя творцаў – а пра іх амаль ніхто анічога ўцямнага не кажа. Гэта быў мой чэлендж: зрабіць новую культуру бачнай.

*– Мелі нейкія арыенціры, прыклады?*

– На мяне моцна паўплывалі тэксты Ігара Бабкова і Валянціна Акудовіча. Гэткае мысленне ў дзеянні – афарыстычнае, прыгожае, рок-н-рольнае. Я зразумеў: філасофскіх трактатаў не напішу, вершаў – таксама. Але ў аналітычнай эсэістыцы магу быць важкім.

*– І якім быў ваш дэбют?*

– Тэкст «Культура смецця і смецце культуры» для часопіса «Фрагмэнты». Я спрабаваў разабрацца, чаму не працуе афіцыйная – і што можа альтэрнатыўная. Бабкоў пераклаў напісанае на беларускую, дадаў некалькі трапных тэрмінаў. Так пачалася мая адысея культурнага аналітыка. Але доўгі час я заставаўся самотным: не было іншых аўтараў, здольных суразмерна асэнсоўваць сітуацыю. Гэта сапраўдная самота самурая: праца, якую трэба рабіць, бо ніхто іншы за яе не браўся.

*– Ці не ўзмацнілася тая самота, калі сталі загадваць аддзелам культуры ў «БДГ»?*

– У журналістыку я трапіў крыху раней. Спачатку проста прыбіла да хлопцаў з «БелГазеты». Там намеснікам рэдактара быў Саша Міхальчук. Мы збіраліся з ім і агульным сябрам Андрэем Фядорчанкам у кавярні славутай крамы «Каравай» на плошчы Перамогі, размаўлялі, абменьваліся фільмамі. І вось аднойчы Міхальчук кажа: «А давайце вашы размоўкі пра кіно друкаваць на апошняй старонцы газеты!» Так мы з Андрэем пачалі рабіць праблемныя кінадыялогі. Прыгожа і цікава. Нас пачалі пазнаваць на вуліцах.

*– Але вы адтуль пайшлі?*

– Так. Фядорчанка ажаніўся і з’ехаў за мяжу, у мяне здарыўся канфлікт з рэдактарам Высоцкім. Так трапіў у «БДГ».

Легендарны рэдактар Пётр Марцаў даў мне поўную свабоду. Давер яго быў абсалютным і натхняльным. Я пачаў будаваць аддзел культуры па-свойму: прыцягнуў туды Будкіна, Стрэльнікава, Свярдлова. Віця Пазнякоў пісаў пра музыку. Даша Сітнікава і Таня Чудак рэцэнзавалі кніжкі. Склалася вельмі моцная і цікавая каманда.

*– І што ў выніку ўдалося зрабіць? Чым ганарыліся?*

– Мы фактычна стваралі культурны праект новага ўзроўню. Паспрабавалі пракачаць культурніцкую тэму на новых хуткасцях, распрацаваць новую стылістыку. Гэта было крэатыўна, спрэчна і выбухова, дагэтуль прыемна ўзгадваць.

*– Пра што менавіта вы пісалі? Што зачароўвала, а што выклікала крывую ўсмешку? Якія фарбы таго часу?*

– Хочаце абагульненняў? Калі ласка! Вось некалькі пойнтаў.

Па-першае – абсалютная непрадказальнасць сітуацыі.

Па-другое – адкрытая прастора магчымасцяў.

Па-трэцяе – складанае ўзаемадзеянне розных культурных плыняў.

Было відавочна адно: мы пастунова аддзяляемся ад імперыі, фармуем свой адмысловы свет. Можна ўзгадаць метафару з фільма Кустурыцы Underground: героі п’юць, танчаць, спяваюць, не заўважаючы, што кавалак зямлі, на якім яны стаяць, ужо аддзяліўся і плыве па рэчцы. Вось так і беларуская культура: мы жылі жыццё і мроілі мроі. Займаліся сваімі маленькімі праектамі, не заўважаючы, што ўсе яны разам складаюцца ў сыход з маскоўскацэнтрычнай залежнасці.

Гэтае развітанне з імперыяй было адначасова ярка эмацыйным і трывожным. Бо побач з нашым праектам «Беларусі мары» існавалі праекты ўлады, Масквы, еўрапейскай бюракратыі. Таму разам з кайфам з’явілася новая няўпэўненасць. Замест савецкай

маналітнасці прыйшла непрадказальная шматвектарнасць. Канцэптуальная вайна культур. Адначасова адбываліся спробы новай эстэтыкі, новага светапогляду, новай культурніцкай дыпламатыі. І ўсё гэта без агульнага цэнтра кіравання.

## Асобы і падзеі эпохі

*– Можаце назваць людзей і творы, якія сталі сімваламі таго часу?*

– Безумоўна, Валянцін Акудовіч – хросны бацька беларускага інтэлектуалізму. Ягоныя «Мяне няма» і «Код адсутнасці» – кнігі, за якія ў нармальнай краіне ставяць помнікі пры жыцці. А як не ўзгадаць «Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнні ру[і]наў» і «Адама Клакоцкага» Ігара Бабкова?

Першыя кнігі Андрэя Хадановіча – выбух дзёрзкіх эмоцый і вербальнага піжонства.

У кіно – «Акупацыя. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі: эпахальны сыход ад мадэлі банальнага «Партызанфільма».

У музыцы – беларускі рок з яго шурпатай шчырасцю. Лявон Вольскі, Міхал Анемпадыстаў і ўся брыгада «Народнага альбома».

Але разам з тым – неймаверны працэнт недасканалых рэчаў. Мы ўсе былі дылетантамі, ніхто не выкладаў нам новай беларускасці. Мы самі яе стваралі. Працэнт памылак, папраўдзе, быў вельмі вялікі, але акурат праз гэты хаос адбываўся пошук і здараліся цуды.

Валянцін Акудовіч трапна заўважыў: магчыма, галоўнае, што адбылося з краінай, – гэта мы. Супольнасць незалежнага мыслення і культурніцкага актывізму. Творцы новых мапаў сусвету і дызайнеры скразнякоў існавання.

## ЕГУ: досвед свабоды і аўтарытарызму

*– Вы называеце ЕГУ адным з ключавых эпізодаў свайго жыцця. І няпростых. Што там адбылося?*

– Канцэптуальна ЕГУ быў сугучны лініі Беларускага калегіюма – як спроба недзяржаўнай еўрапейскай вышэйшай адукацыі. Але стратэгічна ён застаўся ў палоне аўтарытарных мадэляў – савецкіх па форме, калгасных па сутнасці. Віленскі ЕГУ пазіцыянаваў сябе то як беларускі ўніверсітэт у выгнанні, то як літоўская прыватная ўстанова. Гэтая двaістасць фармавала і маё стаўленне: з аднаго боку – выдатныя студэнты і поўная свабода ў аўдыторыі, з другога – дзіўнае, часта варожае стаўленне інерцыйнай адміністрацыі.

Мы з сумленнымі выкладчыкамі-актывістамі, такімі як Вольга Шпарага ці Андрэй Лаўрухін, пастаянна сутыкаліся з гэтымі бар’ерамі. У 2014 годзе дэмакратычна абраны Сенат ЕГУ – і мы ў тым ліку – спрабаваў абараніць акадэмічныя свабоды і правы супрацоўнікаў. Адміністрацыя ў выніку яго проста разагнала і выкінула нязручных разумнікаў за борт. Элітная прафесура абрала лаяльнасць кіраўніцтву замест салідарнасці. Гэта была ў мініяцюры тая ж схема, якую Лукашэнка правёў у краіне ў 2020-м. Таму ў мяне да ЕГУ застаюцца амбівалентныя пачуцці: прафесійны патэнцыял студэнтаў – вялікі, але інстытуцыйная крывадушнасць – тыпова беларуская.

*– Тыя студэнты – ужо іншае пакаленне, выхаванае ў іншых рэаліях. Ці яны таксама шукалі не проста веды, а патрэбу ў свабодзе? Якая не ўпісваецца ў рамкі беларускіх універсітэтаў і праграм?*

– Я з моладдзю працаваў заўсёды, і студэнты ЕГУ прынцыпова не адрозніваліся ад калегіюмных. Было бачна, як у іх фармуецца асабістая свабода. Яна не даецца інстытутамі, яе можна толькі ўзяць. І яны яе бралі. У гэтай моладзі ёсць неймаверная

ўнутраная прыгажосць, актыўнасць, незалежнасць мыслення. Многія прайшлі праз палітычны супрацiў – і гэта, пэўна, таксама вынік нашай адукацыйнай працы.

Але выкладанне заўсёды непрадказальнае: ты аддаешся на сто працэнтаў, а вяртаецца добра калі дваццаць. І ўсё ж яно таго варта. Мы, творчыя меншасці, гадуем тую самую творчую меншасць. Іншага шляху няма.

## Беларусь як недабудаваны праект

*– Вы не раз казалі: Беларусь патрабуе дадумвання, дабудовы. Чаму? Вінаваты выключна славуты персанаж, які адзіны, хто «чытаў быкаўскія вершы»?*

– Лёгка ўсё зваліць на адну асобу, але гэта будзе няпраўдай. Лідары робяць тое, што дазваляе грамадства.

Беларусь недабудаваная, бо заблакаваныя крыніцы развіцця. На пачатку дзевяностых краіна мела шанец трансфармавацца ў паўнавартасную еўрапейскую нацыю. Але з умацаваннем аўтарытарнага рэжыму ўсе магчымасці прыпыніліся.

Забілі незалежныя медыя.

Сістэма адукацыі засталася савецкай і штампуе пакаленні без досведу інтэлектуальнай свабоды.

Незалежны бізнес прыціснулі.

Шматпартыйная сістэма ператварылася ў дэкаратыўную шыльду нязменнай улады.

Рэжым будуе схемы лаяльнасці, а не механізмы крэатыўнага пошуку.

Няма рэсурсаў для канфліктнасці, дыскусійнасці, шматзначнасці.

У выніку Беларусь на доўгі час завісла на паўзе, у рэжыме stand by: чакае чарговага сігналу і слаба здольная ствараць іх сама.

Гэта і ёсць сімптом недабудаванага праекта.

*– Вы кажаце: Беларусь існуе як патэнцыйная нацыя, якая яшчэ не развіла сябе да канца. Што маеце на ўвазе?*

– Як казаў Міхал Анемпадыстаў, «няўпэўнены стан, незавершаны лад». Недаадукаваных і выціснутых за мяжу інтэлектуалаў. Разумнікаў, што не маюць рэальных рычагоў уплыву. Зрэшты, можа, і добра, што не маюць, бо невядома, што б яны накруцілі. Але агулам вынік адзін: слабасць культурніцкага жыцця, кволасць мыслення, няспеласць кіравання. Нуль перспектываў, скокі на месцы.

## Два ўзроўні часу: 1996 і 2018

– У лепшым выпадку мы жывём у 2018 годзе, у горшым – яшчэ ў 1996-м.

*– А можаце расшыфраваць, што за гэтымі рубяжамі-знакамі?*

– 2018-ы – сітуацыя кануна катастрофы. Адносна камфортная эпоха для крэатыўнага класа: малы бізнес, адукацыйныя праекты, лаўкосты, грамадзянскі актывізм, літаратурныя ўзнагароды, фасонныя кавярні, вышыванчны патрыятызм. Улада давала сігнал: не лезьце ў палітыку – і мы вас не кранём. Так і жылося культурнай меншасці, пакуль не надышоў фатальны 2020-ы.

А 1996–1998-ы – час прывідных праектаў, рамантычны ўздым нацыянал-дызайну. Вось дакладна «Незалежная Рэспубліка Мроя»! Самадастатковы рух думкі. Гэта былі зоны супольнай галюцынацыі, візіі немагчымага. Акудовіч, Баярын, Мацкевіч, Тодар Кашкурэвіч – кожны гуляў у свае канцэпты, не чакаючы іх сацыяльнай рэалізацыі.

І Акудовіч абсалютна меў рацыю, калі ў сваім тэксце «Без нас» зрабіў жорсткую выснову: краіна жыве па-за межамі нашых схемаў, а мы думаем па-за межамі яе рэальнасці. Гэтая

сітуацыя захавалася і сёння. Нашы тэксты – нібы спеў у фортку: ці пачуюць, ці не? Але спяваць мы ўсё адно мусім. Бо без тых спеваў ужо немагчыма.

*– Гэта падвешанасць, боўтанне ў космасе без разумення, куды ляціш: як з такім жыць далей? Ці ёсць адказ?*

– Трэба вучыцца любіць уласную няўтульнасць. Любіць няпэўнасць і невідавочнасць. Яны пазбаўляюць ілюзій, прымушаюць быць моцнымі. Усё, што мы плануем, не спраўджваецца. Рэчаіснасць заўсёды выпраўляе нашы мары, перакладае пажаданае на магчымае.

Інтэлектуальная праца – шлях без канца, асалода Сізіфа. Не таму, што калісьці здолееш спыніцца, а таму што гэта праца назаўсёды. Такі лёс. Мы абавязаныя мысліць, быць нязручнымі і спрэчнымі. Гэта стварае магчымасць руху.

*– Можа, уся справа ў тым, што нашае пакаленне пасля 1996 года страціла крылы? Мы трыццаць гадоў штурхаем камень – і нічога?*

– Зноў спакуса ўсё звесці да палітычнага анекдота. Але не так усё проста. Калі нават дачакаемся змены першай асобы – ці прыйдзе гармонія? Не. Будзе татальны фестываль новых войнаў: перадзел маёмасці, барацьба за ўладу, захоп фінансавых крыніц, культурныя спрэчкі, плыні хлуду, выбух непрадказальнага. Прагнозы хлусяць. Праекты – мана.

Таму інтэлектуальная праца – не пра канчатковыя вынікі, а пра здольнасць ствараць нязручнасць, спрэчнасць, невідавочнасць. Як робіць, напрыклад, Уладзімір Мацкевіч: ён часта кажа рэчы, з якімі я нязгодны, але ўдзячны яму за сам факт выказвання. Бо гэта стварае нагоду для думкі.

*– Значыць, галоўнае не спыняцца і штурхаць камень далей?*

– Менавіта так. З гэтага не вынікае, што не трэба спрабаваць. Дзякуючы нашай працы мы захоўваем сябе як інтэлектуальную

меншасць, ролевую мадэль для новай генерацыі. І ёсць яшчэ прыватны кайф: прыгожа быць нязручным, істотна быць няправільным, кайфова быць спрэчным.

Тут палітра магчымасцяў, якой мы жывём з дзевяностых. Мы дагэтуль дазваляем сабе мысліць і быць істотнымі. І нават калі паўстаюць сумневы ў нашай важкасці – гэта натуральна. Бо вартасць у тым, каб стаць падмуркам. А калі ёсць падмурак – можа вырасці што заўгодна.

## Беларусь, транзіт, танец у пустэчы

*– У вашым выдатным лексіконе шмат назоўнікаў і дзеясловаў з пачаткам неда-: недадумалі, недарабілі, недапісалі… Але, можа, у гэтым і ёсць нашая беларуская асаблівасць? Можа, мы здолеем зрабіць з недададзенасці сваю эстэтыку?*

– Зноў прыгадаю зонг з «Народнага альбома»: «Я стаю на мяжы, я іду па нажы…». Гэта і ёсць беларуская транзітыўнасць. Мы нацыя на ростанях ды скрыжаваннях, у полі спрэчных уплываў, знешніх трэндаў, культурных сінтэзаў. І гэта моцная пазіцыя.

Нам не варта будаваць ізаляваную фартэцыю. Наадварот – трэба адкрывацца, засвойваць уплывы, ствараць мазаічную ідэнтычнасць. Як робяць амерыканцы: іх сіла – у міксе рэсурсаў ды плыняў, які ўзмацняе, а не разбурае тваю існасць. Беларусь таксама можа існаваць у фармаце адкрытай, дыскусійнай, супярэчлівай супольнасці. Таму я кажу: дыяспара – не страта свайго, а яго экспансія.

Траўма эміграцыі – гэта магчымасць новага пачатку.

Мы вяртаемся ў сітуацыю пачатку дзевяностых: танец у пустэчы, палёт без спадахрону, але з прасторай для дзеяння. Гэта небяспечна і цудоўна адначасова.

Частка II

# ЗАХАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ

# НАТАЛЛЯ ДУЛІНА



Фота з асабістага архіва Н. Дулінай

*Нарадзілася 15 лістапада 1964 года ў Мінску.*

*Скончыла звычайную школу. З дзяцінства адчувала асаблівую схільнасць да рускай мовы і літаратуры, але паступіла ў тэхналагічны тэхнікум. Разам з вывучэннем спецыяльнасці праходзіла праграму старэйшых класаў і адчула моцную цікавасць да замежных моў.*

*Паступіла ў Мінскі інстытут замежных моў толькі з трэцяга разу. Скончыла яго са спецыяльнасцю «Выкладанне іспанскай, англійскай і італьянскай моў».*

*Выкладала італьянскую мову ў сваёй альма-матар.*

*У 1997/1998 навучальным годзе атрымала стыпендыю ўрада Італіі і паўгода вучылася ў Італіі. З 1999 года з яе ініцыятывы было адкрыта аддзяленне італьянскай мовы як асноўнай спецыяльнасці на перакладчыцкім факультэце. Сама распрацавала навучальную праграму і выкладала амаль усе дысцыпліны і спецкурсы. У 2016 годзе ўрад Італіі ўзнагародзіў Наталлю Дуліну званнем афіцэра ордэна «Зорка Італіі» – за ўнёсак у распаўсюд італьянскай мовы і культуры, а таксама за ўмацаванне беларуска-італьянскіх культурных сувязяў.*

*У 2020 годзе, пасля 29 гадоў працы, была звольнена «за парушэнне ўмоў працоўнага дагавора», бо далучылася да агульнанацыянальнага палітычнага страйку і адсутнічала на працоўным месцы. У лістападзе 2020 года, на наступны дзень пасля звальнення, Наталлю Дуліну затрымалі і асудзілі на 14 сутак адміністрацыйнага арышту.*

*Пасля гэтага выкладала італьянскую мову, працавала на камерцыйных курсах і чытала дыстанцыйныя спецкурсы італьяністыкі ў Патсдамскім універсітэце.*

*У 2022 годзе тройчы, з невялікімі перапынкамі, адбывала 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Восенню таго ж года супраць Наталлі Дулінай распачалі крымінальную справу з абвінавачаннем ва «ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах» (студэнцкія пратэсты 2020 года) і «садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці» (інтэрв'ю СМІ, абвешчанаму дзяржавай «экстрэмісцкім фарміраваннем»).*

*Асудзілі на 3,5 года пазбаўлення волі. За паўгода да заканчэння тэрміну, праз дамоўленасць з адміністрацыяй прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, разам яшчэ з 13 асуджанымі была вызвалена і выслана з Беларусі ў Літву.*

*Цяпер жыве ў Вільні.*

НАТАЛЬЯ ДУЛИНА

# ДАЖЕ В ТЮРЬМЕ Я ОСТАВАЛАСЬ СВОБОДНОЙ

## Белорусский язык как иностранный. Типа английского. Почему?

– Я – русскоговорящий человек. Помнится, где-то во втором классе уже говорила: буду учительницей русского языка. Это очень ясно врезалось в память. Но вы говорите со мной, калі ласка, на мове!

*– Добра, але чаму ўсё ж руская? Гуманітарны магніт без беларускай прыцягальнасці?*

– Тогда, в семидесятые, была возможность отказаться от белорусского. Мама боялась, что если я начну учить и его, то стану безграмотной в русском. Вот так без меня меня женили. Но со временем я пожалела об этом.

*– Адчуванне гэтага прыйшло ўжо ў інстытуце?*

– Думаю, да, но не сразу. Долгое время я не ощущала этой потери. Сейчас владею языком пассивно. Могу читать, но с усилием, многое понимаю, но не все. Слова, которых не знаю, ищу в словарях. Для меня белорусский – как иностранный. Я лингвист, поэтому знаю: после примерно 12 лет мозг «учит» языки уже по-другому. Так что, когда говорю по-белорусски, из меня начинает «вылезать» итальянский.

Вообще я переключаюсь с одного языка на другой с трудом. В университете учила испанский, английский, потом итальянский. My English is very poor: практики почти не было. Сейчас в Литве иногда надо говорить на нем, и это мучительно. Поэтому делаю вывод: я сама по себе не очень способна к языкам. Итальянский знаю, потому что это моя профессия.

*– У савецкі час здаралася, што вясковыя студэнты, гаворачы па-руску, выдавалі сябе акцэнтам – і гэта станавілася прадметам пагарды. Вы назіралі такое?*

– Да, было. Сельские дети с детства слышали родную речь, но не литературную, а диалектную. Это и формировало акцент

в их русском. Литературный белорусский был замкнут в нишах: радио, телевидение, газеты. А вот акцент ассоциировался с деревней. Которая всегда воспринималась как менее престижная, чем город, не говоря уже о столице. Этот стереотип существовал. Не скажу, что он был ярко выраженным и в чем-то очень мешающим выходцам из деревни, но такая ситуация ощущалась до конца 1980-х.

## Я не могу идти за толпой

*– Частка людзей казала: уражанне было, што вы заўсёды трымалі максімальную дыстанцыю ад палітыкі. Гэта праўда ці ілюзія?*

– Ну конечно, я никогда не занималась политикой. Это просто не было в сфере моих интересов. Я жила своей профессиональной жизнью, преподавала, занималась студентами.

*– Можа, тут, ізноў жа, маюць значэнне сямейныя карані?*

– Я родилась в Минске. Родители имели высшее техническое образование. Когда мне было два года, они развелись, и воспитывала меня семья мамы. Дедушка преподавал технические дисциплины в техникуме, мама закончила политехнический институт и всю жизнь работала конструктором. Гуманитариев у нас не было. Но с детства меня учили: высказывать свое мнение можно только в узком кругу!

*– Падвойная бухгалтэрыя?*

– Мои родные жили без особых иллюзий, хотя мама признавалась, что в молодости верила: в Советском Союзе действительно многое хорошо. Но в целом отношение к системе было скептическим: политические анекдоты, ирония, никакого пиетета к лидерам государства… В этом смысле все очень типично. Отсюда, да, та самая «двойная бухгалтерия»: в школе молчишь – а дома можешь говорить все.

Кстати, я всегда высказывала свое мнение, когда считала это нужным. Но в молодости, как и многие, хотела быть частью группы ровесников. Правда, с одноклассниками у меня не очень складывалось: я жила далеко от школы, к ним почти не ходила, и они ко мне тоже. Поэтому было ощущение отстраненности. В итоге, став взрослой, почувствовала: я не могу идти «за толпой». Если все вдруг проявляют массовый интерес к какой-то новой книге или фильму – у меня возникает автоматическая реакция «не хочу». Это стало почти физиологической реакцией.

## Голосовала за Шушкевича: он до сих пор остается примером достоинства

*– У кожнага – свой залаты век. У вас гэта…*

– 1991–1994 годы. Не буду оригинальной, но считаю именно этот период золотым для Беларуси. Я голосовала за Станислава Шушкевича, и он для меня до сих пор остается примером достоинства, настоящих ценностей. Когда развалился СССР и пришла гласность, я сказала себе: больше ни-ког-да не буду молчать. Это была точка невозврата.

*– Як гэта адбілася на вашай працы выкладчыцай у лінгвістычным універсітэце?*

– Тогда как раз я и начала преподавать. В соответствии с духом эпохи и обещанием самой себе позволяла иронические, саркастические комментарии о политике. Не призывала студентов к гражданственности, но открыто выражала собственное мнение. В 2006 году впервые вышла на площадь. В 2010-м не выходила, но следила за событиями и очень переживала из-за происходящего. Студентам говорила: не могу ни к чему призывать, потому что если возникнут проблемы, не смогу вас защитить. Но не скрывала, что ситуация с выборами меня возмущает.

Например, за несколько дней до выборов студентам объявляли: надо проголосовать досрочно и уехать домой – в субботу никаких занятий! Нас, преподавателей, при этом даже не предупреждали! Мы приходили в аудиторию – а студентов нет. Это было не просто нарушение, а полное неуважение к нам. Всегда из-за этого ругалась с начальством: для меня это унизительно.

*– Але ў важныя палітычныя акцыі такія паводзіны маглі абярнуцца вялікімі непрыемнасцямі?*

– Да, у нас этого не любят, у нас принято соблюдать правила игры. Но я в такие игры играть не собиралась. Что я делала? Предупреждала студентов: ребята, мне никто ничего не говорил, начальство ничего не сообщало, поэтому занятия проводить буду. Единственное, не стану отмечать отсутствующих. Как хотите, но у меня программа, я не могу пропускать занятий.

*– І як рэагавалі вашы слухачы?*

– Минчане приходили, а общежитские часто уезжали. Им намекали: ослушаетесь – потеряете место в общежитии.

*– Сур'ёзная пагроза...*

– Да, поэтому всякий раз во время таких разговоров я добавляла: если все общежитие откажется досрочно голосовать, выселить всех не смогут! Но если не послушаются лишь двое-трое, их легко выжить под любым предлогом. Для меня главное – законная сторона вопроса: официально указаний нет – значит, занятия должны идти.

*– Былі выпадкі, калі студэнты прама вам казалі: даруйце, але не прыйдзем?*

– Да, именно так случилось в пятнадцатом году. За день до занятий староста позвонила с телефона замдекана и сказала: «Группа уезжает, никто не придет». Я благодарна, что предупредили. Думаю, они пытались возразить,

но в итоге подчинились. Замдекана, в свою очередь, оказалась в промежуточной позиции: ей тоже нужно подчиняться начальству. А у нас любят прикрываться приказом, как будто приказ оправдывает любое действие.

## Гуманитарная свобода у нас была, но весьма лицемерная

*– Адпаведна, сказаць, што да 2020-га лінгвістычны ўніверсітэт быў «рэспублікай культуры», не выпадае?*

– Мне кажется, там хватало лицемерия. В девяностые мы сами выбирали ректора – это был настоящий прорыв. Но уже с 1995 года руководителей вузов назначал Лукашенко. Это знак несвободы. С одной стороны, наш кругозор стал шире: ездили за границу, смотрели на Запад. Но при всем этом университет не охарактеризуешь политически диссидентским, скорее прагматичным. Отбор людей для поездок шел по принципу лояльности. Правда, это не становилось тормозом для новых знаний, но политической свободы сильно недоставало.

*– Вы ўспаміналі пра 2015-ы. Ці падтрымалі тады ідэю байкоту?*

– Да, тогда Статкевич призвал бойкотировать выборы, а он всегда был для меня образцом честности и достоинства. Мы с мамой и мужем не пошли голосовать: поддержали попытку показать пустые участки, тем самым вывести власть на чистую воду. Конечно, государство все равно обманывает, но сделать шаг несогласия следовало, пусть даже символический.

*– А ў іншых ВНУ было яшчэ меней гуманітарнай свабоды, чым у вас?*

– Трудно оценить ситуацию в сравнении, но в целом у нас в прошлом были те же циклы соцгума: история КПСС,

марксистско-ленинская философия и прочее. Хотя по логике, если люди учат иностранный язык, у них появляется интерес к стране языка. Обычно не ради идеологии, а из любопытства. Поэтому гуманитарная свобода была, но лицемерная: внутри себя мы интересовались Западом, а в жизни повторяли официальные штампы.

*– Як выкладчыца з вялікім стажам, скажыце: у чым праяўляліся рытуалы канфармізму ва ўніверсітэтах? І чаму яны не спрацавалі ў 2020-м?*

– Во-первых, опять же, не забудем про семью. Родители обычно учили детей: молчи, иначе потеряешь общежитие, а то и вообще вылетишь! За неуспеваемость у нас сложно исключить, а вот за «проступки» – легко. Этого боялись. Помню, в пятнадцатом году ругалась с деканом. На переводческом факультете отменили не только субботние, но и понедельничные занятия. Я возмутилась: «Что вы творите?» А тот оправдывался: «Родители сами звонили и просили отменить занятия». Я ему верю, потому что часто общалась с родственниками студентов. Они боялись больше, чем сами студенты.

*– Ці можна сказаць, што галоўным ідэолагам той пары ў Беларусі была, магчыма, не ўлада, а сям’я?*

– Конечно. А семья, понимаете, что делала? Она могла быть сто раз против. Внутри дома, среди своих – да, ругали власть, но все равно срабатывал материнско-отцовский инстинкт: дети должны получить корочку о высшем образовании, иначе как у них все сложится?..

Политика политикой, а дети – важнее. Я это видела десятки раз, когда разговаривала с родителями. Они демонстрировали именно это: страх за своих детей, прагматическое отношение к их судьбе. Все это ритуально передается из поколения в поколение: что поделать – инстинкт самосохранения. Поэтому настраивали детей «не возбухать».

## 2020-й: общество уже созрело для активных действий!

*– Калі для вас надышоў крытычны момант: далей маўчаць нельга? Гэта быў гвалт на вуліцах, страйк ва ўніверсітэце ці, можа, сама ціішыня калег, студэнтаў?*

– Я убеждена: триггером стало отношение власти к ковиду. Белорусы увидели, что государство не в состоянии их защитить. Люди начали сами шить маски, печатать защитные козырьки на 3D-принтерах. Это было как прозрение: оказывается, мы можем сами. Как у меня с уходом за животными – сначала я не знала, как к ним подступиться, боялась, что ничего не получится, что не справлюсь. Но получилось: стала и собачницей, и кошатницей! С ковидом то же: люди почувствовали свою самостоятельность, увидели, что могут справиться и без помощи государства.

А потом – перед выборами – власть начала сажать оппонентов. Заранее избавилась от конкурентов. Бабарико, Статкевич, Северинец – всех убрали. Это глупо: общество уже по инерции было готово к активным действиям.

*– Вы маеце на ўвазе затрыманні і адключэнне інтэрнэту?*

– Да, еще и его вырубили девятого числа. Абсолютно наглое желание уничтожить на корню протест. Но до конца зачистить все не смогли, информация так или иначе поступала. Вот тогда не участвовать, стоять в стороне было бы уже непорядочно. На твоих глазах бьют людей, а ты молчишь?

У меня было сильное желание что-то сделать. Выход девушек с цветами – это не мое. Мне предложили участвовать в инициативе одной из организаций: мы переводили статьи, рассказы жертв и очевидцев насилия и другие материалы из независимых СМИ на иностранные языки, чтобы отправлять западным журналистам. Это была ниша, где я чувствовала себя полезной.

*– Але ўсё ж выходзілі і на маршы?*

– Да. Первые дни я сомневалась – помните, у меня же всегда неприятие толпы… Но потом решила: нужно. 15 августа мы собрались у входа в иняз: выпускники, немного преподавателей, студенты. Акция состоялась, проезжавшие машины сигналили, поддерживали. 16-го был первый большой марш – я на него не пошла, но позже все-таки стала выходить. И главное, что беспокоило тогда: хоть бы дали собраться. Казалось, что если выйдем все, то масса сможет изменить ситуацию.

*– І як скончылася для вас вулічная эпапея?*

– 20 сентября мне не повезло: задержали. Нас отвезли в РУВД Октябрьского района. Там милиционеры вели себя спокойно, разрешили позвонить домой. Мне сказали: «Задерживать не будем до суда, составим протокол и отпустим. Вам же 55 лет». Эйджизм сыграл на руку – вечером я уже была дома. Остальных отправили в Жодино.

## Это закон жизни: тех, кто выбивается из массы и действует, меньшинство

*– А ўніверсітэцкія студэнты далучаліся да гэтых акцый?*

– Да, 1 сентября была акция. Идея – не идти на занятия, а явиться в Министерство образования с письмом против насилия. Я тоже участвовала. Преподавателей из родного иняза я там не видела, только нескольких человек из других вузов. Мы ходили по городу – студенты называли это демаршем. Потом мне пришлось уйти по неотложным делам, а позже узнала: у стадиона «Динамо» начали хватать студентов.

А еще в самом начале акции у инязовцев возникли проблемы: многие студенты возле университетского здания попали в оцепление, силовики не пропускали их в город. Ребята

кинулись в университет, за ними рванули омоновцы. А 1 сентября – день торжественного собрания первокурсников, занятий у них нет. И они как раз выходили, когда студенты пытались укрыться внутри. Руководители не пускают: «Нет-нет, пусть сначала выйдут первокурсники!», студенты кричат: «За нами гонятся!» Но университетское руководство ничего не понимало и не реагировало. К счастью, в тот раз никого не забрали.

2 сентября пришли выпускники: стояли с плакатами в поддержку студентов. Подъехал бус, кого-то из них задержали. Я тогда дергала за дверцу машины, возмущалась, пыталась вызволить задержанных. Некоторых из них впоследствии отпустили, кому-то назначили штрафы.

4 сентября ребята в фойе пели песни с плакатами и флагами. Деканы и проректоры находились там же. Никого не разгоняли, но стояли рядом, следили за происходящим. И тут ворвались омоновцы, снова загребли несколько человек.

Вместе со студентами я пошла в приемную ректора. Секретарь предложила подождать. Студенты тем временем стали звонить друзьям и родителям – в итоге людей собралось очень много. Нас перевели в большую аудиторию, где обычно собирается совет университета.

Пришла ректор и сказала, что звонила в РУВД: обещали отпустить всех до суда и прямо привезти в университет. Действительно, их позже доставили, обошлось штрафами. Мы, преподаватели, даже собрали деньги, чтобы помочь с оплатой..

– *І выкладчыкі таксама далучыліся да пратэстаў?*

– Да, на следующий день решили выйти вместе со студентами на большой перемене. Это была акция взаимной поддержки и благодарности. Через пару дней преподаватели записали видеообращение – кажется, первыми среди вузов. Текст

разделили на реплики, нас было 22 человека. 9 сентября видео вышло.

После этого ректор вызывала каждого из нас. Манипулировала: кому-то говорила – иностранцы перестанут приезжать из-за того, что у нас творится, потеряем доход и премии; кому-то – будут личные проблемы; мне – что у студентов из-за меня будут крупные неприятности. К каждому подбирала свой ключик.

*– Але група невялікая?*

– Да, студентов участвовало немного – может, 100, ну 150 самых активных. Преподавателей в титрах видеообращения около 140, но впоследствии осталось совсем немного. Многие были на нашей стороне, но предпочитали не высовываться, а другим вообще все по барабану.

Это инерция все той же семейной установки. Родители боялись, что детей исключат или выселят из общежития. Студенты воспроизводили эти паттерны. Я помню, на административке с молодыми девчонками услышала: «Не все так плохо было в Советском Союзе». Но они ведь его не застали! Это выученные в семье штампы. И я рассказывала им о тогдашних запретах, невозможности ездить за границу, о тотальном дефиците – чтобы они понимали реальность.

Это универсальный закон: нон-конформистов всегда меньшинство. На маршах было то же самое. Для некоторых это что-то вроде игры в казаков-разбойников: убегать, прятаться от ОМОНа. А кто-то просто селфился. Не все шли ради цели: часто это была просто массовая волна.

## Важнее сказать правду, чем сидеть под плинтусом и молчать

*– А калі вярнуцца да пытання лідараў: што, каб у той дзень – ды на волі Статкевіч, напрыклад?*

– Возможно, он мог бы организовать людей на какие-то более осознанные эффективные действия. Белорусы считают, что тогда не было именно организации, кого-то, кто бы повел всех за собой. Ну не знаю. Я очень боюсь харизматичных лидеров. Это путь к тоталитаризму. Люди поддаются массовому гипнозу. Как писал Фрейд: в толпе человек теряет часть индивидуальных черт. Поэтому я против лидерства в таком понимании.

*– Зайду з іншага боку: ці магло здарыцца, што гіпатэтычная прысутнасць харызматычных лідараў: Статкевіча, Севярынца, Дашкевіча – наадварот, разбурала б масавасць? Бо людзі маглі бачыць у іх адкрыта палітызаваны заклік да рэвалюцыі?*

– Обратный эффект? Возможно. Мне трудно сказать определенно. Приведу пример: в 2015 году Статкевич призвал людей бойкотировать выборы, не ходить на участки. Многие, даже настроенные против власти, все равно пошли и проголосовали. Люди говорили: «Ну как же, я должен отдать свой голос, это мой гражданский долг». Хотя смысл бойкота был в том, чтобы показать пустые участки, обнажить обман. Но жизнь доказала: это невозможно. Силовики, бюджетники, учителя – их всех заставляли голосовать, возили каруселью по участкам. Поэтому даже правильная идея разбивалась о реальность. Вот и в 2020-м неизвестно, как бы повлияло возвращение ярких лидеров.

*– Што прывяло вас у Каардынацыйную раду?*

– После забастовки и увольнения меня задержали, я отсидела 14 суток. Когда вышла, предложили войти в основной состав КС. В расширенном я уже была: там достаточно было просто подать заявку. Мне предложили войти в группу по образованию – продумывать реформу образовательной системы, чтобы быть готовыми, если власть внезапно сменится.

Я попросила несколько дней подумать. Сомневалась: во-первых, окажусь ли полезной, ведь всю жизнь держалась в стороне от политики. Во-вторых, страшно. Но в итоге согласилась.

Начались встречи, работа в группах. А потом – допросы в Следственном комитете по делу Тихановской. Постепенно стало ясно: идет охота на ведьм, возбуждают уголовные дела и наша работа теряет актуальность. Продолжали обсуждать разные вещи, но сколько может быть пользы от публичных высказываний и заявлений?..

*– А як вы спраўляліся са страхам пасля зняволення?*

– Когда вышла после 14 суток, семья уговаривала меня не появляться некоторое время у себя дома. Я отказалась. Хотя страх накрыл сильно, я даже плакала – так было страшно, что за мной опять могут прийти. Но через пару дней отпустило, и я продолжила свою обычную жизнь. С тех пор перестала бояться.

*– Пайшлі ў пашчу дракона, бо…*

– Воспитание и характер. Мне важнее сказать правду, чем сидеть под плинтусом и молчать. Воспринимаю трусость как предательство по отношению к самой себе. Для меня чистая совесть важнее спокойствия и безопасности.

*– А што дало зняволенне?*

– Главный вывод: и на Марсе есть жизнь. Даже в тюрьме можно остаться собой. Внешние ограничения не лишают внутренней свободы. В глубине себя ты можешь чувствовать свободу, даже если внешне вынужден подчиняться. Однажды даже сказала надзирателю: «Мы ведь свободнее вас». Он ответил: «Ну почему? Я ведь могу после работы пойти выпить пиво». Ну, вот такое понимание свободы.

Я сидела на Володарке. Атмосфера относительно мягкая, читала целыми днями. Иногда спорила, жаловалась, требовала, хотя в целом понимала: ты не можешь распоряжаться собой, нужно адаптироваться. Но в обиду себя не давала. И потом, в колонии, то же самое.

*– Вы пачалі там маляваць і пісаць. Гэта форма самазахавання?*

– Да, это у меня такой способ выразить эмоции. Я рисовала котов – их много было в колонии. Смотрела, как они себя ведут, переносила это на бумагу. Потом стала рисовать помещения и наши действия, но вместо людей изображала котиков. Коты в столовой, на уборке, в библиотеке. Я показывала рисунки другим – им очень нравилось. Они говорили: «О, это узнаваемо». Рисунки я отправляла в письмах своим родным. Это был способ рассказать о жизни в колонии так, чтобы цензура пропустила. Возможность проговорить опыт, вытащить его наружу.

*– Вы расказвалі, што замахнуліся на кнігу. Пра што?*

– Там не повествование, а скорее, мой взгляд на жизнь через эти рисунки, через котов. Они будут и в тюрьме, и на воле – в парке, в кафе, на рок-концерте, в супермаркете. Это не «дневник камеры», нет – такого нельзя было ни отправить в письме, ни вынести из колонии при освобождении. Просто зарисовки изнутри и одновременно воспоминания о свободе.

Например, я нарисовала несколько сцен по памяти из фильма «В джазе только девушки». Назвала их «В джазе только котики». Восстанавливала сюжетные сцены без интернета, только по памяти, иногда просила девочек помочь с деталями – как выглядит саксофон, как нарисовать велосипед?

## Нельзя наступать на себя ради выхода на волю

*– Вы адмовіліся пісаць прашэнне аб памілаванні. Гэта пра годнасць?*

– Конечно. Как можно просить милости у человека, который совершает преступления? Ведь при этом следовало обязательно признать вину и раскаяться. Для меня это невозможно! Да, некоторые говорили: «Подпиши бумажку – и ты на свободе». Но свобода – внутренняя честность. Мы читали Солженицына,

Рыбакова, знали цену компромиссу. Нет, внутренняя свобода дороже.

Я настроилась радикально: нельзя наступать на себя ради освобождения. Есть свобода физическая и свобода внутренняя. Для меня вторая важнее.

*– А іншых, хто выбраў згоду, вы асуджаеце?*

– Нет. Я никого не упрекаю в малодушии. Понимаю мотивацию людей. Это предсказуемое поведение. Для меня здесь нет разочарования – слишком много в жизни видела, чтобы удивляться.

*– Пабачанае не патрабуе адпаведнай рэфлексіі? Напрыклад, у яшчэ адной кнізе, але без коцікаў – з людзьмі, асэнсаваннем іх паводзін, учынкаў? Ды і ўласных…*

– Да, есть о чем порассуждать, что вспомнить. Начиная с 2020-го, с отсылками к более ранним событиям. У меня было шесть задержаний, начиная с предупреждения в сентябре 2020-го и заканчивая уголовным делом. Каждое из них – уникальный опыт, интересные ситуации, отдельные люди. Ценный дар жизни.

*– Данайскі!*

– Не без того… Смотрите: кто-то поездил по всему свету, где только ни побывал – а я прошла через тюрьму. Но ведь это тоже срез жизни! Он дал мне очень многое. Возможно, стоит рассказать об этом – не ради пафоса, а чтобы поделиться личным опытом и ценностями. Для меня важно зафиксировать свою историю – как в поезде люди вдруг начинают открываться друг другу, понимаете? Это потребность поделиться пережитым.

*– Разумею: мы ж верым, што некалі вернемся дадому. Скажыце, калі ласка, што вы прывезяце ў Беларусь? Веды, веру, новыя адценні досведу? Што для вас будзе галоўным, калі пераступіце парог?*

– Ну, понимаете, дважды в одну реку не войти. Мы меняемся, жизнь нас меняет. Может быть, стержень остается, но опыт все равно другой. Так что я вернусь со своим жизненным опытом. Главное для меня – продолжать нормальную жизнь. Жить честно, без компромиссов, не быть конформисткой. Работать, строить дом – в прямом и переносном смысле.

Когда меня депортировали, я очень переживала, а потом мама сказала: «Как здорово, что ты в безопасности! Для меня это, наконец, такое ощущение спокойствия, после постоянных тревог». И я поняла: мое «вышвыривание» сюда имеет плюсы – мои родные выдохнули. Значит, нужно продолжать жить. На новом месте вить новое гнездо.

Сейчас мой дом здесь. Когда вернусь – дом снова будет там. Но настоящий – всегда внутри меня. Важно, чтобы Беларусь, в которую я вернусь, снова стала родным домом. Без пафоса, без травм.

*– Але ж вашае вызваленне і дэпартацыя былі вельмі балючымі. Як вы самі гэта адчуваеце?*

– Для меня мое «освобождение» оказалось больнее, чем задержание с «мордой в пол». Потому что это не свобода, а второе наказание. Сначала срок, а потом еще и изгнание.

Помню, как люди вежливо поздравляли: «Мы рады, что вы на воле». Но они не понимали: это никакая не свобода. И когда Статкевич совершил свой потрясающий поступок, многие наконец осознали: дело не в формальном «выпустили», а в том, что для тебя значит настоящая свобода.

То, как с нами поступили, даже не компромисс – это издевательство.

Но раз уж я здесь, буду выстраивать заново свою жизнь. Мой дом – там, где я.

# ТАМАРА МАЦКЕВІЧ



Фота з асабістага архіва Т. Мацкевіч

*Нарадзілася 31 ліпеня 1964 года на Лепельшчыне ў сям'і сельскіх інтэлігентаў. У 1981 годзе скончыла школу з залатым медалём і паступіла на фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.*

*Пасля яго заканчэння сямнаццаць гадоў працавала ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, займалася даследаваннямі ў галіне інтэгральнай оптаэлектронікі і нанаэлектронікі.*

*У сярэдзіне 1990-х гадоў далучылася да грамадскага аб'яднання «Цэнтр "Супольнасць"», дзе кіравала адукацыйным аддзелам, была сябрай Рады.*

*З 2002-га – кіраўніца Адукацыйнага цэнтра для настаўнікаў. Запачаткавала праграму метадычнай і грамадзянскай адукацыі беларускіх настаўнікаў і праграму «Медыяадукацыя ў школе», праз якія прайшлі больш за тры тысячы педагогаў.*

*Заснавальніца і рэдактарка сайта nastaunik.info (цяпер nastaunik.eu) – незалежнага адукацыйнага рэсурсу, метадычнай бібліятэкі і адкрытай пляцоўкі для публікацый педагогаў.*

*Тры гады выкладала фізіку ў Беларускім гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа, як перад, так і пасля яго ліквідацыі ўладамі. Аўтарка шматлікіх публікацый і метадычных дапаможнікаў, стваральніца і суаўтарка дыстанцыйных курсаў «Актыўная ацэнка», «Медыяадукацыя» і іншых.*

*Шмат гадоў удзельнічала ў працы сеткі незалежнага назірання «Праваабаронцы за свабодныя выбары», была кіраўніцай выбарчага штаба дэмакратычнага кандыдата на парламенцкіх выбарах 2004 года, двойчы выбіралася дэлегаткай на Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі.*

*З 2008 года – намесніца старшыні Таварыства беларускай школы. Узначальвала групу распрацоўшчыкаў кампетэнтнаснай мадэлі беларускага навучання на аснове агульнаеўрапейскіх стандартаў і рэкамендацый. Суаўтарка канцэпцыі рэформы школьнай адукацыі Беларусі 2024 года.*

**ТАМАРА МАЦКЕВІЧ**

# НАРОДНЫ КОД ДЭМАКРАТЫІ – ЖЫЦЬ ПА-ЛЮДСКУ: З РОЗУМАМ, ПАВАГАЙ І БЕЗ ПАНОЎ НАД ГАЛАВОЙ

## Нават калі на гаршку сядзелі, ні разу бацькі не прыкрыкнулі

*– Пачнём з лірыкі. Віцебшчына – гэта беларускасць, якая проста дыхае з зямлі: Быкаў, Барадулін, Бураўкін… Калі чалавек нараджаецца ў такіх прыгожых мясцінах, ды яшчэ ў сям'і інтэлігентаў-вяскоўцаў, то шлях яго бачыцца роўненька ў літаратуру. Але выйшла па-іншаму?*

– Па адукацыі я фізік. Хоць сапраўды, тутэйшыя пагоркі, лясы, азёры нараджаюць беларусаў-лірыкаў. І як інакш з нашымі паганскімі каранямі? Ды ніяк, я дагэтуль веру, што камяні з зямлі растуць! З адукацыі разумею: не могуць яны расці, але логіка тут бяссільная – з глыбіні каранёў, з прыроды нараджаецца наша беларускасць.

*– У дзяцінстве вас аберагалі ад працы: «Сядзі, вучыся – будзеш чалавекам»? Ці зноў не так?*

– О не! Працаваць прыходзілася шмат. Бабуля сачыла, каб мы не павырасталі гультаямі. Гультай – страшнае слова. Але я чалавек абсалютнай волі. Бо вельмі пашчасціла нарадзіцца ў тыповай беларускай сям'і. Наколькі ўдалося дакапацца да продкаў пяці-шасці пакаленняў – не было сярод іх ні энкавэдыстаў, ні прапагандыстаў. Усе былі беларусы, былі пісьменныя, усе жылі з мазаля, не вельмі падпарадкоўваліся ўладам ці папам, жылі сумленна. Карацей, тыповыя беларусы, для якіх свабода – не пусты гук, а найважнейшае ў жыцці.

*– Як вы схіліліся да фізікі? Яе звычайна абіралі хлопцы, а калі ўжо дакладныя навукі, то дзяўчаты часцей ішлі ў хімію.*

– Чарговыя стэрэатыпы… Я не знаёмая з гендарнымі праблемамі. Начытаўшыся педагагічных тэорый, цяпер дакладна ведаю: нас з сястрой выхоўвалі ў новай, сучаснай парадыгме адукацыі – з павагай да асобы. Нават калі на гаршку сядзелі, ні разу бацькі не прыкрыкнулі. Заўсёды тлумачылі, дамаўляліся, пераконвалі, прыслухоўваліся.

Таму і выбірала фізфак БДУ самастойна. Настаўніца была дужа добрая, Нінэль Васілеўна Кашалевіч. Я алімпіяды выйгравала, да іх тады ніхто не рыхтаваў… Мама без захаплення, але з надзеяй у голасе казала пра мой крок: «Ладна, раз надумала. Але можа, адлічаць і пойдзеш далей у нармальны інстытут, медыцынскі…»

*– Відаць жа, не проста так гаварыла?*

– Ды мяне і саму туды цягнула, але маці перастаралася: кінула неяк, што рэктар – наш добры знаёмы. Маўляў, лягчэй будзе паступіць. Я і ўзвілася: ах так?! Вось жа ніколі ў жыцці! Залатая медалістка, трэба здаваць толькі адзін экзамен… Ну і пайшла ў БДУ.

*– Ён якраз насупраць медінстытута! А чаго бацькі хацелі бачыць вас менавіта там?*

– Ды ў іх усё жыццё, можна сказаць, з біялогіяй звязана: заатэхнік і аграном… А доктар – гэта ж з той самай оперы, жыццё ратуе.

Маму пасля інстытута бралі ў аспірантуру, але яна свядома хацела жыць у вёсцы. І тата мой мог не толькі лён ды бульбу вырошчваць: колькі ён англійскіх, французскіх, італьянскіх паркаў заклаў, садоў пасадзіў! Прынамсі, я дзевяць дакладна помню. Пераводзяць у іншы калгас – пакідае свой прыгожы след… Вандравалі, бо бацькі былі добрыя спецыялісты – кажучы цяперашняй мовай, крызісныя менеджары. Таму я пажыла ў шмат якіх вёсках і вельмі шчаслівая: кругагляд большы.

*– Паркі тыя па лініі ўпраўлення культуры? Ці калгасам, парткамам-райкамам хацелася харaства?*

– Які парткам? Бацьку майго ніякія чэрці не маглі ў партыю загнаць! Хацеў пасадзіць – садзіў. Напрыклад, кватаравалі ў адной жанчыны, якая стала фактычна раднёй. Вось каля яе хаты і з’явіўся парк і сад. Не ведаю, адкуль браў дрэвы, напрыклад, блакітныя елкі. Але калі нядаўна прыехала ў сваю

вёску, ледзь не заплакала: няма каму глядзець за жывым, павысякалі і паставілі пальму. Такую, ведаеце, з бутэлек пластыкавых…

*– Людзі яму дапамагалі, скідаліся – ці ўсё сам?*

– Канешне, канешне! Ой, дзе мае бацькі – там заўсёды была самаарганізацыя. Талака. Зараз многія лічаць, што прыгожа мы жылі толькі за панамі ці камуністамі, а як тыя сышлі, то самі ні халеры не маглі. Няпраўда!

Беларусь – краіна нябачных герояў. Усё сапраўднае беларускае жыццё насамрэч ідзе паралельна з тым, пра што пішуць у СМІ. У нас свае каштоўнасці і законы. І яны не сёння з’явіліся, заўсёды былі.

## Маму двойчы падавалі на Героя Сацыялістычнай Працы, але не прайшла. З-за анкетнай графы пра бацьку: прапаў без вестак у чэрвені 1941-га

*– Калі перакінуць масток ад батанікі да фізікі, то гэта, у пэўным сэнсе, традыцыя народнай інтэлігенцыі – праз навуку шукаць праўду жыцця? Спраўджваць патэнцыял? Дэманстраваць годнасць?*

– Адукацыя, як і свабода – наша традыцыйная каштоўнасць. Пасля вайны хаця б аднаму з сям’і ўсе збіралі апошняе, каб выбіўся ў людзі. Так было і ў мамінай сям’і. У мяне не таму ўніверсітэт, што хацелася вырвацца з вёскі. Сто разоў не, гэта проста натуральна.

Калі ёсць дзе набрацца розуму, то бяры, так трэба. І факультэт сур’ёзны, дзе мазгі добра можна патрэніраваць, каб потым усё жыццё карыстацца. Не на цвіку сядзі, як той казаў, а ў кніжках.

У мяне, дарэчы, падсвядома хапіла розуму трымацца далей ад ідэалогіі. А можа, паказалі… Калісьці пачула: «Малайчына, добра вучышся, будзеш інструктарам райкама камсамолу!» І так мне страшна стала ад гэтага, што я зразумела: трэба налягаць на матэматыку, каб ад таго далей!

*– А сваякі як ацэньвалі юнацкі максімалізм?*

– Мама па-свойму мазгі ставіла, яна была зусім не простая. Была дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Я з дзяцінства ведала, што туды выбіралі-прызначалі або змагароў, або чынуш. Мама была са змагароў – гэта было такое прызнанне за добрую працу.

*– У савецкі час дэпутат Вярхоўнага Савета без узнагароды – як салдат без ордэна. Звычайна перад тым ужо меў нейкі «Знак Пашаны», як мінімум. Ваша маці, напэўна, таксама не абышлася без такой увагі ад дзяржавы?*

– Калі быў вобшук у нас дома, то пазнаходзілі розныя ўзнагароды, цётчын медаль Героя Сацыялістычнай Працы, бацькоўскія медалі і ўсклікнулі: «О, дык у вас тут прыстойныя людзі жылі!» – «Прыстойныя жылі, прыстойныя і жывуць», – адказала я.

*– А што за сваячка-гераіня?*

– Жанчына, працавала з маёй мамай. Ніякая не родная: проста цудоўная беларуска, Мазала Ганна Васілеўна, свінарка. Вельмі разумная жанчына. Сваіх дзяцей не мела. Калі мама рыхтавалася да сесіі, цётка Ганна паралельна чытала ўсе яе кніжкі, канспекты. Так і жылі – адной справай, адной думкай. Жыццё прабылі ні разлі вадой. А займаліся яны селекцыяй новых парод свіней, зрабілі гіганцкі прарыў. Далі Ганне зорку, а маме – ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Бо разнарадка на «сялянку», а не «інтэлігентку».

Да таго ж тата мамін, мой дзядуля Ілля, у першыя дні вайны загінуў без вестак. Унікальная сітуацыя: двойчы падавалі на Героя Сацыялістычнай Працы, але не прайшла. З-за той самай графы: «А раптам з ім нешта не так?»

*– «Не паложана»?*

– Вось-вось. «Барані божа, мо кампрамат які знойдзецца…» А цётка Ганна, калі яе на партыйныя з’езды пасылалі, часцяком казала: «Ой, куды нас з тваёй маткай свінні вывелі! «Перад смерцю аддала мне медаль: «Гэта і маці тваёй зорка – забірай». Я пачала ўпарціцца, а яна: «Тады прадай, будуць табе грошы». – «Не, раз такое, адвязу ў Лепельскі музей».

І напалохала музейшчыкаў! «Бярыце, – кажу, – проста так перадаю, бо толькі два Героі ў раёне за ўсю гісторыю. І вось вам пасведчанне, вось ордэн Леніна». А яны адхрышчваюцца: зорка ж з «драгметалу», трэба сігналізацыю ставіць…

*– Медаль залаты, а колькі бруду побач… Як вы гледзіце на зло ідэалагічнай стэрыльнасці? Чалавек згінуў за радзіму – а замест помніка злапомнасць, помста дачцэ-сіраце… Пераслед мінулага, фільтрацыя на чыстых і падазроных… Гэта ж не мусіла скончыцца дабром для сістэмы?*

– Дзеда забралі ў войска за тры месяцы да вайны, нібыта на зборы. А дома трое малых. Старэйшаму – пяць гадкоў, малодшаму – тры дні, а мама ў сярэдзіне. Ён думаў: пакажа метрыкі, адпусцяць. Але… Паспеў прыслаць з фронту толькі адзін ліст: «Стаю пад кулямі, як пад дажджом. Беражы дзяцей». І ўсё. Бабуля казала,  вярнуліся з вайны чатыры мужыкі на ўсю вёску, у якой было дзвесце двароў. Не дзіва, што ў маёй сям’і ніколі не ўспрымалі кампартыю ўсур’ёз. Так: жылі, выконвалі савецкія рытуалы, але трымалі дуліну ў кішэні. Бацька рубіў: «Няма розніцы паміж папамі і камуністамі, што царква, што сельсавет: нарадзіўся – запішуць, памёр – выкрасляць, вось і ўсё!» Затое незалежнасць успрынялі ўсёй душой.

*– Дык, можа, у маральнасці ўсё і прасцей? Не ў лозунгах і граматах, а ў тым, як людзі жылі: садзілі паркі, дапамагалі суседу, не ганарыліся, а проста трымалі адно аднаго?*

– Так. Я сказала б – у любых учынках, у самаарганізацыі, нават у маўчанні.  Вёску любяць паліваць брудам, маўляў, і такая яна, і разгэткая… А я вам проста адзін факт раскажу.

У майго стрыечнага брата – прыёмная дачка. Уся вёска ведала, як яны доўга чакалі гэтага дзіцёнка, гады ў чарзе па немаўля, ад якога нейкая маці адмовілася. І толькі калі мае сваякі памерлі, я была на пахаванні, выпадкова даведалася, што дзяўчына, ужо паўналетняя, ні ад каго не чула праўды пра сябе, што яна насамрэч не родная… Ніхто ніколі не сказаў ёй ні слова. Бо: не нашая справа, не лезь у чужое. Вось гэта і ёсць маральнасць! Ніколі не пагаджуся, што наша вёска цёмная, а беларусы зайздросныя…

Мы – як партызаны, каторыя сапраўдныя: робім сваё ціха, але сумленна.

Або яшчэ адзін факт: у самым пачатку дзевяностых, як толькі стала крышку больш свабоды, у маёй вёсцы нібыта сам па сабе з’явіўся стараста – людзі сталі самаарганізоўвацца, вырашаць пытанні: каму трэба дапамагчы гарод пасадзіць, як разам адрамантаваць водаправод ці купіць трактар. Але потым ізноў насадзілі нейкіх нягеглікаў у сельсаветы і загналі здаровыя парасткі ў падполле. Уяўляеце, як бы расквітнела краіна, каб у нас быў закон аб мясцовым самакіраванні!

Сапраўдная дэмакратыя, самапавага, правы чалавека, калі хочаце, гэта і ёсць нашы нацыянальныя каштоўнасці, якія трымаюць беларусаў, паказваюць, што мы – еўрапейцы.

## Усё ненатуральнае аблятае, нібы восеньскае лісце, і здзімаецца ветрам часу

*– «Адукацыя – каштоўнасць, свабода – каштоўнасць; камунізм – не, царква – не… Беларусь – так!» Калі вось з гэткім жыццёвым досведам, са сваёй унутранай народнай энергетыкай прыехалі*

*ў Мінск, ва ўніверсітэт, ці зламілі антэны вашай душы беларускасць?*

– Вядома! Там стала гэтага ўсяго яшчэ больш – і я адчула, што жыццё можа быць прыемным. Патлумачу.

Школа савецкая наогул не найлепшае месца для людзей. Як у ланцужку Мішэля Фуко: бальніца – армія – турма. Месцы, куды людзі трапляюць не па сваёй волі. Дысцыплінарныя інстытуты, выхаванне паслухмянасці.

Хадзілі мы ў школу, якая ў суседнім вайсковым гарадку. Зразумела, без беларускай мовы, з тыповымі савецкімі рытуаламі. І вясковыя аказаліся ў сябе дома «нацыянальнай меншасцю»! Хаця я вучылася лепш за дзяцей вайскоўцаў, усё роўна адчуваўся дыскамфорт. Мы былі чужыя – разумееце? Не таму, што выразна кепска да нас ставіліся, але там свае законы, свая іерархія. Мы, беларусы, былі ўсе роўныя, а там былі касты – камандзіры, афіцэры, прапаршчыкі… Яшчэ падзел на тых, хто служыў за мяжой, хто не. Для нас дзіка і непрымальна. Дзеці вайскоўцаў былі розныя, можа, не вельмі разумныя, затое фізічна моцныя. Побач з імі адчувала я сябе нейкай не з тога цеста.

І вось універсітэт, а тут усе свае! Вось адкуль маё шчасце: з кантрасту. І мала таго, што ўсе нашы, родныя, зразумелыя, дык яшчэ і такія разумныя: на курсе 82 медалісты.

*– А ўсяго?*

– 275 чалавек, кожны трэці – медаліст. І кожны – асоба. Хтосьці ведаў іспанскую мову, як родную, хтосьці чытаў «нейкага Фрэйда» ў арыгінале, хтосьці разбіраўся ў джазе, хтосьці цікавіўся філасофіяй, амаль усе мелі музычную адукацыю… Мы набіраліся розуму адно ў аднаго і ў выкладчыкаў. А выкладчыкі якія! Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч – свой чалавек для ўсіх студэнтаў; Генадзь Карпенка – дарэчы, паставіў мне пяцёрку па «радыяцыйным матэрыялазнаўстве». Будучыя зоркі свабоды!

Калі разабрацца, то фізфак тады быў рассаднікам антысаветчыны. А з яе вырасла наша нацыянальная самасвядомасць.

*– Дык, відаць, быў нейкі сюжэт, які ўсё расставіў па месцах?*

– Ну хоць бы такі: нас, студэнтаў-фізікаў, на другім курсе не пусцілі на дэманстрацыю. Не паверыце, але я ні разу не прашпацыравала ў «шчаслівых» калонах па галоўным праспекце ад помніка Ільічу да плошчы Перамогі. Бо «ідэалагічна ненадзейныя людзі»!

*– Гора ад розуму: крытычная маса разумнікаў у адным месцы? Як фізіка пранікае ўглыб матэрыі, то вы – у сутнасць сістэмы?*

– У БДУ быў узмоцнены грамадска-палітычны курс, а толку? Да філосафаў са сваім узроўнем крытычнага мыслення сур'ёзна не ставіліся, гісторыю КПСС лічылі смешнай навукай. І зусім іншае – палітэканомія капіталізму: падручнік Рагоўскага – гэта самае тое, што сфармавала светапогляд. Убачылі самарэгуляванне, лагічнасць прынцыпова іншай сістэмы – і ўмомант адчулі розніцу з курсам палітэканоміі сацыялізму.

*– А навуковы камунізм чаму не разнеслі ў пух ды прах?*

– О, навуковы камунізм – дык гэта наогул песня! Калі выкладчык прыходзіў у аўдыторыю, то азіраўся ціхенечка і – вы не паверыце – казаў: «Сябры, гэта не навука, а лухта. Таму давайце ціхенечка, праз галоўны корпус, каб не міма дэканата, пойдзем па дамах – зараз пачнецца футбол!» Наша мінскае «Дынама» тады было на вяршыні славы.

*– Фантастычны навуковы камуніст! Дысідэнцтва ўнутранае абмалявалі, а ці даводзілася сутыкнуцца з адкрытым антысаветызмам, апалітычнасцю ў выразнай форме? Ну ці ў замаскіраванай, прыхаванай?*

– На трэцім курсе мы былі ўжо моцна падкаванымі ў палітычным разуменні сітуацыі. На капусніках напоўніцу

адрываліся з нагоды трох ленінскіх «першакрыніц»: ставілі сцэнкі, дзе грузіны гандлявалі на базары канспектамі з тымі крынічнымі дарамі…

Памятаю, мы смяяліся, калі Брэжнеў памёр. Сагналі два патокі ў адну аўдыторыю і перад тэлекамерай фактычна прымушалі пускаць слязу… Паводле сцэнара да нас прыцягнулі нейкую цётку, і калі тэхніка застракатала, яна давай выць на прыгожую карцінку – а ў нас ад гэтага паноптыкума рэальныя слёзы, толькі ўжо ад смеху.

Ну цалкам як у «Камуфляжы» Занусі: смех не ад радасці, а ад абсурду, які ўжо перайшоў усе межы.

*– Фільм пра маральную дэфармацыю сацыялістычнага грамадства, постінтэлігенцкая іронія са «святога»…*

– Так, пра нашу рэальнасць, дзе трагічнае ў камічным і наадварот. Таму яна неўзабаве і пасыпалася. Праз нейкі час у Коласаўскім ліцэі тлумачыла гімназістам пра градус Цэльсія і згадала радкі:

Не было Галілея і Боба Марлея,
Не было Сальвадора Далі.
Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінэя,
Толькі тры чарапахі былі.

Пытаюся: хто з гэтых пералічаных асобаў мае адносіны да тэмы ўрока? Маладыя гуманітарыі пачалі перабіраць. Яны ведалі ўсіх, акрамя… Леніна! Глядзела на нармальных, разумных дзяцей і бачыла: уся гэтая ідэалогія знікне сама сабой, і вельмі хутка.

Усё ненатуральнае аблятае, нібы восеньскае лісце, і здзімаецца ветрам часу.

## А можа, фізікаў адхілялі ад нацыянальнага руху засланыя ў яго «спецыяльныя абучаныя людзі»?

*– Чарговая класная гісторыя! Але давайце трошкі назад, да Станіслава Станіслававіча. Ён жа на вашым універсітэцкім веку падаўся ў палітыку?*

– У аварыю на ЧАЭС ён кіраваў кафедрай ядзернай фізікі і пасля выбуху адмяніў усе лабараторныя работы. Вывесіў абвестку: можна прыйсці і праверыць прадукты, асабліва калі яны з Гомельшчыны. Адразу пачаліся праблемы, якія, верагодна, і падштурхнулі да палітыкі. Вельмі перажывала за фінал ягонай дзяржаўнай кар'еры. Прырода звышнадзяляе чалавека інтэлектам, але не інтуіцыяй – сітуацыя, калі бог пароўну дзеліць… Ён не надта разбіраўся ў людзях. Прыліпалі розныя. А каб побач была каманда з большым досведам, усё, можа, сталася б інакш. На ўсё жыццё ў мяне захавалася павага да гэтага светлага беларуса.

*– Шушкевіч у 1986-м стартаваў у палітыку, вы – у навуку. Інстытут электронікі АН БССР. Што там адбывалася? Маю на ўвазе і фон універсітэцкай свабоды, і – радыяцыйны, чарнобыльскі.*

– Я займалася рэнтгенаструктурным аналізам: груба кажучы, мы вырошчвалі шматпластовыя паўправаднікі і глядзелі: мона- ці полікрышталь расце, якой якасці, што рабіць з гэтым далей. А радыяцыя… Пасля аварыі на ЧАЭС у нас забралі дазіметры, каб не маглі яе мераць – ні каля ўстаноўкі, ні ў ежы. Насамрэч гэта не дапамагло, бо на ўстаноўцы ж свой наварочаны аналізатар! Спачатку тэхніка сігналізавала пра фон ад шчытападобнай залозы, праз пару месяцаў яна перастала ціўкаць, затое вельмі моцна зашчоўкала пячонка. Падносіш – а там проста ух якое!

Але што мы маглі? Нічога. Карацей, у Акадэміі навук свабоды было нашмат менш, чым у БДУ.

І не толькі з палітычных прычын: акадэмічныя інстытуты актыўна працавалі на расійскі ВПК. У мяне пачалася ломка: не хачу дапамагаць вайскоўцам, якіх неўзлюбіла яшчэ са школы. А тут рабілі, напрыклад, фотапрыёмнік для працы ў дыяпазоне тэмператур ад плюс тысячы да мінус двухсот градусаў. Зразумела, для «мірных» мэтаў…

Як толькі Беларусь атрымала незалежнасць, прыйшла свабода, інстытут апусцеў. За два гады з сямісот чалавек засталося сто дваццаць: начальства, прыбіральшчыцы і лабаранткі. А навуковыя супрацоўнікі хто ў бізнес, хто камп’ютары збіраць-прадаваць – на свой хлеб узбівацца.

*– Вы кажаце пра зніжэнне палітызацыі ў параўнанні са студэнцкай вольніцай. Але ж з вамі быў, напрыклад, Юрый Хадыка – ён жа тады шпарыў з СССР у Беларусь ці не хутчэй за Зянона Пазняка?*

– Прынцыповы момант, мушу сёе-тое патлумачыць. Як я ўжо згадвала, у нас былі сур’ёзныя замовы ад саюзнага вайскова-прамысловага комплексу. Таму ў Мінск размяркоўвалі шмат спецыялістаў з Маскоўскага фізіка-тэхнічнага і Ленінградскага электратэхнічнага інстытутаў. Невыпадкова з прыходам незалежнасці акадэмічная супольнасць рэзка падзялілася. Два лагеры: расіяне – і ўсе астатнія на чале з беларусамі.

Расіяне не дужа гарэлі пераменамі. У нас на ўчастку працавала разумная жанчына, родам з Смаленска (амаль Беларусь), кандыдат тэхнічных навук. І калі давалі заробак (палова старымі савецкімі купюрамі, палова нашымі белачкамі-зайчыкамі) – фыркала: «Хутка тут да змей і жаб дакоцяцца!» Усёй сваёй імперскай душой ненавідзела Беларусь.

А Юрый Віктаравіч быў свой. Ён меў вялікі аўтарытэт, які праецыраваўся на дзейнасць Фронту. Паважаць Хадыку,

шэраг іншых навукоўцаў-фізікаў мы пачалі яшчэ і за стварэнне ў Акадэміі музея нацыянальнай культуры. Якія энтузіясты! Не проста ў тым самым Веткаўскім раёне назбіралі і ўратавалі старажытныя іконы, скульптуры – яны зрабілі выдатныя галаграмы з іх.

*– Фізіка і лірыка – старая тэма, але, здаецца, у вашым выпадку яны даўно памірыліся?*

– Мне здаецца, тут штучны падзел. Ведаю, што ўсе добрыя фізікі – лірыкі. Думаю, наадварот таксама. Вазьміце таго самага Алеся Бяляцкага, нашага набеліянта. Фармальна – лірык, літаратар па адукацыі, а любімым прадметам у школе ў яго была матэматыка. Вагаўся паміж філфакам і матфакам. А геніяльны перакладчык Лявон Баршчэўскі? У свой час выйграваў алімпіяду па хіміі!

Калі лічыць першых талакоўцаў лірыкамі, то мы, акадэмічныя фізікі, адразу ўчапіліся ў ідэю адраджэння і падтрымалі яе. Маё пакаленне было блізкім з талакоўцамі, слухалі касеты Сокалава-Воюша, Андрэя Мельнікава, чыталі Кастуся Тарасава. Са студэнцкіх часоў знаёмыя з многімі, хто стаяў ля вытокаў нацыянальна-дэмакратычнага руху той пары.

Аднойчы я ўбачыла ў чарнобыльскіх лістоўках памылкі. Кажу: дайце мне, фізіку, на вычытку.

*– І што, паслухалі – ці махнулі рукой? Маўляў, не стронцый-90 або плутоній-239 людзей цікавіць, а тое, ці можна тут-там жыць, што лепш есці-піць?*

– Прапусцілі міма вушэй: няма калі, трэба хутчэй! Маўляў, на сябе паглядзіце – у вас мова слабая, гісторыю не ведаеце… Многія адчулі тады гэты халадок і выбралі іншыя сцежкі: «Дайновы», «Менскія кафлі» ды іншыя.

Гэта адна з сур'ёзных памылак. Мы не былі настойлівыя, думалі, калі спатрэбімся, то пазавуць, або: раз так, ну і ладна, самі справяцца… Часам разважаю: а можа, і праўда адштурхнулі

нас тады «спецыяльныя абучаныя людзі»? Бо калі фізікі рэальна паставаралі бізнесы, моцныя малыя прадпрыемствы – значыць, палітыка недаатрымала эфектыўных менеджараў. Хай яны і саступалі ў гуманітарыстыцы, але ў арганізацыі структур відавочна выйгравалі.

*– І ўсё ж са свету фізікаў вы праз нейкі час перайшлі ў іншы – у Коласаўскі ліцэй. Як ацэньваеце сваім крытычным розумам гэты эксперымент беларускага духу?*

– Я шукала тады нармальную беларускую школу для свайго дзіцяці. Пыталася ў франтаўцаў. А Баршчэўскі кажа: «Ай, Тамара, ідзі да нас выкладаць фізіку». – «Лявон Пятровіч, у мяне ў дыпломе пра выкладанне нічога няма». – «Навучыш, каб не совалі пальцы ў разетку, і добра», – пажартаваў.

Насамрэч ён адчуваў маю адказнасць за любую справу. Я моцна яму ўдзячная. Гэта Баршчэўскі зрабіў з мяне педагога, паказаў, як можна трымаць будучыню ў сваіх руках.

Што да чароўнасці беларускага кола… Яно насамрэч цудоўнае. Але, як і ў нашым Інстытуце электронікі былі два тыпы людзей, так і ў ліцэй з часам пратачылася трохі чужых. Бачыла тых мамак-квактух, якія разглядалі ліцэй як пляцоўку для лягчэйшай эміграцыі: «Дзетка, памучышся з гэтай мовай іхнай, затое далей у Еўропе лягчэй уладзіцца, выйдзеш там замуж…»

А я дзецям, наадварот, казала: толькі лузеры едуць за мяжу. Хіба магла падумаць, што сама калісьці апынуся ў выгнанні? Але, безумоўна, у цэлым ліцэі ёсць кім ганарыцца. У тым ліку і на нашых выхаванцах цяпер трымаецца беларушчына ў Беларусі.

## Нельга ўсю сацыяльную групу залічваць у памагатыя рэжыму – розныя настаўнікі ёсць. Не варта дэмаралізаваць іх знявагай

*– Адчулі тады смак педагогікі і спрычыніліся нават да стварэння Таварыства беларускай школы?*

– Яго іншыя зорныя людзі стварылі сто гадоў таму: Браніслаў Тарашкевіч з аднадумцамі-патрыётамі. А мы, больш як дзве тысячы чалавек, падхапілі. Пачалі паціху адраджаць беларускую школу. Рабіць яе сучаснай, канкурэнтнай, уключанай у агульнаеўрапейскую адукацыйную прастору. Я да таго часу зразумела: трэба горы перавярнуць, бо кадраў няма, методык няма, перакладаў педагагічнай літаратуры няма. Так і запачаткавалі праграму «Настаўнік – школа – грамадства». Пачала займацца метадычнай і грамадзянскай адукацыяй настаўнікаў. Бо якасць адукацыі ў краіне не можа быць вышэйшая за адпаведны ўзровень падрыхтоўкі настаўнікаў, якія працуюць у школах.

У ТБШ былі яшчэ іншыя кірункі. Ліцэй аформілі як навукова-практычную лабараторыю, займаліся і культурніцкай дзейнасцю. Праз этнаграфію, фальклор уключаліся ў агульнаеўрапейскую культурную прастору, не толькі ў адукацыйную.

Пабачылі, як шмат трэба перарабляць у нашай адукацыі: «русскомирцы» прывязалі яе да расійскай адукацыйнай прасторы нават тэрміналогіяй – сваім псеўданавуковым «навамоўем» тыпу «функцыянальнай граматнасці» замест кампетэнтнаснай мадэлі, прынятай у акадэмічнай літаратуры. Дарэчы, самыя цытаваныя ў нас расіяне, такія як Хутарской, Макаранка, не прызнаныя ў навуковым свеце. На Захадзе ведаюць хіба Выгоцкага, а ён народжаны ў Беларусі, выкладаў у Гомелі, менавіта яго тэорыя лягла ў аснову новай парадыгмы еўрапейскай адукацыі. Гэта контраргумент таму, хто глядзіць

у бок Расіі і кажа, што заходнія методыкі нам не падыходзяць… Дык яны ж тут нарадзіліся!

ТБШ увесь гэты час вяртае сабе сваё. І не толькі мову.

*– А калі зірнуць праз наступную оптыку: педагог – фігура амбівалентная. Ён адначасова і слуга сістэмы, і магчымы яе разбуральнік. Будзеце аспрэчваць?*

– Ёсць такое, але не згодная з амбівалентнасцю. Бачу дзве валентнасці. І іх цяжка арганічна спалучыць у адной асобе. Вось.

*– Тады наступная катэгарычная выснова, якую вы чулі, калі ўдзельнічалі ўназіраннях за выбарамі: маўляў, настаўніцтва так упісалася ў фальсіфікацыі з падлікам галасоў, што каб раптам люстрацыя, то ў школах будзе суцэльны дэфіцыт кадраў. Крыўдная праўда – ці беспадстаўнае абвінавачванне?*

– Гэта медыйны стэрэатып. Логіка – бі сваіх, каб чужыя баяліся. Разбіваю яе лічбамі. Глядзіце: у галіне адукацыі працуе 450–500 тысяч чалавек, з іх настаўнікаў каля 100 тысяч, а выбарчых участкаў – крыху больш за 5 тысяч. Атрымліваецца, нават калі ўсе яны фармаваліся выключна педагогамі, гэта максімум 5 % ад агульнай колькасці.

Я была незалежным назіральнікам, найчасцей у сваім Партызанскім раёне Мінска. Таму ў курсе ўсіх «фокусных тэхналогій». Ведаеце, колькі там камісій было сфармавана пераважна з настаўнікаў? 4 ці 5 з 44. Усяго.

Асноўную масу камісій фармавалі заводы і прадпрыемствы: маторны завод, холадакамбінат, «Белтэлекам», лясгас… Вялікая зона адказнасці ў паліклінік… Але фізічна выбарчыя ўчасткі найчасцей знаходзяцца ў школах. І таму ўсім здаецца, быццам там спрэс настаўнікі. У райцэнтрах педагогаў, вядома, больш, бо прадпрыемстваў меней. Аднак і там усё вырашае старшыня камісіі і сакратар – а гэта звычайна людзі збоку, выканкамаўскія або ідэалагічныя работнікі.

Так што нельга ўсю сацыяльную групу залічваць у памагатыя рэжыму альбо ў амбівалентныя. Розныя ёсць. І не варта іх дэмаралізаваць знявагай.

## Ніколі маса не зробіць тое, што на здольныя адзінкі. Згадайце: у школе сто настаўнікаў – але памятаеце вы аднаго-двух

*– Відавочна: нацыянальная адукацыя патрабуе мадэрнізацыі. І што трэба мяняць?*

– Змест, методыкі, сістэму кіравання. І галоўнае – не чакаць з мора пагоды, а мяняць, што можаш. У змест мы абмежавана можам улезці.  Праграмы складаюць у міністэрстве. Але крыху можам. А ў кіраванне пры ўсіх нашых жаданнях – пакуль аніяк. Бо сістэма выбудавана так, што нікога з неправераных туды не пускаюць. Значыць, застаюцца методыкі. А яны даюць вельмі шмат: часам адно-два разумныя пытанні настаўніка расстаўляюць у маладых мазгах усё на свае месцы.

Менавіта правільна падабраныя методыкі дазваляюць фармаваць у вучняў адказнасць, настойлівасць, уменні самастойна вучыцца і працаваць у камандзе, лідарскія якасці, добразычлівасць… Бачыце: усё тое, што цяпер патрабуецца для працаўладкавання і актыўнага грамадскага жыцця. ТБШ за апошнія 20 гадоў выдала дзясяткі кніг, дзе настаўнікі дзеляцца ўласнымі практыкамі развіцця крытычнага мыслення, грамадзянскасці. За гэты час вырасла пакаленне самадастатковых разумных асоб. Паглядзіце, колькі моладзі выйшла на вуліцы ў 2020-м! Не хачу прымазвацца, што гэта настаўнікі малайцы, але і не думаю, што ўсё здарылася без іх.

*– 90 % педагогаў – жанчыны. Яны на сваіх плячах нясуць школу, дзяцей, мову. І па вялікім рахунку – сапраўдную Беларусь?*

– Насамрэч у беларушчыны шмат фактараў, у тым ліку і настаўніцкі. Але я перакананая: ніколі маса не зробіць тое,

на што здольныя адзінкі. Згадайце сябе: у школе сто настаўнікаў, але дастаткова аднаго-двух, каб ты адчуў матывацыю, паверыў у сябе і нечага дабіўся.

Мяне, старшакласніцу, неяк абвінавацілі ў «няправільных» палітычных паводзінах. Дык падышла класная: «Тамара, спакойна. Я не дажыву, а ты яшчэ ўбачыш, што з гэтага ўсяго будуць смяяцца». Я паверыла.

Бачыце: хапіла аднаго аўтарытэтнага, сапраўднага школьнага голасу – і нарадзілася моц жыцця.

*– А жаночы твар беларускай школы – гэта слабасць адукацыі ці ўлады?*

– Лявон Пятровіч адкрыта казаў: бяру мужчын у ліцэй, нават ахвяруючы якасцю выкладання. Проста дзеля гендарнага балансу. Бо – слабасць, слабасць…

Не ведаю, чаму мужчыны не ідуць у педагогіку. Ясна, заробак маленькі. А што – жанчынам не трэба грошы?

Мне здаецца, не стае шырокага, практычнага разумення, што гэта – самая ўплывовая прафесія ў свеце. Я сама гадамі ўцякала ад школы – і толькі цяпер зразумела энергію адказнасці за будучыню, якую дае настаўніцтва.

*– Тады пытанне: на які досвед варта арыентавацца беларускай школе?*

– Прывяду адказ славацкага калегі, што перабудоўваў сістэму адукацыі ў сваёй краіне: рэформа – гэта змена парадыгмы. Цяпер важна, каб дзіця не толькі ведала, што ў павука восем ног, а яшчэ і не адрывала іх. Каштоўнасны складнік адукацыі (attitude) вызначае атмасферу ў грамадстве.

Згадайце зараз нашых маладых амапаўцаў, сярод якіх нямала зусім не дурняў…

Гэта велічэзная праблема: у нас адсутнічае павага як да педагога, так і да вучняў. Інакш і не можа быць, бо ў школе

фактычна дзейнічае прыгонная сістэма. Яна блакуе развіццё прафесіі.

А што зрабілі, напрыклад, фіны? Проста «купілі» ў грамадства найлепшых людзей для педагогікі. І не трэба прымітызаваць іх падыход: не проста да столі паднялі заробкі, але і абвясцілі поўную свабоду навучальнага працэсу, адмянілі кантрольныя органы. Кажуць, мы давяраем сваім настаўнікам. Замест гэтага раз на тры гады праходзіць міжнароднае даследаванне PISA, якое ў нас бачылі адзін раз. У выніку – найпрэстыжнейшая прафесія і відавочны рост адукаванасці. Фіны, эстонцы, палякі – гэтыя сістэмы адукацыі пакуль найлепшыя.

*– А маральны складнік нашай школы? На чым ён базуецца? Што ўтрымлівае тых, каго вы ведаеце, з чымі думкамі знаёмыя? Якія працэсы адбываюцца ў настаўніцкім асяродку?*

– Усё трымаецца на энтузіястах. На прафесіяналах з грамадзянскай пазіцыяй і прыблізна такой устаноўкай: «пакуль не выгналі, рабі што можаш». Не скажу, што іх шмат, але яны моцна ўплываюць сваімі паводзінамі на будучыню.

Адначасова не трэба забываць і пра феномен школьнага маўчання. Як сказала адна выкладчыца, цяпер былая, маўчанне ў беларусаў – гэта не знак згоды. Тут ёсць і «партызанскае», калі моўчкі робяць сваё, але грамадска важнае. Мае калегі моўчкі слухаюць ідэалагічныя ўстаноўкі, а дзецям ціхенька паказваюць, што, як і чаму.

І ўсё ж, ёлкі-палкі, каб у XXI стагоддзі хавалі свае погляды?! Баяліся слова і праўды? Жахліва, да чаго давялі краіну… На жаль, рэальнасць цёмная, несвабодная. І таму маем столькі флюгераў: куды падзьме – туды і плывуць.

Аднак гляджу на іх і радуюся, што ў нашай мове няма нават такога слова, як «чинопочитание». Гэта да таго, што не ўсё згублена. Беларуская прырода сваё возьме. Карацей:

цяпер большасць сапраўды складаюць маўчуны. Яе падпіраюць сабой энтузіясты. На гэтым і трымаецца адукацыя.

*– Інакш кажучы, насуперак усяму сённяшні школьны ўзровень не сказаць, каб добры, але і не самы кепскі? І насамрэч школа пры сваім нібыта маўчанні – гаворыць? Жыве здольнасцю да беларушчыны?*

– Гэта бачна і па адаптацыі дзяцей беларускіх палітычных уцекачоў у польскіх, літоўскіх, нямецкіх школах. Пастаянна чую ад замежных калег рэверансы і цешуся гэтым. Бо таксама не была ў баку.

Наша, маё пакаленне вельмі шчаслівае. Мы двойчы перажылі шчасце нацыянальнага адраджэння. Першы раз – у 1990-х, момант, пра які нават у снах не маглі марыць: незалежнасць, свая краіна. Глыток свабоды…

Другі раз – 2020-ы. Я бачу: нас большасць. І ўсё! Нікому нічога не трэба даказваць. Нацыя сфармавалася. Вось яна ёсць: выйшла паказацца ў Мінску, ва ўсіх гарадах і гарадках, у вёсках. Не хаваецца больш за эўфемізмамі, за белымі стужачкамі ці «джынсавымі рэвалюцыямі», дастае свае сцягі – і яны, аказваецца, у кожнага. Пляваць, што на нейкі час нас адкінулі назад… Галоўнае, дакладна ведаем што мы – ёсць.

Тое вельмі важна ўсведамляць, бо дэмакратыя – гэта наша нацыянальная каштоўнасць, наша прырода, яна ў нашай крыві, у традыцыях, у сямейным укладзе. І нікуды ад нас не падзенецца. Дабудуем і дзяржаву.

# ІРЫНА СУХІЙ



Фота з асабістага архіва І. Сухій

*Беларуская экалагічная актывістка, грамадская дзеячка і фотамастачка. Больш як трыццаць гадоў прысвяціла ахове навакольнага асяроддзя і прасоўванню ідэй устойлівага развіцця.*

*Нарадзілася 16 ліпеня 1963 года. Расла ў Мінску, пачала сваю дзейнасць у канцы 1980-х – у перыяд павышанай грамадскай увагі да экалагічных праблем у Беларусі, непасрэдна звязаных з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай станцыі.*

*Першыя крокі ў грамадскім жыцці былі звязаны з фотаклубам «Мінск» і легендарнай постаццю Валерыя Лабко, які стаў*

*праваднікам «новай хвалі» ў беларускай фатаграфіі. У той жа час удзельнічала ў дзейнасці фота-рок-асацыяцыі «Беларускі клімат» – знакавага арт-праекта, што аб'ядноўваў музыку, перформанс і фатаграфію. Гэтае аб'яднанне стала маніфестам свабоды творчасці і думкі, а для самой Ірыны – школай незалежнасці і натхненнем для будучага экалагічнага актывізму, у якім цесна перапляталіся мастацтва і грамадская пазіцыя.*

*У 1996 годзе стала адной з заснавальніц грамадскага аб'яднання «Экадом», што ператварылася ў найбольш уплывовую экалагічную арганізацыю краіны. Пад яе кіраўніцтвам «Экадом» займаўся адвакацыяй, абаронай экалагічных правоў грамадзян, ініцыяваў грамадскія кампаніі супраць будавання небяспечных аб'ектаў, распрацоўваў альтэрнатыўныя экалагічныя стратэгіі, прадстаўляў пазіцыю грамадзянскай супольнасці Беларусі на міжнародных пляцоўках – канвенцыях Орхуса і Эспаа. Прыкладам такой дзейнасці з'яўляецца Беларуская антыядзерная кампанія, што пачалася ў 2008 годзе пасля абвяшчэння планаў будавання АЭС у Астраўцы.*

*У 2007 годзе Ірына Сухій стала сузаснавальніцай таварыства «Зялёная сетка», якое аб'яднала больш за дваццаць экалагічных НДА і ініцыятыў. Сетка адыграла важную ролю ў фармаванні сучаснага экалагічнага парадку Беларусі, развіваючы супрацу з ЕС і прасоўваючы прынцыпы Еўрапейскага зялёнага курсу.*

*За сваю грамадзянскую пазіцыю неаднаразова сутыкалася з пагрозамі, ціскам, ператрусамі, затрыманнямі і штрафамі, а ў 2021 годзе была вымушана выехаць з краіны.*

*Працягвае сваю дзейнасць з Літвы, падтрымлівае беларускую экалагічную супольнасць і развівае міжнародную супрацу, не спыняе працы дзеля ўстойлівай будучыні Беларусі.*

ИРИНА
СУХИЙ

# НЕ ВЕРНЕМ В БЕЛАРУСЬ ДЕМОКРАТИЮ – НЕ СОХРАНИМ НИ СЕБЯ, НИ БЕЛОВЕЖСКУЮ ПУЩУ

## Мы создали объединение «Провинция»: в столице! Это метафора вызова. Удивительные были времена…

*– Пакаленне, народжанае ў шасцідзясятых гадах, яшчэ стрыножвалі тужлівым афіцыёзам. Але вы былі сярод тых, хто раздзіраў шаблоны. Жылі насуперак логіцы быцця: стоп – і рэзкі паварот, насуперак правілам… Адкуль гэтае жаданне вольнасці?*

– Готовьтесь: сейчас будет феминистский и психоаналитический заход.

Итак, дело житейское: у меня есть брат, всего на полтора года старше. Ему подарили фотик, а мне нет. Ему можно кататься на велосипеде за оградой дачного участка, мне – никак: «Он мужик, ему надыть, девочка смирной должна быть», – приговаривала бабушка, Полина Лукьяновна.

Вот так? С какой стати?! И получите внутренний протест. Захотелось все, чего «низзя».

В школе – золотая медаль, дальше – архитектурный факультет. На втором курсе бросила: укатила в белый свет автостопом с хиппи. Мама мрачно: «С цепи сорвалась». Так и было. Хотелось свободы, творчества. Через какое-то время появилось желание фотографировать.

*– Фатаграфаваць – гэта ж не проста глядзець. Вы капіявалі стыль іншых – ці адчувалі патрэбу рабіць па-свойму, без чужых парад пра дыяфрагму і вытрымку?*

– Когда бросила архитектуру, университет, я уехала в Питер работать дворником, но меня на эту «престижную» работу не взяли! Родители, конечно же, были в шоке: «Высшее образование, как без него ты можешь?!» А я, что – совсем бесчувственная? Надо их как-то успокоить, вот и поступила

в Москве в фотографический техникум. Так что все, честно говоря, было для меня сначала чем-то вроде шутки.

*– I што, у Мінску супакоіліся?*

– Какое там! Продолжали плакать: «Ну зачем тебе техникум? Возвращайся, иди тогда в фотосалон». Слезы близких – это… В общем, дала слабину: вернулась, пошла работать учеником в фотографию на улице Калинина. Через три месяца получила третий разряд, перевели на фабрику фоторабот «Вилия», где печатали незатейливые кадры с пленок, которые сдавал народ. Восемь часов подряд в темноте, при красном свете печатать одинаково дурацкие фотографии с чьего-то летнего отдыха – удовольствие сомнительное. Какое-то время работала сторожем (стрелком ВОХР) на ВДНХ, так что фраза «поколение дворников и сторожей» – это и обо мне. Про политику я тогда почти не думала: ну, совок, ну, типа перестройка… Все вокруг гнило, однако нас это особо не волновало. Хотелось просто творить, искать свое место.

*– I знайшлі яго ў падвале.*

– Именно там ютились многие неформальные, как их тогда называли, тусовки, и мне это было по душе. Стала работать в фотоклубе «Минск» – вот где настоящее место свободы! По четвергам собирался клуб, по вторникам – студия Валеры Лобко. В остальное время подвал – это место, где можно быть просто собой.

*– Легендарны ў нефармалаў адрас: Казлова, 2. Райскае месца для альтэрнатыўнай моладзі?*

– Пили вино, спорили, фотографировали, обсуждали. А в соседнем подвале художники-оформители, у Михала Анемпадистова. Мы пересекались, дружили. Это было пространство без прожекторов советской системы.

*– Тады яе ўжо напоўніцу сляпілі пражэктары перабудовы.*

– Да, что-то начало меняться. У нас прошла первая альтернативная выставка студии Валерия Лобко, участники которой уже создали ассоциацию творческой фотографии «Провинция» и фото-рок-ассоциации «Белорусский климат». В Красном костеле, тогдашнем Доме кино. «Белорусский климат» занимал первый этаж, но продержался ровно один день: «ответственные товарищи» посетили выставку и закрыли ее, вторая часть продержалась дольше, хотя некоторые работы тоже сняли. Удивительные были времена…

*– Гэта дысідэнцтва ў натуры, а яно ж побач з палітыкай, ці не так?*

– Я, кстати, занималась изготовлением и распространением диссидентской литературы.

*– Ого! Ратапрынт?*

– Нет, фотоаппаратом. Книгу переснимаешь на пленку, печатаешь на фотобумаге – получайте и наслаждайтесь крамолой.

*– Дарагое задавальненне?*

– Не то чтобы уж совсем! В начале восьмидесятых вполне по карману даже средним советским гражданам.

## В восьмидесятые никто из нормальных не мог любить Советский Союз

*– Дык вы падселі на дысідэнцкую літаратуру праз фатаграфію? Гэта звязаныя гісторыі?*

– Частично. После опыта работы в темноте на фотофабрике «Вилия» я осознала, что «ученье – свет, а неученье – тьма» в прямом смысле этого слова и быстренько поступила

на филфак. На сей раз, хоть и не обошлось без еще одного побега, закончила заочно.

*– Гэта быў універсітэт – ці педагагічны?*

– БГУ. Русский язык и литература.

*– І чаму менавіта філалогія?*

– Тянуло к слову, рефлексии. Диплом писала по Трифонову.

*– «Дом на набережной»? Класіка свайго часу, кніга-сімвал. Фактычна антысавецкая літаратура. Не выклікала пытанняў?*

– Так это 1987-й: начало короткой поры демократизации.

*– Тэму параілі?*

– Сама выбрала. А научным руководителем у меня была дочка Машерова, Наталья Петровна. Мало того, я даже ездила в Москву, пару часов разговаривала с вдовой Трифонова. Сейчас вот рассказываю – и как будто все заново вижу.

Наталья Петровна была удивительно спокойная, умная женщина, без тени надменности. Я даже слегка гордилась, что пишу под руководством дочки Машерова. С ней приятно общались.

*– Але ж перад гэтым – самвыд. Адкуль ён узяўся? Вынік хіпі-падарожжаў?*

– Это до хиппи, в начале восьмидесятых. Диссидентство тогда было… ну, знаете, прямо в воздухе. В восьмидесятые никто из нормальной молодежи не мог любить Советский Союз. Архитектурный факультет, художественные, артистичные люди – все во внутренней оппозиции. Чувствовали: надо делать иное, не компартийное. Если в официальной фотографии снимали парады, пионеров, комсомольцев, то мы – помойки, подворотни, развалины. Это было наше «анти». Логично нарисовался и переход к фоторазмножению «антикниг».

*– Як вы сталі актывісткай у галіне аховы навакольнага асяроддзя?*

– Как и у многих людей моего поколения, началось все с Чернобыльской катастрофы. Но не напрямую с аварии, она была как будто где-то далеко. Шло по касательной. Например, прилавки забили дешевым молдавски вином, а мы шутки шутили: «Выводим радиацию!»

А вот когда затем родила дочку, стало не до смеха – меня прошибло по-настоящему. Нужно кормить ребенка, а я панически боюсь купить продукты на рынке: вдруг их привезли из Гомельщины, из зараженных районов? Я, молодая мама, зациклилась на еде: что выросло у нас на даче – едим без проблем. Знала, где по дороге к Нарочи пятно, а где чисто. Там и собирала ягоды, грибы, сушила их, замораживала. К тому же тогда в магазинах была почти стерильная пустота… Самообеспечение было частично вынужденным. Мигом появилось очень сильное ощущение беспомощности. Я поняла, что экология – это, в том числе, и про то, чем ты дышишь и что ешь. Пришло осознание, что технический прогресс может привести нас к экологической катастрофе. Нас – это все человечество.

*– І з’явілася ідэя стварэння сваёй грамадскай арганізацыі?*

– В 1987-м скандинавская молодежь решила прорваться через железный, как тогда говорили, занавес – познакомиться с советскими ровесниками. Молодые датские коммунисты, шведские социалисты и прочие интересные люди. Они перед тем ездили в Неваду протестовать против испытания американцами ядерного оружия – была кампания Next Stop Nevada. А потом организовали кампанию Next Stop Soviet. Прилетели в Москву, попали в суперпопулярную телепрограмму «Взгляд». Везде искали неформальную молодежь. В Беларуси нашли нас – меня и моих друзей.

*– А далей яны да вас, вы – да іх? Тады ж немагчыма было нават уявіць такое!*

– После Скандинавии у всех, конечно же, был культурный шок. Пробовали как-то наложить увиденное на свою реальность, тем более, время позволяло потеснить комсомол, найти свою нишу. Создали организацию Next Stop – New Life, которая, кстати, была первой молодежной организацией, зарегистрированной уже в независимой Беларуси в 1992 году.

У «Некстопа» среди прочих был и проект по реабилитации чернобыльской ребятни. Наши партнеры делали выставки рисунков беларусских детей в Голландии и Германии, продавали их. А на эти деньги мы возили школьников на Байкал. Отличная оздоровительная практика.

*– Вось і масток у экалагічны рух!*

– Скорее, кладочка. Глубокое осознание проблемы появилось позже. Когда решили создать на Байкале свой центр для детей Чернобыля. А потом все: совок развалился, здесь уже другая страна, иные порядки, идея лишалась смысла. Но она засела в мозгах и придумали: а давайте поищем место у себя, на севере Беларуси, где чистая земля и вода! Мы были вот такими экологическими романтиками, говорили об экологии сознания, экологическом образовании детей, которые со временем будут министрами либо иными важными персонами. А значит, руководящие фигуры будущего по-другому начнут относиться к природе. И представляете, какой-то молодежной организации выделили четыре гектара земли на берегу озера Нещерда в Россонском районе!

*– Уяўляю іншае: пасля радасці раптам навалілася практыка: геадэзія, архітэктары, мясцовыя райвыканкам, сельсавет... А рэсурс?*

– Партнеры собрали 20 000 марок, по меркам 1994-го хватало на комплекс для полсотни человек. И вдруг – экономический

обвал: на то же самое требуется уже миллион баксов. Надежда превратилась в тыкву…

Вслед за этим и организовали «Экодом». Документы о регистрации отдали 21 июня 1996 года. И мы такие: «Ура, день летнего солнцестояния – прямо знак!»

*– У тым ліку і персанальна для вас: хутка пачалі зваць «мамай» беларускага экалагічнага руху!*

– Сейчас уже слышу про «бабушку»…

*– Але тады, пасля народзінаў ідэі, як пачыналі вучыць немаўля – праз азы экалагічнага лікбезу?*

– Увлеклись более глубоким – экологическим образованием в интересах устойчивого развития. В Березинском заповеднике собирали ребят, на различные программы и тренинги приглашали даже иностранных волонтеров.

*– Як тлумачылі дзецям, што экалогія – гэта не пра тэорыю, а пра жыццё?*

– На примерах. Есть такое упражнение: брали два аквариума: в одном чистая вода, а во второй по капельке добавляем все, что делаем в течение дня – зубную пасту, чай, кофе, немного мыльной после мойкі посуды воды… И впечатляющая финальная картинка: противная коричневая жижа. Вот ребенок и понимал, что такое разумное потребление воды. Просто, но срабатывало. Мы были фактически пионерами интерактива.

В конце девяностых – начале двухтысячных школьники еще жили на улице: в парках, в лесу, у бабушек в деревне. А теперь даже если они там, то в телефоне, а не на велосипеде. Прежде жизнь была более экологичной в буквальном смысле – в контакте с живой природой.

## В министерстве думали про меня плохо – ну и я в долгу не оставалась

*– Неймаверна для сённяшняга часу, але раней вы праводзілі навучанні і для чыноўнікаў. Як яны рэагавалі?*

– В 2002–2004 году я работала в проекте Европейского Союза по Орхусской конвенции – о доступе к информации и правосудию по экологическим вопросам, участии общественности в принятии решений. Мы делали тренинги для Минприроды, его областных комитетов.

*– І што, сур'ёзныя дзядзі пагаджаліся нават уключацца ў ролевыя гульні?*

– Открыла для себя Америку: чиновники тоже люди. Да, играли, да еще с каким знанием дела: одни представляли общественность, другие администрацию президента, третьи местную власть. И делали это всерьез, не дурачились. Иногда даже слишком точно изображали «администрацию».

*– То-бок у міністэрстве працавалі людзі з пачуццём адказнасці?*

– Да, тогда работали профессионалы, для которых экология была важной. Но потом, с каждым годом, все деградировало. И я со знанием дела повторяю: каждый последующий министр хуже предыдущего. Ну, может быть, за исключением нынешнего: он раньше возглавлял Минский комитет природных ресурсов и имел неплохую репутацию у общественников.

*– Як называлася вашая пасада падчас працы пры Мінпрыроды?*

– Лидер национальной команды. Это проект ТАСИС – международный, на шесть стран. Тогда его еще не требовали регистрировать. Мы работали свободно, даже с наличными деньгами: такое нынче невозможно представить. Офис проекта был в Минприроды. Сидела там два года, познакомилась с руководством, видела, как все устроено изнутри.

Сначала, конечно, они думали про меня плохо – ну и я в долгу не оставалась. А потом все поняли, что можно нормально коммуницировать. После проекта стало легче добиваться обратной связи: нас слушали, учитывали предложения.

«Экодом» повзрослел, участие общественности в принятии экологических решений стало нашей главной темой.

– *Што вам удалося рэальна змяніць у экалагічным заканадаўстве?*

– Как сторона Орхусской конвенции, Беларусь обязана была выполнять ее положения. И через международные механизмы мы реально улучшали национальное законодательство, процедуры участия граждан в принятии экологических решений.

Например, когда решили строить АЭС, не было правовых норм для проведения общественной экологической экспертизы. Все в ступоре: кто может ее проводить, каким образом это должно быть устроено? Мы взяли инициативу в свои руки и профессионально, с привлечением таких экспертов, как Иван Никитченко, член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси, Георгий Лепин, профессор, доктор технических наук, (после аварии на ЧАЭС добровольно с 1986-га по 1992 год работал в чернобыльской зоне), физик-ядерщик Андрей Ожаровский, оценили воздействие станции на природу и человека. Благодаря этому опыту появилось соответствующее положение, принятое министерством с небольшими поправками.

Потом предоставили властям свою экспертную оценку Светлогорского целлюлозно-бумажного завода. Также нелицеприятную. Рекомендовали изменить технологию, предупреждали о весьма реальных экологических рисках.

*– Улады адмоўчваліся, ігнаравалі, неяк рэагавалі?*

– Увы, ЦБЗ периодически воняет поныне, травит всех меркаптаном. Ну а за «нарушение покоя» мы все чаще стали попадать под огонь.

*– Але паводле міжнародных пагадненняў перaслед за экаактыўнасць забараняецца?*

– Да, в Орхуской конвенции, статье 3, четко говорится: никто не должен подвергаться наказанию, преследованию или дискриминации за участие в экологической деятельности. В самом начале это не всегда, но работало. А дальше начало сворачиваться.

Когда в 2012-м мы хотели передать письмо «Не стройте АЭС» приехавшему в Минск президенту России Медведеву, то не успели даже выйти из офиса, как тут же всех – под белы рученьки. Я отделалась штрафом: у меня была несовершеннолетняя дочь, а остальных посадили на 3–10 суток.

*– Спрабавалі абараняцца?*

– Подали жалобу в комитет по соответствию Орхусской конвенции. Беспредел по полной программе – как стерпеть? Да, мы-то среагировали, но международные механизмы так медленно работают и они такие мягкие… Только спустя пять лет появилось решение, что Беларусь нарушила регламент, преследуя антиядерных активистов. В Минск пришло требование откатить все эти решения, вернуть штрафы. Понятно, никто ничего делать не стал.

*– І паступова ўсё прывяло да ліквідацыі «Экадома»?*

– В 2021 годзе нас ликвидировали, как и многие другие общественные организации. Комитет Орхусской конвенции потребовал восстановить юридический статус организации, на что официоз издевательски ответил, что мы «сами себя закрыли, желая хайпануть перед донорами». В результате

страну лишили некоторых прав и небольших привилегий и она «гордо» вышла из конвенции.

## Мы обняли деревья – поди отдери. Прораб орет, а работяги бодались без особого энтузиазма: все ведь понимали

*– Вам помсцілі за недамоваздольнасць?*

– Мы были практически единственной организацией, которая пыталась через правосудие решать острые экологические вопросы. Самой зубастой. За последние годы на нашем счету около шестидесяти различных кейсов в судах.

*– З чым ішлі туды найчасцей?*

– В основном, конечно, речь о доступе к информации. Разные были дела. И понятно, выиграли мы очень немного. Побеждали, когда бодались не с госорганами, а с какими-то коммерческими предприятиями. Например, против свинокомплексов прямо на окраине Молодечно. Их в конце концов построили, но подальше. А помогла в том сражении общественная экспертиза, участие горожан в слушаниях.

Ходили в суды, если находилась конкретная группа, инициатива, человек, который говорил: «Мы готовы». Тогда подавали совместный иск – граждане и экологическая организация.

К сожалению, часто нарывались на другое. Когда с порога: «Вы должны нас защитить!» Это так не работает, дорогие друзья. Невозможно спасти всех, у кого во дворе рубят деревья. Можно научить тому, как остановить вырубку – куда жаловаться, что еще предпринять…

*– Вы ж не толькі з чыноўнікамі ды камерсантамі змагаліся?*

– Удивительно, но периодически пересекались на судебных заседаниях с ксендзами и батюшками.

В минской Котовке прямо в сквере костел хотели построить. Пробовали договориться с этой парафией, предлагали пробить другое место, готовы были собрать деньги на переделку проекта… В прессе пошли заголовки типа «экологи против католиков». Очень смешно… Но на самом деле – невесело.

Или история с церковью на берегу озера в Поставском районе. Там вообще частная инициатива: бизнесмен вздумал поставить храм прямо возле своей дачи на берегу, вопреки общественному мнению, законодательству и природе. Но вначале мы придержали его пыл, а потом контролеры прижали за взятки. Опять очень смешно: строил, значит, церковь, чтобы грехи замаливать.

*– А гісторыя з касцёлам чым скончылася?*

– Ну чем? Отменили выделение участка, сквер сохранился. Потом мы вместе с урбанистами и местными жителями благоустроили его.

*– Расказваеце так, быццам усё было проста ды гладка…*

– Не совсем. Однажды приехали из «Зеленстроя» с бензопилами да топорами, а тут мы с народом. Обняли деревья – и попробуй отдери. Прораб, или кто там, орал, командовал, они пробовали нас выпроводить, правда, без особого энтузиазма. Работяги все ведь понимали… 2017 год. И удивительно: ни милицию, ни ОМОН не вызвали. Мы ни на шаг не отступили, и они уехали восвояси.

## Наша модель сотрудничества? Меньше амбиций, больше синергии. Тогда усиливаем друг друга

*– Гэта размова няпоўная без згадкі пра «Зялёную сетку» – каардынацыю розных экалагічных НДА. Ці складана ўсіх сабраць? Амбіцыі, розныя планы…*

– Экологическое движение – это не про героев-одиночек, а про сетевое поколение. Именно сеть позволяет поддерживать экологическую грибницу страны в целом и эффективнее влиять на охрану природы.

Один журналист легко напишет прекрасную статью в одиночку. А один эколог не может реализовать свой замечательный проект. Он добьется очень немногого. Без взаимодействия, поддержки, обмена опытом у нас никак.

Кроме того, всегда были мегазадачи. Мы не просто хотим спасти одно дерево во дворе. Наша цель – чтобы во всех дворах Беларуси не вырубали деревья. Чтобы сохранялись заповедники, болота не осушались.

И, возможно, это идет от самого восприятия природы как экосистемы, где все связано со всем. Это и есть модель сотрудничества: меньше амбиций, больше синергии. Тогда усиливаем друг друга. Ну и, конечно, ключ – общие базовые ценности.

*– Як у супольнай працы ішла прыцірка? Што давалі асобным арганізацыям калектыўныя высілкі?*

– Смотрите, «Экодом» – один из инициаторов создания «Зеленой сети». Мы вложили туда очень много сил. Здоровое сообщество – это всегда больше возможностей для каждого, усиление коммуникации. Реально стали эффективнее, увидев вблизи опыт небольших местных организаций.

А еще «Зеленая сеть» была зажигательной, с воодушевляющей лидерской ролью. Она собрала много молодых людей, которые делали отличные акции, волонтерские программы. Школы экологического активиста, экологического юриста – через них вовлекали людей, и многие потом создавали свои инициативы либо оставались рядовыми экосферы.

Только в списке волонтеров около 500 человек. Огромная живая база!

*– Але вы і самі па сабе былі вялікай арганізацыяй, якой шмат пад сілу.*

– Да разве мы одни впечатляли количеством? Были и другие. Все ликвидированы. Но по отдельности никому не под силу потянуть, например, экофорумы. А мы каждые два года проводили их. И двигателем была именно сеть. Сообщество развивало каждого.

*– А як вы падымалі яго?*

– Суммой усилий, опять же, каждого. Но в совокупности эти усилия давали реальное влияние. Нет случайности в том, что не экодомовского, не любой другой отдельной организации, а именно представителя «Зеленой сети» включили в официальную делегацию Беларуси на климатическом саммите, когда подписывалось Парижское соглашение. Представляете? Тогдашнее Минприроды понимало, что им не хватает специалистов, и позвало активиста сети в делегацию. А там была настоящая работа, не прогулка: круглые сутки над документами, чтобы были учтены интересы страны.

## Беларусь вся в целях устойчивого развития, но власть все дальше от него

*– У 2020-м большасць уразілася дваровым рухам і задалася пытаннем: адкуль раптам той супольны парыў, адчуванне свайго двара – усяго вось гэтага вар'яцка-ашаламляльнага руху?*

– А для меня в этом никакого сюрприза. Потому что раз за разом сталкивалась: люди готовы объединяться, когда чувствуют несправедливость в отношении их территории, земли. Уплотнительная застройка, безумная война ЖЭСов с деревьями, вместо которых высаживали неспособные прижиться прутики,

эффективно мобилизовали общественную энергию. Я видела взросление нашего социума.

*– Не спрашчаеце праблему? Калі вырубка ў двары ці забудова побач, тады так – загараюцца, абы хто з паходняй знайшоўся. А як атамная станцыя на мяжы з Літвой, у Астраўцы, дзе яны не былі ніколі, тут канец энтузіязму: мая хата з краю. Хоць насамрэч усё горшае ў сто разоў. Што рабіць з парогавай псіхалогіяй, калі хвалюе толькі тое, што побач са сваім домам?*

– В этом смысле интересен проект «Зеленый дозор»: собирали активистов из разных городов, учили их законодательству, общественным процедурам. Они видели, например, как где-то из коровника нагло сливают фекалийную вонючку в речку, и сообщали в местную власть или прокуратуру.

Около 200 человек по всей Беларуси следили за экологическими проблемами. Это давало ощущение: нас много, мы везде, мы видим все.

И заметили: когда местная власть понимает, что за ней приглядывают гражданским взором, пишут жалобы, то она поджимает хвост и начинает вести себя приличнее. Пусть и не идеально.

*– З 2006 года вы цягнулі ў Беларусь еўрапейскія працэдуры: бюджэт удзелу, адкрытасць, празрыстасць… Як гэта атрымлівалася ў не самай спрыяльнай для таго атмасферы?*

– Для нас это миссия. Поэтому идем, спотыкаемся, падаем, отходим, подымаемся… Сплошные противоречия и противодействия. Беларусь вся увешана плакатами о целях устойчивого развития, но власть все дальше от от него. Поэтому нужно выжимать максимум из возможного, как бы ни было сложно.

*– Што ў паводзінах чыноўнікаў вас больш за ўсё абурала падчас бясконцых атак на праваабарончую экасістэму?*

– Самый длинный и болезненный кейс – все та же злополучная атомная станция. Когда у правительства появилась мысль о ней, мы тогда такие самоуверенные либо наивные: «АЭС в Беларуси? Да это невозможно, потому что это невозможно никогда!»

У меня было ощущение, что все моментально выскажутся «против». А «все» взяли да промолчали. Тот самый порог непонимания не просто страшного, а недопустимого.

Тем не менее, пишем в Минэнерго: «Готовы помочь, потому что атомные станции – это отдельная категория, и по ним должны проводиться особые общественные обсуждения, как прямо обозначено в подписанной Беларусью Орхусской конвенции». И спрашиваем о государственном видении роли общественных организаций в этом процессе.

Ответ: она в том, чтобы бороться с радиофобией беларусов. Издевка.

*– Ці кароткая даведка: «людзішак» як партнёраў не ўспрымаюць. Але ж перад тым вы ладзілі з міністэрствам?*

– При Минприроды тогда как раз существовал общественный консультационный совет.

На одном из заседаний я подняла эту тему, говорю: «Как же так? В атомной ситуации вообще должно быть национальное обсуждение!» – «Да что обсуждать? Решение еще не принято». Проходит еще немного времени и: «А что теперь обсуждать? Решение уже принято».

Вот такая логика. Даже когда есть международные нормы, даже когда Беларусь официально сторона соглашений, все можно похерить, если кому-то очень хочется быть ядерной державой.

Повторю: в структурах Минприроды часто работают нормальные люди. Их действительно заботит беларусская природа и люди, они стараются в рамках своих возможностей

делать правильные вещи. Но система не дает! Многие хорошие специалисты поэтому ушли.

*– Гэта выснова пярэчыць гадамі складзенаму меркаванню, што НДА нельга палітызаваць, маўляў, яны ў полі грамадзянскай супольнасці. Памылка?*

– Экологические вопросы сплошь политические. Чтобы и сохранить природу, и обеспечить права граждан на благоприятную окружающую среду (то есть на чистую воду, воздух, землю), чтобы международные соглашения реально работали, нужны демократические институты. А когда их нет? Беларусское экологическое законодательство неплохое. Но правоприменительная практика – совсем другая история.

*– Нельга дабіцца ўстойлівага развіцця без дэмакратычных змен?*

– Да: нельзя, просто невозможно сохранить Беловежскую пущу без демократии в Беларуси, потому что только при демократии местные жители, сообщества, организации гражданского общества имеют возможность защищать свои интересы, интересы природы. В случае, когда власть и все ресурсы сконцентрированы в руках небольшой группы людей, которые преследуют личные корыстные цели, отстоять права граждан, сохранить природу практически невозможно или очень сложно.

В ценностях глобальных зеленых, которые мы разделяем, есть не только экологическая мудрость, максимальная забота о биоразнообразии, но и демократия. Что совершенно логично.

## Мечты сбываются чаще, чем прогнозы. Новая Беларусь – зеленая Беларусь.

*– Нешта не відаць на гарызонце змен у бок дэмакратыі. Тады якой вы бачыце перспектыву экалагічнага руху і экалагічнай Беларусі?*

– Что нам делать? Использовать все возможности влияния. Их не так много, но некоторые все еще остаются. Важно мониторить обстановку. Важно понимать, что происходит, иметь цельную картину и показывать это людям. Когда видят неладное, понимают, что делать.

Нельзя жалеть усилий, энергии на подготовку будущих изменений. Для того, чтобы будущее наступило, очень важно создать представление о том, каким мы хотим его видеть.

*– Але гэта ж могуць быць проста вашыя мары...*

– Мечты сбываются чаще, чем прогнозы!

Белорусское экологическое движение разработало видение будущего зеленой Беларуси, ориентируясь примерно на 2050 год, сформулировало концепцию «Зеленая Беларусь 2050». Это очень четкая программа и на сегодня, и на завтра. Благодаря ей при определенных условиях можем сразу же стать впереди планеты всей.

*– Гэта такая аптымістычная надзея?*

– Вовсе нет: именно впереди. Ведь в старой Европе сложно перестраивать традиционные, веками сложившиеся системы, а у нас много чего надо будет создавать с нуля, что дает шанс сделать все правильно при наименьших затратах времени. Да и средств.

«Зеленая Беларусь 2050», с одной стороны, утопия, проект мечты, основанной на зеленых ценностях и синхронизированной с современными европейскими зелеными процессами. Но с другой стороны, это очень, очень практический проект, направленный на совершенно необходимые изменения. Если мы как страна не повернемся лицом к тому, что в Европейском Союзе называют «зеленым переходом», то не сможем развиваться.

Мы верим, что мечта может стать реальностью, во всяком случае, имеет шанс стать ей. При условии общественной поддержки.

*– І як яе атрымаць?*

– Здесь очень важную роль играет образование, включение молодых людей, для которых экологические сегодняшние проблемы, например, последствия изменения климата – это не пустые слова, а реальность, в которой им предстоит жить. Запрос есть. Молодежь понимает: они застанут не лайтовые последствия изменения климата, а, возможно, уже серьезные климатические катастрофы, миграции народов, новые конфликты. Вот новое поколение и волнуется за свое будущее. И с этим можно, нужно работать.

Здесь большой потенциал – мы видим надежду как раз в этом.

# АЛЯКСАНДР КАПУЦКІ



Фота з асабістага архіва А. Капуцкага

*Нарадзіўся 27 снежня 1962 года ў Маладзечне ў сям'і рабочых.*

*Па сканчэнні ў 1985 годзе Беларускага тэхналагічнага інстытута працаваў у Мядзельскім лясгасе, а потым на Маладзечанскім заводзе тэхналагічнай аснасткі. На прадпрыемстве ўпершыню стварыў працоўную дакументацыю на беларускай мове.*

*У 1986–1987 гадах далучыўся да нацыянальна-дэмакратычнага руху (хаця з працай Беларускай майстроўні і яе некаторымі дзеячамі пазнаёміўся ўжо ў 1984-м). У 1987 годзе быў абраны кіраўніком маладзечанскага нефармальнага аб'яднання «Крывіч», што ўваходзіла ў Канфедэрацыю беларускіх суполак. Удзельнічаў у Другім вальным сойме КБС у Вільні, у сходзе ў мінскім Чырвоным касцёле (тагачасным Доме кіно) для стварэння грамадскага*

*аб’яднання «Мартыралог» і аргкамітэта Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне», а затым у 1989 годзе – у Вільні – ва ўстаноўчым з’ездзе БНФ. Тады ж на сваім заводзе стварыў першасную суполку руху, пасля – гарадское аддзяленне. У 1990 годзе ўдзельнічаў у стварэнні раённай арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны.*

*У 1991 годзе быў запрошаны тагачасным кіраўніком Маладзечна, вядомым дэмакратычным палітыкам Генадзем Карпенкам, на працу ў гарвыканкам.*

*У 1995 годзе ад Партыі БНФ і праз збор подпісаў вылучаўся кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета, сярод васьмярых кандыдатаў заняў у першым туры першае месца і разам з кандыдатам-камуністам выходзіў у другі тур. Але ў выніку фальсіфікацый выбары прызналі нядзейнымі. Падобнае адбылося і ў 2003 годзе, калі балатаваўся ў раённы савет.*

*У 1997 годзе быў звольнены з гарвыканкама на падставе скарачэння, бо не падзяляў палітыкі тагачаснага прэзідэнта.*

*У 1999 годзе разам з былым дэмакратычным дэпутатам Мінскага абласнога савета Аляксеем Хвосцікам стварылі ў горадзе грамадскую прыёмную і распачалі праваабарончую дзейнасць, а ў 2000-м далучыліся да праваабарончага цэнтра «Вясна».*

*У 2022 годзе адбываў двухмесячны адміністрацыйны арышт у маладзечанскім ІЧУ, быў прызнаны беларускай праваабарончай супольнасцю палітзняволеным. Пасля адбыцця пакарання быў вымушаны пакінуць Беларусь.*

*За грамадска-палітычную дзейнасць неаднаразова прыцягваўся да розных відаў адміністрацыйнай адказнасці. Упершыню апынуўся пад судовым праследам у 1990 годзе, за выкарыстанне бел-чырвона-белага сцяга на грамадскім мерапрыемстве, але тады быў апраўданы. Гэта адзін з першых у гісторыі БССР судовых працэсаў за выкарыстанне нацыянальнай сімволікі, што адлюстравана ў першым томе энцыклапедыі «Гісторыя Беларусі».*

АЛЯКСАНДР
КАПУЦКІ

# АД ВУЗЕНЬКАЙ СЦЕЖКІ ДА ВЯЛІКАГА ГАСЦІНЦА

## «І не думайце сунуцца са сваёй скаргай: ці спыняйцеся – ці атрымаеце па поўнай»

*– Які момант стаў для вас асабістым адкрыццём: сітуацыя «иногда не до законов» насамрэч «застабільваецца»?*

– Найперш уразіла збіццё апазіцыйных дэпутатаў, абвясціўшых галадоўку ў Авальнай зале Вярхоўнага Савета. Гэта шакавала. Яшчэ праз месяц, у маі 1995 года, я балатаваўся ў Вярхоўны Савет ад БНФ. Сабралі подпісы, каманда працавала актыўна: заняў у сваёй акрузе першае месца і выйшаў у другі тур разам з камуністам Кандраценкам. Але не паспелі нават нарадавацца – навіна: выбары на нашай акрузе не адбыліся! Нібыта не хапіла некалькіх дзясятых адсотка да 50 % квоты яўкі.

І хоць хутка разабраліся, што ўлады перакінулі адзін дом у іншую акругу, ніякія тлумачэнні не дапамагалі. Разам з апанентам паехалі ў Цэнтральную выбарчую камісію. А там нас яшчэ ў калідоры папярэдзілі: «І не думайце сунуцца са сваёй скаргай: ці спыняйцеся – ці атрымаеце па поўнай». Вось і зразумеў: усё пайшло не ў лепшы бок.

*– Тады паралельна праходзіў і рэферэндум. Ён таксама ўразіў?*

– Змена сімволікі і наданне рускай мове статусу дзяржаўнай балюча адгукнулася ўва мне. Цяпер разумею: трэба было байкатаваць. Але тады панавала эйфарыя, па інерцыі думалі, што здолеем вярнуць этап перамен. Калі многія галасавалі «за новую сімволіку», то думалі, што гэта якраз Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг. Але насамрэч ім лоўка падсунулі старыя, назваўшы іх новымі…

*– Вы некалькі гадоў працавалі ў гарвыканкаме. Выпадковага чалавека з вуліцы наўрад ці запрасілі б у гарадскую ўладу?*

– Прыйшоў у аргаддзел у 1991 годзе, па запрашэнні Генадзя Карпенкі. Бо ўжо меў за плячыма багаты досвед грамадскай дзейнасці. Яшчэ ў 1984-м трапіў у асяроддзе

Беларускай майстроўні: брат зацягнуў на іх сустрэчы ў мінскім Доме прафсаюзаў. Пазней пазнаёміліся з Генадзем Кахаbuild Каханоўскім, маладзечанскім краязнаўцам, і той звёў з «Беларускай хаткай». Праз выразнае беларускае кола я і перайшоў на мову.

*– У тагачасным кансерватыўным Маладзечне гэта ж амаль як грамадзянскі подзвіг?*

– Не без таго. Але Каханоўскі, мінскія талакоўцы давалі сілу. Гэта быў мой унутраны выбар, асабістая дэкларацыя незалежнасці.

Калі ў Маладзечна пераехаў Сяргей Дубавец, мы стварылі гістарычна-культурнае аб’яднанне «Крывіч». Нават удалося зарэгістраваць яго, дасюль памятаю хаджэнні ў гаркам з паперамі.

*– Пачыналі з чыстай культура, а далей пакрочылі ў бок грамадзянскіх ініцыятыў?*

– Мы і раней не абмяжоўваліся толькі асветай. Напрыклад, у цэнтры горада каля кінатэатра «Радзіма» чыноўнікі задумалі ўпарадкаванне – і давай зносіць тое, што не пасавала іх густу. Але нам удалося сабраць подпісы ў абарону гістарычнай спадчыны, і бульдозеры развярнуліся. Цяпер там музей.

Змагаліся і за драўляны вакзал на станцыі «Уша», які памятаў Максіма Багдановіча. Нам паабяцалі яго захаваць, перанесці на пляцоўку з помнікамі драўлянай архітэктуры. На жаль, падманулі: разабралі і знішчылі.

Дарэчы, клапаціліся не толькі пра горад. Напрыклад, ездзілі ўпарадкоўваць могілкі паўстанцаў у Плябані, каля Краснага. Праца сціплая, але жывая. Ну і пайшоў далей: удзельнічаў у II Вальным сойме КБС у Вільні, а таксама ва ўстаноўчым сходзе БНФ у Чырвоным касцёле. Гэта быў натуральны шлях – ад культурнай самаарганізацыі да палітычнай адказнасці.

*– Вы працавалі на дзяржаўным прадпрыемстве. Не баяліся быць заўважаным, абвінавачаным у нелаяльнасці?*

– Наадварот: стварыў першую суполку падтрымкі БНФ на заводзе тэхналагічнай аснасткі, які належаў Таварыству сляпых. Быў у канструктарскім аддзеле і зрабіў у 1990-м годзе першы чарцёж на беларускай мове. І вось тое нарабіла шуму: ні парткам, ні заводскае начальства не разумелі, як ды што рабіць. Пакуль кансультаваліся, узгаднялі пазіцыі, штамп пайшоў у вытворчасць. Для мяне гэта стала сімвалам: беларуская мова ўваходзіць не толькі ў побыт, але і ў працу, у метал. А значыць, у жыццё.

*– Давайце вернемся да вашай гарвыканкамаўскай пары, калі даручылі развязанне тапанімічнага вузла. Не той выпадак, каб раз мячом – і справа вырашана?*

– Камісія перайменавання вуліц з'явілася ў 1992-м. Я стаў яе сакратаром: рыхтаваў пратаколы, уносіў прапановы. Адраджалі тое, што выкрасліла з гісторыі савецкая эпоха.

*– І што ўдалося?*

– Вуліцы Савецкай вярнулі старую назву Віленская, Горкага зноў пачала звацца Замкавай, Пушкіна – Гарадоцкай. А праспекту Леніна далі назву Вялікі Гасцінец. Гэта моцна раззлавала ветэранаў, асабліва адстаўных вайскоўцаў з усяго СССР: яны бясконца пісалі скаргі, зрабілі невуцкі пераклад – «Большой подарок» – і здзекаваліся з таго. Не жадалі разумець, што гэта старадаўняя назва. Але мы адстаялі сваё.

*– А ці былі прыклады, калі савецкія знакі памяці замянялі зарубкамі беларускасці?*

– А як жа! 60 год Кастрычніка – у Францішка Скарыны.

Цэлая эпапея з плошчай Леніна: спрачаліся, як назваць: Вітаўта Вялікага, Еўфрасінні Полацкай? У выніку прыйшлі да кампрамісу: проста Цэнтральная плошча. Не ідэальна, але ўсё ж не ў гонар «самага чалавечнага чалавека».

*– Працэс спынілі пасля адыходу Карпенкі?*

– На яго пачалі ціснуць яшчэ раней і ўрэшце звузілі нашую агульную актыўнасць. Але галоўнае паспелі: вярнулі сэрца горада да яго сапраўдных імёнаў. Лічу тое не проста перайменаваннем, а вяртаннем годнасці.

## Тандэм Карпенка – Ганчар: мэр – як адкрытая энергія, намеснік – як інтэлектуальная канструкцыя

*– Што сімвалізуе эпоха Генадзя Карпенкі? Ці мог гарадскі старшыня і яго намеснік Віктар Ганчар сапраўды стварыць за два гады «горад-сонца»?*

– Каб не «новы» палітычны курс краіны, ім па сілах было перавярнуць Маладзечна. Месца тады літаральна жыло і дыхала пераменамі. Уверсе не разумелі, што тут, унізе, прарыў у будучыню.

Напрыклад, Лукашэнка не раз наракаў: «процьму банкаў набудавалі!» Але ж сам факт іх з’яўлення – сведчанне развіцця, эканамічнага кіслароду. Гэта значыць, горад пачынаў функцыянаваць як жывы арганізм. У Швейцарыі таксама ўсё стаіць на банкаўскай сістэме.

Або такі праект: вядомая кампанія Sharp хацела выкупіць наш «Спадарожнік». Завод саюзнага падпарадкавання, паўсакрэтны, дзе выпускалі розныя радыётэхнічныя рэчы – рацыі, апаратуру… Японцы прапанавалі інвестыцыі, пераабсталяванне, тэхналогіі. Але ўрад Кебіча заблакаваў здзелку! Без разумных тлумачэнняў – назло маме вушы абмарожу… І прадпрыемства, якое магло стаць сучасным цэнтрам вытворчасці, паступова знікла, урэшце ператварылася ў гандлёвы цэнтр. Вялікая карысць дзяржаве?

Гэта ўсё выдатна ілюструе: нават калі ў мясцовых кіраўнікоў была воля і энергія, сістэма зверху не давала разгарнуцца, душыла ініцыятыву, дух бізнесу і прадпрымальніцтва.

Але Маладзечна на нейкі момант сапраўды стала месцам з дыханнем новага часу.

*– Генадзя Дзмітрыевіча вы ведалі асабіста. Гэты новы тып кіраўніка, асоба, у якой спалучаліся тэхнар і гуманітарый. Доктар навук, дырэктар завода парашковай металургіі.*

– І чалавек надзвычайнай душэўнасці. Ён не цярпеў бар’ераў паміж сабой і гараджанамі. Мог выйсці на вуліцу, пагаварыць, пачуць праблему – і адразу ж пачаць дзейнічаць. Не для паказухі і пратакола, а шчыра, зацікаўлена. З павагай да людзей і карысцю для горада.

Пры ім Маладзечна стала поўніцца беларускай культурай: мэр падтрымліваў усё, звязанае з творчасцю. Менавіта тады з’явіўся фестываль нацыянальнай песні і паэзіі. Не баяўся таксама нефармату: у 1993 годзе мы ладзілі рок-фэст – вялікі, гучны, жывучы. Без падтрымкі Карпенкі не пацягнулі б.

Культура для яго была часткай здаровага гарадскога жыцця. Ён думаў пра ўсё гэта шырока: дбаў пра спорт, інфраструктуру адпачынку… Пры ім футбольная каманда «Маладзечна» ўзнялася на самыя вярхі. Усё рабіў без шуму, але з бачным вынікам.

*– Як не падобна да папярэднікаў, класічных савецкіх начальнікаў з маршальскім гонарам…*

– Шкада, што і наступнікі не пераналі стыль Крапенкі, без пыхі і халоднага адміністрацыйнага тона. Ён гаварыў з чалавекам як з роўным. Вельмі просты, але не вульгарна, а па-чалавечы адкрыта. Ніколі не паказваў, што вышэйшы за іншых. І таму яго сапраўды любілі, паважалі – не за пасаду, а за тое, што свой.

Калі Лукашэнка ўзяў сваім папулізмам, то Карпенка – натуральнасцю. Чалавек глыбока інтэлігентны, але народны

па сутнасці. У ім адчувалася харызма, без паказнога пафасу. Ён умеў слухаць людзей, не апускаючыся да таннай блізкасці, не пераходзячы грань годнасці.

*– А побач Ганчар. Хіба яны падобныя?*

– Гэта зусім іншы тып. Інтэлектуал, юрыст вельмі высокага ўзроўню, выдатна адукаваны, элегантны. Заўсёды дакладна падбіраў словы, прыемна было слухаць. Але ў ім жыла сталічная пыха. Ён ніколі не прэтэндаваў на статус, так бы мовіць, народнага ўлюбёнца. Бо не меў патрэбы размаўляць з людзьмі проста так. Чалавек іміджу… Пры ўсім тым – прафесіянал, які дапамагаў Карпенку ў эканамічных і арганізацыйных справах.

Іх тандэм працаваў эфектыўна: мэр – як адкрытая энергія, намеснік – як інтэлектуальная канструкцыя. Гэта быў, можа, адзін з нешматлікіх выпадкаў, калі розныя натуры гарманічна дапаўнялі адна адну.

## Ніякага палітычнага тэатру: гарадская рэальнасць з прыцэлам на еўрапейскія стандарты

*– Нярэдка даўно мінулае ўяўляецца ў нечым прыхарошаным. У тагачасным Маладзечне было сапраўднае самакіраванне – ці прыгожая дэкарацыя?*

– Ніякага тэатру: рэальнасць з прыцэлам на еўрапейскія стандарты, хоць і ў пачатковай форме. Гарадскі савет складаўся з дэпутатаў, якія былі сапраўды актыўнымі і самастойнымі. Палова, а то і больш, – людзі з дэмакратычнымі поглядамі, побач з імі – прадстаўнікі старой наменклатуры.

Вострыя пытанні вырашаліся праз адкрытую дыскусію. Карпенка ніколі не ціснуў, не маніпуляваў. Ён слухаў, і калі прымалі рашэнне – яно выконвалася. Мы ўпершыню сутыкнуліся з працэсам, у якім адчуваліся ўзаемныя адказнасць і павага.

Яшчэ не такая мадэль самакіравання, як цяпер у Польшчы, але з выразным кірункам у той самы бок. Мы былі на парозе новай мадэлі грамадскага жыцця. І калі б гісторыя не павярнулася інакш, магчыма, Маладзечна стала б сапраўднай школай беларускай дэмакратыі.

*– Калі пачалося закручванне гаек? Вы трапілі пад гэты прэс? Як доўга ўвогуле прабылі ва ўладзе?*

– На дзіва, я пратрымаўся ажно да 1997 года. Гэта апошнія рэшткі перыяду дэмакратызацыі: на нелаяльнасць яшчэ не зважалі, нешта можна было рабіць без санкцыі зверху… Тым больш, неўзабаве трапіў у апарат гарадскога старшыні Вікенція Сіроты, чалавека дэмакратычных поглядаў. Мы сядзелі ў асобным будынку, мелі сваю невялікую каманду. І таму я фактычна не падпарадкоўваўся выканкаму. Гэта і ратавала некаторы час.

А калі пачалося татальнае ўмацаванне вертыкалі і ўсе паўнамоцтвы сканцэнтраваліся ў руках выканаўчай улады, незалежныя структурныя адзінкі сталі непатрэбныя. Пачалося скарачэнне: фармальна законна, а па сутнасці – палітычнае рашэнне: пазбавіцца тых, хто асацыяваўся «не з тым» духам.

*– Куды падацца чалавеку, скарочанага з улады? Тады вы ўжо адчулі яе не проста чужой, а варожай?*

– Пайшоў у цэнтр занятасці, аформіў дапамогу. Паўгода мне яшчэ нешта выплачвалі: нейкі мінімум, пакуль шукаў, што рабіць далей.

І тут пачалося новае жыццё, якое цяпер называю другой грамадзянскай рэінкарнацыяй. Мы ў горадзе стварылі грамадскую арганізацыю – Цэнтр грамадскіх ініцыятыў. Тады яшчэ ўдавалася мець дапамогу ад замежных фондаў. І гэта адкрыла новыя магчымасці.

У 1999 годзе я напісаў праект «Прававая асвета насельніцтва», выйграў грант фонду «Еўразія». Ідэя простая, але вельмі

патрэбная: стварыць спецыялізаваную грамадскую прыёмную. Вялі бухгалтэрыю, справаздачнасць – усё афіцыйна. Людзі цягнуліся штодня, бо з даступнай юрыдычнай дапамогай проста бяда… Усё працавала як гадзіннік, пакуль не пачаліся наезды: праверкі, адмова ў арэндзе, пошукі чарговых офісаў… КДБ, падатковая… Але мы трымаліся, пакуль маглі.

Наш юрыст Аляксей Хвосцік паспеў пабыць дэпутатам у абласным савеце. Вельмі моцны спецыяліст, сумленны і спакойны чалавек, з глыбокай павагай да беларускай справы. Ён прымаў скаргі, пісаў звароты, дапамагаў судзіцца – і ўсё без фанфараў, але вельмі эфектыўна.

*– А Цэнтр грамадскіх ініцыятыў – толькі прыгожая назва ці ў горадзе сапраўды хапала рэальнага руху?*

– Гэта сапраўдны рэсурсны цэнтр, які падтрымліваў іншыя грамадскія ініцыятывы: экалагічныя, культурніцкія, моладзевыя. У нас была тэхніка, арганізавалі камп’ютарныя курсы, вучылі людзей працаваць з інтэрнэтам, дакументамі.

Але важнейшае іншае: моладзь літаральна жыла гэтай прасторай! Газету сваю выпускала. Дзейнічала харугва беларускіх скаўтаў: збіралі сродкі на лагеры, вучылі дзяцей адказнасці і самастойнасці.

Мы ладзілі сустрэчы, дыскусіі, абмяркоўвалі падзеі, арганізоўвалі палітычныя акцыі. Памятаю, у парку праводзілі пікет з удзелам Сямёна Домаша, які тады спрабаваў балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах. Вось хлопцы і распаўсюджвалі ўлёткі, дапамагалі арганізаваць сустрэчы. Умелі бавіць час. Чаго варты толькі фестываль «Рок-немаўля»: прыязджалі «Крама», N.R.M., іншыя гурты.

Мы падтрымлівалі рытм актыўнага грамадзянскага жыцця. Горад доўга дыхаў свабодай…

## Даходзілі да Вярхоўнага Суда, ЦВК: гэта была школа грамадзянскай настойлівасці

*– Але ўрэшце Цэнтр грамадскіх ініцыятыў адсунулі на перыферыю, усё паступовa заглухала. Чарговае пераключэнне. Куды гэтым разам?*

– Дзякуй Алесю Бяляцкаму – прапанаваў далучыцца да «Вясны»: «Вы ж фактычна займаецеся тым самым». Мы даўно ведалі адзін аднаго: з канца васьмідзясятых, калі ствараўся БНФ. Так разам з Хвосцікам пачаў працаваць у рэгіянальнай сетцы арганізацыі.

Асноўным інструментам была ўсё тая ж прававая дапамога. Прымалі людзей, вялі справы ў судах… Напрыклад, праз нашыя высілкі рашэннем Вярхоўнага суда аднавілі на працы незаконна звольненую з фабрыкі работніцу. Два гады барацьбы, якая скончылася перамогай: жанчыне выплацілі ўвесь заробак за гэты час. Уяўляеце, як рос аўтарытэт пасля такіх сітуацый?

Безумоўна, разам з БХК удзельнічалі ў выбарах як назіральнікі. Бачылі парушэнні – складалі скаргі, пісаў іх усё той жа Хвосцік. Даходзілі да Вярхоўнага Суда, ЦВК… Гэта была школа грамадзянскай настойлівасці.

Акрамя таго, займаліся асветай: напрыклад, для прадпрымальнікаў выдавалі брашуры кшталту «Да вас прыйшла праверка». Былі і маленькія праваабарончыя газеты, якія распаўсюджваліся ў горадзе. Праводзілі трэнінгі, семінары, навучалі, як абараняць сябе.

*– А як вас успрымалі? Не было гэткага: «О, грантасосы, жывяце на заходнія грошы»?*

– Калі і казалі, дык не ў вочы. А ў большасці – з павагай. Бо людзі бачылі: ім дапамагаюць. Ды і не было ў нас тых грошай, ніхто не жыраваў. Мы ўсе працавалі, дзе толькі маглі. Я, напрыклад, кантралёрам на аўтастаянцы, гандлёвым агентам у мінскіх фірмах… А як скончыў у 2010-м Беларускі

інстытут правазнаўства, то падпрацоўваў юрыстам у калгасах – на паўстаўкі, па кантрактах. Хлеб не з лёгкіх, але трэба было жыць.

## З праспекта – на вуліцу, з той – на тратуар. А далей – вузенькая сцежка

*– У пачатку дзевяностых людзі былі адкрытыя, верылі, што ўсё можна зрабіць разам. Потым прыйшла стомленасць, апатыя, страх. Бачылі, як закрываюцца, вучацца маўчанню?*

– Я гэта адчуваў літаральна па вуліцах: пасля 1996-га мінакі ўсё больш ціха, з асцярогай аглядаліся. Настроі ператварыліся з «давай зробім» у «давай перажджом». І гэта, напэўна, самае балючае, што тады здарылася.

Спачатку ў народа забралі дробныя свабоды, пасля пачалі знікаць людзі... Усё звялося ўрэшце да аднаго цэнтра, да аднаго голасу – ручнога кіравання. Звужвалася і грамадская дзейнасць.

*– З праспекта – на вуліцу, з той – на тратуар. І вось толькі вузенькая сцежка. Людзей зноў перавялі ў насельніцтва, у саўковую масу, якая жыве прынцыпам «абы не чапалі». Схема такая?*

– Я згадваў, што ў нашым гарсавеце больш за палову дэпутатаў былі дэмакраты. А тут усё адным махам аднялі, вярнулі сістэму прызначэння «сваіх».

*– Як з форткай у вясковым доме – толькі прыадчынілася, а гаспадару скразняк не даспадобы: забіў кароткімі цвічкамі.*

– Але шараговец, які не ўнутры працэсу, нават не ўсведамляў, што адбываецца. Ён бачыў: на галасаванне завуць – значыць, усё добра. «Выбары ж ёсць!» А гэта ўжо імітацыя... І хоць незалежная прэса пра яе пісала, свабодны інтэрнэт з’явіўся, а ўсё больш махалі: «Што мы можам?» Гэта страшнае пачуццё, бездапаможнасць...

*– Ну а вы, хто ўнутры падзей, не сведкі, а ўдзельнікі. Вас душылі за актыўнасць?*

– Даставалася, і не раз. Хаця паўзмрок апускаўся паступова. Вось 2010-ы, 25 снежня – Божае Нараджэнне. Мы дома рыхтавалі стол, а тут званок у дзверы. На парозе міліцыя, з ордарам на вобшук «па даручэнні КДБ». Чытаю і не веру вачам: мяне падазраюць у сувязях з «арганізатарамі пратэстаў». Хаця я нават у Мінску не быў! Назіраннем за выбарамі займаліся, але афіцыйна, з бэйджамі, па ўсіх правілах. Спрабую тлумачыць, ды дзе там: вобшук, забралі тэхніку, далей у офісе яшчэ раз усё перавярнулі. Аддалі праз паўгода – усё паламанае.

У 2015 годзе тое самае: дом, званок. На парозе намеснік пракурора, з ім бамбіза пад два метры. Пачынае: «Аляксандр Аляксандравіч…» Адразу разумею, што нічога добрага не будзе. Але неяк адгаварыўся, паабяцаў прыйсці сам. Слова стрымаў, але мяне суправаджалі міжнародныя назіральнікі, што, на шчасце, якраз былі ў горадзе. Хоць стаялі звонку пракуратуры, іх прысутнасць усё змяніла. Убачылі, што я не адзін і, відаць, спалохаліся. Паўшчувалі дзеля праформы, папярэдзілі і адпусцілі. Каб не еўрапейцы з пасведчаннямі, думаю, усё магло быць горш.

*– А як гэта ўсё адбівалася на блізкіх?*

– Наўпрост не трапляла. Але жыццё ўсё адно складвалася цяжка. Сям’я распалася. Дзеці засталіся з былой жонкай. І хоць мы не жылі разам, у 2020-м і яе цягалі на допыты. То-бок, даставалі нават праз шэсць гадоў пасля скасавання шлюбу.

*– У няпростым працэсе стварэння грамадзянскай супольнасці вялікую ролю заўсёды адыгрываюць СМІ. Маладзечна мела сваю моцную «Рэгіянальную газету». З журналістамі, якія не баяліся пісаць. Адчувалі іх падтрымку?*

– Гэта незалежнае выданне, у палітыку адкрыта не залазіла. Але грамадскія тэмы падымала і праз тое ўскосна

падтрымлівала нас. Напрыклад, калі пісала пра мясцовыя ініцыятывы, правы дзяцей. Здаралася, разам праводзілі круглыя сталы ў рэдакцыі. Вялікая дапамога: як ідэі навідавоку, пачынаюць верыць.

*– Калі глядзець шырэй, то гораду пашчасціла: на ўсю Беларусь з процьмы недзяржаўных грамадска-палітычных выданняў да 2020 года ацалела ўсяго з дзясятак. Ці стварала гэта адчуванне, што ў Маладзечне больш паветра, чым у іншых?*

– Безумоўна. Тым больш, «Рэгіянальная» выходзіла па-беларуску – сам па сабе ўжо знак годнасці. Па-другое, газета давала людзям адчуванне альтэрнатывы: ёсць іншы голас, не дзяржаўны. І гэта падтрымлівала. Асабліва ў 2020 годзе, калі яны пісалі пра тое, што бачылі на вуліцах, без страху і скажэнняў.

## Было ўражанне не мітынгу, а нечага большага – так адраджаўся народ

*– Які экзамен здало тады Маладзечна? Як паводзіў сябе горад?*

– Спачатку «кармленне галубоў», сімвалічныя акцыі ў парку. Людзі, пераважна маладзёны, стаялі, размаўлялі пра падзеі ў краіне. Было спакойна, хоць міліцыя круцілася недзе побач. Потым пачалі ствараць мясцовыя Telegram-каналы: «Маладзечна для жыцця», іншыя. Я назіраў за ростам энергіі, тым, як паступова вярталася звычка гаварыць адкрыта.

Пасля затрымання Бабарыкі – выбух: выйшлі на Вялікі Гасцінец, у знак салідарнасці. Там і здарыўся эпізод, калі ашалелы ад нашай свабоды амапавец выцягнуў пісталет. Гэтыя фота і відэа абляцелі ўсю краіну. Маладзечна не адставала ад Мінска ці Гродна. Усе разумелі: цяпер адбываецца не проста пратэст, а нешта большае.

*– Людзі не баяліся? У вялікім горадзе можна згубіцца ў натоўпе, а ў Маладзечне ж усё на віду.*

– Вось таму многія асцярожнічалі. Асноўную актыўнасць праяўлялі вядомыя асобы, актывісты – тыя, хто не маглі маўчаць. Але нават яны да пары да часу дзейнічалі з аглядкай. І ўсё ж адчуванне супольнасці нарастала, народ усё часцей збіраўся на плошчы.

*– Не проста натоўп, а народ у высокім сэнсе.*

– Так. Гэта галоўнае, што я вынес з вечара 9 жніўня. Маладзечанцы проста сабраліся без арганізатараў і лозунгаў. І было ўражанне не мітынгу, а нейкага адраджэння. Той народ, якога ператваралі ў маўклівую масу, раптам успомніў сябе. У тую ноч Маладзечна, як і ўся Беларусь, стала не электаратам, не насельніцтвам, а менавіта народам. І гэтага ўжо ніхто не зможа выкрасліць.

Перад тым я не планаваў там доўга заставацца, думаў: пашумяць і разыдуцца. Аднак жа карціна была неймаверна натхняльнай.

*– А для вертыкальшчыкаў – разбуральнай. Свой страх выбівалі другім клінам: непрапарцыйнай сілай…*

– Сітуацыя сапраўды не для слабанервовых. З-за вугла пад’ехалі аўтазакі. Выскачылі спецназаўцы і пачалі люта біць усіх запар… Я паспеў зрабіць фота акрываўленага беспрытомнага чалавека і зразумеў, што трэба ратавацца ад гэтага дзікага палявання.

На наступны дзень – новае паведамленне ў Telegram-каналах: «Збіраемся зноў на плошчы». Прабрацца туды было не проста: дарогі перакрываліся. Спрэс шэрагі «касманаўтаў» са шчытамі і дубінкамі, з сабакамі. Каля іх ужо не моладзь, а бацькі, сваякі збітых: «Што вы робіце? Мы ж адзін народ!» Хтосьці нават стаў на калені. Тады схапілі і мяне. Завезлі ў пастарунак. У дворыку ўжо ляжалі хлопцы з перавязанымі рукамі. Звычайныя рабочыя, не якіясьці палітычныя. Канвеер расправы не спыняўся: прывозілі яшчэ і яшчэ. У тым ліку збітых.

Месцаў у ізалятары не хапала, таму нас раскідалі па навакольных гарадах: у Вілейку, нават у Слуцк. Я трапіў

у Валожын. Мы доўга не ведалі, што робіцца, пакуль аднойчы начальнік ізалятара не кінуў разгублена: «Заводы сталі...» Зразумелі: адбываецца нешта вялікае.

*– Судзілі проста ў аддзяленні міліцыі?*

– Тройкай: суддзя, міліцыянер і «касманаўт». Без сакратаркі і прапісаных працэдур. Я тлумачыў, што назіральнік, паказваў бэйджык з пячаткай, але гэта нічога не значыла. Мне далі максімум, 15 сутак. Але праз тры дні нечакана выпусцілі.

Тады даведаўся, што ў горадзе ўжо з'явілася ініцыятыўная група, ідуць перамовы з уладамі. 16 жніўня адбылася вялікая маніфестацыя: ад Палаца спорту праз увесь Вялікі Гасцінец – калона з бел-чырвона-белымі сцягамі.

Я не памятаю, каб калісьці столькі выходзіла. Перапоўненая плошча. Бачыў тых, якія ўсё жыццё трымаліся ўбаку. І вось цяпер яны тут. Сапраўдны выбух годнасці.

Потым чарговыя рэпрэсіі. Менш акцый, больш арыштаў, судзілішчаў. І гісторыя, якая ўрэзалася ў памяць – смерць Мікіты Крыўцова, маладзечанца, футбольнага фана, актывіста. Яго знайшлі павешаным у Мінску, збітага на горкі яблык. Усё было зразумела без словаў. Пахаванне ў Маладзечне выйшла маштабным, са сцягамі. Момант глыбокага болю...

*– Калі б тады, у васьмідзясятых, ведаць, якой доўгай, цяжкай будзе дарога, што вас пачнуць звальняць, пераследаваць, дэпартаваць, то пагадзіліся б пайсці гэтым шляхам?*

– Адназначна: інакш не магу. У мяне з дзяцінства абвостранае пачуццё справядлівасці, глыбока ўнутры сядзіць «не» крывому і злому вакол. Яшчэ ў першым класе заўважыў, што ў горадзе ўсе гавораць па-руску, а ў вёсцы па-беларуску. І ўжо тады адчуў: тут нешта не так. Таму ў бібліятэцы ўсвядомлена ўзяў першую кнігу па-беларуску, хацеў чытаць сваё.

ЗАХАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ

Я веру, што кожнага чалавека Бог пасылае ў свой свет з місіяй. Мая – зрабіць усё, каб не аддаць зямлю дзядоў тым, хто яе не любіць. Гэта ніякі не выбар, а тое, што жыве ў душы ад пачатку.

Тут, у Беластоку, разам з сябрамі зарэгістравалі грамадскую арганізацыю. Мэта – асвета беларускіх мігрантаў. Бо шмат хто, апынуўшыся за мяжой, губляецца: як жыць, што рабіць, куды рухацца, як не страціць сябе?

Мы хочам дапамагчы ім не толькі адаптавацца, але і захаваць у сабе пачуццё Бацькаўшчыны і малой радзімы. Каб яны маглі вярнуцца і мець веды, уменні, пачуццё адказнасці. Каб прыехалі дадому не проста як людзі, што ўцяклі, а як носьбіты новай культуры грамадскай дзейнасці.

Галоўнае – не маўчаць, не замыкацца ў эміграцыйнай бурбалцы.

# ЗОСЯ КУСТАВА



Фота з асабістага архіва З. Куставай

*Нарадзілася ў 1957 годзе ў вёсцы Ухвала Крупскага раёна Мінскай вобласці.*

*З 1972-га па 2021 год жыла ў Мінску. З 2021 года, пасля вымушанага ад'езду, – у Варшаве.*

*Вучылася ў Мінскім радыётэхнічным тэхнікуме, пасля скончыла Мінскі радыётэхнічны інстытут (спецыяльнасць – ЭВМ, кваліфікацыя – інжынер-сістэматэхнік), Мінскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (кваліфікацыя – настаўнік беларускай мовы і літаратуры).*

*Працавала на Мінскім заводзе электронна-вылічальных машын інжынерам-канструктарам, у Камбінаце надомнай працы, Міністэрстве народнай адукацыі БССР, Рэспубліканскім цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей.*

*Была намесніцай галоўнага рэдактара навучальна-метадычнага часопіса «Пралеска», літаратурнай кансультанткай Саюза беларускіх пісьменнікаў, навуковай супрацоўніцай Дзяржаўнага музея Янкі Купалы, вядучай спецыялісткай выдавецтва «Мастацкая літаратура».*

*Сябра Саюза журналістаў.*

*Узнагароджана нагрудным значком «Выдатнік адукацыі рэспублікі Беларусь».*

*Стваральніца аўтарскіх методык для выхавання і развіцця маладога пакалення беларусаў і беларусак, папулярызатарка беларускай літаратуры, аўтарка-складальніца зборнікаў для дзяцей.*

*2012: «Азбукоўнік і лічылка», выдавецтва «Мастацкая літаратура», наклад 2 тыс.*

*2014: «Лучынка», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Зборнік быў рэкамендаваны для падрыхтоўкі да конкурсаў і алімпіяд па беларускай літаратуры. Агульны наклад – большы за 20 тыс.*

*2015: «Зярнятка», выдавецтва «Мастацкая літаратура», наклад 2 тыс.*

*У чэрвені 2021 года дома ў Зосі Куставай адбыўся ператрус, сілавікі канфіскавалі тэхніку, апячаталі жытло.*

*У Варшаве рыхтуе да выдання зборнік «Алфавітка» для дашкольнікаў і бацькоў, настаўнікаў. Кніга складаецца з твораў незалежных беларускіх пісьменнікаў, казак, загадак, прыказак, прымавак, хуткагаворак.*

*Працягвае аказваць (анлайн) метадычную дапамогу беларускім настаўнікам у Беларусі.*

ЗОСЯ
КУСТАВА

# НАВАТ
# КАЛІ ДАРОГА
# НАЗАД ДОЎГАЯ,
# СЛЕД
# УСЁ АДНО
# ВЯДЗЕ ДАДОМУ

## На заводзе пра каструлькі, дзе хто што выхапіў, а мне хацелася гамонкі пра літаратуру…

*– Вы стартавалі ў свеце жалеза і алгарытмаў: радыётэхнічны тэхнікум, інстытут, завод у Мінску. Што адбылося ўнутры, калі рацыянальная траекторыя інжынера нечакана звярнула ў бок гуманітарнай місіі, да мовы, літаратуры, дзіцячай адукацыі? Учора метал, пластыка – а сёння чытачы, пісьменнікі. Як і чаму?*

– Я добра вучылася: матэматыка і літаратура ішлі аднолькава лёгка. Наогул хацела стаць настаўніцай, як мама. Але яна адгаварыла: дачушка, цяжкая праца, павер – не варта.

За вокнамі 1972 год: на піку ўвагі – электронна-вылічальныя машыны, таму конкурс у радыётэхнічны быў вялізны, 14 чалавек на месца. Вырашыла проста паспрабаваць – і паступіла. Настолькі нечакана, што спачатку нават не хацела ехаць у горад, жыла ў бабулінай вёсцы. Угаварыў бацька: «Зося, трэба вучыцца, збірайся». Вучылася мне лёгка, над адзнакамі не карпела.

*– Ці заставалася ў рамантычнай душы надзея ўсё ж такі пайсці ў бок настаўніцтва?*

– І спецыяльнасць добрая ў руках – а цягнула да літаратуры і культуры. Выйсце шукала ў мастацкім чытанні: задумала стаць дыктарам беларускага радыё. Спецыяльную адборачную камісію ўзначальвала Зінаіда Бандарэнка. Канкурэнцыя вялікая, перамаглі пераважна акцёры. А мяне суцешылі перспектывай: «Атрымай вышэйшую адукацыю, тады зможаш працаваць тут».

Я і паступіла ў радыётэхнічны інстытут. Толькі мары пачало тапіць жыццё: жытло, бацькі, сям’я, праца – усё як вакол. Дванаццаць гадоў у канструктарскім бюро электронна-вылічальных машын. Праца, дарэчы, вельмі цікавая.

ЭВМ той пары – гэта вялізныя шафы (працэсары, назапашвальнікі інфармацыі на магнітных стужках або дысках,

розныя каналы), унутры якіх знаходзіліся тыпавыя элементы замены, злучаныя паміж сабой правадамі. Мы праводзілі выпрабаванні, шукалі няспраўнасці, удасканальвалі, уносілі карэктывы. Складана, але займальна.

А пасля змены, зразумела, у самадзейнасць: чытала вершы, удзельнічала ў розных конкурсах і канцэртах.

*– Вось і баланс!*

– Якое там, дома часта плакала: на заводзе толькі пра каструлькі, дзе хто што выхапіў, а мне хацелася гамонкі пра літаратуру, мастацтва… Страшэнна таго не хапала. Мама якраз рупілася над сваімі методыкамі, таму стала ёй дапамагаць шукаць матэрыялы.

*– Хоцькі-няхоцькі, але канструктарства фармавала інжынернае мысленне. Яно спрацавала потым, калі вы сталі рэдактаркай, арганізатаркай культурных праектаў?*

– Перш за ўсё на заводзе займела арганізаванасць, дакладнасць, сістэмнасць. Пасля тэхнічнай адукацыі гуманітарыстыка даецца лёгка. Ты ўжо прывыкла мысліць лагічна, структурна, навучылася цаніць сістэму ў любой справе. Гэта вельмі спатрэбілася потым у педагогіцы, культуры, рэдагаванні.

## Сямейнай каралеўнай была мова, а бабуля – яе ахоўніцай

*– Дык у свет чароўных кірылічных знакаў, што выстройваюцца ў радкі і старонкі тэксту, прывяла мама?*

– Цікавасць, насенне – ад бабулі. Яна гаварыла выключна па-беларуску, іншай мовы ведаць не хацела. Чытала, безумоўна, і рускую літаратуру, якую выкладала ў школе мая мама, але дома ўсе размаўлялі толькі па-нашаму. Гэтага парадку прытрымліваўся і бацька, які на той час узначальваў аддзел прапаганды і агітацыі райкама партыі.

Сапраўднай каралевай у хаце была менавіта бабуля, яе слова было галоўным. Хаця папраўлюся: сямейнай каралеўнай была мова, а бабуля – яе ахоўніцай.

*– Адкуль гэта зацятая беларускасць? Шляхецкія карані?*

– Прозвішча – Казлоўская: паходзіла са старой беларускай шляхты. Усе дзеці ў сям'і мелі добрую адукацыю. Мова заўсёды стаяла на першым месцы. Была роднай, натуральнай – не «моднай», а хатняй, свойскай.

*– Як гэта спалучалася з тым, што ваш бацька не проста партыец, а прафесійны прапагандыст?*

– Ён таксама вясковец, шмат вершаў ведаў на памяць. І нават пасля разводу, калі з'ехаў у Маскву, усё роўна заставаўся тутэйшым па духу. Гэта з ім на ўсё жыццё.

Хіба можна таго пазбавіцца, калі доўгія гады дома ўсё нашае – і святы, і песні, і абрады. Мама збірала мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў, на Каляды накрывала стол сенам пад абрус, ставіла чыгункі з ежай. На кухні бабулін калаўрот, у куце туліўся качарэжнік, па столі на стужках з беларускім арнаментам віселі драўляныя лыжкі і чарпакі. У гарадской кватэры – сапраўдная беларуская вёска.

*– Прычым задоўга да таго, як у канцы 1980-х з'явіліся «Талака», «Тутэйшыя» і панеслі ў народ народныя ж, фальклорныя традыцыі, песні, танцы. Той рух не абмінуў?*

– Дык я і была адной з удзельніц Беларускай майстроўні пры БДУ. Разам з Вінцуком Вячоркам, Ларысай Сімаковіч, Сержуком Сокалавым-Воюшам, Рыгорам Марачкіным, Міколам Купавам… Мы спявалі, ладзілі абрадавыя святы, шукалі, шылі і апраналі строі… Сапраўдны покліч душы, які пачаўся яшчэ з дому.

*– А да вас у кватэру якія знакамітыя госці завітвалі – музыкі, мастакі, пісьменнікі?*

– Алесь і Ірына Марачкіны, Мікола Купава, Ірына Крэнь… Каляды і маміны дні народзінаў заўсёды святкавалі ў нас. Гэта як адна сям'я – вось такая сувязь была. Памятаю, і заручыны мае праходзілі ў гэтай кампаніі. У яго ў майстэрні потым вісеў той ручнік з подпісам: «У дзень заручын Зосі і каранацыі свата». Вельмі кранальна! Потым жыццё разнесла.

## Разанаў пакінуў на кніжцы надпіс: «Неба блізка» – і кропку ў канцы не паставіў. Гэта космас!

*– Хто яшчэ быў у такім незвычайным коле знаёмцаў? Вінцук Вячорка, Алесь Суша?*

– З кім толькі не зблізілася праз тагачасную Майстроўню! І не дзіва: часта сустракаліся, ладзілі святы, арганізоўвалі розныя незвычайныя сустрэчы. Памятаю першую паездку ў Вязынку, сапраўдны карнавал: сотні людзей, нацыянальныя строі, ручнікі, беларускія стравы, жывыя карагоды… Быў і Сяргей Дубавец, і Мікола Купава, і славутасці з Купалаўскага, і нашыя навукоўцы, і мастакі.

А прывёў у Майстроўню мяне Рыгор Марачкін. І вось менавіта там на адной з сустрэч я ўпершыню пабачыла Алеся Разанава.

Ён прэзентаваў сваю кнігу «Шлях-360». На маім экзэмпляры зрабіў надпіс: «Неба блізка» – і кропку ў канцы не паставіў. Гэтае бяскроп'е ўразіла настолькі, што я ляцела на крылах па вуліцы і нават не бачыла святлафораў. Якое геніяльнае адкрыццё: неба сапраўды блізка, і сэнс – у незавершанасці. Тады я зразумела, што паэзія можа быць космасам. З таго часу назбіралася не адна паліца кніг з аўтографамі нашых нацыянальных геніяў і зорак.

Цікава, што далей мая дачка, калі ёй было гадоў пяць, таксама палюбіла Разанава. Пакуль не прачытаю ўсю кнігу, не супакойвалася. Казала: «Мама, давай яшчэ раз "Першую

паэму шляху”». Пытаюся: «Ты ўсё разумееш?» А яна супакойвае: «Вось яшчэ раз прачытаеш – і ты таксама ўсё зразумееш». Многім гэта здаецца неймаверным, аднак Разанаў, аказваецца, не цяжкі і для дзіцяці. Яна ўспрымала яго чыста, без бар’ераў.

*– Ці можаце цяпер згадаць нейкія радкі?*

– Здаецца, змагу:

праз шкло павелічальнае
нябыт
глядзіць людзьмі
падобныя адбіткі

Я заўсёды адчувала ў радках Разанава не проста глыбокі, а цалкам касмічны сэнс. У яго кожнае слова выверанае, ляжыць, як камень у падмурку.

*– І колькі працягваліся вашыя чытанні з малой Валярынкай?*

– Мінімум тры гадзіны на дзень.

*– Цяжкая праца!*

– А ведаеце, не. Бо гэта без аніякага прымусу – сама прасіла. У чатыры гады адужала ўсю дзіцячую дамашнюю бібліятэку. І калі неўзабаве бацька прывозіў з Масквы цэлыя чамаданы кніжных навінак, яна выбірала ўжо не казкі, а Эдгара По. Прасіла, напрыклад: «Мама, давай зараз нешта лёгкае – напрыклад, “Залатога жука”». А гэта ж не проста дэтэктыў, а псіхалагічны!

*– У мяне прадчуванне, што ў хатняй чытальні агучваўся і незабыўны Уладзімір Сямёнавіч?*

– З ім асабіста давялося пазнаёміцца падчас нашых калядных паходаў да пісьменнікаў у знакаміты дом на Карла Маркса – вось дзе сапраўднае ўзрушэнне. Калі ўпершыню трапіла да Караткевіча ў кватэру, здавалася, што дакранулася да самой беларускай літаратуры. Ён стаў не проста легендарным аўтарам, а родным чалавекам. Ведалі ягоныя тэксты на памяць.

Ужо значна пазней, праз многія гады, Валярына як навукоўца зрабіла тое, пра што я толькі марыла: падрыхтавала два тамы ў збор твораў класіка – сцэнары мастацкіх і дакументальных фільмаў, якія ніколі раней не друкаваліся. Такі працяг даўняй любові і традыцыі сямейных чытак. Усё – ад той першай Майстроўні, дзе слова ператваралася ў справу. Дзейнасць.

*– Выходзіць, рух нефармалаў вынес вас з завода і прыбіў да культуры, педагогікі, эстэтычнага выхавання?*

– Калі размова пра вельмі глыбокае захапленне чымсьці, то яно найперш мацуецца знутры – душой. У маім выпадку шмат завязана яшчэ і на дачку. Яна стала тым чалавекам, які дапамог мне зразумець і знайсці свой шлях. Падчас чытацкіх гадоў усвядоміла: без ведання псіхалогіі, педагогікі, методыкі не змагу выхоўваць такое дзіця. Таму пайшла ў педагагічны інстытут, на факультэт беларускай філалогіі і культуры. Дакументы здавала разам з чатырохгадовай дачкой. Вакол сцвярджалі, што шанцаў мала, але я не адступіла.

Дзеці – гэта галоўнае ў нашым жыцці. Калі захаваем роднае ў іх, то зберажом і сябе. Асабліва цяпер, у выгнанні. Нашае пакаленне вырванае з каранёў. Моладзь яшчэ можа прыстасавацца, а старэйшыя ўжо не.

*– Адсюль місія зберагчы тое, што робіць блізкіх людзей беларусамі: мову, культуру, памяць, святло?*

– Місія ў гэтым. А мэта – захаваць сябе…

Цяжка ўсвядоміць, што мы, можа, назаўжды тут. Так далёка ад магіл бацькоў і бабуль. Я ўжо пяты год не была там, дзе яны пахаваныя. Бацьку, дарэчы, прывезла з Масквы ў Беларусь, бо ён хацеў спачыць на сваёй зямлі. Гэта ягонае завяшчанне.

Адсюль і маё разуменне: можам застацца беларусамі тут, у выгнанні, толькі калі не адмовімся ад памяці, ад сваіх каранёў.

Гэта тое, што дае нам сілу захаваць нацыю і ў выгнанні. Нават у лагерах смерці мова і культура заставаліся жывымі. Успомніце

Ларысу Геніюш, Сяргея Новіка-Пяюна – яны адседзелі гады за тое, што былі беларусамі, любілі сваю радзіму. Дык хіба мы не зможам зберагчы гэты вялікі скарб, прывезены з сабой?

Так, зямля, на якой жывём цяпер, не можа стаць роднай. Карані тут не пусціць, бо яны дома – у Беларусі.

*– Кажуць, каб валодаць мовай па-сапраўднаму, трэба нарадзіцца, вырасці там, дзе яна жыве?*

– Калыханку на роднай мове маці можа спяваць і тут, далёка-далёка… Яна ўсё адно дапамагае: падтрымлівае трываласць дзяцей. Дапамагае стаяць мацней, бо з'яўляецца гонар прыналежнасці: я – беларус. Разуменне, хто ты, веданне сваёй мовы, адчуванне Бацькаўшчыны ўздымаюць тваю годнасць.

Хай нашыя дзеці стануць на «ты» з польскай, будуць вучыць іншыя мовы, але яны мусяць перш за ўсё ведаць сваю – родную, мілагучную, найлепшую.

Памятаеце словы Пімена Панчанкі пра мову?

Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Баравая ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы у расе.

Гэта найлепшае з ім напісанага. Дарэчы, верш «Настаўніцы» ён прысвяціў і маёй маме, згадаўшы яе імя.

## З заняткаў у радыётэхнічным бегла слухаць Гілевіча на філфак – палюбіла Ніла Сымонавіча на ўсё жыццё

*– Пераключыліся непрыкметна на Варшаву, але давайце вернемся ў момант, калі вы пайшлі ў педагагічны інстытут. І пачулі: «Можа, і залічым, але будзеце ў спісе апошніх»…*

– Мне так хацелася паступіць, што была гатовая на ўсё. Ведала больш, чым патрабавалася.

Бо мама працавала ў Міністэрстве адукацыі, таму чытала падручнікі, што пісаліся для школ, рэцэнзавала іх. Нярэдка адгукалася адмоўна. Яна вельмі адказна падыходзіла да сваёй справы. Казала, што нават просты сказ павінен мець сэнс – выхаваўчы, эмацыйны. А як нейкі прыклад, то не просты, а «з дыханнем». І ўсё гэта абмяркоўвалася дома, бо мне было цікава. Я вельмі рана зразумела шмат тонкасцей працэсу адукацыі. Здаралася, дапамагала выбіраць адзін найбольш прыдатны сказ з вялікай колькасці адабраных.

Захапленне літаратурай было такім моцным, што яшчэ ў радыётэхнічным інстытуце хадзіла на лекцыі ў БДУ – да Ніла Гілевіча, які выкладаў на філфаку вусную народную творчасць.

*– Адмыслова?*

– Тут і жаданне, і збег абставінаў. Сястра там вучылася, аднак любіла прапускаць лекцыі. Вось і замяняла. А мая сяброўка перапісвала для мяне канспект у радыётэхнічным, пакуль спяшалася ўвечары слухаць Ніла Сымонавіча. Сапраўды гэта быў мой свет… З тае пары і на ўсё жыццё паўстала вялікая любоў да Гілевіча, ягонай школы слова.

*– А якая любоў была ў сястры?*

– Яна таемна ад бацькоў хадзіла ў тэатр замест лекцый ва ўніверсітэце.

Часта са мной. У Купалаўскі, Горкага, у ТЮГ. Мы вывучылі ўсе афішы, ведалі кожнага акцёра, ад Клімавай да Станюты. Калі праводзілі Стэфанію Міхайлаўну ў апошні шлях, на лафеце, то плакалі як па роднай душы. Тэатр быў святам, як і філармонія.

*– Што за пастаноўкі засталіся ў памяці?*

– «Тутэйшыя» Янкі Купалы паставіў Мікалай Пінігін. Ролі выконвалі вялікія майстры беларускай сцэны. Узрушыў сцяг, які ў канцы спектакля несканчона цягнуўся ў вышыню пад доўгія апладысменты гледачоў… Пазней сцяг стаў карацейшым, а на апошнім спектаклі – зусім невялікім кавалачкам, імгненна прамільгнуўшым, ледзь заўважаным гледачамі.

Або ў падвальным памяшканні ТЮГа тады ставілі камерныя спектаклі. Не для ўсіх. Там ішлі «Эдыт Піаф», «Распуцін»… Хадзіла па дзесяць разоў – зачараваная. Бо тут не проста мастацтва, а таямніца.

*– Я таксама памятаю «Эдыт Піаф»: шыкоўная музыка, славутыя песні пад фанаграму… Да дрыжыкаў!*

– Так, супервытанчаная пастаноўка. І менавіта там я адчула: тэатр можа стаць месцам, дзе чалавек сустракаецца з самім сабой.

Ну і музыку я заўсёды любіла. Валярына таксама грае на скрыпцы, фартэпіяна і на гітары. Цяпер вучу гэтаму ўнучку, Дзіву. Я не прафесійная музыкантка, але маю пачатковую адукацыю, яшчэ з 1971 года.

## Адміністратарства – гэта як для каго. Па мне дык лепей рабіць сваё, па душы

*– У міністэрства вы трапілі адразу пасля дыплома педінстытута?*

– Ды не. Спачатку я, новенькая настаўніца, пайшла ў… камбінат надомнай працы. Вязала шэрыя мужчынскія швэдры, кіламетры нітак спляла… Рабіла гэта, каб быць побач з дзіцем: такі рабочы рэжым дазваляў заставацца дома, даглядаць малую.

Памятаю, рыхтавалася да экзамену па філасофіі. Валярыне гадоў пяць. Услых чытаю пра ідэалізм і рэалізм, а яна побач з лялькай.

Раптам кажа бацьку: «Тата, я думала, што ты ідэаліст, а не – рэаліст». З таго часу філасофія ў нашым доме стала часткай паэзіі..

*– Камбінат надомнай працы ўратаваў ад завода?*

– Я сама звольнілася, каб быць дома. І калі атрымала педагагічны дыплом, знаёмы драматург прапанаваў пайсці ў Рэспубліканскі цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей пры Міністэрстве адукацыі. Спачатку адмаўлялася, потым передумала. Стала галоўным інжынерам у дзіцячым тэлецэнтры. Бо мела за спінай і тэхнічны, і профільны інстытуты.

*– З чаго пачалася кіпучая дзейнасць: з мадэрнізацыі абсталявання?*

– З гуманітарнай рэвалюцыі. Зрабіла беларускі пераклад дакументацыі: тэхнічных умоў, інструкцый, справаводства.

*– Гэта быў рамантызм ці патрыятызм? Як рэагавала начальства?*

– Адразу паставіла ўсім ультыматум: «Інакш не буду працаваць». На дзіва лёгка мяне падтрымалі. Ва Уладзіміра Іскрыка, кіраўніка цэнтра, уся сям'я гаварыла па-беларуску. Ён нават не здзівіўся. Наадварот, сказаў: «Так і трэба». Для мяне гэта было важна: працаваць, думаючы і пішучы па-нашаму.

Цэнтр толькі нараджаўся, шмат чаго стваралася з нуля. Але ўсё, што я рабіла, было пра адраджэнне – не па загадзе, а па неабходнасці.

*– Не заміналі? Ніякага «тэлефоннага права», бюракратычнага канструкта?*

– Гэта ж пачатак 1990-х, калі толькі пачынала брацца новае жыццё. Я прайшла шлях ад галоўнага інжынера да мастацкага кіраўніка, дырэктара, потым стала першым намеснікам дырэктара. Давала справаздачы ў Міністэрства адукацыі,

удзельнічала ў калегіях. Час, калі мова зноў дыхала. Шчаслівая, што адчувала яго.

– *Таго кіслароду дзецям хапіла на ўздым?*

– У адзін год ажно сямнаццаць чалавек з нашай студыі паступілі ў БДУ на журфак. Яны рабілі першыя крокі. Але многія потым сталі вядомымі журналістамі, рэжысёрамі, апаратарамі. Гэта былі разумныя, жывыя дзеці. І вельмі цікавыя выкладчыкі. Ігар Волчык, напрыклад, – піяніст, лаўрэат конкурсу Чайкоўскага. Пасля траўмы рук займаўся рэжысурай, выкладаў анімацыю: «Дзеці, пастаўце кляксу, далучыце да яе хвост – што атрымалася? Гляньце – камета!» Потым усё бегла на плёнцы і атрымліваўся мультфільм. Камета ляцела! Выхаванцы верылі ў цуд…

Яны рабілі сапраўдныя фільмы: дасылалі на конкурсы ў Парыж, у Японію. І мелі ўзнагароды. Волчык прыносіў справаздачы, усміхаўся: «Вось, яшчэ адзін дыплом, яшчэ адзін прыз!» Сапраўдны педагог: тонкі, іранічны, творчы.

А ў 1992-м правялі першы фестываль дзіцячых кіна- і відэафільмаў, які неўзабаве атрымаў статус міжнароднага: у нас гасцявалі галандцы, украінцы, іншыя. Праводзілі ўсё пад Маладзечнам, у піянерскім лагеры «Даманава». Фестываль вясёлы, шчыры: з прызамі, песнямі. Спонсараў знаходзілі самі. Прыязджала Алена Цыплакова – актрыса і рэжысёрка. Усе былі натхнёныя. На жаль, праз нейкі час цэнтр пайшоў на закрыццё.

– *Заглух з вашай віны?*

– Міністр прапанаваў пасаду генеральнага дырэктара. Я ўперлася: «У мяне дзіця». – «У вашых падначаленых таксама па двое, па трое, а ўсяго – дзвесце чалавек у цэнтры». Са мной такія ўгаворы не спрацавалі, і далей казалі, што ўсё развалілася менавіта праз тую незгаворлівасць. Магчыма, так і было. Падраздзяленні раскідалі па іншых структурах.

Але я не шкадую. Адміністрацыйная пасада – няўдзячная рэч. Мама заўсёды казала: «Рабі сваё, не чужое». І я вярнулася да свайго – да кніг.

## Калі Гілевіч чытаў паэму ўголас, гэта нешта асаблівае: як дыхае зямля

*– Раскажыце пра гэтую працу.*

– Натрапілі мы неяк з дачкой на адзін незвычайны буквар. І там у вершы дзіўна пераблыталі словы. Валярына: «Не буду вучыцца па гэтай кніжцы. Ты мне чытала – колас, а тут муха!» І я вырашыла зрабіць свой даапможнік. Так нарадзіўся «Азбукоўнік і лічылка».

Ён друкаваўся спачатку ў «Пралесцы», часопісе дашкольнага выхавання. На кожную літару падбірала творы беларускіх аўтараў, ад класікаў да сучаснікаў. Каля сотні пісьменнікаў. Тут ёсць і адмысловыя творы, якія замаўляла Міколу Маляўку, Міколу Чарняўскаму, Васілю Зуёнку… Кніга атрымалася вялікая – фармат А4, 327 старонак. Наклад разляцеўся за два тыдні. У кнігарні «Светач» мне пакінулі толькі 25 асобнікаў для прэзентацыі. Потым яшчэ, мабыць, зборнікі недзе дадрукоўвалі, і яны дзіўным чынам з'яўляліся на кніжных кірмашах.

Ілюстрацыі зрабіў Уладзімір Пашчасцеў (разам са сваёй дачкой Елізаветай), выкладчык Акадэміі мастацтваў, чалавек з асаблівым адчуваннем дзіцячага свету. Ён маляваў не ў сучасным стылі, а душэўна. Гэта было маё першае выданне, зробленае з любові.

*– У знаёмых давялося бачыць вашу пазнейшую «Лучынку» на журнальным століку замест газет. Чым яна брала?*

– Фарматам: кароткія тэксты, вершы, роздумы, каб заходзіла і дарослым, і дзецям. Зборнік пра слова: як нараджаецца яно, а з яго сказ і тэкст.

«Лучынка» – гэта ж святло, агеньчык, ад якога пачынаецца асвета. Калісьці бацькі чыталі пры лучыне, і вось мне займелася вярнуць гэтае адчуванне: святло ведаў, мовы. Там сабраныя адпаведныя цытаты беларускіх і замежных аўтараў. Ёсць апавяданні, эсэ, а таксама вершы, сугучныя з сённяшнім днём.

*– Калі апынуліся ў «Мастацкай літаратуры», якім адкрыўся свет беларускай кнігі?*

– Нейкіх нечаканых адкрыццяў не здарылася, бо паставіла ўмову працаваць толькі з тымі, з кім хацела. Аўтар мне не блізкі – то і разміналіся. Гэта, па вялікім рахунку, вельмі прадуктыўна.

Я сябравала з Гілевічам. Мы часта сустракаліся, асабліва апошнія гады. Калі ягоная жонка Ніна Іванаўна захварэла, дужа перажываў. Я часта ладзіла творчыя сустрэчы з Нілам Сымонавічам, дзе ўдзячныя гледачы дарылі букеты. Заўсёды хадзіў у шпіталь з кветкамі – вялізнымі, яркімі. Палата апошнія дні была ўся ўбраная імі. Жонка – яго любоў, яго боль і чалавечнасць.

Мы многа разоў былі на выступленнях у інстытутах, школах. І кожны раз аднаўлялася праграма. «Зося Іванаўна, гэта для вас! Я ж не хачу, каб сёння слухалі тое, што было ўчора», – з усмешкай казаў Ніл Сымонавіч. А ў мяне была вялікая асалода паслухаць Народнага паэта яшчэ раз. Я прапагандавала яго кнігі – і тыя, што выйшлі, і што яшчэ чакалі свайго часу. Цудоўны чалавек: мудры, светлы.

*– Вы перавыдалі славутых «Родных дзяцей». Гэта быў асабліва дарагі для яго твор?*

– Перавыдала выдавецтва «Мастацкая літаратура». Тады Ніл Сымонавіч ужо мала хадзіў, усё ўзгаднялі ў яго дома. Нават вокладку выбіралі разам – карціну Гаўрыіла Вашчанкі «Матчыны крылы»: буслава гняздо, стаіць птушка з распасцёртымі крыламі над сваімі птушанятамі. Як гэтая кніга – сімвал сям'і, жыцця і вяртання.

На той момант ужо амаль немагчыма было нешта выдаць. Ён і не спадзяваўся, а ўдалося. Апошні прыжыццёвы томік… Наклад скупілі імгненна, бо людзі чакалі сапраўднага – беларускага слова.

Калі Ніл Гілевіч чытаў мне паэму ўголас, гэта нешта асаблівае і магічнае: як дыхае зямля.

*– Вы пабачылі свет беларускай літаратуры знутры. Былі там зайздрасць, іерархіі – ці больш трымалася на служэнні і праўдзе?*

– Зайздрасць, вядома, жыла. Без яе ніводнае асяроддзе не абыходзіцца. Амаль кожны пісьменнік лічыў, што да свайго юбілею мусіць выдаць кнігу. Раней гэта было нормай. А пазней выявілася інакш. Калі аднаму друкуюць, а другому не – пачынаецца звядзенне рахункаў. Але гэта ўсё ішло больш праз галоўнага рэдактара. Да мяне людзі завітвалі з радасцю, са святлом.

Памятаю шчасце сустрэч з Анатолем Вярцінскім, Васілём Зуёнкам, Рыгорам Барадуліным. З дзядзькам Рыгорам часта хадзіла на выступленні. Неймаверныя сустрэчы: гумар, цеплыня, чалавечнасць. Генадзь Бураўкін – таксама асобая постаць. Ён быў і таленавітым журналістам, і пісьменнікам, і тонкім аналітыкам. Калі сумнявалася, ці варта заставацца ў выдавецтве, сказаў: «Вось пойдзеце – заменіць нехта іншы, і ўсё стане інакш. А пакуль вы тут, беларуская кніга жыве». І я разумела, што гэта праўда.

*– А як тады ішлі справы з выданнем аўтараў, якія не ў фаворы ва ўлады?*

– Заўсёды падтрымлівала тых, хто па-за афіцыйным кантэкстам. Гэтыя людзі не баяліся слова. Але многіх не ўдавалася надрукаваць нават у дзіцячых выданнях. Ларысу Геніюш, напрыклад, колькі разоў спрабавалі, а ніяк! Звычайныя вершы: «Добрай раніцы, Алесь», «Зубры» – без палітыкі і падтэкстаў.

Але яе імя было табу. «Самсона Самасуя» спачатку друкавалі, таму што добра разыходзіўся, а потым, мабыць, прачыталі пільныя таварышы… Уладзіміра Караткевіча друкавалі толькі таму, што ён ужо памёр, а творы былі ў школьнай праграме.

Аднак я імкнулася, каб сапраўдныя галасы гучалі. Каб дзеці і дарослыя маглі бачыць: беларуская літаратура жывая, яна не зламалася. І таму кожная кніга, якой радавалася, была маленькай перамогай.

## Цяпер паўсюль людзі іншага складу, але пераможцы – мы

*– Вы з людзей, пра якіх кажуць: шавец, кравец і на дудзе ігрэц. І ЭВМ, і тэлецэнтр, і вязанне швэдраў, і кнігі… І – кіно?*

– Мая бабуля казала: «Што ўмееш – за плячыма не насіць». На той час тэлевізійная праграма «Тэлебачанне школе» знікла і не хапала наглядных дапаможнікаў настаўнікам. Узнікла ідэя здымаць пісьменнікаў. Я была дырэктарам фільма. Першай – стужка пра Новіка-Пяюна. Тры дні працы, амаль без перапынку. Калі вярнулася дадому, Валярына, якой было шэсць, сказала: «Ты столькі была з ім, а расказала мне за дзве гадзіны. Гавары далей!» Скончылася сяброўствам: пры сустрэчы яна напісала свой верш, прысвечаны Сяргею Міхайлавічу, у яго дзённік. Ён прапанаваў яе навучыць мове эсперанта, якую добра ведаў. Вельмі кранальна. Такі натуральны дыялог пакаленняў, праз паэзію і чалавечнасць. Потым часта тэлефанаваліся, спявалі разам і па тэлефоне «Беларусачку», «Вальс над Шчарай». У перадапошні дзень яго жыцця была ў шпіталі. А на пахаванні сабралася няшмат народу…

*– На вашых вачах літаратура фактычна змянялася. Як тое адбывалася?*

– Калісьці кнігі выходзілі толькі праз адбор. Потым з’явілася свабода – і разам з ёй хаос. Кожны мог выдаць сваё ў прыватным

выдавецтве. Чытач па старой звычцы лічыў: раз ёсць вокладка – значыць, гэта кніга. Але тое не заўсёды праўда…

Знікла літаратурная крытыка – сапраўдная, што адрознівае мастацтва ад самадзейнасці. Крытыкі альбо замаўчалі, альбо не мелі што казаць. І людзям стала цяжкавата разбірацца. Зараз на паліцах побач годнае і выпадковае. Але з цягам часу ўсё рассеецца: у гісторыі застануцца адзінкі. Можа, праз стагоддзе іх можна будзе палічыць на пальцах адной рукі.

Я заўсёды імкнулася, каб праз выдадзеныя кніжкі гучалі менавіта тыя, хто пішуць з душы і сумлення. Мае аднадумцы – людзі святла.

*– Вы звольніліся з неабходнасці – ці ўнутранага пераканання?*

– І тое, і другое. Па дакументах – «сямейныя абставіны». Але па душы – развітанне. Я адчувала, што інстытуцыя, у якой працавала, ужо не тая. Пачалі вылучацца іншыя людзі: не па таленце, а па патрэбе сістэмы. Мне стала цяжка. І калі сышла, то пачала лягчэй дыхаць.

Каб жыло адчуванне натхнення, засталася б. Але я бачыла, як паступова сыходзіць тое, дзеля чаго ўсё рабілася. І ў душы расла туга па васьмідзясятых, па пачатку дзевяностых – кароткім часе свабоднай Беларусі.

*– Кажаце гэта з болем, але і з годнасцю…*

– Так, цяпер паўсюль людзі іншага складу, але не лічу іх пераможцамі. Пераможцы – мы. Тыя, хто застаўся верным мове, зямлі, літаратуры. Мы, хто вымушаныя з'ехаць, але сваё зрабілі. Нехта больш бачныя, іншыя менш. Але ўсе мы пакінулі след на роднай зямлі. У сваёй мове, культуры і ў сваім жыцці.

Мы – гэта і тыя, хто застаўся на Радзіме, і хто тут, далёка ад яе. Нягледзячы ні на што, можа, і ціха, але пераканана працягваем справу асветы, захавання традыцый.

## ЗАХАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ

Галоўны наш набытак – нашыя дзеці, унукі, якія не зракліся сваёй Беларусі, здолелі запомніць словы бабулінай песні і матчынай калыханкі, якія ўзгадаваліся з разуменнем, кім яны ёсць і адкуль паходзяць.

# УЛАДЗІМІР ВЯЛІЧКІН



Фота з асабістага архіва У. Вялічкіна

*У 1986–1987 гадах працаваў настаўнікам у раёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС.*

*У 1987 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў.*

*Служыў у авіяцыі Паўночнага флоту, меў службовыя камандзіроўкі ў Лівію і Сірыю.*

*Пасля звальнення з арміі выкладаў замежныя мовы ў навучальных установах Беларусі і Польшчы (1990–2002).*

*Скончыў Каледж дзяржаўнага кіравання імя Станіслава Сташыца ў Беластоку (2007).*

*З 1994 года актыўна ўдзельнічаў у выбарах у Беларусі як кандыдат, давераная асоба або назіральнік з мандатам ініцыятывы «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Назіраў за выбарамі ў Азербайджане, Украіне, Кіргізіі, Казахстане, Германіі, Косава, Грузіі, Украіне.*

*У 1999 годзе падчас альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў узначальваў выбарчую камісію Ленінскага раёна Брэста.*

*Сябра БНФ «Адраджэнне» і ПБНФ, старшыня суполкі «Усход-1» (1994–2010).*

*З 1998 года – старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання «Праваабарончы цэнтр “Вясна”».*

УЛАДЗІМІР
ВЯЛІЧКІН

# ТВАЯ
# ЎЛАСНАЯ СВАБОДА
# ЎМОЎНАЯ,
# КАЛІ
# ПОБАЧ ТОПЧУЦЬ
# ПРАВЫ ІНШЫХ

## «Зробім так, што заваліш сесію, і ўся вучоба – сабаку пад хвост»

*– Спадар Уладзімір, вы расказвалі, як аднойчы дражнілі супрацоўніка брэсцкай тэлерадыёкампаніі музычным суправаджэннем: у застаўку падчас запісу на мясцовым радыё ўставілі песню беларускага барда Сержука Сокала-Воюша «Вып’ем за снайпера». Зразумела, на каго той паляваў… А вам самому – ці падносіла жыццё сюрпрызы, пасля якіх з палёгкай думалася: слава богу, пранесла?*

– А што нашае жыццё? Сума абставінаў. У маладосці яны складаліся так, што будучы праваабаронца дадумаўся паступаць у… Акадэмію міліцыі! Ясна, быў пасля войска, меў за спінай пару курсаў ін’яза, камандаваў там добраахвотнай народнай дружынай. Яна мела ўзорную рэпутацыю!

Досвед атрымаўся выключна карысным як на крымінальніках, так і на аднагодках з лёгкім ухілам у дысідэнцтва…

*– Вось тут падрабязней!*

– Напрыклад, на інструктажах у райаддзеле рэкамендавалі звяртаць асаблівую ўвагу на прафілактыку праяў заходняга ўплыву – так гэта фармулявалі. «Таварышы, вы асабліва прыглядайцеся да панкаў, пацыфістаў. Як вылічваць? Знешні выгляд, дэманстратыўныя паводзіны, падазроныя песні. Апрануты кідка, не па-нашаму, значок незвычайны – “курыная лапка”, напрыклад. Гэта яны! Закон не парушаюць, нікога не чапляюць, але іх трэба прыбраць з нашых вуліц!» Інструкцыя патрабавала падысці да падазронага, патлумачыць, што ён не мае рацыі, а калі не разумее, наўпрост папрасіць знікнуць, пераапрануцца, весці сябе «па-людску», не падрываць устояў сацыялістычнай дзяржавы, той самы значок адарваць… Адмахваецца, голас падвышае – тут як тут нарад міліцыі: ага, хуліган!

*– Фактычна прымушалі правакаваць «нефармалаў»… І гэта не напружвала? Не было адчування, што вамі карыстаюцца ў непрыгожай гульні?*

– Чаму? Разумелі двухсэнсоўнасць сітуацыі, таму не актыўнічалі. Цяпер тое самае робіць рэжым. З улікам часу, але па форме і метадах рэжым не проста рэанімаваў савецкую практыку ў барацьбе з іншадумствам, а ўдасканальвае. Памятаю, у 2006-м праводзілі ў Брэсце «Свечку памяці» па зніклых палітыках. Моладзь са знічамі ў руках уздоўж праспекта Машэрава. Пад’ехаў бобік, з яго – амапаўцы ў чорным без знакаў адрознення. Падыдуць да дзяўчат, пальцамі свечку патушаць, а хлопцаў так штурхнуць, што тыя ледзь не куляюцца… Побач афіцэр. Выпадковая жанчына да яго: «Зрабіце што-небудзь!» У адказ: «Ідзі адсюль, цётка, прычым хуценька!» Трэба было бачыць жах у яе вачах, калі ўсвядоміла, што адбываецца.

Ну а тады, у маладосці, я ўсё ж заглянуў у акадэмію, каб перавесціся з ін’яза. Мне адкрытым тэкстам патлумачылі: служба ў структуры МУС – гэта дынастычны праект, і калі ў цябе няма сваякоў у органах, партбілета, то не варта і сунуцца. Не «свой», значыць. Тады крыўдна было, але вельмі хутка зразумеў, што пашанцавала не ўступіць у лайно.

*– Часта бывае: як не заладзіцца з першага разу, то і другі няўдалы. Або ў вас па-іншаму?*

– Не ведаю. На чацвёртым курсе выбухнуў рэактар у Чарнобылі. І пачаліся мае далейшыя антыўніверсітэты савецкага жыцця. Зверху спусцілі разнарадку накіраваць у школы забруджанай зоны будучых настаўнікаў – некаму ж трэба вучыць дзяцей. Дурняў-добраахвотнікаў не знайшлося, дык пачалі выклікаць студэнтаў апошняга курса, пытанне рубам: «Або едзеш, або сесію не здасі!» Яшчэ варыянт: «Заўтра праз ваенкамат павестачку атрымаеш – і не настаўнікам, а ў скафандры на рэактар абломкі збіраць».

Хоць план набору шматкроць перавыканалі, рэктарка не скарэктавала яго ў бок паніжэння, а пазваніла ў міністэрства з просьбай забяспечыць працай усіх. Вось у выніку такога камсамольскага «энтузіязму» я і апынуўся на мяжы адселенай зоны, у Нараўлянскім раёне.

## Адміністрацыя радавалася, калі выпаў снег: маўляў, прыкрыў радыяцыю, фон знізіцца… Наіўнасць!

– Адправілі ў вёску Вербавічы, праз яе дарога на Кіеў праходзіць. Палова адселеная, палова аселая. Сярэдняя школа, у класах ад аднаго да дзесяці дзяцей, агулам з паўсотні. Астатніх вывезлі.

*– Як рэагавалі на катастрофу мясцовыя, ад калгаснікаў да райкамаўцаў?*

– Пачнём з таго, што стаяла пытанне ліквідацыі раёна як адміністрацыйнай адзінкі, з-за адкату насельніцтва. Дык раённыя ўлады дзеля захавання пасадаў усякімі няпраўдамі накруцілі патрэбныя лічбы. Дарэчы, першымі зону пакінулі менавіта чыноўнікі. Тыя, хто стаяў бліжэй да інфармацыі. Ім было глыбока ўсё роўна, хто застаецца. А заставаліся тыя, у каго ні грошай, ні сваякоў недзе ў Беларусі або ў Саюзе. З найбольш брудных тэрыторый услед за жывёлай і тэхнікай вывозілі людзей: проста грузілі ў шалёным тэмпе, амаль нічога не паспявалі сабраць у свае клункі.

*– А што было са школай? Ці прыйшла хоць нейкая дадатковая дапамога і ўвага, калі высветлілася, што зямля і паветра атручаныя?*

– Двухпавярховы будынак, з туалетамі, але яны не працавалі. Па патрэбе дзеці бегалі ў поле, за сто метраў. Адміністрацыя радавалася, калі выпаў снег: маўляў, прыкрыў радыяцыю, фон знізіўся.

У класах холадна, дзеці ў футрах і куртках, бо старшыня калгаса падключыў свой гараж да школьнай кацельні: яму цёпла, а нам дубарна.

*– Вы разумелі рызыкі для здароўя, што гэта можа мець наступствы?*

– Цудоўна разумеў. Тэрміновую я служыў у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння, там на тэарэтычных занятках увесь час пра гэта тлумачылі...

*– А не ўзнікала думкі напісаць рапарт: «Прашу вызваліць у сувязі з абставінамі...»?*

– Каго гэта хвалявала? Напрыклад, перад адпраўкай як коржык-прынаду абяцалі падвойную аплату. Ну, стаўка настаўніка: колькі там рублёў? Атрымаў першы заробак, другі, трэці – бачу, не адпавядае. Пайшоў разбірацца. Мне кажуць: «Маеш стыпендыю – гэта твой другі заробак. Якія прэтэнзіі?» Пачаў разбірацца: падман! Старшыня райана, нехта Фешчанка, у маёй прысутнасці набраў нумар інстытута: «У мяне тут дэзерцір!» Вялікае шчасце, што трубку ўзяла прарэктарка, нармальная жанчына. Хапаю тэлефон: «Ён хлусіць!» – «Усё разумею, прыедзеш, то і пагаворым».

*– Такое ўражанне, што вас з усіх бакоў толькі і рабілі, што абʼядалі.*

– Ды есці сапраўды не было чаго. Пайшоў у краму: «Дайце мне тое ды тое». – «Цябе няма ў спісах». – «Як няма? Я ж у школе працую!» – «Няма, і ўсё». Карацей, за мой кошт яна сваіх дзяцей карміла.

У іншай школе, дзе падпрацоўваў, дырэктар трапіўся вельмі чалавечны: «Запішу цябе шматдзетным. Пяцёра – будзеш супербацькам, атрымаеш добрую пайку». Пайшоў у краму: «Вось даведка, глядзіце, малодшаму тры месяцы». – «А колькі табе гадоў?» – «Дваццаць шэсць». – «І калі ж ты паспеў?»

Адну пайку адклала, мабыць, забрала сабе: «Груднічкі мяса не ядуць!»

*– Холад, дэфіцыт прадуктаў, спрэс «нельга» – як удавалася трымацца? Гэта барацьба не за камфорт, а за існаванне. Даводзілася круціцца?*

– Выкручвацца. Паступіў у раён дурнаваты загад: вадзіцелі нікога не мусілі падвозіць. А мне з Вербавіч у горад, дзе другая школа, сем ці восем кіламетраў. І так штодня. Каб не здырдзіцца ад холаду, бегаў. Зімовая дарога, а паўзбоч усё часцей то сабакі, то ваўкі. Шэрыя яшчэ нічога, яны людзей баяцца, а вось шарыкі маглі і загрызці. Бяжыш і думаеш: крануць – не крануць…

Вяртаешся назад уначы. З вокнаў свішча, ложак без матраца і пасцелі. Прыцягнуў спартовы мат са школы. Печка – нешта плоскае на чатыры цагліны ад падлогі, жалезны верх. Пакуль дровы кідаеш, то цёпла, а як сеў, дык адразу капец, замярзаеш.

Валасы з раніцы маглі прымерзнуць да спартыўнага мата, на якім спаў…

*– Калі вы гэта апісваеце, перад вачыма проста кадр з Таркоўскага – сталкерскі свет холаду і радыяцыі. Сапраўды так было – ці вашая памяць падфарбавала?*

– Гэта чысцюткая, як спірт, праўда.

Дарэчы, раз на месяц кожнаму жыхару на забруджанай тэрыторыі афіцыйна належала паўлітра гарэлкі – «для вываду радыяцыі». Сцвярджалі, што гэта адзіны ўніверсальны сродак, які дапамагае.

Адпрацаваў я там свае паўгода, да здачы дзяржаўных экзаменаў у ін’язе.

## Дзед некалі меў свой надзел, і калі ехалі да яго, сваякі паказвалі ў акно вагона: «Вось гэта – нашая зямля!» Была…

*– У інстытуце на вайсковай кафедры вам выкладалі спецпрапаганду. Што гэта такое?*

– Гэта ў рамках вайны. Спачатку інфармацыйна-псіхалагічная дзеянні, яны папярэднічаюць сілавой фазе, бо апошняя тады, калі ўсе хітрыкі і правакацыі не спрацоўваюць. Але спачатку насельніцтву трэба даць «правільныя» расклады пра «ёсць» і «будзе», каб народ сам згадзіўся на «патрэбныя» рашэнні, з радасцю і надзеяй прыняў новую ўладу ці «аб’яднанне» з суседняй дзяржавай.

Так было шмат разоў у гісторыі Беларусі: і пры падзеле Рэчы Паспалітай, і пры распадзе СССР. Ва Украіне Расія разлічвала менавіта на гэта. На Данеччыне, Луганшчыне і спраўдзілася: сярод іншага і таму, што не бачылі ўкраінскага тэлебачання, толькі Масква вяшчала. Кажу так, бо назіраў за выбарамі і на ўсходзе, і на захадзе Украіны, магу параўноўваць.

*– І як студэнты ўспрымалі гэты курс?*

– Маладыя, таму асабліва не ўдумваліся. Галоўнае, каб залік паставілі. Але веды засталіся. І тое, што я бачу цяпер вакол, – адзін у адзін тое, чаму вучылі яшчэ тады. Тэхналогіі змяняюцца, а сутнасць – не.

*– Калі адчуванне маніпуляцыі перастала ўспрымацца тэорыяй і ператварылася ў асабісты досвед? Убачылі, што рэальнасць можна «перапісваць»?*

– Я з Брэста. Горад пасля вайны быў практычна расстраляны. З 50-60 тысяч насельніцтва засталося 5-6. З мясцовых усе ведалі, хто такія бальшавікі, камуністы – і хто фашысты. Мая маці, калі я быў малы, казала: «Тут зямля варушылася». Бо побач – расстрэльныя ямы. Некалькі гадоў таму адну раскапалі

і парэшткі 1200 чалавек без музыкі адтарабанілі за горад, каб на іх месцы пабудаваць прэстыжны «Прыбужскі квартал». Шмат абурэння, а толку?

У школе – настаўніца літаратуры, характар адпавядаў прозвішчу: Лютава. Прыпыніўся пры адказе – больш трайбана не атрымаеш. За першай партай сядзеў вучань, з вёскі ў горад пераехаў, ну і гаворыць з беларускім акцэнтам. Яна: «Ты, мальчик, не руский! Не руский. Я тебе хорошей оценки не поставлю…»

Гэткіх «савецкіх» многа да нас прыбіла з Расіі… Памятаю, на чарговых выбарах падыходзіць да маёй улёткі нейкі добра ўпакаваны дзед, пачытаў – і на ўвесь прыпынак: «Жыдапаляк недабіты!»

*– А як вас занесла ў Сірыю і далей? Гэта ўжо пасля інстытута?*

– Калі дайшло да размеркавання, прапанавалі ў армію афіцэрам. А я ўжо жанаты, дзіця маленькае. Адмовіўся. І давай адразу: «Не паедзеш – сапсуём кар'еру». Мала таго, бацькоў выклікалі, жонку, пагражалі. Застрашылі, сям'я пачала ўгаворваць. Тады пайшоў на міравую: «Добра, але служыць буду толькі за мяжой». Трапіў у авіяцыю Паўночнага флоту, там службовыя камандзіроўкі: Сірыя, Лівія, іншыя краіны.

Па сутнасці, дальняя разведка. Напрыклад, у Міжземным моры ізраільскія самалёты да нас ніколі не падляталі, а вось амерыканскія ці натаўскія – рэгулярна. Настолькі блізка, што можна прачытаць імя пілота на кабіне. Мы перакідваліся жэстамі: павярні самалёт – пагляджу, чым ты ўзброены. Ён паварочвае, фатаграфуем; затым наадварот. Такія сабе дарослыя дзядзькі гулялі ў вайнушку. Або толькі падлятаем да амерыканскага флагмана, авіяносца Saratoga – адразу іх знішчальнікі падымаюцца. F-16 завісае над намі і пачынае паліва зліваць. Газа па кабіне – карцінка так сабе… Першы

раз я ў паніцы: «Камандзір, згарым!» А той: «Херня!» Разварочваемся – і янкі задаволена вяртаюцца дадому.

*– Але ж вы не за штурвалам? За што адказвалі ў экіпажы?*

– Пасада бортаператара або бортперакладчыка. Савецкі пілот ін’язаў не канчаў. Каб самалёт сеў-узляцеў, перакладаў перамовы з дыспетчарам. Гэта дадаткова да асноўных абавязкаў. Мы лёталі пад выглядам пошукава-ратавальнай місіі. На справе вынюхвалі, але афіцыйна – ратавалі. Інструктаж адпаведны: «Калі раптам саб’юць, легенда такая: «Я марак сейнера “Дружба”». Бо ў цывільным былі. Жоўтую форму колеру пяску апраналі толькі на аэрадроме, калі абслугоўвалі самалёты.

*– Значыць, «ратавальнік»: у Лівіі, у цывільным, сярод вайны… І як яно, «ратаваць» пад прыкрыццём? Нібы ў шпіёнскім фільме… І ці не даводзілася ратавацца самаму?*

– Жылі ў гатэлі Libyan Palace – у цэнтры Трыпалі, ля ўзбярэжжа. Выходзіць у горад не дазвалялі, але як вельмі хочацца, дык можна. Аднаго разу ўцёк з гатэля, і хоць па маладосці быў падобны да араба, адразу пачуў: «Рускі лётчык!» Атрымліваецца, ці нас пасвілі, мы былі пад пільным вокам, ці я так сабе акцёр.

*– Паводле законаў жанру, відаць, не спала ў шапку і свая контрвыведка? Або – бязмежны давер?*

– Там усе адзін за адным сачылі. Аднойчы ў нумар пастукаў нейкі чалавек: чарнаскуры, у нацыянальнай вопратцы, з Чаду. Пытаецца, дзе жыве такі вось спадар. – «Не ведаю». Уся размова. Умомант забыўся. А трохі пазней, у Саюзе, выклікаюць асабісты: «Ты кантактаваў з замежнай разведкай!» Здаў сусед-прапаршчык, які прыкідваўся спячым.

*– Што з армейскіх баявых будняў вас асабліва уразіла?*

– Памятаеце гісторыю з падводнай лодкай «Комсомолец»? Красавік 1989-га, поўнач Атлантыкі. 42 з 69 нашых падводнікаў

загінулі. І ў пажары, і ад холаду. Мы ратавалі тых, каму ўдалося ўсплыць: з самалётаў кідалі ўніз ратавальныя плыты. Калі памылішся хаця б на пяцьдзясят метраў – усё, хлопцы не даплывуць, замерзнуць. Арганізацыя выратавання не ўзорная, выжыць у ледзяной вадзе без цёплай вопраткі маглі не многія.

*– Як ад амерыканскай «Саратогі» і гатэля ў Трыпалі вы апынуліся ў правінцыйнай польскай школе? Дзіўны пераход з фільма-баевіка ў амаль меладраму…*

– Я з Брэста, польскую ведаю з дзяцінства, яна для мяне амаль родная. Як продкі гаварылі, так усё і захавалася ў генетычнай памяці. Межы рухаюцца, людзі застаюцца. Мы не выбіраем, дзе нарадзіцца, але можам выбраць, кім сябе лічыць.

Пасля войска на пачатку дзевяностых я быў дробным прадпрымальнікам. Меў кіёск у родным горадзе. Гандляваў чым мог: семкамі, бульбай, тэхнічнай драбязой. Далей і птушкамі, рознымі хамякамі ды пацукамі… Сутыкнуўся з мясцовай шпаной і сапраўднай мафіяй. Прыйшлі: «Будзеш плаціць во столькі і ў такія во дні!» Паслаў у грубай форме. Пачалі па начах біць вокны – лічы, усё заробленае ішло на аднаўленне. Дык спаў там, каб неяк зберагчы сваё дабро.

І вось чарговым разам званю ў 02. «Што здарылася?» – «Кіёск суседа зламаць спрабуюць». – «Ты хто такі? Што там робіш?» – «Гаспадар, сяджу, ахоўваю». – «То і сапі ціхенька ў сваёй будцы!» Яшчэ раз пераканаўся, як працуе міліцыя… Каго абараняе.

Аднойчы ўдала прадаў за нямецкія маркі пару чарапах. На гэтыя грошы купіў два білеты ў Польшчу, і з жонкай паехалі паглядзець, як там. Выпадкова перасекліся з адным мясцовым дзядзькам, пагаварылі – ён і прапанаваў выкладаць англійскую, бо ў іх школе не было настаўніка.

*– Польшча таго часу – гэта сустрэча з іншым светам ці вяртанне да свайго, да таго, што было страчана пад савецкім пластом?*

– Я ўспрымаў нас як адзін народ з агульнай гісторыяй. У Брэсце многія мелі сваякоў у Польшчы. Мой дзед, напрыклад, заўсёды казаў: «Так жыць, як пры саветах, нельга». Ён меў 10 гектараў зямлі, і на маіх вачах завяршылася калектывізацыя, недзе ў сярэдзіне 1960-х. Стварылі калгас, сабралі ўсю земляробчую тэхніку, конныя сеялкі, веялкі, касілкі – і ўсё пад нашую клуню, з якой зрабілі калгасную стайню.

## Мая справа стала другой у гісторыі Беларусі, якую звычайныя грамадзяне выйгралі ў дзяржавы

*– Развітанне з арміяй было змушаным – ці на ўласнае жаданне?*

– Калі Саюз развальваўся, войска надумалі кідаць у гарачыя пункты. А мы супраціўляцца: як гэта – ваяваць супраць тых, з кім разам служылі? З зампалітамі я агульнай мовы не знаходзіў. Дайшло да таго, што прыгразіў аднаму набіць морду. Звольніцца «па скарачэнні штатаў» дапамог саслужывец, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

*– Калі вярнуліся, пачалося фармаванне БНФ, партый, рухаў. Як гэта выглядала знутры?*

– Я ўжо ўладкаваўся ў школе № 25 у Брэсце. На двары 1990-ы. У нас адбываліся сустрэчы з кандыдатамі ад БНФ. На адну запрасіў настаўнікаў: хай, думаю, паслухаюць апазіцыянераў, даведаюцца пра іхныя праграмы, самаму цікава. Але дырэктар баяўся ўсяго беларускага і з пераляку на пачатку сустрэчы зайшоў і абвясціў: «Камуністы – на сход!» Засталіся толькі некалькі настаўніц, пераважна жонкі афіцэраў, ды я. Добрая размова ў вузкім кале – ну і зблізіўся з мясцовымі актывістамі.

Удзельнічаў ва ўсіх акцыях апазіцыі. Узначальваў адразу мясцовую суполку БНФ, а потым і гарадскую арганізацыю. Грантавых грошаў не было, усё рабілі за свае, заробленыя,

за сяброўскія складкі. Друкавалі ўлёткі, арганізоўвалі мерапрыемствы, плацілі штрафы… Заўсёды ездзілі на падмогу сваім у Мінск. Памятаю, як у 1996-м стаялі пад мостам на Нямізе. Насупраць нас – шыхты навабранцаў унутраных войскаў. Саплівыя, са шчытамі, змянялі іх кожныя дваццаць хвілін: хлопцы баяліся, млелі і літаральна падалі ад страху.

*– Падзеі таго года адных зламалі, а іншых загартавалі. Як гэта адбілася на вашым шляху, што змяніла ў разуменні барацьбы?*

– Перамога Лукашэнкі натуральна паспрыяла майму пераходу з палітычнай дзейнасці ў праваабарончы сектар. Зачысткі азначалі арышты, затрыманні, рэпрэсіі… Працы было вельмі многа: ведалі, колькі затрымалі, а каго менавіта – не ў курсе; у курсе, каго ўзялі – а ні гу-гу, куды павезлі… Трымаліся разам – і паступова ўсё вырашалася. Каб аказваць дапамогу арыштаваным, іх сваякам, у гарадах утварыліся ініцыятыўныя групы.

У Мінску – праваабарончая арганізацыя «Вясна-96» на чале з Алесем Бяляцкім. Афіцыйная рэгістрацыя яе брэсцкага абласнога аддзялення адбылася ўвосень 1998 года.

*– Чыя ініцыятыва – таму і лейцы ў рукі?*

– Абралі, адмовіцца аніяк не выпадала. Перш за ўсё заняліся юрыдычнай дапамогай. Вось нібыта проста – скласці скаргу. Але насамрэч тут трэба ўлічваць шмат момантаў. Тады, дарэчы, яны былі важнымі, бо судовая сістэма ўсё ж працавала. Да татальнага беззаконня яшчэ не дакацілася. Арганізоўвалі ды ўдзельнічалі і ў грамадскіх акцыях: заўсёды бралі на сябе страхаванне актывістаў у юрыдычным і інфармацыйным плане. Ездзілі па вобласці, сустракаліся з насельніцтвам, праводзілі навучанне па абароне правоў.

*– Пакуль вучылі людзей іх правам, улада, здаецца, таксама час не марнавала: вучылася абыходзіць законы. Калі вы ўпершыню адчулі гэты разрыў паміж правам на паперы – і праўдай на зямлі?*

– Памятаю адно з першых адкрытых сутыкненняў з уладамі. Святкуем Дзень правоў чалавека, снежань. Падалі заяўку на правядзенне акцыі – фактычна адмова,а паводле закону пайшлі насустрач: далі месца на ўскрайку, дзе ніхто не ходзіць. Вырашылі не здавацца: а давайце ў цэнтр горада, станем каля ЦУМа, якраз насупраць упраўлення міліцыі. Папярэджваю: «Хлопцы, хто са мной? Могуць арыштаваць».

Разгарнулі плакат – тут як тут участковы: «Разыходзімся!» Кажу яму: «Слухай, не рабі сабе праблем. Патупай вакол магазіна, і пакуль вернешся, мы якраз закруглімся. А так начальству выходны сапсуеш, яно на шашлыках, мабыць». – «А я ўжо пазваніў…» Шустры лейтэнанцік!

Праз некалькі хвілін пад'ехаў начальнік Ленінскага РАУС, падпалкоўнік Касцючык, у скуранцы, ну чысты камісар, з групай плячыстых хлопцаў. Загадаў: «Три минуты – вас здесь нет!» – «У нас 10 хвілін да заканчэння». Псіхануў: «Взять!» Усіх схапілі, завалаклі ў варанок – і ў падвал.

*– Колькі было тых, хто не пабаяўся свядома падставіцца?*

– Шасцёра. Камера – гэта такая металічная скрынка, пятнаццаць квадратных метраў. Дзесяць кармушак у сцяне і нас пятнаццаць. Паветра як кісель, многія паляць, па сценах цячэ, ад бамжоў смурод такі, што дыхаеш як гноем.

Потым суд, штраф. А далей падаў скаргу ў міжнародныя інстанцыі. І мая справа стала другой у гісторыі Беларусі, якую звычайныя грамадзяне выйгралі ў дзяржавы.

*– Вас падтрымаў Камітэт па правах чалавека ААН?*

– Так, а пасля прабітай берасцейцамі дарогай пайшлі іншыя. У мяне адкуль тая ідэя? Ад бессэнсоўнага хаджэння па вядомым коле: гарадскі, абласны, Вярхоўны суды… Камітэт прызнаў, што Беларусь абмежавала свабоду выказвання. Мы давялі, што гэта не пікет, а інфармаванне грамадскасці аб неабходнасці

бараніць правы чалавека, да таго ж, прымеркаванае да адпаведнага свята.

*– Спрацавала навука спецпрапаганды, свайго роду манеўр з фактамі?*

– Можа быць. Але мы і насамрэч не пратэставалі, а інфармавалі!

*– Адкуль у вас арыентацыя ў юрыдычных тонкасцях? Без спецыяльнай адукацыі?*

– Знаходзіліся патрэбныя людзі. Яны, ды і мы, верылі ў закон, у магчымасць справядлівасці. На мне ідэі, каардынацыя, дакументы, камунікацыя. На іх – тэхналогіі. Шукалі прафесіяналаў сярод мясцовых, брэсцкіх. Былі і маладыя, і пенсіянеры. Асаблівая ўвага да тых, хто гадамі працавалі ў міліцыі, пракуратуры ці ў судах, а потым выйшлі на пенсію. Яны ўжо маглі гаварыць шчыра, дапамагаць без страху. І шмат хто верыў у справядлівасць, гэта праўда!

*– А што рухала? Жаданне паквітацца з сістэмай, паказаць наступнікам, што ім яшчэ вучыцца і вучыцца? Сцвердзіць самапавагу? Ці ўсё ж грамадзянскае сумленне?*

– Сумленне. У сістэме не ўсе былі цынікамі. Многія – годныя людзі, проста ў іх за тым часам не мелася магчымасці выбару. А тут нарэшце і момант прафесійнай свабоды наступіў, і Саюз ляснуўся, зайшла размова пра будаванне новай, менавіта прававой, дзяржавы.

*– Тады скажыце: а яны што, за сабой грахоў і грашкоў не адчувалі?*

– Ведаеце, я такім пытаннем асабліва не задаваўся. Мо таму, што мы ўсе былі камсамольцамі, піянерамі, чальцамі партыі, але жылі сумленна.

*– Адно – быць камсамольцам, іншае – першым сакратаром райкама. Адно – верыць, іншае – проста існаваць у сістэме. А яны: юрысты, суддзі, пракуроры – працавалі прафесійна.*

*І калі б усё рабілася законна, дык навошта тады ўвогуле праваабарончая сістэма?*

– Тут я з вамі не пагаджуся. Дзяржава не можа ахапіць усе бакі жыцця чалавека, кантралюе толькі асноўныя рэчы. Шмат чаго застаецца па-за ўвагай. Вось гэта і ёсць поле для грамадскіх арганізацый, праваабаронцаў: працаваць з тым, што не ахоплена дзяржаўнай сістэмай.

І яшчэ раз падкрэслю: не варта мінулае мераць сённяшнімі меркамі. На пачатку дзевяностых я падаваўся кандыдатам у мясцовы савет ад БНФ. Еду, даішнік махае жэзлам, забірае дакументы, знікае. Доўга няма. Іду адстойваць праўду, ён нехаця дастае нарэшце мае паперы, сярод якіх – пасведчанне кандыдата. У бедака шапка ажно на патыліцу з’ехала! Адразу па стойцы «смірна», казырнуў: «Выбачайце, таварыш кандыдат!»

– *То-бок ведалі законы і іерархію?*

– А цяпер іншы час. Няма павагі ні да закона, ні да чалавека.

## Калі апазіцыйным дзеячам падкладаюць фальшывыя фота, гукі – усё гэта зброя. Гэта вайна

– *Ёсць меркаванне, што праваабаронцы займаюцца толькі палітычнымі справамі: дапамагаюць тым, каго збілі, арыштавалі, хто супраць улады. Але ж вы займаліся і звычайнымі людзьмі, так? Пакрыўджанымі ў раёне, гарвыканкаме, на пошце, заводзе…*

– Мы дапамагалі ўсім, хто не ў стане сам сябе абараніць. Не кожны мае падвешаны язык, не любы здольны ўстаяць перад чыноўнікам. Тады бярэш чалавека за руку і ідзеш з ім як прадстаўнік. Канстытуцыя дазваляла. Там было прама

напісана: «Кожны грамадзянін мае права на абарону і можа мець свайго прадстаўніка, якому давярае».

Чыноўнік бачыць: перад ім не проста бабулька, а яшчэ і «з прадстаўніком», юрыдычна падкаваным. І адразу тушуецца, становіцца мякчэйшым. У тыя часы права яшчэ працавала.

*– Ці абарочвалася гэта павагай да вас непалітызаваных гараджан?*

– На пэўным этапе адчуў, што ў горадзе мяне ведаюць. Напрыклад, калі мяняліся кіраўнікі мясцовай улады, то яны нярэдка запрашалі на сустрэчы. Разумная тактыка: знаёміцца з тымі, хто нешта сабой уяўляе, хто ў тэме, каб разумець, чым дыхае горад.

*– І якія, напрыклад, кіраўнікі пакінулі ўражанне?*

– Апошні – Рагачук. Раней быў Цупрык.

У гэтых запрашэннях на сустрэчы не заўсёды павага, хутчэй агледзіны: ці варты ўвагі? Ацэнка: лічыцца з такім – ці не?

*– Размовы былі нармальныя? Без начальніцкай інтанацыі?*

– Так. Але пазней я зразумеў, што кіраўнік горада вельмі часта зусім не галоўны ў Брэсце. Сістэма пераплеценая: міліцыя, пракуратура, адміністрацыя, партыя – усё звязана. У старшыні выканкама няма паўнаты ўлады, бо ў кожнага сілавіка, напрыклад, свая вертыкаль, спрэс падвойнае падпарадкаванне. І гэбэшнае начальства заўсёды вышэйшае за мясцовае.

*– А бывала, што гэтыя ж уладныя структуры, ад якіх звычайна чакалі перашкод, раптам станавіліся на бок здаровага сэнсу? І ў тых кабінетах можна было дагрукацца да чалавечага?*

– Напрыклад, калі я адкрываў беларускі клас, то зрабілі ўсё, што прасіў: рэклама на тэлебачанні, публікацыі ў газетах, нават вызначылі школу бліжэй да кватэры, дзе жыў. Мяркую, было ўказанне: «Для гэтага чалавека рабіць усё, каб не наракаў на рэжым». А прыйшоў хто іншы – адмовілі б.

Памятаю выпадак на выбарах: камісія не хацела прапускаць. І вось старшыня адміністрацыі бярэ за руку, завёў унутр і сказаў: «Пусть будет».

*– Унікальная формула!*

– Па законе не меў права ўмешвацца, але… Закон у нас як? Куды павярнуў, туды і пайшло.

*– Хто быў вашымі саюзнікамі ў недзяржаўным Брэсце? Напрыклад, горад заўсёды вызначаўся моцнай журналістыкай, незалежнай прэсай.*

– Добра працавалася з «Брэсцкім кур’ерам» і «Брестской газетой», перыядычна дапамагаў «Вечерний Брест», здараліся кантакты з «Брэсцкім веснікам».

*– А што праваабарончая сетка ў горадзе: яна шырокая, моцная?*

– Беларускі Хельсінкскі камітэт, «Прававая ініцыятыва». Не скажу, што існавала нейкая моцная каардынацыя, але кантактавалі міжсобку. Суперніцтва не бачыў, бо працы хапала ўсім.

*– Калі меркаваць з раней вамі сказанага, вызначэнне «шматстаночнікі» цалкам пасуе. Гэта псавала – ці ўмацоўвала імідж арганізацыі?*

– Нешта не шмат было ахвочых займацца правамі чалавека. Бо не заўсёды да хаты можна дабрацца: чатыры разы на год затрымлівалі або наогул выкрадалі са збіццём і мехам на галаве.

А наогул лічу так: чалавек прыйшоў – трэба дапамагчы. Як веласіпед: каб ехаць, трэба круціць педалі. Не мог сказаць: «Не, тут не пра правы чалавека». Калі бабуля просіць дапамагчы ў падзеле маёмасці – дапамагаем. Калі нехта скардзіцца, што на пошце абышліся несправядліва – таксама. Вядома, у прыярытэце затрыманыя ці збітыя «за палітыку». Але было і зацішша: дык складаць рукі? Не, мы заўсёды працавалі.

*– А бывала, што вашыя намаганні радавалі не аднаго чалавека, а цэлы горад? І трыста тысяч адчувалі: праўды можна дабіцца!*

– Звярнуўся грамадзянін Варвашэвіч: прынёс раскладку відавочных парушэнняў у карыстанні вадой. Дапамаглі яму ўзняць пытанне – і ў выніку пераразлік тарыфаў атрымаў увесь горад. Гараджанам вярнулі грошы.

*– Тады яшчэ арыфметыкі: як паказаць працу праваабаронцы ў лічбах? Токар скажа, колькі дэталей вытачыў, а колькі чалавек абаранілі вы?*

– Звярталіся да нас тысячы – і дапамагалі ўсім, хто звяртаўся. Таму і падтрымка была. Або такая матэматыка. У вобласці каля тысячы выбарчых участкаў. На прэзідэнцкіх выбарах 2001 года мы, вясноўцы, забяспечылі назіранне на ўсіх участках. У Століне запрасілі на дапамогу студэнтаў юрыдычнага факультэта мясцовага каледжа. На «выдатна» спрацавалі! Ад абласной арганізацыі выставілі трыста назіральнікаў. Трыста! У мяне мазалі на пальцах былі ад пляскання пячаткай па пасведчаннях.

*– Часта пасля такіх кампаній даводзілася абараняць калег, арганізацыю?*

– У 2003-м рэспубліканскую «Вясну» ліквідавалі, а мы працягнулі яшчэ амаль год і запусцілі працэдуру рэгістрацыі свайго рэгіянальнага аддзялення. Падавалі дакументы разоў адзінаццаць, не менш. Бо пакуль паперы на разглядзе, ты ў нейкім паўлегальным стане, можаш дзейнічаць. І гэта было важна. Так вось і ваюем за справу і сябе. Дваццаць сем гадоў запар. І па сёння не капітуляваў: застаюся старшынём Брэсцкага абласнога аддзялення.

*– Чвэрць стагоддзя супраціву – гэта ўражвае. Што трымае ў справе, калі многія даўно апусцілі рукі?*

– Я не хаваюся. Проста не ўсё можна агучваць. Праца працягваецца і там, і тут. Людзі ж ёсць паўсюль. Але паролі-яўкі раскрываць не буду.

Сёння мы маем вайну. І пачалася яна не ў 2022-м, а ў 2020-м – у Беларусі. Гэта вайна рэжыму з народам. Усе метады баявых дзеянняў ужываюцца супраць грамадзян. Грымелі стрэлы, ляцелі гранаты, былі параненыя, была прапаганда. А яна працуе як зброя.

Калі мяне дапытвалі апошні раз, следчы сказаў: «Вось гэтую інфу – туды, тое – сюды, а самае смачнае – прапагандыстам». Скінулі розным «жоўтым слівам», каб выкруціць, перайначыць, прыдумаць: інфармацыйная, псіхалагічная дыверсія. Калі пляжаць апазіцыйных дзеячаў featured рознымі падкладзенымі для карцінкі на ўладных рэсурсах прадметамі, фальшывымі фота і гукам – усё гэта зброя вайны. Не справа «праваахоўных» органаў займацца чорнай ды шэрай прапагандай. Пасада спецпрапагандыста прадугледжана ў армейскім штаце, а не ў Міністэрстве ўнутраных спраў.

*– Не жартуюць часам: маўляў, Вялічкін – «Лукашэнка праваабароны», бо амаль столькі сама гадоў на пасадзе?*

– Ніколі. Мы – не ён з ягонымі фальшывымі выбарамі. Да нас доўгі час цягнуліся з надзеяй, у нас шчыра верылі. Да апошняга дня, да пагрому грамадскіх арганізацый і журналістаў у лютым 2021-га, на прыём стаялі чэргі, каб напісаць скаргі, у офісе збіралі перадачы для затрыманых, давалі кансультацыі, кантакты адвакатаў…

Перад тым мне здавалася, што ўлада здолела зламаць грамадзянскі супраціў у краіне.  Аднак яшчэ калі ў Брэсце пачаліся пратэсты супраць акумулятарнага завода, то адчуў: памыляюся, нешта зрушылася! Асабліва зайшоў момант з расійскімі трыкалорамі, якія на першым этапе нейкія людзі пачалі прыносіць, але гэтым хлопцам хуценька патлумачылі, што яны памыліліся адрасам. Затое з’явіліся бел-чырвона-белыя сцягі. У дваццатым яны, нібы парасонам, накрылі ўвесь горад.

Ні ў якім разе не звязваю гэта наўпрост з сабой, але ў тым, што Беларусь стала беларускай, ёсць, напэўна, і кропля праваабарончай працы ўсіх тых, хто далучыўся да супольнай дзейнасці.

Спадзяюся, нашае жыццё і жыццё нашых нашчадкаў неўзабаве пацячэ ў прававой дзяржаве пад гербам «Пагоня» і бел-чырвона-белым сцягам.

Частка III

# РАСКАЗАЦЬ БЕЛАРУСЬ

# АЛЕГ ГРУЗДЗІЛОВІЧ



Фота з асабістага архіва А. Груздзіловіча

*Нарадзіўся ў канцы 1958 года ў Брэсце.*

*Бацькі – дзяржаўныя службоўцы. Жанаты, бацька трох сыноў.*

*У 1976 годзе закончыў сярэднюю школу № 9 (спецыялізаваная англійская) і гарадскую музычную школу. Падчас вучобы захапіўся палітычнымі працэсамі ў Еўропе і вырашыў стаць журналістам.*

*Скончыў журфак БДУ.*

*Уладкаваўся на пасаду карэспандэнта заводскай шматтыражнай газеты «Інтэграл», далей чатыры гады працаваў інструктарам адзела прапаганды ў Мінскім абкаме камсамолу.*

*Адтуль у пачатку 1985 года перайшоў у моладзевую газету «Знамя юности».*

*На той момант цалкам расчараваўся ў камуністычнай ідэалогіі.*

*З малых гадоў з павагаю ставіўся да беларускай мовы і культуры, але да перабудовы размаўляў і пісаў журналісцкія тэксты па-руску.*

*У 1988 годзе быў адказным сакратаром выдання, ініцыяваў спыненне перадруку артыкула камуністычнай артадаксальнай публіцысткі Ніны Андрэевай.*

*У наступным годзе далучыўся да падпольнага выпуску газеты «Навіны БНФ», стаў дэлегатам устаноўчага з'езду БНФ у Вільні.*

*У 1994–1995 гадах працаваў у «Народнай газеце», потым у «Свабодзе» і «Навінах». З 1995 года супрацоўнічаў, а з 2000 года стала працуе карэспандэнтам беларускай службы «Радыё Свабода».*

*Больш за 10 разоў затрымліваўся за рэпарцёрскую працу на пратэсных акцыях. У снежні 2021 года быў арыштаваны і асуджаны паводле так званага народнага артыкула 342 Крымінальнага кодэкса на 1,5 года зняволення. У верасні 2022 года вызвалены з магілёўскай калоніі на падставе памілавання, дэпартаваны ў Літву. З таго часу жыве ў Вільні з жонкай Мар'янай.*

*Аўтар кніг «Хто ўзарваў менскае мэтро?» (2012), «Мае турэмныя муры» (2023), «Прыгоды дзядзі Віці на Валадарцы» (2024).*

*Лаўрэат прэміі Праваабарончага альянсу Беларусі (2009), прэміі імя Францішка Аляхновіча за найлепшы турэмны твор (2023), прэміі Сейма Літвы «Надзея Свабоды» (2022), журналісцкай прэміі імя П. Браўна за 2023 год.*

*У 2024 годзе быў узнагароджаны медалём Няскораных Ларысы Геніюш (узнагарода Аб'яднанага пераходнага кабінета), у 2025 – медалём ордэна Пагоні (узнагарода Рады БНР).*

АЛЕГ
ГРУЗДЗІЛОВІЧ

# ПІСАЎ ПРА ЗДЗЕКІ. ПРАЙШОЎ ТУРМУ. І ДАКАЗАЎ: СВАБОДУ НЕ ЗЛАМАЦЬ

## Брэст – адзіны горад Расійскай імперыі, які дзеля крэпасці быў зруйнаваны і адбудаваны побач

*– Алег, у лёс праз расклад зорак верыце? Астралогіяй цікавіліся?*

– У маім выпадку геаграфія, зямля больш падыходзіць, чым геаметрыя нябёсаў. Не ведаю, кім бы стаў, каб жыў у Гомелі ці Магілёве. А нарадзіўся ў Маладзечне – тады гэта быў абласны горад. Якраз час хрушчоўскай адміністрацыйнай завірухі: вобласць ліквідавалі. Бацькі – перад выбарам, куды падацца: закрывалі іхныя рабочыя месцы. Тата нават ездзіў прымервацца ў Гродна: усё там добра, акрамя кадравых перспектыў. А ў Брэсце прапанавалі пасаду намесніка начальніка ўпраўлення мясцовай прамысловасці. Для яго кваліфікацыі цалкам адпаведна, і кватэру абяцалі. Зоркі, як вы кажаце, сышліся: выбар зроблены, мой лёс быў прадвызначаны.

*– Браты-двайняты нарадзіліся ў наменклатурным доме, у цэнтры?*

– Якое там! Спачатку арандаваная кватэрка ў драўляным доме на гарадскім ускрайку. Гэта стэрэатып, што начальнікі савецкай сістэмы ўсе былі ўпакаваныя. Маме не хапала свайго малака для сыноў, але пашанцавала – побач жыла жанчына, якая гандлявала казіным. На ім і выраслі. Толькі значна пазней бацьку пачалі два разы на год выдаваць наменклатурныя падарункі: звязка воблы, палка каўбасы, пачак грэчкі, печыва, маленькая бляшанка распушчальнай кавы – вось і ўсё. Прывілеі мясцовай партбюракратыі таго часу – шмат у чым міф.

*– А як Брэст, горад на мяжы, паўплываў на ваш светапогляд і жыццё?*

– «Вароты ў Еўропу» – гучыць банальна, але гэта, безумоўна, уплывала. Напрыклад, у нас загучалі бітлы і ролінгі тады, калі большасць маладзёнаў у СССР пра іх яшчэ ні сном, ні духам. Толькі з Высоцкім было наадварот.

Па-другое, горад вайсковай славы – моцны выхаваўчы чыннік.

Ну і трэцяе – удалая кар’ера бацькі. Спачатку ачоліў управу мясцовай прамысловасці, хутка стаў намеснікам старшыні гарвыканкама, а ў 1968 годзе старшынёй, фактычна мэрам. Хоць якія «мэры» ў нас нават цяпер, не кажучы пра той час? Кіраваў дзесяць гадоў.

*– Для ўсёй Беларусі гэта быў час сацыяльна-эканамічнага рыўка. Прамысловасць цягнула за сабой усю гарадскую інфраструктуру. Імклівасць урбанізацыі мог заўважыць нават школьнік.*

– Час сапраўды быў унікальны. Але я прыкмячаў гэта не па заводах і фабрыках, а па Брэсцкай крэпасці, якой якраз далі зорку Героя. Пачалася маштабная рэканструкцыя фактычна руін. На маіх вачах – размовы і спрэчкі з легендарным скульптарам Аляксандрам Кібальнікавым. Бацька расказваў пра сустрэчы з публіцыстам Сяргеем Смірновым, аўтарам кнігі пра подзвіг абаронцаў цытадэлі.

*– А ці не згадваў пра генерала Крывашэіна – таго, што разам з галоўным нямецкім танкістам Гудэрыянам прымаў парад у Брэсце ў 1939-м?*

– Так, і тут у мяне цікавая згадка. У васьмідзясятых, журналістам «Знамёнкі», трапіў на сход ветэранаў, якія горача аспрэчвалі наш артыкул пра гэтыя падзеі. «Хлусня! Праплачаная публікацыя!» Падымаюся: «Мой бацька асабіста сустракаўся з Крывашэіным, я сам бачыў фота таго параду. Гэта гісторыя, а ў вас, пры ўсёй павазе, – міфы. 22 верасня 1939 года ў Брэсце сапраўды прайшла савецка-германская вайсковая калона – у гонар перадачы горада і крэпасці пад наш кантроль. Пакт Молатава – Рыбентропа ў дзеянні».

*– Думаю, апладысментаў за той лікбез не было.*

– Не, зашумелі, заўлюлюкалі. І адзін з пагонамі палкоўніка выдыхнуў: «А, ну ўсё ясна: Груздзіловіч – габрэй». Дарэчы, заўважыў: сярод зацятых камуністаў хапала антысемітаў.

*– І як тады наменклатурны юнак узбіўся на беларушчыну?*

– Вучыўся фактычна ў элітарнай спецшколе: англійская з другога класа – на ёй геаграфія, тэхнічны пераклад, літаратура. Настаўнікі адукаваныя. Выкладчыца фізікі пазнаёміла з «Майстрам і Маргарытай», а настаўніца англійскай расказвала пра сустрэчы з маладымі людзьмі, якія гавораць па-беларуску і крытыкуюць «рэканструкцыю» крэпасці. Яны казалі: «Не аднаўляць трэба, а выратаваць старое». І сапраўды – гэта адзіны горад у Расійскай імперыі, які дзеля фартэцыі быў зруйнаваны цалкам і адбудаваны наноў. Збоку. Настаўніца асабліва захаплялася маладымі журналістамі, што выцягвалі гэтыя факты на святло.

## Кармленне навуковым камунізмам хапала, хоць я і так быў паўфабрыкатам прапаганды

*– Халодны душ, контрпраўда пра тое, што нараджала запал патрыятызму, нечакана выклікала цікавасць да журналістыкі?*

– Не без таго. Але пачалося з іншага. Светапоглядна я рос шчырым камуністам – перажываў, каб лагер сацыялізму пашыраўся па ўсім свеце. Калі зрынулі рэжым Салазара ў Партугаліі, я, школьнік, страшэнна радаваўся і стаў сачыць за тым сюжэтам. Тым больш, цэнтральная прэса шмат і цікава пра гэта пісала. І вось – жаданне: буду журналістам. З дзявятага класа пачаў хадзіць у абласную «Зарю», наладзіў кантакты, нешта пісаў.

*– Напэўна, бязлітасна правілі. Перакрэсліванні не збівалі імпэт? Калі замест чарговай нататкі з'явілася нешта, чым ганарыліся?*

– Рэдагаванне ўспрымаў спакойна. А важным лічыў артыкул пра тое, чаго не хапае сучаснай школе. Замахнуліся на рэальную аналітыку ўдваіх – кансультаваў і падчышчаў тэкст старэйшы сябра, вядомага брэсцкага актывіста. Прозвішча яго было

легендарнае, як у аса савецкай публіцыстыкі з Масквы, Аграноўскага. Тады я гэтага не ведаў і ў творчым сачыненні шчыра напісаў: ідэйным настаўнікам быў Аграноўскі. А дэкан журфака, Рыгор Васілевіч Булацкі, літаральна абрынуўся з абвінавачваннямі: маўляў, нахабна прыпісаў сабе знаёмства з мэтрам! Вось і зацікавіўся творчасцю Анатоля Абрамавіча.

*– Пасля яго кніг з нарысамі і разважаннямі пра журналістыку выкладчыкі ўжо не ўражвалі? На факультэце ж было не столькі пра сутнасць прафесіі, колькі пра каванне ідэолагаў.*

– Безумоўна, кармленне навуковым камунізмам хапала, хоць я і без таго быў тады паўфабрыкатам прапаганды. Але вучылі і рамяству: тэорыі жанраў, макетаванню, фотасправе. Наогул, універсітэцкая адукацыя заўсёды шырэйшая за прафесію. Важнае не проста тое, чаму вучаць, а хто вакол. Людзі, кантакты, атмасфера – усё гэта мае значэнне. Напрыклад, ужо на другім курсе мы сустракаліся з Васілём Быкавым. Запомнілася, як сціпла паводзіў сябе такі славуты чалавек, колькі разважаў над кожным словам. А потым – кантраст: сустрэча з радыёжурналісткай Нінай Чайкай. І такі барабан ні пра што! Як кажуць, адчуйце розніцу.

*– У перабудову Беларусь стала адным з «рупараў Вандэі». Журфак як школа прапаганды ў яе выпадку не прагадаў. Але рэдакцыйныя ідэолагі звычайна былі слабымі прафесіяналамі. Заўважалі гэта?*

– Так, лозунгавасць не пасуе рэдакцыі, бо пазбаўляе крэатыўнасці. Я адчуваў гэта яшчэ інтуітыўна. Напрыклад, калі галоўны рэдактар «Зари» Пётр Суцько пасля дыплома запрасіў да сябе, то адмовіўся – з ідэйных меркаванняў. Бацька начальнік, будуць глядзець праз яго, паспрабуюць выкарыстаць як свайго ў гарадскіх колах – запхнуць у афіцыёз. Таму выбраў нейтральны, рабочы мінскі штотыднёвік «Інтэграл». Праз год спакусілі прапановай перайсці інструктарам у аддзел прапаганды абкама камсамолу – паабяцалі кватэру. На заводзе чарга гадоў на дваццаць, а ў мяне сям'я: жонка, сын. Трэба цягнуць.

*– Ну дык лагічна было прабівацца ў прапагандысцкай «чарадзе чаек» на першыя ролі – рабіць партыйную кар'еру. Ці ўжо адчувалася, што там не ваш кісларод?*

– Наадварот, менавіта там згубіў усе свае былыя камуністычныя ілюзіі. У камандзіроўках зблізжаўся з равеснікамі, і калі па вечарах пад музыку кідалі камсамольскую рыторыку, пачыналася: «Ты не ведаеш жыцця! Паглядзі – усё працуе інакш, чым на словах». І давай сыпаць фактамі…

Або паслалі працаваць на Маскоўскі фестываль моладзі. Калі камсамольскія лідары ў Беларусі яшчэ трымалі нейкі сорам, то ў Расіі – проста жах. Цягнулі ўсё, што маглі. Начальнік нашай групы – сакратар абкама дзесьці ў Разані ці Бранску– быў банальным злодзеем. Цягнуў усё, на што вока клалася.

Памятаю, як калісьці студэнтам падпрацоўваў на чыгунцы. Брыгадзір там заўсёды таксама нешта выносіў. Аднойчы гляджу: хавае вяроўку. Кажу: «Навошта табе яна?» – «Ды сабака дамоў не пусціць, калі нічога не прыцягну». Жывы анекдот, хоць і праўда. Вось і ў іх тое самае мысленне: трэба нешта вынесці. Налепкі, чэкі, талоны на бензін, на харчаванне – усё ішло ў ход.

*– А самога пасылалі правяраць тое, у што ўжо не вельмі верылася?*

– Скажам, еду рэвізаваць працу лектарскіх груп. Суцэльная фікцыя. Нічога няма, толькі паперы. Можаш наваліцца на таго камсамольскага сакратара, толькі ведаеш: у яго дзіця хворае, заядае быт… А мы тут з лініяй партыі і чарговым з'ездам. Разумееш: гэта тэатр. І паступова расчараваўся ў сістэме.

Памятаю, памірае Брэжнеў. Мне задача: «Пішы тэлеграму са спачуваннем ад моладзі вобласці». Ну, напісаў: «глыбока смуткуем», «светлая памяць», «вялікі сын партыі». Паперу, не ведаю чаму, не выкінуў. Паклаў у шуфляду.

Праз год – памірае Андропаў. Выклікаюць ізноў: «Пішы тэлеграму». Дастаю старую, чышчу пару слоў – нясу гатовую.

Захапленне: «Малайчына, аператыўна!» Праз паўтара года памірае Чарненка. Я ўжо з іроніяй: «Пачакайце, пяць мінут!» І ўсе смяюцца, як з нармальнага працэсу.

## Прылятае шэф: «Малайцы! Вось гэта камсамол новай эпохі!» Так з вінаватага стаў героем

*– Працягласць жыцця сістэмы адпавядала яе шаблоннасці. Ці былі гатовыя да перабудовы?*

– Тады я працаваў адказным сакратаром у «Знамени юности». Газета грымела, ішла ў нагу з часам: свабодная рэдакцыйная палітыка, журналісты не лезуць па слова ў кішэню… І тут, у 1988-м, артыкул Ніны Андрэевай «Не могу поступиться принципами». Кіраўніком газеты быў тады Аляксандр Саламаха. Пад вечар ідзе дадому, кідае набраныя гранкі: «Пастаў гэта на суботу». Чытаю і разумею: нас выкарыстоўваюць, каб распаўсюдзіць чарнасоценны фактычна пасквіль – у газеты найвялікшы наклад у Беларусі, за паўмільёна.

Я склікаў калег: Юрыя Вельтнера, Ларысу Саенку, Паўла Уладзімірава, іншых. Дыскусія вострая, але большасць вырашыла: не ставіць.

У панядзелак – разбор палётаў. Прыбег з ЦК інструктар Крукоўскі, пачалі выклікаць па адным і ціснуць: «Чаму не надрукавалі? Парушылі партыйную дысцыпліну!» Маладым журналістам пагражалі звальненнем. Мяне асабліва не чапалі, але пры выхадзе Крукоўскі злосна шапнуў: «Я цябе знішчу!»

Але праз два дні – нечаканы паварот. Выступае ў Маскве член палітбюро Аляксандр Якаўлеў, называе той артыкул «антыперабудовачным маніфестам». Высвятляецца, што сам Гарбачоў палічыў яго дыверсіяй. І нават сказаў дзесьці: «У Беларусі знайшлася маладзёжная рэдакцыя, якая адмовілася друкаваць».

І ўсё змянілася. У рэдакцыю прыбег Саламаха, усім цісне рукі: «Малайцы! Вось камсамол новай эпохі!» Так я з вінаватага стаў героем.

*– А што засталося ў душы: адчуванне змен – ці ўсё яшчэ разгубленасць?*

– Мы не дазволілі сабе перадрукаваць Андрэеву, але не стварылі альтэрнатывы. Былі яшчэ не гатовыя да сапраўднага плюралізму. Тады – пашчасціла, пранесла, але да нас пачалі пільна прыглядацца. Даводзілася ўжо карыстацца шчылінкамі свабоды.

Калі ў балтыйскіх рэспубліках з'явіліся народныя франты, пра іх забаранілі пісаць. А я ўзяў нататку пра эстонскі рух і паставіў пад рубрыкай «За рубежом». Праскочыла. Потым зрабіў тое самае з Латвіяй. Зноў пацiраю далоні. Але калі ўрэшце гэтыя хітрыкі заўважылі, выклікалі на дыван, доўга пясочылі.

Толькі ўжо не спыніць: стаў дэлегатам устаноўчага з'езду БНФ у Вільні, стварыў яго ячэйку ў «Знамени юности», мы правялі агульны сход у Доме друку. Народны фронт быў тады маладым, вольным, поўным веры. Не апазіцыяй, а рухам адраджэння.

Тады пазнаёміўся з Вячоркам, Івашкевічам, Алесем Сушам. Хлопцы папрасілі напісаць артыкул для «Навінаў БНФ» пра карупцыю партыйных кіраўнікоў у прыгараднай гаспадарцы «Атоліна». Зрабіў. Усё выйшла, і так стаў часткай новай журналістыкі.

*– А ці паўплывала на сыход новая кадравая палітыка? Якраз тады ў «Знаменку» прыйшоў новы рэдактар.*

– Так, Міхась Кацюшэнка. Тыраж упаў, газета стала больш урадавай. Шэф, як высветлілася, быў чалавекам Кебіча – і ўвогуле не з тых, хто цягнуў да перамен. І я пайшоў у «Народную газету», якую тады стварыў у парламенце Іосіф Сярэдзіч. Паўтара года быў парламенцкім карэспандэнтам,

разам з Мікалаем Галко. Мы асвятлялі ўсе падзеі, а тады палітычнае жыццё выбухала штодня.

*– Па сённяшніх мерах гэта выглядае неймаверна: у парламенце сапраўды панавала свабода слова?*

–. Раніца пачыналася з гадзіны рэплік: дэпутаты маглі выступіць свабодна, выказаць пазіцыю. І вось Лукашэнка выкарыстоўваў тую магчымасць на сто адсоткаў. Гаварыў гучна, з жарцікамі і лозунгамі. Палова – пустата і папулізм, але слухалі. Так і набіраў папулярнасць.

А потым 1995 год. Збіццё дэпутатаў. Я быў у зале, дзе апазіцыя пачала галадоўку пратэсту супраць моўнага рэферэндуму. Вечарам мы трохі пасядзелі, размаўлялі. Сышоў дадому позна, а раніцай даведаўся: хлопцаў збілі! Вывозілі на аўтобусах, катавалі. Сустракаю Герменчука – паказвае спіну ў сіняках. Алеся Шута таксама змалацілі. Я запісаў сведчанні, апісаў у рэпартажы ўсе падрабязнасці: як адчыняліся дзверы і пачаўся гэты гвалт, хто збіваў, каму дасталася… Перадаў у рэдакцыю, не сумняваўся, што матэрыял выйдзе назаўтра, але ў газеце толькі першая частка, дзе драбяза: пачатак дня, а пра яго драматычны фінал – нічога.

*– А чаму матэрыял абрэзалі? У паветры пацягнула цэнзурай? Пакацілася на вечар?*

– Выканаўцам абавязкаў рэдактара быў ужо Мікалай Галко. Сярэдзіча знялі, сярод іншых прычын, і за падпісаны ў свет мой артыкул «Лукашэнка нацэліўся на Крэмль». Паласу з гэтым матэрыялам тады разабралі.

А я сказаў у ім тое, пра што яшчэ ніхто ўголас ні-ні. Выразна адчуў далёкі намер «маладога прэзідэнта», калі апынуўся побач падчас візіту Ельцына на МТЗ. І «наш» з цяплом у голасе і ліслівым паклонам казаў тады «дарагому госцю»: «Глядзіце, гэта ж ваш завод!»

*– Ну а Галко? Вы ж былі калегамі, працавалі плячо ў плячо! Тлумачыў неяк сваю пазіцыю, апраўдваўся?*

– Проста сказаў традыцыйнае ў дзяржаўнай прэсе: «Ты ўсё разумееш…» І я зразумеў. Мы засталіся ў добрых адносінах, бо зразумела, што ён быў паміж молатам і кавадлам, калі пагадзіўся быць выканаўцам, разумеючы, што хутка заменяць. Так і сталася: праз паўгода прызначылі іншага, а Мікалай сышоў.

А я ўжо на заўтра напісаў заяву аб звальненні. Вырашыў, што калі як парламенцкі карэспандэнт не магу асвятляць галоўную падзею парламента, мая праца губляе сэнс. Галко падпісаў адразу, без спрэчак.

## «Свабода» – гэта іншы свет: у ім усё на табе. Напісаў – адказваеш. Ніхто не прыкрые, няма найвышэйшай інстанцыі

– Хутка прапанаваў той самы зняты артыкул пра крамлёўскія памкненні Лукашэнкі дэпутату і рэдактару газеты «Свабода» Ігару Герменчуку – і той яго хутка надрукаваў. Так пачалася мая праца ў гэтай рэдакцыі. Там ужо былі Віталь Цыганкоў, Віктар Уладашчук, Алесь Дашчынскі. Мы разам рабілі газету, якая потым называлася «Навіны», «Наша Свабода» – назвы змяняліся, але сутнасць заставалася.

– *А чым «Свабода» адрознівалася ад «Народнай газеты»?*

– Гэта іншы свет. У ім усё на табе. Напісаў – адказваеш. Ніхто не прыкрые, няма найвышэйшай інстанцыі. Калі памыліўся – адказнасць і перад чытачом, і перад рэдактарам. А Ігар быў залатым чалавекам, падводзіць яго не хацелася. Цяжэй, але значна цікавей. Сапраўдная школа незалежнасці.

– *Памятаеце момант, калі яна ператварылася ў сапраўднае выпрабаванне, бо ад слова ўжо залежала свабода рэальная, а не газетная?*

– Здаецца, гэта Павел Жук прынёс у рэдакцыю сакрэтны дакумент. Гаворка ішла пра падрыхтоўку захадаў супраць

апазіцыі, якая, маўляў, плануе «захоп улады». Таму дазвалялася прымаць супраць гэтых людзей «жорсткія меры» – нават фізічнае знішчэнне. Публікацыя выйшла пад маім імем.

Праз некалькі дзён пасля публікацыі я збіраўся на працу і заўважыў пад вокнамі бусік. Патэлефанаваў Жанне Літвіной, тады яна кіравала «Радыё Свабода» і была старшынёй БАЖа. Толькі выйшаў з пад'езда – адразу падскочыў чалавек у плашчы. Тыповы гэбіст. Паказаў пасведчанне, ухапіў за руку – і ў бусік. Там нейкі «сведка». Малады, гадоў трыццаць, у дзіўным убранні: скураная куртка з махрамі, вялікія туфлі з абцасамі, амаль са шпорамі – як нейкі індзеец. Потым я зразумеў, што такіх выпускалі на вуліцу, каб сачыць, заводзіць кантакты, здаваць.

– *Стукач на ўсе выпадкі жыцця?*

– Іх вербавалі паўсюль, у розных слаях грамадства.

У галоўным будынку КДБ мяне бесперапынна валтузілі некалькі гадзін: хто прынёс дакумент, адкуль, як, што, чаму… Але я меў на той момант добрую юрыдычную кансультацыю і трымаўся яе: буду размаўляць толькі ў прысутнасці грамадскага прадстаўніка. Кадэбістаў гэта збівала з толку, але не здаваліся: пагрозы, шантаж, псіхалагічны ціск. Урэшце хтосьці патэлефанаваў майму следчаму, ён засунуў паперы назад у тэчку і сказаў:

«Ну добра, распішыцеся хоць, што былі ў нас». – «Не буду. Нават гэтага не зраблю».

Праз некалькі месяцаў – раптоўная смерць Карпенкі. Потым прапалі Захаранка, Ганчар, Красоўскі. Мы ўсе разумелі: гэта ўжо не гульня.

Я шмат разоў пасля думаў: маглі ж і са мной зрабіць тое самае. Але тады, у 1998-м, яшчэ заставалася нейкая інерцыя перабудовы, крыху свабоды. Мо таму і не рызыкнулі. А ўжо праз год іх метады сталі іншымі: ціха, без судоў, без следства.

І галоўнае – гэты дакумент сапраўдны. Ён прарочыў усё, што адбылося. Значыць, у тых органах яшчэ былі людзі сумлення. Тыя, хто хацеў прадухіліць злачынства.

## Час, у якім адбілася ўсё: вера, адчай, кроў і праўда, што ніколі не знікае

– Ну а стала працаваць на «Радыё Свабода» пачаў з 2000 года. Па сёння, за выключэннем зняволення.

*– За гэты час вы бачылі шмат палітычных постацяў эпохі: і Гарбачова, і Ельцына, нават з Клінтанам, здаецца, была сустрэча?*

– Але часцей за ўсё, зразумела, даводзілася назіраць за Лукашэнкам – з часоў дэпутацтва. Калі ён яшчэ толькі рабіў выгляд, што дэмакрат. Неяк браў каментар пра закон аб зямлі і пачуў: «Сялянам трэба даць яе, гэта зменіць усё на агульную карысць». Не паспеў выключыць дыктафон, як Лукашэнка пачынае каментаваць карэспандэнту камуністычнай газеты «Товарищ»: «Нельга аддаваць зямлю, бо разваляць усё, пачнуць гандляваць, народзяцца алігархі». Тады і зразумеў: гэты чалавек будзе гаварыць усё, што зручна яму.

Або ўзяць першыя крокі прэзідэнцтва. Знакавай была сустрэча з групай журналістаў пасля гісторыі з белымі плямамі: тады з газет паздымалі альтэрнатыўны антыкарупцыйны даклад Сяргея Антончыка. Прыйшоў з ахоўнікам – вельмі грозным, і сам хмуры, жорсткі. Але ўсміхаўся, павітаўся за руку.

Старэйшыя калегі падштурхнулі мяне да выступу, я і сказаў: «Вы знішчаеце люстэрка, якое можа дапамагчы бачыць краіну. Свабодная прэса – гэта не вораг, а інструмент. Без яе страціце арыенціры».

Слухаў моўчкі. Потым ляпнуў штосьці дзяжурнае пра дысцыпліну, дзяржаўныя інтарэсы. Вочы халодныя,

шкляныя. Да мяне дайшло: не чуе, прыйшоў не слухаць – толькі адпрацаваць ролю.

*– Фактычна, маналог перад Лукашэнкам – гэта смелая спроба захінуць сабой свабоду слова. Калі разабрацца, усе гады на «Радыё Свабода» вы займаліся праваабарончай журналістыкай.*

– Памятаю першы працэс, які адкрыў мне гэты кірунак. 1996 год. У судзе Славамір Адамовіч – фактычна першы палітвязень новай Беларусі. Ён напісаў верш «Забіць прэзідэнта» і атрымаў рэальны тэрмін.

Потым разгон Чарнобыльскага шляху, арышты, турмы, знікненні палітычных актывістаў і лідараў. Я кантактаваў з іх сем'ямі: з маці Завадскага, з дачкой Захаранкі. Гутаркі, якія немагчыма забыць. Гора, бездапаможнасць і ўсё ж – надзея. Хоць боль і не праходзіць.

*– А які з процьмы рэпартажаў найбольш урэзаўся ў памяць?*

– Напэўна, калі мяне затрымалі, але праваранілі камеру. Гэта 2011-ы, так званыя маўклівыя акцыі. Людзі выходзілі на плошчы і проста пляскалі ў далоні. Без лозунгаў. Бясслоўны пратэст супраць крызісу і страху.

Я быў каля Нацыянальнай бібліятэкі. Людзей усяго дзясятак-другі. Падлятае АМАП, пачынаюць хапаць усіх падрад. Мяне таксама ў варанок. Але камеру не заўважылі.

І вось мы ў фургоне, у акенца відаць дарога, твары міліцыянтаў. Дастаю камеру, пачынаю браць інтэрв'ю ў тых, каго затрымалі разам са мной. Потым хаваю флэшку ў шкарпэтку, каб зберагчы ад канфіскацыі.

Але не, у пастарунак прывозяць, правяраюць і – нечакана – адпускаюць. Аказваецца, падключыўся прэс-сакратар міліцыі Ластоўскі, ён тады меў вагу і шмат каго насамрэч абараніў. Такі перыяд кантрастаў… Адразу бягом у рэдакцыю, і праз гадзіну рэпартаж з аўтазака ўжо на сайце.

На наступны дзень яго паказалі па расійскім РТР: «У Беларусі журналіст “Радыё Свабода” зняў відэа знутры аўтазака». Рэдкая прафесійная ўдача.

*– Бываюць рэпартажы, што прыносяць удачу. А ці ёсць такія, пасля якіх не заснуць?*

– 19 снежня 2010 года. Разгон плошчы. Сярод тых, каго здымаў у самым цэнтры месіва, – малодшы Аляксандр Класкоўскі, сын майго сябра-журналіста. У форме, з крывёй на твары. А я тады не ведаў, што гэта Саша. Спачатку думаў – міліцыянт, што перайшоў на бок людзей. Потым ён сам сказаў, што звольніўся з ДАІ раней. Званю позна ўвечары, пасля таго закалоту, а ён паспеў толькі сказаць: «Да нас ужо грукаюцца». Нядаўна Саша памёр, а я дагэтуль бачу перад сабой той кадр – як люстэрка часу, у якім усё адбілася: вера, адчай, кроў і праўда, якая ніколі не знікае.

## Беларуская турма – гэта калі ўвечары думаеш, як дажыць да раніцы, а раніцай – як працягнуць да вечара

*– Вашае зняволенне: ці была нейкая сітуацыя, якая паказала сістэму ўжо знутры? Не журналіст, што назіраў звонку, а чалавек, які сам стаў яе часткай?*

– Так. У мяне былі тры такія этапы адкрыцця.

Першы – восень 2020-га. Упершыню затрымалі і далі 15 сутак у Баранавічах. Мясцовая адміністрацыйная турма, падрыхтаваная загадзя пад масавыя разгоны. Да таго часу фактычна не выкарыстоўвалася – былыя казармы. Некаторыя казалі, яшчэ царскія, іншыя – што стайня польскага часу. Яе спехам пераабсталявалі пад ізалятар. Замест рамонту – брызент, пабітыя сцены, цвіль. Некаторыя камеры яшчэ паспелі тынкаваць, і, здаецца, мяне, журналіста, кінулі якраз у тую,

што больш-менш прыстойная. Але потым перавялі ў іншую, з надпісамі на сценах яшчэ з васьмідзясятых гадоў.

Там захварэў на ковід, выйшаў ледзь жывы – на нагах трымаўся з цяжкасцю. Турма – гэта бытавыя пакуты, прыніжэнне, штучная жорсткасць.

Мы, дзевяць чалавек у камеры, чулі, як прывозяць новых: сабакі брэшуць, крыкі, лаянка, бягуць па калідоры, б'юць, прымушаюць глядзець у падлогу. Але пры гэтым думалі: вось выйдзем, а там набіраецца разгон да свабоды…

*– Рэпрэсіі насамрэч заглушалі пратэст. Выбівалі прыцэльна? Тых, то падтрымліваў гарэнне?*

– Другі этап пачаўся ў ліпені 2021 года. Масавымі затрыманнямі журналістаў. Заведзена справа супраць супрацоўнікаў «Радыё Свабода». Узялі мяне, Дашчынскага, Студзінскую. Напярэдадні ўжо арыштавалі «Нашу Ніву», «Вясну», TUT.by.

Гэта была ўжо іншая рэальнасць – жорсткая, без прыкрыцця. Мы з Дашчынскім сядзелі разам, я бачыў праз акно Валадаркі, як да нас прыходзілі родныя з перадачамі, але мы нічога не атрымлівалі. І нічога не давалі: ні пасцелі, ні ежы. Спалі, паклаўшы пад галовы пластыкавыя бутэлькі, я потым намаляваў гэта ў сваёй кнізе.

У камеры сядзеў адзін крымінальнік – за наркотыкі. Ён вучыў, як сябе паводзіць у калоніі: што трэба сказаць, каб не прынялі за «блакітнага», як ставіцца да рэчаў, што можна браць з падлогі, а што нельга. Лікбез выжывання.

Стаўленне да палітычных кардынальна змянілася. Калі ў 2020-м думалася пра «зло па інерцыі», то ў 2021-м ты ўжо ўспрымаў зло як сістэму.

*– Трэцяя пасадка – праз паўгода – паказала сябе ўжо без усялякіх масак і выпадковасцяў?*

– Ужо на каранціне я пачуў: «Палітычны? Ну, чакай – зараз ШЫЗА».

І сапраўды. Прыдумалі прычыну: памылка ў спісе рэчаў, нібыта чагосьці не хапае. І пад выглядам законнага пакарання адправілі ў штрафны ізалятар.

Гэта ўсё падаецца фармальна: спачатку рапарт, потым камісія, якая нібыта вырашае, што з табой рабіць. Але ўсё ўжо вырашана загадзя.

Мяне прывялі ў кабінет начальніка калоніі, там – яшчэ некалькі афіцэраў. Ён паглядзеў на паперу, убачыў «Радыё Свабода» і раз’юшыўся: «Ты што, прыехаў сюды свабоду разводзіць?!»

Крычаў, перабіваў, пагражаў. Калі я паспрабаваў адказаць па-беларуску, наогул ледзьве не звар’яцеў і загадаў: «Разабрацца з ім. Ці ў ПКТ, ці ў петушатню.»

Ты ідзеш па калідоры і не разумееш: гэта проста пагроза – ці ўжо прысуд? Ведаеце, словы могуць азначаць рэальную небяспеку. А потым цябе заводзяць у ШЫЗА. І там б’юць. Проста ў спіну, без слоў. Сядзіш у адзіночцы – і ўсё. Першы вечар – як першае правальванне ў бездань. Ноч – найцяжэйшая: няма сну, няма часу, няма цябе. І раніцай ты думаеш толькі пра адно: абы дажыць да вечара. А ўвечары – дажыць да раніцы.

Вось што такое беларуская турма.

*– Пасля ўсяго гэтага, «Свабоды» і турмы, ці ёсць адчуванне паразы пакалення? Вашага асабістага?*

– Паразы не бачу.

Але ёсць прыкрасць. Шмат ад каго. З кім я рос, працаваў, хто застаўся ў баку. Я не бачыў іх на акцыях, у калонах. Некаторыя з маіх аднакурснікаў, калег, сваякоў проста закалыхалі сваё сумленне мантрай: усё спакойна, усё нармальна. І нават цяпер не хочуць нічога мяняць у сваім светапоглядзе. Іх абараняюць пасведчанні, пасады, вечны страх.

Але ёсць і іншыя – тыя, што «выйшлі з берагоў». Я бачыў іх у жывым ланцугу, які цягнуўся ад Кастрычніцкай плошчы

да Чырвонага касцёла. Стаялі мужчыны і жанчыны, якія яшчэ ўчора галасавалі за Лукашэнку, а сёння казалі: «Мы расчараваліся. Калі цяпер нічога не зменіцца – з'едзем».

Гэта і ёсць Беларусь. Не чорна-белая, а жывая, складаная – розная. Галоўнае, здатная на абуджэнне.

*– Але чаму адны злавілі вецер эпохі, а іншыя ні пра якія ветразі не думалі і нікуды не паплылі, бо «нас і тут добра кормяць»?*

– Універсальнага адказу няма. Бо ў кожнага свой узровень досведу, адказнасці. Савецкая школа – у шырокім сэнсе – рабіла ўсё, каб прывучыць людзей не высоўвацца, не рызыкаваць, не задаваць пытанняў. Гэта ўлілі ў кроў. І пазбавіцца гэтага зусім не проста.

Памятаю аднаго калегу – не буду называць, хаця яго ўсе нашыя ведаюць. Ён жыццё адпрацаваў у дзяржаўнай газеце, добры журналіст, сам мне выхваляўся: ні разу не з'ездзіў за мяжу! Нават у Польшчу… Вось замкнёнае кола: чалавек ніколі не бачыў, як можа быць інакш, і не імкнецца пабачыць.

*– Што стала вашым уласным акенцам у іншы свет?*

– Не адно і не два… Напрыклад, такое. На століку майго бацькі-начальніка ляжала «Новая зямля» – тая самая, якую Якуб Колас пісаў у турме на Валадарцы. Я чытаў яе не па праграме, і яна дапамагала, спрыяла. А хтосьці такой магчымасці не меў і замест палявання за класнымі кнігамі налаўчыўся лавіць печкуроў. На нашым курсе хапіла кар'ерыстаў найвышэйшага пілатажу ў арбіце лукашэнкаўскай вертыкалі.

Але быў таксама Пятро Васючэнка, узор нацыянальнай свядомасці. Выдатны творца і навуковец, сапраўдны беларус.

*– Шмат каго запаліў сваім прыкладам, а колькі выхаваў! І не толькі ў навуцы.*

– Дзякуючы такім людзям, як Пятро, як тыя, каго не паспеў згадаць добрым словам у гэтай размове, і паўстала непрыкметна новая генерацыя. Шчыра скажу: не спадзяваўся, што 2020-ы будзем такім маштабным. Калі назіраў перад ім у двухмільённым Мінску калоны актывістаў па пары соцень чалавек, то думаў, што паўторыцца ў найлепшым выпадку сцэнар-2010. А стаў сведкам магутнай рэвалюцыі!

Дык што падтрымлівае маю веру?

Вось «Свабода», якой аддаў палову творчага і грамадзянскага жыцця. Гэта афіцэр-турэмшчык лічыў яе амерыканскай, так любяць казаць і прапагандысты. Але я сотні разоў пераконваўся: для звычайных беларусаў радыё – люстэрка, у якім людзі бачаць сябе і краіну сапраўднымі. Мы разам змагаемся за мову і годнасць, за права называць рэчы сваімі імёнамі.

На Валадарцы быў выпадак. Сталы ўжо чалавек, затрыманы за каментары, пачуў прозвішча «Груздзіловіч» і ўспомніў мае артыкулы яшчэ часоў «Знамени юности»! Як тут не задумацца пра тое, што частка жыцця, як і лёсы маіх герояў, былі не дарэмнымі.

Калі нават за кратамі памятаюць нашую праўду, значыць, жылі мы годна.

# ЗОЯ БЕЛАХВОСЦІК



Фота з асабістага архіва З. Белахвосцік

*Беларуская артыстка тэатра і кіно, дацэнт Беларускай акадэміі мастацтваў, Народная артыстка Рэспублікі Беларусь (2018), Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь (1997), Заслужаная артыстка Аўтаномнай Рэспублікі Крым (1999).*

*Нарадзілася 26 кастрычніка 2959 года ў Мінску, у сям’і акцёра Валянціна Белахвосціка і канцэртмайстры Вольгі Глебавай, дачкі акцёра Глеба Глебава.*

*Скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1982 годзе, спецыяльнасць – актрыса драмы і кіно.*

*На чацвёртым курсе была запрошана на ролю Паўлінкі ў Купалаўскі тэатр. З гэтага моманту выконвала ролю Паўлінкі да 2000 года.*

*З 1982 года была актрысай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, у якім сыграла каля ста роляў. Знакавыя: Паўлінка («Паўлінка», Янка Купала), Аленка («Тутэйшыя», Янка Купала), Юлька («Ідылія», В. Дунін-Марцінкевіч), Малгажата («Івона, прынцэса Бургундская», В. Гамбровіч), Бона Сфорца («Чорная пана Нясвіжа», А. Дудараў), Марцэля («Хам», Э. Ажэшка), Аркадзіна («Чайка», А. Чэхаў), Ганна Андрэеўна («Рэвізор», М. Гогаль).*

*Працавала на радыё, тэлебачанні, здымалася ў кіно. З 1997 года выкладала акцёрскае майстэрства ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.*

*Пасля масавых фальсіфікацый на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года, жорсткага разгону акцый пратэсту калектыў Купалаўскага тэатра 13 жніўня запатрабаваў спыніць гвалт супраць мірных грамадзян, выступіў за пералік галасоў з удзелам незалежных назіральнікаў, абвясціў забастоўку.*

*26 жніўня Зоя Белахвосцік разам з большасцю трупы і іншымі супрацоўнікамі тэатра звольнілася ў знак пратэсту.*

*2 кастрычніка 2020 года яе звольнілі з Акадэміі мастацтваў, дзе як мастацкая кіраўніца яна выпусціла пяць акцёрскіх курсаў.*

*З 2020 года не можа працаваць у Беларусі, таму ў 2022 годзе мусіла эміграваць разам з сям'ёй у Польшчу. Цяпер – актрыса незалежнай тэатральнай групы «Вольныя Купалаўцы».*

*Пры падтрымцы польскай дзяржавы Вольныя Купалаўцы атрымалі магчымасць супрацоўнічаць з польскім тэатрам, з Цэнтрам культуры ў Любліне, працаваць з польскімі рэжысёрамі. У 2023 годзе Зоя Белахвосцік стварыла як драматург і рэжысёрка монадраму «Moj Hleb». Гэта біяграфія сям'і і краіны, спектакль пра лёсы пяці пакаленняў тэатральнай дынастыі, пра Купалаўскі тэатр.*

ЗОЯ
БЕЛАХВОСЦІК

# ЖЫЦЬ ТЭАТРАМ – ВЯЛІКІ ДАР. АЛЕ ЯШЧЭ БОЛЬШЫ – ЖЫЦЬ БЕЗ ТЭАТРАЛЬНАСЦІ

## Жыццё скончылася! Ты ні на што не здатная! Нікому не патрэбная! Бясконца раўла, але выпадак – і…

*– Творчасць была для вас паўсядзённасцю, мастацтва – дыханнем. Бацька, Валянцін Белахвосцік, – вядомы акцёр, мама, Вольга Глебава, – канцэртмайстарка. Адчувалі дылему падмуркаў і вынікаў?*

– Капайце глыбей: дзядуля – мегазорка Глеб Глебаў, бабуля таксама актрыса. І, канешне, усе іхныя сябры – спрэс музычнае кола, мастакі, акцёры… Безумоўна, расла гуманітарыем, шмат чытала, займалася ў мастацкай школе, але дакладна ніхто ў сям'і не марыў, каб я выбрала тэатр.

*– Бо знутры ведалі цяжар працы?*

– Бацька наогул адрэзаў жорстка: «На сцэну – толькі праз мой труп!» Ён вельмі балюча ўспрымаў лёсы сваіх каляжанак. Бачыў, што нават самая таленавітая можа захраснуць – іграць усё жыццё сыраежку ў сёмым радзе, трэцім складзе. Тут шмат пра ўдачу-няўдачу, часта многае не залежыць ад самога чалавека…

А я насуперак усім хацела паспрабаваць! Толькі хавала гэта, ні з кім не дзялілася. Вось мае і думалі, што паступлю на кніжную графіку: яшчэ школьніцай аформіла некалькі дзіцячых кніжак.

*– Гэта ўсё дзякуючы мастацкай школе?*

– Больш нават мая самадзейнасць: прыдумляла казкі для малодшай сястры, Надзеі, і рабіла з іх «сапраўдныя» кнігі. Малявала, падпісвала, пераплятала. Гэта пабачыў сябар таты – славуты графік, жывапісец Георгій Паплаўскі: «Цудоўна, хай прыходзіць».

Усе «за», апроч мяне. Пашчасціла: бацька з'ехаў на гастролі ў Адэсу, а я – шмыг у тэатральна-мастацкі, зразумела,

на акцёрскі курс. Тады набіраў Аляксандр Бутакоў. Дайшла да канца і… не паступіла.

*– На фоне паспяховай сям'і параза пякла асабліва балюча?*

– Якое балюча: жыццё скончылася! Ты ні на што не здатная! Нікому не патрэбная! Бясконца раўла, але выпадкова даведалася: адкрыўся Інстытут культуры, там набор на месяц пазней. Сабрала эксплікацыю, сцэнаграфію, касцюмы – і на рэжысуру самадзейнага тэатра.

Цудоўны курс, выдатныя педагогі. Па акцёрскім майстэрстве – Галіна Пятроўна Вішкарова з Рускага тэатра. Шмат працавала са мной: вызваляла ад заціскаў, дапамагала адкрыцца.

*– А канчаткова вас адкрыў выпадак?*

– На трэцім курсе, да Міжнароднага дня тэатра, мы зрабілі капуснік: я, Аляксандр Кузьмянкоў ды Надзея Гаркунова. І сапраўды выпадкова на яго трапіў Барыс Эрын, легендарны рэжысёр. Адразу патэлефанаваў бацьку: «Робіце памылку: яна мусіць вучыцца ў тэатральна-мастацкім. Дапамагу».

Вось і апынулася на курсе Браварскай і Манаковай.

*– Калі сямейную гісторыю закальцаваць, то згадайма і мужа, Аляксандра Гарцуева. Як гэта – творчае жыццё ўдваіх?*

– Вучыліся ў адным інстытуце ў адзін час, толькі на розных курсах. Ён мяне ведае, я яго – і ўсё. А па-сапраўднаму пазнаёміліся пазней, калі на тэлебачанні здымалі нейкую паэму, а мы з Сашам у галоўных ролях.

Потым у адным тэатры, ужо пасля яго службы ў арміі. Пачалі разам ездзіць з канцэртамі па калгасах, заводах. Спявалі: я пісала вершы, ён музыку. Ну і ўсё, як сказаў калісьці Крыжаноўскі: «Пелі, пелі – і дапеліся».

Яўген гадоў дзесяць працаваў у Купалаўскім, быў нашым сябрам. Потым сышоў і пачаў рабіць сваю «Юмарыну».

## У Паўлінцы, як і ў гераінях жаночай рэвалюцыі, неразрыўна спалучаны і неба, і зямля

*– Тэатр савецкай рэчаіснасці: цэнзура Мінкульта, абавязковыя агітпаездкі па калгасах і саўгасах... Як вы гэта ўспрымалі? Што чэрпалі для сябе з тых народных выступаў?*

– У асноўным ездзілі па мінскіх заводах з канцэртамі, для якіх самі складалі праграму. Сцэна са спектакля, песні, вершы – усё прыгожае, светлае. Чыталі-спявалі Рыгора Барадуліна, Вольгу Іпатаву, Раісу Баравікову. Вядома, Янку Купалу. Нічога сорамнага ці такога, да чаго не ляжала душа.

А як далей – то ўжо сапраўдныя гастролі. Напрыклад, у Слуцк. Жылі там тыдні тры, у гатэлі, і штодня па калгасах. Гэта былі «Паўлінкі» – дваццаць, дваццаць пяць спектакляў на тыдзень.

Канец верасня, кастрычнік: холад, ледзяныя клубы дыхання, на сцэне мінімум дэкарацый, святла, гукавой апаратуры – усё на каленцы.

*– Як трупа ставілася да такой тэатральнай самадзейнасці?*

– Артысты майго пакалення былі сціплыя, спакойныя. Прывыклі да ўсяго. Нават да часу выступаў, бо даяркі і трактарысты дадому вярталіся пад ноч. Саграваалі адносіны вёскі: нас чакалі і так прымалі, так прымалі... Прыносілі кветкі, малако, цыбулю, сала – у знак падзякі. Для іх гэта свята, сустрэча з чымсьці вялікім. У зале трыццаць чалавек, пяцьдзясят, дзеці, старыя. Вельмі светлыя, чалавечныя сустрэчы.

*– А як успрымалі гэтую рэальнасць з кароўнікамі без вадаправода, дамамі без газу і ўнітазаў вы, маладая сталічная дзяўчына?*

– Хоць і гарадская, але правільна выхаваная. Бацька – чалавек з вёскі, прайшоў усё: і кабаноў калоў, і даіць умеў, і трактар вадаў. Малою ездзіла ў Беразіно, да нашых сваякоў, дапамагала

па гаспадарцы: масла біць, кароў пасвіць. Таму для мяне гэта было натуральна, ніякай экзотыкі.

*– Можа, таму вы так арганічна ўпісаліся ў ролю Паўлінкі? І надоўга: гадоў дваццаць пасля чацвёртага курса… Чуў, для першай і адразу знакавай ролі нават адрасцілі доўгія валасы.*

– Не ведаю, адкуль гэта байка ўзялася. Каса даўняя – у многіх артыстак тады былі доўгія валасы: грымёрам зручней.

*– Такое жыццё: у зорак заўсёды шлейф міфаў. Хіба не?*

– Я ніколі не адчувала ў сабе зорнай хваробы. Затое заўсёды прысутнічала адказнасць, проста бясконцая. Ніякіх плюшак – толькі абавязак. Бо ў мяне дзядуля – Глебаў, тата – Белахвосцік. Не мела права на слабіну, якая магла адбіцца на рэпутацыі дынастыі. Усё жыццё мушу нешта даказваць – сабе, людзям, лёсу. Хацела і хачу быць проста добрай, нармальнай артысткай.

*– Падаецца, роля Паўлінкі для вас была цяжкай не толькі з гледзішча сцэнічнай адказнасці. Не пабойваліся, што людзі пачалі бачыць у вас выключна Паўлінку, а не самастойную актрысу са значна большым рэсурсам? У спевакоў адна песня часта з'ядае астатнія…*

– Такое здараецца. Вольга Клебановіч, актрыса старэйшага пакалення, аднойчы адмовілася граць Паўлінку: «Не хачу быць артысткай адной ролі». Разумею яе. Але сама не думала пра гэта. Я проста марыла, што калі сыграю Паўлінку, мяне возьмуць у тэатр Янкі Купалы. І сапраўды – узялі.

Я не разважала, а проста грала. І дзякуй Богу, што мой акцёрскі дыяпазон заўважылі: у Паўлінцы было відаць, што магу рознае.

*– Што менавіта захапляла вас у гэтым вобразе? Якое вашае прачытанне закладзенага ў Паўлінку Купалам?*

– Маладая, разумная, мае сумленне і годнасць. Ніхто не можа прымусіць яе жыць чужым лёсам. Яна любіць сваіх бацькоў, паважае іх, але хоча сама выбіраць. І не скараецца.

Паўлінка – здольная на многае беларуская дзяўчына, яна ў стане здзейсніць сваю мару. Нават калі прыйдзецца пайсці насуперак абставінам, усё адно застанецца са сваім сумленнем, са сваёй годнасцю і каханнем.

Я хацела, каб яна была не толькі камічнай, а драматычнай. Паўлінка – сур'ёзная дзяўчына, са сваім характарам, нават з нотай трагізму.

Для мяне галоўнае ў ёй – годнасць, стрыжань, здольнасць супраціўляцца.

– *Адпавядае сутнасці характару беларускай жанчыны?*

– Так. Яна ўмее падтрымліваць іншых, жыць у няпростых умовах і заставацца аптымісткай. Не губляе сябе. Спектакль любяць і таму, што ў Паўлінцы многія пазнаюць ці сябе, ці сваіх любімых жанчын. Якія ў такой неймавернай, светлай прыгажосці паказалі сябе ў 2020 годзе… Вельмі ганаруся імі.

– *Ваша гераіня пасуе гэтаму сцэнару сваім рамантызмам?*

– Не толькі. У Паўлінцы, як і ў гераінях нашай жаночай рэвалюцыі, разам, неразрыўна спалучаны і неба, і зямля.

Таму, дарэчы, я люблю беларускіх паэтак больш, чым паэтаў. Яны стаяць на зямлі, але заўсёды дакранаюцца да неба. Могуць выдатна апісаць вышыні кахання – і пры гэтым быць моцна зямнымі.

– *А каго з паэтак вы асабліва любіце?*

– Вольгу Іпатаву, Раісу Баравікову, Жэню Янішчыц. З сучасных – Насту Кудасаву і Юлю Цімафееву. Гэта дзве, каго чытаю кожны дзень.

– *Давайце згадаем яшчэ адну жанчыну: маму. Яе роля ў вашым тэатральным жыцці?*

– Безумоўна, гэта для мяне найважнейшы чалавек. Яна магла быць цудоўнай артысткай, але праз сціпласць сваю не стала.

Цудоўны музыкант! Калі пыталіся: «Чаму не стала канцэртаваць як піяністка?» – адказвала: «Тады б адарвалася ад сям'і. А я і так шмат езджу з вакалістамі. Мне добра там, дзе ёсць».

Працавала канцэртмайстрам у кансерваторыі, потым у вучылішчы. І была вельмі чуллівай, далікатнай. Надзвычай тонка адчувала ўсё. Толькі яна магла зрабіць заўвагу, якую я прымала. Напрыклад: «Зоінька, можа, хопіць ужо граць Паўлінку?»

*– Відаць, на той момант вы і так ужо думалі пра гэта, толькі штуршок патрабаваўся?*

– Але ад чалавека, якому давярала. Мама адчула гэтыя ваганні…

Заўсёды падтрымлівала. Калі былі музычныя спектаклі, разам вучылі вакальныя партыі. Яна дапамагала ставіць дыханне, выстройваць фразы. Была сапраўднай апорай у творчасці і жыцці.

Сціплая, нібыта непрыкметная, але менавіта яна – стрыжань нашай сям'і. Яе дапамога і любоў гэта тое, без чаго мы з Надзеяй не ўяўляем сябе. Незаменныя людзі ёсць…

## Падпарадкаванасць вертыкалі, розным аддзелам культуры – як тыя гіры

*– Вы перажылі комплекс ролі аднаго тыпу, даказалі дыяпазон і зноў трапілі ў пастку: сталі сімвалам тэатра, пакаленняў. Цяжка, калі ў табе бачаць знак, а не чалавека?*

– Ніякім «знакам» сябе не адчуваю.

Чаму мы ўсе не змаглі адсядзецца па сваіх катухах у 2020-м? Бо гэта было немагчыма. Я ніколі не маўчала – заўсёды, як гэта, «няўгодная».

Усе купалаўцы не маглі набраць вады ў рот. Бо столькі спектакляў пра каханне і годнасць, пра людзей, перад якімі

стаіць выбар. Мы казалі праўду. Гледачы прыходзілі і разумелі, што чорнае, а што белае.

Калі нехта лічыць, што тэатр – гэта не палітыка, проста забаўка, я адказваю: няпраўда! Нават клоўн у цырку можа быць вострым і сацыяльна актыўным. Яшчэ Станіслаўскі пісаў, што тэатр – не пра забавы.

*– Як працягваць гэту думку, то праз Купалаўскі ў тым ліку якраз і адбывалася рэвалюцыя?*

– Калі казаць пра душу, дык гэта праўда. Зусім не спантанная.

Памятаю фінал «Тутэйшых». Тады перад паклонам зале мы стаялі ў кулісах і спявалі малітву, напісаную Купалам. А над сцэнай падымалася палатно, утвараючы бел-чырвона-белы сцяг… Кожны раз гэта было нешта неймавернае. І акторы, і гледачы не проста стаялі – дыхалі разам. Знікала мяжа паміж сцэнай і залай… Сапраўднае яднанне. Момант урачыстага гонару, любові да свабоднай Беларусі, удзячнасці беларускаму народу.

Вось чым ёсць тэатр перажывання, а не прадстаўлення. У ім нашыя паклоны і авацыі гледачоў – як маніфест.

*– Неўзабаве пастаноўку знялі з рэпертуару – афіцыйна з-за «састарэлых дэкарацый» ды іншага трызнення. Але гэта ж не пра сцэнаграфію? Тут палітычнае рашэнне?*

– Вядома, ўсе ўсё разумелі. Нам казалі: хай спектакль ідзе, толькі прыбярыце сцяг. Не пагадзіліся.

«Ціхія задачы» з міністэрства, розныя заўвагі былі пастаянна, таму навучыліся гаварыць паўтонам. Нават калі фігура на сцэне маўчала, гледачы разумелі маўчанне лепей за маналог. Бо калі ўлада шукае блох, сапраўдныя рэжысёр і трупа ўсё роўна знойдуць выйсце.

Тэатр – гэта кафедра: ты выходзіш і гаворыш праўду, змагаешся за яе. У артыстаў з годнасцю і самапавагай адчуванне адказнасці

перад грамадствам – як ушыты пад скуру чып. Заўсёды адчуваеш сігнал сумлення.

*– Хто з купалаўцаў найбольш паўплываў на вашую акцёрскую філасофію?*

– Вельмі складана адказаць… На мяне цяжка паўплываць. Таму і аўтарытэтаў не многа. Але ёсць адзін безумоўны – Галіна Талкачова. Лічу яе вялікай актрысай, якая, можа, не сыграла ўсяго, што магла. І яшчэ Віктар Паўлавіч Тарасаў – геній. Проста геній…

Я глядзела і думала: як яны гэта робяць? Як такое атрымліваецца? І цешыла сябе надзеяй: а раптам – змагу?

Вось гэта і ёсць сапраўдны ўплыў – калі чалавек стымулюе цябе быць лепшай.

*– Ці часта рэжысёры і драматургі 1990–2000-х пераступалі межы дазволенага? Як яны ўплывалі на мастацкую этыку тэатра?*

– Складана з драматургамі ў Беларусі, іх нягуста. Затое ёсць вельмі цудоўная і сапраўдная літаратура. Найчасцей выратоўвалі менавіта інсцэніроўкі. Але не ўсе рэжысёры ўмеюць падступацца да іх. Пінігіных вакол нямнога… З аповесцяў і раманаў зрабіць п’есу можа толькі Аляксандр Гарцуеў.

*– А ці былі вы задаволены тэатральнай крытыкай?*

– Прафесійнай крытыкі ў высокім сэнсе ў нас амаль ніколі не было. Тая, што такою лічылася, у асноўным залежная, ангажаваная, часам смешная. Хвалілі тых, каго трэба было хваліць. І гэтаксама вельмі часта ганілі… Не заўважалі таго, што варта было падымаць.

Гэта, бадай, адзін з самых слабых бакоў беларускага мастацкага жыцця. Між тым без незалежнай крытыкі няма развіцця. Ніхто не трымае люстэрка перад сцэнай.

*– Гледачоў вам хапала?*

– І тут не без праблем. Тэатр не бег наперадзе гледача і таму, у прыватнасці, што даводзілася лічыцца з яго, скажам так, мастацкай адукаванасцю. У дадатак план наведвальнасці: колькі квіткоў прададзена, якая акупляльнасць… Гэта моцна ўплывала на фармаванне рэпертуару. Здаралася атрымліваць такія ролі, што я стыдалася выходзіць на сцэну… Але даводзілася і весяліць.

Падпарадкаванасць вертыкалі, розным аддзелам культуры – як тыя гіры. Цягнуць на дно.

## Калі бачыла, як зрывалі наш сцяг, ірвалі на ласкуты, тапталі, – не магла не выйсці з ім, пад ім

*– І вось дваццаты год: путы скінуты, рукі развязаны. Калі вы са сцягамі годнасці пакідалі тэатр, ці разумелі складанасці наступстваў?*

– Адкуль было ўзяцца рацыянальнай логіцы ва ўмовах непрадказальнай сітуацыі? Напрыклад, думалі, што па старой схеме зможам узяць гастрольныя пасведчанні, так званыя гастрolькі, і пацiху пачнём вандраваць, неяк выб’емся. Але як толькі сунуліся хлопцы за гэтымі гастролькамі ў міністэрства, то ўмомант стала ўсё і зразумела, і ясна да канца: вы ў «чорных-найчорных» спісах. Гэта кропка.

*– Стрэс моманту з наступным страхам за будучае жыццё?*

– Такі паварот, наступныя страшэнныя рэпрэсіі цяжэй перажыць маладзейшым. Асабліва на кантрасце ўзлёту, эйфарыі.

Момант з’яднаў акцёраў і касцюмераў, гукавікоў і апературараў, бутафораў і манціроўшчыкаў… Бязмежна ганаруся імі.

Хоць я асабіста разумела, што будзе нявесела і наладзіцца не хутка.

Але вось у чым рэч. Мы развіталіся не з будынкам, а з адчуваннем, што больш нічога не зможам там, у сцэнах

свайго выдатнага тэатра. Тэму несвабоды, свайго непрымірэння з ёй з розных бакоў абмеркавалі яшчэ да маніфеста. Мы паразмаўлялі мо тысячу разоў, перш чым прыняць салідарную пазіцыю. У галовах нашых проста не ўкладвалася, што на свяце стагоддзя тэатра ганаровымі гледачамі ў зале будуць тыя, на кім адказнасць за ману, шальмаванне выбараў, садызм падчас затрыманняў… Ужо тады заявілі  Латушку і Пінігіну: не выйдзем на сцэну, не будзем іграць «Паўлінку» пасля гвалту, зараз аніяк не да «вясёленькага».

*– Ды ў новых умовах вас бы папросту пазбавілі права рабіць адбор спектакляў!*

– Не далі б нічагусенькі.

*– І тады 12 жніўня з’явіўся ваш відэазварот, 13-га абвясцілі забастоўку. Што пасля?*

– Адразу дырэктара наверх і ўперлі спіс: каго звальняць. Найперш кідалі за борт моладзь. І што, якія спектаклі без яе?!

Якія «Тутэйшыя», якая прэм’ера, якое стагоддзе тэатра? Не, мы ўсё правільна зрабілі і ніхто вось цяпер, калі пяць гадоў мінула, не пашкадаваў пра гэта. Правільна ўсё, што тады адбылося. Без гэтага – не мець Беларусі будучыні. Няхай цяжка і доўга да яе ісці, але інакш не атрымлівалася… А зараз трэба неяк цярпець.

*– У Беларусі стае спевакоў, літаратараў, кіношнікаў, навукоўцаў, але з рашучым калектыўным пратэстам выступіў толькі тэатр. У чым тут рэч?*

– Папраўдзе, найперш я чакала чамусьці выбуху ад мастакоў і музыкантаў. Але выйшла як выйшла. Адкажу толькі за нас і сябе: мы выбудавалі сябе так, што не змаглі маўчаць. Мы мусілі выказацца. Выплюхнулася супраціўленне, якое было ў нашых спектаклях і ўнутры нас. Рэвалюцыя на аўтамаце сабрала штаб Купалаўскага, хлопцы па начах ахоўвалі вывешаныя намі сцягі.

*– Для вас яны святыня пасля «Тутэйшых»?*

– Безумоўна, але я і жыла пры сапраўдным дзяржаўным сцягу колькі гадоў! І калі бачыла, як яго зрывалі, ірвалі на ласкуты, тапталі, – не магла не выйсці з ім, пад ім.

*– Бяда не любіць адзіноты: тады ж звольнілі з Акадэміі мастацтваў. Відаць, маральна ўжо да гэтага падрыхтаваліся?*

– А вось і не: акадэмічная гісторыя моцна ўдарыла. Я ж вяла выпускны курс, чацвёрты. Я не мела права іх кінуць. Ну, думаю, дадуць завяршыць вучобу, звольняць пасля. Наіўнасць, але спадзявалася на разуменне сітуацыі. А калі ўсё адбылося па-іншаму, то спакойна ўспрыняла прысуд сабе, аднак за студэнтаў душа балела так доўга…

Наогул, акадэмія даўно абрыдла. Ведаеце, калі балота зацягвае, яно высмоктвае твае сілы. Трымалася з апошніх, дзеля маладых. І вельмі па-хамску насамрэч, гнюсна абышліся тады нават не са мной, а са студэнтамі, якіх бесцырымонна пазбавілі мастацкага кіраўніка.

Хаця мы знайшлі з імі спосаб давесці да ладу і канцэрт, і спектакль. Як заўсёды, неяк выкруціліся. Гарцуеў быў яшчэ на плаве, хоць і на кручку, то гралі ў яго. Гэта дазволілі зрабіць, бо студэнты заявілі: дружна сыдуць, калі ім некага падсунуць, а не дадуць выбраць таго, хто ім падабаецца. Пайшлі на прынцып, у акадэміі спужаліся чарговага скандалу і зрабілі выгляд, што Гарцуеў – мастацкі кіраўнік. Аляксандр сапраўды раней дапамагаў нам у пастаноўцы, выкладаў, таму варыянт вось такой замены і прынялі.

У выніку я змагла паставіць спектакль, аднак дзверы ў акадэмію перагарадзіў спецыяльна пасаджаны міліцыянт.

*– А што вы ставілі тады са сваёй яршыстай студэнцкай камандай?*

– «Раскіданае гняздо».

*– Сімвалічна…*

## Пакуль няма глыбокага асэнсавання мінулага і пакаяння, усё будзе паўтарацца

*– Незвычайная гісторыя. Давайце згадаем яшчэ адну: ваш яркі монаспектакль Moj Hleb. Ён нібыта асабістая споведзь пра сям'ю, гісторыю тэатра… А насамрэч глыбейшы – пра нас, беларусаў. Як радавод робіцца часткай агульнай памяці краіны.*

– Сабрала матэрыялу значна больш, чым дазваляе сцэна. Даводзілася скарачаць, а мяне ўсё адно несла – хацелася расказаць усё, не прапусціць ніводнай драбнічкі, бо ў іх усяго столькі…

Заўсёды лічыла: беларусы мусяць ведаць пра сябе больш. Што мы не проста «сціплая, занядбаная, сялянская» нацыя з «непрыгожай мовай», як нас прывучалі думаць. Не: мы моцныя, разумныя, таленавітыя. У нас доўгая памяць, нам ёсць чым ганарыцца. Ёсць вялікія імёны, сапраўдныя навукоўцы, пісьменнікі, артысты. І я хацела, каб людзі пачулі гэтыя гісторыі, убачылі жывыя лёсы.

Moj Hleb – не проста пра дынастыю Глебавых і Белахвосцікаў. Гэта арганічная частка гісторыі нацыі і дзяржавы. У ёй і страты, і годнасць, і супраціў, і тая самая спіраль гісторыі, якая заўсёды вяртае нас да адказу, хто мы і адкуль.

*– Якія сюжэты найбольш дарагія вам асабіста?*

– Напэўна, самы важны тыпаж – Антон Балецкі. Асоба вялікага маштабу, якую ў сям'і глыбока паважалі і любілі. Ён быў наркамам Беларусі з 1926 года, займаўся мовай, літаратурай, працаваў у Акадэміі навук. Беларус духам і сутнасцю.

Падлеткам, гадоў у пятнаццаць, спытала: «Бабуля, а вы баяліся ў трыццаць сёмым?» Адказала ціха: «Усе баяліся. Усе зачынялі вокны. Калі ўначы пад'язджаў чорны варанок, слухалі, ці лязгаюць дзверы ў пад'ездзе, ці чутныя крокі па лесвіцы… Гэта не кніжнае…»

Слухала, але не разумела да канца. І толькі потым шмат чаго дайшло, а ў дваццатых і сама перажыла, пабачыла, якімі могуць быць ночы ці дні страху, калі лёс залежыць ад стуку, званка ў дзверы.

Балецкага звольнілі, потым арыштавалі. Пусцілі па справе Саюза вызвалення Беларусі – сфальсіфікаванай, наскрозь падложнай, у якую ўцягнулі сотні людзей. Купалу таксама спрабавалі прывязаць да яе. Трагедыя цэлага пакалення.

*– Праводзіце паралелі паміж тым, што адбывалася ў 1930-х, і перажытым намі нядаўна?*

– Паралелі вельмі выразныя. Мы перажылі бальшавікоў, Сталіна, камуністаў, але не ліквідавалі наступстваў рэжымаў, іх ідэалогіі. Пакуль у нас няма асэнсавання мінулага і пакаяння, усё будзе паўтарацца. Нельга заставацца памяркоўнымі беларусамі, якія ўсё даруюць.

Калісьці яны расстрэльвалі за нібыта здраду, шпіянаж – як ворагаў народа. Сёння даводзяць да смерці за годнасць і праўду – як экстрэмістаў і тэрарыстаў. І пакуль мы не запытаем з кожнага, хто рабіў і робіць гэта з нашай зямлёй, чорная гісторыя не спыніцца. Бог любіць тройцу, кажуць... Але я веру, што на трэці раз усё ж зробім правільныя высновы.

*– Вы згадвалі і свайго дзядулю. Раскажыце пра яго крыху больш.*

– Глеб Паўлавіч Глебаў. Прозвішча – гэта псеўданім. Ён нарадзіўся ў Вазнясенску, у Херсонскай вобласці, ва Украіне. Маці беларуска, а бацька, здаецца, украінец. У сям'і гаварылі і па-беларуску, і па-ўкраінску, і па-руску – усё перапляталася натуральна, без бар'ераў.

Ён з самага пачатку быў чалавекам сцэны, хоць спрабаваў пайсці іншым шляхам: у Адэсе паступіў ва ўніверсітэт на інжынера чыгункі.

У Мінску спачатку працаваў у цыркавым аркестры, іграў на флейце. Але тэатр цягнуў мацней. Ён не пабаяўся пайсці

на праслухоўванне ў Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1), і яго прынялі. Гэта 1926 год. У спісе трупы значыўся пад нумарам 33. Усё змянілася пасля першай вялікай ролі ў фанвізінскім «Недарослі»: у тэатры з'явіўся сапраўдны талент. Ён умеў усё: і камедыю, і трагедыю. Быў розным: і лёгкім, і глыбокім, і невыказна чалавечным.

І, вядома, «Паўлінка». Яго Пустарэвіч стаў легендай. Калі я пазней працавала над сваёй роляй, было страшна сапсаваць славу дзядулі. Усё ж легенда! Але яго постаць і святло толькі дапамагалі, як бы падтрымлівалі з-за кулісаў.

– *Чуў, яго любілі ў тэатры.*

– Вельмі. І артысты, і гледачы. Ніхто ніколі не называў яго проста Глебаў ці Глеб Паўлавіч. Усе казалі: наш Глебушка. Знак пяшчоты, любові, удзячнасці.

Ён памёр 3 сакавіка 1967 года. Хавалі, мне здаецца, усёй краінай. Тады не было ні тэлебачання, ні інтэрнэту – нічога, што магло б арганізаваць, аднак людзі ехалі з усіх куткоў Беларусі. З гарадоў, вёсак. Проста каб развітацца, сказаць дзякуй.

– *Ён быў вашым настаўнікам у акцёрстве?*

– Больш: маім сябрам. Менавіта дзядуля прышчапіў любоў да тэатра. Вучыў трымаць сцэну, слухаць партнёра, не баяцца гледача. Калі паказваў тэатр ценяў, зразумела, што магія пачынаецца з нічога. І магічна ператвараў страх у радасць, хваляванне ў энергію.

Яшчэ ён прыдумаў цікавы, задзірысты такі рытуал ці талісман: калі артыст хваляваўся перад выхадам, дзед навучыў казаць услых ці пра сябе: «Насяру!» – і зрабіць крок на сцэну. Было як малітва.

– *Дарэчы, назва Moj Hleb: што вы ўкладалі ў гэтую метафару?*

– Moj Hleb – гэта мой Глеб. Мой дзядуля.

Калі ён кінуў курыць, то заўсёды насіў у кішэні сухарыкі – маленькія, духмяныя. І артысты, жартуючы, крычалі яму: «Глебушка, дай хлебушка!»

І вось гэтая гульня словаў – «Глеб» і «хлеб» – стала сімвалам усяго спектакля. Бо для мяне яны непадзельныя: глеба, хлеб, жыццё. І ўсё пачынаецца з кораня.

*– У 2023 годзе вы ўдзельнічалі ў канферэнцыі па стварэнні Беларускага інстытута тэатра. Ці бачыце ў гэтай ініцыятыве надзею на адраджэнне тэатральнай Беларусі?*

– Пакуль толькі намер. Вельмі прыгожы, патрэбны, але намер.

Я заўсёды за любыя рухі, ініцыятыву. Але ў мяне няма ілюзій: гэта цяжкая гісторыя. Каб яна атрымалася, трэба не проста зрабіць інстытут, трэба аднавіць сам грунт, глебу беларускай культуры.

*– Што станеце рабіць, калі вернемся ў вольную краіну?*

– Не ведаю, ці вярнуся ў тэатр. Але, можа, проста выйду на сцэну з «Хлебам». Не адна, а з аркестрам. Каб іграў раяль, каб на вялікім экране быў партрэт дзядулі. Каб гэта быў мой сапраўдны «Хлеб» – і як спектакль, і як сімвал жыцця.

А потым, можа, пазнаёмім беларусаў з тым, што рабілі ў выгнанні, пакажам створанае тут, у Польшчы.

Ну і паставіла б камедыю. Лёгкую, музычную, прыгожую. Каб верылася, што ўсё магчыма. Можа, нават казку. Мне цяпер хочацца менавіта казкі.

# ЛЮБОЎ ЛУНЁВА



Фота з асабістага архіва Л. Лунёвай

*Нарадзілася 29 студзеня 1959 года.*

*У пасведчанні нараджэння напісана: шахта «Юнком» Янакіеўскага раёна Сталінскай вобласці. Бацькі былі размеркаваны на Данбас ва Украіну як маладыя спецыялісты пасля заканчэння Харкаўскага інжынерна-эканамічнага інстытута. Пераехалі ў Беларусь, калі дачцэ споўнілася пяць гадоў. Люба пайшла ў першы клас адразу ў дзве школы – агульнаадукацыйную і музычную (клас скрыпкі).*

*Працавала ў Інстытуце матэматыкі АН БССР і вучылася на вячэрнім аддзяленні гістарычнага факультэта БДУ. Скончыла ўніверсітэт з чырвоным дыпломам.*

*Праз два гады запрасілі працаваць на кафедру гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістфака, на пасаду старэйшага лабаранта з вышэйшай адукацыяй. Сумяшчала з працай на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Працавала і пісала дысертацыю.*

*Пасля пратэстаў 1995 года далучылася да справы дапамогі затрыманым. Знаходзіла адвакатаў, распрацоўвала памяткі ўдзельнікам вулічных акцый на выпадак затрымання і допыту. Спачатку прымала людзей ва Управе БНФ, потым – у офісе «Вясны», дзе была загадчыцай грамадскай прыёмнай. З 1997 года супрацоўнічала з «Радыё Свабода».*

*У 1999 годзе трапіла ў «чорны спіс» супрацоўнікаў гуманітарных факультэтаў, не лаяльных да ўлады Лукашэнкі. Адміністрацыя БДУ не падоўжыла з ёй працоўны кантракт.*

*Працавала на «Радыё Свабода» да сярэдзіны 2011 года, пакуль Міністэрства замежных спраў не скасавала ёй працоўную акрэдытацыю. Далей – праца палітычнай аглядальніцай у газеце «Народная Воля», карэспандэнткай на тэлеканале «Белсат».*

*Мусіла з’ехаць з краіны пасля таго, як некалькі супрацоўнікаў «Белсата» трапілі за краты. Выехала ва Украіну ў канцы 2021 года. Падчас шырокамаштабнага ўварвання ва Украіну расійскіх войск вяла рэпартажы з Краматорска.*

*Цяпер жыве ў Польшчы.*

*За сваю працу атрымала некалькі прэстыжных узнагарод, сярод якіх – прэмія імя Дзмітрыя Завадскага за прафесіяналізм і адвагу, Нацыянальная прэмія ў галіне абароны правоў чалавека, дыплом за абарону ліцэя імя Якуба Коласа, дыплом ад дэмакратычных сіл «Журналіст года», шэраг дыпломаў і прызоў за найлепшыя рэпартажы года.*

ЛЮБОЎ
ЛУНЁВА

# УЛАДА, ШТО БАІЦЦА СВАБОДЫ, АЎТАМАТАМ ВЫБІРАЕ ДУБІНКУ

## Міні-спадніцы, Высоцкі, Акуджава, The Rolling Stones – а нам пра спаборніцтва!

*– У савецкім дзяцінстве-юнацтве ўсё было раскладзена па паліцах: лозунгі, падручнікі – адна «правільная праўда». Але многім удалося адчуць: ёсць і нешта большае… Думалася калісьці пра гэта?*

– Я рана пачала чытаць, да школы. І зразумела: праглынаць усё запар – неразумна. Нават шкодна. Са скрыпкай бягу ў музычную школу, а паўсюль бясконцыя «Даеш пяцігодку за тры гады!» Нудота. Асабліва калі ў цябе як не томік Конана Дойла, дык навуковая фантастыка. А яшчэ па нядзелях бегалі на ранішнія сеансы ў кінатэатр. Там ці ідыёцкі фільм пра будоўлю або завод, ці бадзёрая дакументалка пра бітву за ўраджай, нейкі партсход… А на двары, між іншым, другая палова шасцідзясятых. Шпількі, магнітафоны, твіст, міні-спадніцы, Высоцкі, Акуджава, The Rolling Stones, Beatles… Якія пяцігодкі! Якое сацспаборніцтва! Не, ніхто лепш за саміх савецкіх ідэолагаў не мог зрабіць нам, яшчэ школьнікам, прышчэпку д саўковасці. Хай і не ўсім. Але мы з сябрамі, як казаў «дарагі Леанід Ільіч», ішлі нага ў нагу з часам.

*– Вашае школьнае юнацтва – не толькі Мінск, але і Клічаў з яго правінцыйнасцю. Што заўважалі на гэтым канцы зямлі?*

– Да дзеда з бабуляй прыязджала кожныя вакацыі. У мяне локці і каленкі гаіліся затым аж да канца першай чвэрці! Колькі розных прыгод… Аднойчы натрапілі ў лесе на месца, дзе шмат-шмат лісічак. Нехта раптам: «Давайце адсюль хутчэй – гэта габрэйскія могілкі!» А чаму ўсё зарасло мохам, кустоўем? Незразумела. Тады ж пра Халакост нідзе не згадвалася. Я прыстала да дзеда. Так і пачула, што Клічаў быў яўрэйскім мястэчкам да вайны. Амаль усіх і забілі. Пасля вайны гарадок нанава адбудоўваўся і засяляўся.

*– Зарубка ў памяці: так паступова прыадчынялася другая гісторыя Беларусі?*

– У тым ліку і праз радавод. Дзед кіраваў школай, калі на яго паступіў данос у НКВД: маўляў, дома ў Дарафея Солтана на сцяне ікона – такому настаўніку давяраць дзяцей нельга! Насамрэч быў ён перакананым атэістам. А неяк намаляваў партрэт маёй будучай бабулі, зрабіў прыгожую рамку ў выглядзе васількоў і незабудак. Тое мастацтва і вылезла бокам. Каб не кінулі за краты, хуценька запісаўся ў армію… Хто ў войску, тых не чапалі. Я думала: вось жа гад – гасцяваў, смяяўся, глядзеў на маладую сям'ю з дзвюма маленькімі дзяўчынкамі, а пасля так сподлічаць…

*– І як склаўся дзядулеў армейскі лёс?*

– Хутка пачалася вайна. Зведаў усякага: пальцы на левай руцэ не разгіналіся, рука напаўсагнутая ў локці. Меў ордэны і медалі. Пасля шпіталя працаваў на вайсковым авіярамонтным заводзе. Але пра баталіі – ні-ні.

А бабуля ахвотна расказвала, як яны выжывалі ў акупацыі ў лясным краі. І гэта зусім не тое, што паказвалі ў кіно. Сваімі былі тыя партызаны, якія не паспелі адступіць за лінію фронту, а вось закінутых з вялікай зямлі дыверсантаў пабойваліся. Яны і дыслакаваліся асобна. Аблавы на мясцовых жыхароў рабілі ў асноўным з-за іх дыверсій. І яшчэ якія аблавы!

Дарэчы, немцаў не лічылі аднолькавымі нелюдзямі. Быў адзін, які прыносіў прадукты, калі ўсе на тыф захварэлі. Часта браў маю пяцігадовую маму на рукі і нават плакаў. Паказваў фатаграфію. У яго таксама дома дзве дачкі. Цікава, як склаўся яго лёс.

Вось і чарговая мая зарубка: не ўсе вакол аднолькавыя.

*– А неймаверная розніца ў жыцці горада і вёскі? Колькі фізічнай працы… І дарослыя вечна занятыя, і дзеці.*

– Гэта праўда: не разгіналіся. Але пры тым якія прыгожыя песні спявалі, калі збіраліся за сталом! Вельмі шкадую, што не запісала. Цэлыя балады. І ніякага п'янства.

*– Каб не Клічаў, то ці змаглі б загаварыць па-беларуску? Гэта ж міф, што на ўсходзе выключна «великий да могучий»…*

– Тады там рускай гаворкі не было. Калі пачуеш яе ў некага з дзяцей, то і да бабкі не хадзі: гарадскі, прыехаў на вакацыі.

*– Што яшчэ сядзіць у памяці?*

– Рэчка, бачу як зараз: кладка праз яе на Бёрда. Сяджу, любуюся на гарлачыкі, цікую за рыбай у празрыстай вадзе…

Ідылія скончылася з меліярацыяй. Не паляпшэнне – асушванне зямлі. Зніклі крыніцы ў лесе з берастовымі кубкамі. Знікла Суша, на беразе якой стаяў дом прабабулі. Ольса стала зарастаць, бо вакол сыпалі нітраты, іх змывала ў рэчку, а ў дадатак яшчэ пачалі мяхамі збіраць ракавінкі, па-навуковаму перлаўкі, для падмуркаў крам і клубаў. Нейкі дурань вырашыў, што гэта прыгожа, а яны ж фільтравалі ваду. Разлівы з кожным годам меншыя, а рэчка – усё ўжо, цяпер проста ручаёк. Ручная праца на загад «мудрай партыі». Новая зарубка…

## Нармальнага чалавека – пад крыміналку, а са злачынцы і цыніка ляпілі святога

*– Вы працавалі ў Інстытуце матэматыкі Акадэміі навук і пайшлі вучыцца на вячэрняе на гістфак. Зусім розныя навукі. Чаму такі роскід?*

– Тады толькі пачыналася эпоха вылічальных машын, гэта быў авангард навуковага прагрэсу. У нас была ЭВМ БЭСМ-6 – трэцяя ў СССР пасля Навасібірска і Дубны. Яна проста вялізная, некалькі вялікіх залаў! Увесь першы паверх – лабараторыя вылічальных комплексаў. Усё працавала кругласутачна, я хадзіла ў начныя змены.

Але тым не менш гісторыя, асабліва Старажытнага свету, не давала спакою. Тады ў нашым асяроддзі шмат дыскутавалі пра «новую храналогію» Фаменкі і Постнікава. Дарэчы,

мае сябры, чыстыя матэматыкі, як іх называлі, былі на баку гэтай тэорыі. Божа, часам так рубіліся! На што была падобная дошка ў лабараторыі дыферэнцыяльных ураўненняў – графікі з прамымі лініямі, ламанымі, формуламі… Ведалі б фінікійцы, як іх гісторыю правяралі метадам матэматычнага мадэлявання!

*– Што стала галоўным вынікам адукацыі: веды – ці ўменне сумнявацца, ставіць пад пытанне навязаныя тлумачэнні? Жыло адчуванне, што ў самой сутнасці прафесіі ёсць выклік, нешта большае за даты і прозвішчы?*

– Калі заканчваўся мой дэкрэтны водпуск, вызвалілася месца лабаранткі на кафедры паўднёвых і заходніх славян. Меркавалася, што буду працаваць, здам кандыдацкі мінімум і пачну пісаць дысертацыю. На факультэце адразу пасябравала з Юрыем Іосіфавічам Драгуном, Валянцінам Навумавічам Рабцэвічам і Генадзем Іосіфавічам Даўгялам. Якія выдатныя цікавыя людзі і як іх мне не хапае… Тады ўжо бачылася, як пачынаўся падзел па поглядах. А для некаторых кан'юнктура была важнейшая. Яны спяшаліся перапісваць падручнікі па гісторыі, бо Лукашэнка кіўнуў. Мала хто тады звярнуў увагу. А гэта нават не званочак, а сірэна.

*– Кожны рана ці позна сустракае сваю першую забарону, калі сістэма загадвала: «Гэта нельга!» Якім быў унутраны адказ, прыняць – ці пераадолець?*

– Дык сам удзел у вулічных акцыях хіба не пераадоленне страху? Калі палохалі снайперамі на дахах, калі ты ішоў і невядома было, чым усё скончыцца. Усё ўпершыню. Нават кангрэс правесці. Памятаю, Юры Захаранка асабіста правяраў, каб не здарылася «сюрпрызаў».

*– Які з прыкладаў сямейнай гісторыі паўплываў на вас больш: маўчання – ці адкрытай, сумленнай, а таму рызыкоўнай, пазіцыі?*

– Памятаю эпізод, хоць апавяданне пра яго пішы. 1964-ы. Мама ў кабінеце планавага аддзела шахты ў Янакіеве,

за спінай – партрэт Мікіты Сяргеевіча. У кабінеце праз сценку нешта забівалі ў сцяну – і рамка ўпала. Узяла за пятлю, выцягнула ў калідор і пажартавала: «Мяняю Хрушчова на два хуткасшывальнікі». А тут, як назло, старшыня парткама. Меў чатыры класы адукацыі і таму ненавідзеў ітэраўцаў з вышэйшай адукацыяй. Вось і скарыстаўся момантам: «У пятніцу партсход, дык разгледзім вашу персанальную справу. З камсамолам дакладна развітайцеся, а яшчэ спадзяюся, што і з працы звольняць па артыкуле».

Проста катастрофа!

І вось у чацвер, калі заставаўся адзін дзень да судзілішча, раптам падбеглі дзяўчаты: «Лора, Лора! Па радыё кажуць, што Хрушчова знялі!!!» Напэўна, тады ніхто так не цешыўся гістарычнай адстаўцы, як мама.

Памятаю, яна вучылася ў аспірантуры, канспектуе Леніна – ну, усе праз гэту абязалаўку прайшлі, я ў тым ліку, хоць і пазней. І тата пытаецца, чаму яна не хоча ўступаць у партыю. Адказ: «Вазьмі і пачытай, што ён піша. Вось гэты абзац, напрыклад. Разумееш? Правадыр сусветнага пралетарыяту… Паскуднае людажэрства!» Я аслупянела: Ільіч для мяне быў проста святым: з дзяцінства вакол – брашуркі і кніжачкі пра небажыхара. Потым, калі сама пачала штудзіраваць яго, шмат чаго зразумела. Так тады адбывалася: нармальнага жывога чалавека рабілі злачынцам, а з адкрытага цыніка і злачынцы ляпілі святога.

## Дзякуючы нашаму пратэсту ўкраінцы змаглі пражыць без вайны на пару гадоў больш

*– Беларусь 1990-х – эпоха, якая і сёння выглядае супярэчлівай: з аднаго боку выбух магчымасцяў, адкрытасць, свабода; з другога – наіўнасць, памылкі, расчараванні. Якім бачыцца гэты час праз прафесійную оптыку?*

– У ім прыадчынілася фортка, праз якую можна было збегчы ад Расіі… Але гэта разумееш зараз, калі за спінамі столькі падзей і часу. Тады ж грамадства не было гатовае: савецкія мазгі, атручаныя ідэалогіяй, блакавалі палітычную волю. Ці шмат ведалі пра страшную ролю суседзяў у нашым лёсе? У свядомасць убівалі адно: ёсць старэйшы брат, які мудрэйшы, прыгажэйшы і мацнейшы.

Аднойчы назірала за рэакцыяй су056раўцаў, якіх прывялі на фільм з новай праўдай пра паўстанне Тадэвуша Касцюшкі ў Дом пісьменніка. Прыйшлі шумнымі – вярталіся задуменнымі. Ну, хоць нешта даведаліся. Але колькі людзей убачыць тую стужку? Пара соцень ці тысяч? Па ТБ яго ж не паказалі. Праўда прабівалася з цяжкасцю.

*– Калі пісаць праўдзівую гісторыю мінулага стагоддзя, то якімі бачацца галоўныя лініі разрываў і пераломаў, найважнейшых падзей?*

– Дарэчы пачынаць адлік з 1914 года. Патрэбныя публікацыі ў школьных і студэнцкіх падручніках пра тое, які каласальны і зруйнавальны ўдар нанесла Беларусі Першая сусветная вайна. На мой погляд, яна пацярпела больш за ўсе астатнія краіны і не змагла акрыяць да пачатку наступнай трагедыі.

Далей 1945–1991 гады: працяг русіфікацыі, ператварэнне Беларусі ў выпрабавальны камуністычны палігон, наступствы Чарнобыля.

Трэці – з 1991 да 2020-га. Пачатак суверэнітэту і крах незалежнай палітыкі, усталяванне марыянетачнага рэжыму, знішчэнне ўласнай, добра развітой прамысловасці. Поўная залежнасць эканомікі ад Расіі. Карупцыя, адсутнасць падзелу ўлад, знішчэнне дэмакратычных інстытутаў.

Чацвёрты – з 2020-га: знішчэнне грамадзянскай супольнасці, рэпрэсіі, масавая эміграцыя, пачатак вайны Расіі супраць Украіны. Беларусь пад акупацыяй.

*– Пратэсты 1990-х і 2020-га: заўважаецца пераемнасць у настроях, лозунгах, стылі салідарнасці? Ці наадварот, разрыў, які паказвае, што краіна ўвайшла ў новы этап?*

– Вядома, сітуацыя мянялася, людзі таксама. Спачатку былі белыя стужачкі, але пратрымаліся яны зусім нядоўга. Раптам з'явіліся нацыянальныя сцягі, нібы ў адзін момант. «Жыве Беларусь!» – з усіх бакоў. У 2020-м народ быў злы і з-за ковіду, і з-за таго, што з ім абышліся, як з быдлам. А само адключэнне інтэрнэту ў дзень выбараў?

*– Гавораць, не было на шэсцях столькі сапраўды ідэйных, як раней.*

– Не пагаджуся. Няўжо той, хто патрабуе замест кавалка хлеба права выбару, не ідэйны? Гэта зусім не дэманстрацыя працоўных супраць дэфіцыту тытуню! Народ захацеў свабоды і дэмакратыі. І ў якой унікальнай форме! Якія плакаты людзі вынаходзілі! Якая салідарнасць была!

Пасля тых падзей мы дзівіліся, калі ўкраінцы пыталіся: «А чым ваш прэзідэнт кепскі?» Не разумеюць дагэтуль: дзякуючы нашаму пратэсту яны змаглі на пару гадоў больш пражыць без вайны.

*– Часта параўноўваюць сучасныя рэпрэсіі са сталінскімі. Ці справядліва? Гэта рэальны аналітычны ключ для разумення сітуацыі – або хутчэй метафара, якая падкрэслівае маштаб жорсткасці?*

– Паралелі выглядаюць праўдападобнымі: нават у працэнтных адносінах статыстыка пацярпелых не будзе асабліва адрозніваццa. Няшмат, напэўна, сёння сем'яў, якія не трапілі пад каток: кагосьці збілі або звольнілі, хтосьці сядзеў на сутках або сплаціў штраф… А як дасталася нават ускосна, то хіба цяперашняе жыццё пад пастаянным прыцэлам можна назваць нармальным? Вельмі страшны перыяд перажывае Беларусь. Дастаецца нават «ябацькам».

*– Падаецца, наадварот: цяпер на іх вуліцы свята.*

– Ай, насамрэч дрэнна ўсім. Бо жыць мусілі непараўнальна лепш, каб не той абрыў. А купка мярзотнікаў – гэта ж кропля ў моры.

*– Чаго ў нас немагчыма адабраць ні рэпрэсіямі, ні прапагандай?*

– Жадання быць свабоднымі.

## «Аляксееўна, там Хрыстос нейкі выступаў, міністэрства на вушах. Што ён там нагарадзіў?»

*– Якая цана рэпутацыі адной з галоўных хранікёрак пратэстаў? Цягам цэлай эпохі – паміж апазіцыяй і ўладай, энергіяй вуліц і болем дубінкі? Як гэта даецца – не сімвалу, а жывому чалавек?*

– Наконт жывога чалавека – цікава… Часам у мяне бывалі такія моманты, калі хацелася застацца жывой у найпростым сэнсе. На праспекце Дзяржынскага ў 2006-м, калі стралялі шумавымі гранатамі і страшна збівалі людзей, я вярнулася ў рэдакцыю з крывёй на бэжавых замшавых ботах. Што ўжо пра 2020-ы казаць… Вельмі цяжка часам стрымліваць сябе, калі бачыш, як страшна збіваюць людзей, цягнуць за ногі па асфальце. Праца на радыё абвастрае сітуацыю, бо неабходна пастаянна трымацца эпіцэнтра падзей, каб слухач мог адчуць тую атмасферу, услухацца ў крыкі болю скалечаных, ярасную злобу сілавікоў…

*– Не раз і не два чуў: да Лунёвай нават міліцыянты ставіліся з павагай. Чым растлумачыце гэты феномен? Вынікам прафесійнай вытрымкі, асабістай смеласці – ці ўменнем гаварыць з сілавікамі як з людзьмі, а не як з ворагамі?*

– Ды самой цікава было пачуць адказ ад тых старлеяў, маёраў, палкоўнікаў… Але як ёсць – у іх адносінах да мяне сапраўды адчувалася нешта незвычайнае. Камандзіры

высокага рангу заўсёды прысутнічалі на апазіцыйных акцыях, слухалі выступы. А потым, калі без калатнечы, маглі падысці і спытаць: «Аляксееўна, а што там за даклад нейкі ўсіх нашых на вушы паставіў? Гэты, як яго… Ну, Хрыстос нейкі выступаў. Што ён такога нагарадзіў?» Тады і расказваеш у двух словах, што «нагаварыў» дакладчык юрыдычнай камісіі ПАРЕ Хрыстас Пургурыдыс пра зніклых людзей у Беларусі. Ім цікава і мне, бо разумела: сапраўды міжнародныя назіральнікі паставілі МУС на вушы. Але чаму са мной размаўлялі з пэўнай лаяльнасцю, не ведаю.

Наагул, да 2020-га мы жылі ў іншай краіне. Я брала каментары ў featured рознага міліцэйскага начальства, і неяк начальнік крымінальнай міліцыі Савецкага РУУС узгадаў, што вучыўся ў беларускай школе і даў каментар «на мове» для «Радыё Свабода». Хіба можна ўявіць такое цяпер?

– *Анекдот! І відаць, не адзінкавы?*

– Аднойчы камандзір роты АМАПа сказаў мне пасля чарговага разгону акцыі на Кастрычніцкай плошчы: «У вас ёсць нейкія сродкі абароны? Вы ж так і па галаве можаце атрымаць». – «Мая зброя – дыктафон, ручка і нататнік». А нам тады якраз выдалі ў рэдакцыі маленькія дыктафоны з вялікімі і цяжкімі мікрафонамі. Ён бярэ навінку, пастукаў сабе па галаве: «А, ну гэта нармальна».

– *Словы пра тое, што ў асобных момантах адна толькі прысутнасць Лунёвай магла стрымаць агрэсію сілавікоў, не прыгожая метафара?*

– Спецыфіка моманту: для многіх цяжка паверыць, але гады таму многія сілавікі хацелі выглядаць, так бы мовіць, прыстойнымі. «Мы – ахоўнікі правапарадку». Ага… Хоць пэўны перыяд нават існаваў загад не дапускаць пры журналістах брутальных затрыманняў. Я сапраўды заўважала: як падыходзіш бліжэй, яны пачынаюць больш кантраляваць сябе.

Неяк мы, журналісты «Белсата», ехалі на сустрэчу з кіраўніцтвам кампаніі ў Вільню, а шмат народу тады ж – на канцэрт Міхалка. Мяжа забіта аўтобусамі, спазняемся. Нашыя падбухторваюць: «Ну падыдзі да іх — папрасі, можа паслухаюць. Яны ж у форме». Я і пайшла. Сказала проста, што мы едзем не на канцэрт, а па справе. Вельмі трэба. Адзін спытаў: «Дзе ваш кіроўца?». І неўзабаве загадаў рушыць за ім. І так мы праехалі мяжу. Жартавалі да Вільні пра гэта.

*– А ці няма ў гэтым няўлоўнага ў вострай сітуацыі моманту павагі да жанчын, тым больш з гучным імем?*

– Ха! Часам здараліся зусім анекдатычныя сітуацыі. Служыў у Маскоўскім РУУС адзін вельмі спецыфічны кадр. Па дарозе ў суд яшчэ ў калідоры пачынаў запужваць: лаяўся, агрэсіўна паводзіў сябе. Зрабіла заўвагу і папрасіла знізіць тон, а ён: «Вы ваабшчэ не ўмешвайцеся!» – «Так з усімі жанчынамі размаўляеце?» – «Аляксееўна, вы для мяне не жэншчына, вы для мяне хужэ Пазняка!»

Відаць, Зянон быў для яго вяршыняй усяго самага кепскага ў дэмакратаў…

*– З гэтай нагоды такое пытанне: шматгадовая праца ў асяроддзі, дзе дамінавалі мужчыны: у навуцы, журналістыцы, праваабароне. Ці было адчуванне падвойнага цяжару? Не толькі прафесійнага выкліку, але і гендарнага бар’еру, калі доказ кампетэнцыі патрабаваў удвая большых высілкаў?*

– Такая праблема дзе-нідзе існуе яшчэ дасюль. Хоць сітуацыя пакрысе мяняецца ў лепшы бок. Як правіла, гэта датычылася грошай. Лічылася, што мужчынам трэба плаціць болей – банальныя праявы патрыярхальнага грамадства. І тут хачу згадаць нашы жаночыя маршы, тое, як менавіта жанчыны прарывалі кардоны АМАПа… Як іх збівалі і цягнулі ў аўтазакі і як яны ўсё адважна пераносілі. Вось дзе поўная гендарная роўнасць…

## Доўга не магла ачуняць: у мяне – параза, але ў іх – аднятае жыццё…

*– Адчуванне таго, што зараз трэба быць вунь там менавіта, побач вось з гэтым чалавекам – адкуль такі прафесійны інстынкт: з адукацыі гісторыка, які шукае знакі ў дэталях, з досведу праваабаронцы, які заўсёды бачыць чалавека за фактам, ці з асабістай інтуіцыі?*

– Мне здаецца, часам нейкія дэталі становяцца самі па сабе прыкметнымі, калі падзеі развіваюцца – і трэба проста ўважліва ўглядацца ў сюжэты. Прычым менавіта на месцы падзеі, дзе ўсё разгортваецца. Я не магла б працаваць толькі з офіса. Мне заўсёды трэба знаходзіцца ў віры, каб адчуваць, што называецца, пах, смак, чуць размовы. Многае не ўваходзіць у рэпартаж, застаецца за кадрам, але яно ў памяці і паступова фармуецца ў пэўную сістэму назірання, адчування і разумення. Так ты і пачынаеш бачыць заканамернасць.

*– У чым сутнасць журналістыкі падчас пратэстаў? Гэта халодная фіксацыя фактаў – ці яшчэ і спроба даць людзям адчуванне: ваш голас пачуты, вашая годнасць заўважаная?*

– Журналіст павінен усё ж такі быць бесстаронінм. А гэта вельмі цяжка. Асабліва калі ўсё імкліва развіваецца. Неабходна адлюстраваць усё да дробязяў, каб была зразумелая карціна. Падчас пратэстаў 2020-га трэба было яшчэ думаць і пра сваю бяспеку, што ўсё вельмі ўскладняла.

Дзякуй людзям, якія бачылі і цанілі ўмовы тваёй працы. Аднойчы стаяла на ганку дома, калі ў мяне стаў цэліцца сілавік. Адчуванне бездапаможнасці яшчэ тое… Раптам дзверы рэзка адчыніліся – і мужчына ўмомант уцягнуў мяне ў пад’езд. Услед бахнула па дзвярах. Мне потым падарылі на памяць гільзу ў выглядзе нейкай бомбы. Вось найлепшае прызнанне.

*– Не толькі вы некага ратуеце, але і вас? Можна прыгадаць выпадкі асаблівага эмацыйнага кантакту з людзьмі, якіх запісваеце, чыю гісторыю вывучаеце?*

– Даводзілася мець справу з прысуджанымі да смяротнага пакарання.

*– Як гэта адбывалася?*

– Сваякі ці іх блізкія, сябры прыносілі запіскі з просьбай разабрацца ў справе. Восем гісторый. Кожны раз праходзіла ўсе інстанцыі. Вывучала матэрыялы, сустракалася з адвакатамі. Шасцёра мелі такія нестыкоўкі ў справах, што нават мне, не юрысту, было відаць: даказана далёка не ўсё. Гэта дадавала энергіі, жадання пашукаць факты, аргументы, каб выратаваць бедакоў. І было моцным ударам, калі іх расстралялі. Усіх. Амаль за адзін дзень. Пры тым, што актыўна падключыліся розныя міжнародныя арганізацыі, ад іх меліся заявы ў Вярхоўны суд і пракуратуру з просьбай дадатковага разбору, магчымасці даць адтэрміноўку выканання прысуду. Але ўсё дарма. Пасля таго доўга не магла ачуняць… У мяне – параза, але ж у іх – беззаконна аднятае жыццё…

*– Вы пачыналі назіраць за праваахоўнымі органамі яшчэ ў часы позняга Савецкага Саюза, калі міліцыя здавалася хутчэй непаваротлівай і нават нясмелай, чым жорсткай. Памятаецца першы момант, калі ў яе дзеяннях пабачылася ўжо не ахова парадку, а адкрыты гвалт?*

– Адразу згадваецца брутальны разгон акцыі 1995 года пасля рэферэндуму: студэнты вывесілі сцяг БССР на туалеце Купалаўскага тэатра. Гэта і быў пачатак. Мяне тады ўразіла, як людзі ў нейкіх спартыўных строях могуць так абыходзіцца з удзельнікамі мірнай акцыі. З таго эпізоду і пайшло, як па наезджанай дарожцы. Затрыманні, збіццё затрыманых, абразы…

*– Тры дзесяцігоддзі рэпартажаў пра рэпрэсіўны механізм. Як ён эвалюцыянаваў ад савецкага сцэнара да аўтарытарнай практыкі?*

– Практыка арыштаў і крымінальных спраў за праявы волі на вуліцах пачала складвацца ў сістэму з 1996 года, калі ўлады вырашылі любым коштам збіць хвалю пратэстаў. Яшчэ трэба мець на ўвазе, што адначасова гэтыя графіці, пікеты, дэманстрацыі, мітынгі, вывешванні нацыянальных сцягоў – пагроза расійскай экспансіі.

Згадваю, напрыклад, Марш свабоды ў 1999-м. Ён уражваў, за што па логіцы тагачаснай улады нехта мусіў адказаць. Але ўсё трэба было абставіць так, каб гэты нехта выглядаў для грамадства злосным хуліганам, які проста павёў за сабой сляпы натоўп. Тады з экрана Зімоўскі заявіў пра «статак адмарозкаў». І патрабавалася яшчэ паказаць, што «пацярпелі» менавіта сілавікі. Хуценька распачалі справы: судзілі Валерыя Шчукіна і Міколу Статкевіча.

А зараз усё ўжо зусім інакш: проста бясконцыя рэпрэсіі, калі не спрабуюць ствараць нават бачнасці законнасці. Міліцэйскае самавольства перарасло ў санкцыянаванае бязмежжа.

*– Беларуская прававая сістэма ўсё яшчэ працуе паводле логікі мінулага? Нават калі формы змененыя?*

– Былы старшыня суда расказваў мне яшчэ ў канцы дзевяностых, як яго выклікалі ў райкам на дыван і доўга распякалі: пасадзіў члена КПСС. І нікога не хвалявала, што мера пакарання не прадугледжвае іншага. У постсавецкай Беларусі саўковасць увогуле вельмі жывая з-за таго, што краіну ўжо столькі часу спрабуюць загнаць у стойла, у СССР. Сказаў старшыня Вярхоўнага суда, каб не было адмены прысудаў паводле крымінальных артыкулаў – ну і ўсё: можаш пісаць колькі заўгодна апеляцый, але толку… Адмена – выключная рэдкасць. З законнасцю зусім бяда, вось і маем зараз тое,

што маем. Галоўнае – слова, думка старшыні суда. У ягоным кабінеце ўсе адміністрацыйныя справы загадзя распісваюцца. Зрэшты, якая розніца, хто і дзе гэта робіць? Больш сумленна, каб проста адразу зачытвалі спіс і адразу паведамлялі, каму, колькі і па якіх артыкулах…

*– Ці можа праца праваабаронцы ў такіх умовах рэальна зберагчы сведчанні для будучыні? Ёсць спадзеў, што сабраныя «Вясной» дакументы стануць не проста архівам, а галоўнымі доказамі ў магчымым будучым судзе над сістэмай?*

– Безумоўна. Усё, што пісалі СМІ, усё, што маніторылі праваабаронцы, – гэта доказы злачынстваў улады. Шмат каго трэба судзіць за найгрубейшыя парушэнні рэспубліканскага заканадаўства, міжнародных нормаў права.

## Сілавікоў здымаюць за мяккасць, а не наадварот. Вось і адрываюцца. Ад закону і ад народа

*– За трыццаць гадоў у Мінску змянілася нямала кіраўнікоў сілавых структур, кожны з якіх задаваў тон свайму падраздзяленню. Ці можна сказаць, што жорсткасць залежала ад асобаў? Або гэта агульная логіка сістэмы, якая перамолвала нават тых, хто спачатку заставаўся «звычайным» чалавекам, хай і ў пагонах з вялікімі зорачкамі?*

– Заўсёды шмат залежыць ад кіраўніка таго ці іншага падраздзялення: дысцыпліна, паводзіны, абыходжанне з удзельнікамі акцый. Калі ўзяць АМАП, то назірала, што з прыходам кожнага новага камандзіра ўсё рабілася толькі горшым. Бо такія ўнутраныя парадкі. У нас жа сілавікоў распякаюць і здымаюць менавіта за дапушчаную мяккасць, а не наадварот. Або суддзю могуць пакараць за лаяльны прысуд, але, зноў жа, не наадварот. Вось усе і адрываюцца. Ад права, закону, гуманізму. Ад народа.

*– Ці былі пры тым выпадкі-выключэнні, калі сілавік нечакана паводзіў сябе па-чалавечы: папярэджваў, не паднімаў руку, адварочваўся?*

– Калі мяне перавезлі з Акрэсціна ў СІЗА Жодзіна, то аднойчы папрасіла ахоўніка пакінуць прыадчыненай «кармушку»: у камеры невыносна душна. Ён у адказ: «Магу і з акном зрабіць тое самае». Зайшоў у камеру з такім штыхом металічным і даў паветра. Гэта ўвогуле парушэнне інструкцыі: у камеру нельга, тым больш аднаму. Хутчэй за ўсё, нам трапіўся звычайны салдат. Раз ён ужо такі ветлівы, папрасіла прынесці акуляры з сумкі, без іх не магла чытаць. Схадзіў і перадаў. А іншы, калі нас вывелі на прагулку ў дворык, на мае словы: «А! Трэба ж рукі за спіну. Ніяк не магу да гэтага прывыкнуць…» – зрэагаваў: «Што вы? Не трэба…» На фоне звычайных паўсядзённых монстраў проста ўразіў.

*– Французская рэвалюцыя з гільяцінай, расійскія рэвалюцыі з крывёй на вуліцах, беларуская рэвалюцыя 2020-га з катаваннямі ў ізалятарах… Чаму чалавечая гісторыя ў моманты перамен паўтарае адны і тыя ж сцэнары жорсткасці? Гэта нейкая праграма чалавечай прыроды – ці ўсё ж можна гаварыць пра канкрэтную беларускую традыцыю страху і памяці войнаў, якая пераходзіць у палітычны гвалт?*

– Тут няма лагічнай паслядоўнасці. Глядзіце: французская рэвалюцыя ўрэшце прынесла станоўчы плён: канец манархіі, з’явілася Дэкларацыя правоў чалавека, адмянілі саслоўныя прывілеі. Яна паказала прыклад новага ўкладу жыцця іншым краінам.

*– Дык і буржуазная рэвалюцыя 1905 года ў Расіі мела плюсавыя вынікі?*

– Так: з’явілася заканадаўчая Дзяржаўная дума, легалізавалі палітычныя партыі, палепшылася становішча народа. Можна нават казаць пра перадумовы для развіцця грамадзянскай супольнасці.

*– Як на тое пайшло, дык у 1917-м скончылася эпоха самадзяржаўя, амніставалі палітвязняў, адмянілі смяротнае пакаранне, абвясцілі свабоду слова і сходаў. Суцэльныя плюсы?*

– Не, зразумела, вынікі сталіся проста катастрафічнымі… Але пагадзіцеся: была ж магчымасць неяк гэтай краіне стаць нарэшце чалавечай, але вось прыйшла хеўра бальшавікоў – у прынцыпе, амаль бяскроўна. А забраліся на гару і залілі слязьмі ўсе рэспублікі. Дагэтуль невядомая дакладная колькасць забітых у лагерах і турмах.

*– А ўрокі 2020-га?*

– Хоць гэта не рэвалюцыя, але беларусы адчулі сябе народам. Сілай. Пабачылі сваю нацыянальную годнасць. Не па хлеб мы выходзілі, не па зямлю – па свабоду. І так яе захацелі, што ніякім здзекам тое жаданне не задушыць. Яна прыйдзе. Абавязкова.

*– Псіхолагі кажуць: у кожным чалавеку жыве і агрэсар, і абаронца. А што пераважае ў беларускіх пагонах, з досведу сведкі?*

– Справа ў тым, што зараз такі перыяд, калі ў сілавыя структуры набіраюць увогуле не тых людзей, якія павінныя там служыць. Ідуць дзеля кватэр, заробкаў, дзеля прывілеяў. Калі чалавек жыве ў нармальнай сям'і, мае зносіны са звычайнымі людзьмі і бачыць, што адбываецца, хіба надумаецца служыць у пекле?

Здарацца перамены, то дзяржаву, нас усіх чакае вялікая праблема: што з імі рабіць? У іх жа ў выніку разлад псіхікі. Процьма маладых «дубіначнікаў» будзе ўрэшце браць шлюбы, нараджаць дзяцей… Упэўнена, што з эканомікай хутчэй разбяромся, чым з такімі вось. Іх тысячы…

*– Калі сабраць усе лунёўскія рэпартажы ў адзін том, атрымаецца фактычна гісторыя дзяржаўнага гвалту ў Беларусі.*

*Чым ён мусіць стаць для наступнікаў: папярэджаннем, прысудам, споведдзю эпохі?*

– Думаю, гэта некалькі важкіх тамоў. І ўсе яны – ілюстрацыя таго, што адбываецца з краінай, калі чужакі ўстанаўліваюць дыктатуру і ўлада трымаецца на дубінках.

# СЯРГЕЙ (СЯРЖУК) СЫС



Фота з асабістага архіва С. Сыса

*Нарадзіўся 26 студзеня 1962 года ў вёсцы Пракісель Рэчыцкага раёна.*

*Бацькі – настаўнікі. У 1979 годзе паступіў на гістарычна-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францішка Скарыны. Вучыўся разам з Алесем Бяляцкім, Эдуардам Акуліным, Анатолем Сысам. Пасля службы ў войску працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры.*

*З 1986 года – журналіст у розных СМІ Гомельшчыны.*

*З 2000 года працаваў у камерцыйных структурах, выдавецкіх і рэкламных агенцтвах і кампаніях.*

*У цэнтральным друку дэбютаваў у 1986 годзе паэтычнай падборкай у часопісе «Маладосць». Быў сябрам Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя». Прымаў удзел ва ўстаноўчым сходзе Таварыства беларускай мовы.*

*Друкаваўся ў беларускіх і замежных выданнях; аўтар шматлікіх калектыўных зборнікаў і анталогій, публікацый*

*у часопісах і газетах, а таксама кніг паэзіі «За трапяткім матыльком кахання» (2000), «Стрэмка» (2011), «Павук» (2014), «DOM» (2024). Першая празаічная кніга – «Пералёт-трава» (2025). Лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (2008), пераможца мінскага Фестывалю аднаго верша (2009). Удзельнік і госць шматлікіх літаратурных фестываляў і аўтарскіх вечароў ва Украіне: у Луцку, Жытоміры, Львове, Чарнігаве, Херсоне.*

*Творы перакладаліся больш чым на дзясятак моў.*

*Сябра БАЖ, Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭНа.*

*У 2007 годзе на запрашэнне Алеся Бяляцкага далучыўся да працы ў праваабарончым цэнтры «Вясна». Прымаў удзел у многіх праваабарончых місіях (Чачня, Украіна) і кампаніях («Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання», «Праваабаронцы за свабодныя выбары»). Неаднаразова затрымліваўся за асвятленне або ўдзел у масавых мерапрыемствах.*

*Праводзіў трэнінгі па праваабарончай журналістыцы, арганізоўваў і выступаў на мерапрыемствах, якія ладзіліся беларускімі пісьменнікамі і журналістамі.*

*Лаўрэат конкурсу «Вольнае слова 2016» у жанры «Журналісцкае расследаванне». Аўтар дзясяткаў артыкулаў пра пераслед і жыццё палітвязняў. Супрацоўнічаў з выданнямі «Новы Час», «Народная Воля», «Наша Ніва». Выступаў як праваабаронца на старонках украінскіх выданняў.*

*У вымушанай эміграцыі напісаў і выдаў кнігі «DOM. Паэзія выгнання 2021–2023» (Skaryna Press, Лондан), «Пералёт-трава» (Lohvinau, Вільня). Рыхтуецца да выдання кніга паэзіі «Прыручэнне Літвой», эсэ пра Алеся Бяляцкага.*

*З прычыны крымінальнага пераследу ў Беларусі за праваабарончую дзейнасць быў вымушаны шукаць палітычнага прытулку ва Украіне. Пасля ўварвання расійскіх агрэсараў з’ехаў у Нямеччыну.*

*Цяпер у Літве, дзе працягвае займацца грамадскай-палітычнай, праваабарончай і культурнай дзейнасцю.*

СЯРГЕЙ (СЯРЖУК) СЫС

# ЧАЛАВЕК БЕЗ ПЯРЧЫНКІ – НІБЫ ВЕРШ БЕЗ РЫТМУ

## У вёсцы беларускасць прымалі, аднак лічылі як бы хатняй, неафіцыйнай

*– Сяржук, паэтычны ключ да мовы – гэта дзяцінства?*

– Бацькі і кнігі. Да кніг прывучвала маці, яна працавала ў школьнай бібліятэцы. Жыццё пад кантролем: з урокаў не ўцячэш, як іншыя хлопцы. Чытаў без разбору, што трапляла пад руку. І аднойчы наткнуўся на «Палескіх рабінзонаў» Янкі Маўра. Зачапіла мова – нейкі ток праз душу. А потым вясковая школа, дзе гаварылі перамешанай, амаль беларускай мовай.

Тата быў трохі дысідэнтам – пісаў пародыі на Хрушчова, хаваў іх у шуфлядзе. Па начах слухаў таемныя галасы на старым лямпавым прыёмніку: «Ватыкан», «Свабоду»… Я, малы, крадком падслухоўваў і не разумеў, чаму робіць гэта ўпотай. Дайшло пазней: Беларусь трэба берагчы.

*– У вас і цяпер адчуваецца вера ў асвету, слова, у прыгажосць простага жыцця. Адгукаецца ўласнае настаўніцтва?*

– Пасля вучобы доўга не ведаў, куды ісці, але выпадкова ўсё вырашылася: суседская дзяўчына паступіла ў Гомелі на гістфак і прапанавала рушыць услед. На іспытах гаварыў выключна па-беларуску. Прайшло лёгка.

*– І ўсё ж: школа таго часу – для вас гэта месца росту ці ўцёкаў?*

– Як шчыра, і тое, і тое. У вёсцы Дабрагошча Жлобінскага раёна, дзе апынуўся па размеркаванні, рабіў урокі жывымі. Прыносіў альбомы, кнігі, гульні – інтэрактыў у дзеянні. І гэта працавала: дзеці пачыналі гаварыць па-беларуску нават на вуліцы. Мяне натхняла, што яны ўспрымаюць мову сваёй, а не змушана «абавязковай».

*– А ў настаўніцкай нехта яшчэ гаманіў на ёй?*

– Амаль не. Зрэдзьчас толькі маладыя настаўнік фізікі і фізрук. Астатнія – з горада: прыязджалі, вучылі і з’язджалі. Беларускасць

успрымалася імі як нешта правінцыйнае, хоць і з павагай. Але я не адчуваў сябе чужым: проста рабіў сваю справу.

*– Падручнікі па-беларуску?*

– Не. Канец васьмідзясятых, ужо ўсё на «великом и могучем».

*– Многія і праз гады ўспамінаюць русіц як любімых настаўніц, а на выкладчыкаў беларускай часцей крывяцца. Чаму?*

– Адлюстраванне грамадства таго часу. Беларускасць лічылася як бы хатняй, неафіцыйнай. Гарадскія педагогі прывозілі з сабой русіфікацыю. Але ў маёй школе яшчэ трымалася жыццёвая беларуская гаворка. Яе не выкладалі – ёй жылі.

*– Вы пасля школы выбралі журналістыку. Там як з гэтым?*

– Занесла ў «Гомельскую праўду». Назва наша, а тэксты амаль усе па-руску. Толькі я ўжо не мог змяніцца. Мова засталася ўва мне, як кроў у венах.

## Мова для мяне не зброя і не сімвал, а натуральны стан

*– У другой палове 1980-х вы былі сярод тых, хто ствараў «Талаку», «Тутэйшых». Рухала энергія маладосці – ці ранняе ўсведамленне, што без роднага слова няма нацыі?*

– Студэнтамі вывучалі замежныя (польскую, балгарскую) і здзіўляліся: у іх усё на роднай мове. Газеты, тэлебачанне, вуліцы. А ў нас – няма. Гэта балела. І быў прыклад – Анатоль Сыс, фактычна факел. Гаварыў толькі па-беларуску і пад'юджваў іншых: «Што, абмаскаліліся?» Настойліва вяртаў нас да сябе. Гэта быў першы крок да ўсведамлення: мы – не прыдатак, а народ.

*– А было адчуванне, што краіна прачынаецца?*

– Так. Памятаю, як мінскае «Дынама» стала чэмпіёнам СССР: пасля вырашальнай гульні людзі валам валілі на вуліцы

і ў тых шчаслівых натоўпах раптам пачуліся беларусамі. Гэта нейкі сігнал… Нават штуршок: мы, гомельскія студэнты, пачалі хадзіць пешкі праз палову краіны, спыняліся ў вёсках, глядзелі старыя цэрквы… Вось яна, нашая зямля!

*– Як выглядалі вандроўкі: выбар маршруту, што бралі з сабой, як прымалі людзі?*

– Пачулі пра нейкую цікавую вёску: ага, давайце туды па песні! І з вялікім бабінным магнітафонам – да нейкай бабулі-пявунні. Тая адразу аднекваецца, далей для смеласці кліча суседак. Сядалі ў хаце і пачыналася магія… Словы забудуцца – пасмяёмся разам, яны ўсё наноў. Гэта як адкрыць крыніцу.

Мова там жывая, з украінскімі адценнямі, але ўсё роўна нашая: смачная, вострая, трапная. Мы рабілі рукапісныя слоўнікі, натавалі сок, які дапамагаў расці ў паэзіі.

Хоць вершы я пісаў яшчэ са школы, але пасля такіх урокаў у іх з'явілася натуральнае дыханне, а не проста штучная вентыляцыя лёгкіх. Фальклор, жывая гаворка зрабілі маю паэзію больш спелай. Урок ад народу!

*– Далейшы ўдзел у стварэнні ТБМ – цалкам свядомае дзеянне?*

– Арганізатары ведалі, што я не проста беларускі настаўнік з глыбінкі, але пішу, актыўнічаю, вось і запрасілі ў Мінск. А там Бяляцкі, людзі, якім не ўсё роўна – адразу адчуванне сябе часткай руху. Значна пазней, у працяг, былі цікавыя праекты з Саюзам беларускіх пісьменнікаў, арганізацыя паэтычнага свята ў Гарошкаве ў гонар Анатоля Сыса, удзел у працы беларускага ПЭНа, дзе я браў удзел у журы прэміі «Кніга года», удзел у пэнаўскай імпрэзе «Нельга забіць: смяротнае пакаранне і беларуская літаратура». Усё гэта грунтавалася на беларушчыне і было вельмі натуральна.

*– Калісьці мова была знакам прыналежнасці, потым – сродкам супрацы. А цяпер чым?*

– Спосабам быць сабой. Не зброяй, не сімвалам, а натуральным станам. Калі сям’я гаворыць па-беларуску, калі дзеці на ёй – гэта і ёсць жыццё. Я ніколі не думаў, што можа быць інакш.

*– Чуў, знаходзіце беларускія слоўцы нават у літоўцаў, сярод якіх цяпер.*

– У нас агульная гісторыя. «Дзякуй», «вавёрка» – шмат такога падобнага… Мова не мяжуе, яна злучае.

*– Школьныя ўрокі – адно, а гаварыць па-беларуску проста ў побыце ці ў публічнай прасторы? Асабліва на першых парах?*

– Гэта патрабавала нават пэўнай мужнасці. Часам тое нібы гульня: праверка сябе, сваіх нерваў. Напрыклад, у войску: вакол азербайджанцы, украінцы, эстонцы. Кожны меў сваю гаворку, але беларуская ўспрымалася нечым дзіўным. Калі я, каравульны, прамаўляў па-нашаму, афіцэры адразу: «Гэта не язык службы!» Савецкі шавінізм працаваў без збояў.

Але нават там я не змоўк. У мяне былі беларускія кнігі, часопісы: «Маладосць», «Полымя», іншыя. Дасылалі з радзімы цэлымі бандэролямі. Мы з сябрамі чыталі, перадавалі ад рукі да рукі. Калі сыходзілі з войска, пакінулі пасля сябе невялікую бібліятэку. Каб навабранцы-беларусы мелі што чытаць. Нашае салдацкае змаганне.

*– Ваша малая радзіма – Пракісель, пазней Заспа над дняпроўскай кручай. Месца, дзе зямля, вада і чалавек непадзельныя. Паўплывала палеская прырода на светапогляд, паэзію?*

– Тыя пейзажы ў маёй крыві. Вялікі, паўнаводны вясновы Дняпро разліваўся да самых хат. Свет абрываў, водбліскаў і прастораў, якія не забываюцца.

Не толькі мной. Там зусім побач па беразе жыў паэт Віктар Ярац, непадалёк і Віктар Стрыжак, за ракой – Нэлі Тулупава, крыху далей і трошкі пазней з’явілася і моцна заявіла пра сябе Наста Кудасава. Усе яны людзі, у якіх Дняпро зрабіўся часткай

душы. Ён не плёскаецца, не цячэ, а стварае мысленне: вучыць спакою, прастору і глыбіні.

## Кажуць: «Я еўрапеец, а не беларус». Але калі адрэзаны ад глебы, то засыхаеш

*– Вы не раз казалі: чым хацець змяніць увесь свет, лепей проста саджаць ля дому дрэвы і кветкі. Гэта не толькі пра актыўнасць і прыгажосць?*

– Пасадзіў больш за дзвесце соснаў, яблынь, клёнаў.
Але сапраўдныя дрэвы – гэта людзі і творы. Мае дзеці, сябры, творчасць – вось мой лес.

Імкнуся жыць у суладдзі з зямлёй, люблю яе пах… Калі пераехаў у Мінск і атабарыўся на цешчыным лецішчы на Лысай Гары, славутай пісьменніцкай выспе ў лесе, то хутка да майго гародзіка на полі пачалі прыходзіць, каб вучыцца прыгажосці. Паэтка Аксана Спрынчан нават ладзіла экскурсіі. Гэта ў мяне ад памяці дзяцінства і коду беларускасці.

*– Часам падаецца, што апроч слова, ваш другі спосаб бачыць свет – гэта… грыбы!*

– О, мая стыхія… Збіраў, вывучаў, чытаў, запісваў гісторыі… І нарадзілася кніга «Таямніцы беларускага лесу». Не даведнік, а збор гісторый і метафар. Я апісваю грыбы праз людзей. Напрыклад, як паэт Віктар Шніп і яго жонка Людміла Рублеўская назбіралі па няведанні абы-чаго і трапілі ў шпіталь. Такія эпізоды, здарэнні паказваюць лес як жывую істоту. Менавіта з гэтай прычыны мой удзел у моўных курсах «Мова Нанова» тычыўся ляснога багацця, грыбнога царства.

*– Выпісаў для гэтай размовы: «Я не шукаў грыбы – я збіраў сваё». Цікавая формула!*

– Трэба адчуваць лес, ягонае дыханне. І разумець: грыбы не проста расліны, яны істоты з памяццю.

*– Вы параўноўваеце грыбніцу з чалавечай супольнасцю. Чаму?*

– Відавочнае падабенства ў тым, як жывое злучаецца. Найвялікшая ў свеце грыбніца, дарэчы, у Канадзе: больш за 200 кіламетраў пад зямлёй адзінага арганізму. Беларусаў сёння раскідала па свеце: Варшава, Вільня, Берлін, Лондан… Але пакуль існуе цэнтр – Беларусь, культура, мова – нітачкі-павуцінкі дацягнуцца дакуль заўгодна. А толькі знікае сувязь з цэнтрам, грыбніца гіне. Разам з ёю і мы.

*– Павуцінкі гэтыя яшчэ трымаюць вецер – ці ўжо параскіданыя ім?*

– На жаль, ірвецца… Асабліва моладзь, якая з'ехала. Кажуць: «Я еўрапеец, а не беларус». Але калі адрэзаны ад глебы, то засыхаеш. Без сілкавання сваёй «грыбніцы» чалавек губляе сябе.

*– Прыхільнікам вашай творчасці імпануе грамадзянскасць без лозунгаў. Палітычная паэзія – трыбуна, боль ці споведзь?*

– Гэта баланс. Ёсць творы, якіх я не друкую – надта прамыя. Але калі гаварыць пра грамадзянскую лірыку, то мне важней не выкрыкваць, а прымусіць задумацца.

Напрыклад, верш пра хлопчыка на Кастрычніцкай плошчы, які сядзіць і грызе чырвона-зялёны сцяжок. Яшчэ малы, але ўжо нішчыць сімвал хлусні. Тут не лозунг, а вобраз, які працуе мацней за крыкі.

Паэзія мусіць разбураць маўчанне. Ёй не абавязкова быць палітычнай, каб стаць небяспечнай. Дастаткова сумленнасці.

*– А проза, напрыклад, вашая «Пералёт-трава»: ці адчуваеце розніцу ў сабе паміж паэтам і празаікам?*

– Пісаў кароткія апавяданні яшчэ ў дзевяностых, але не друкаваў. Потым назбіралася… Згаданая кніжка – выключэнне. Як бы пратэст супраць шаблону ўнутры сябе. Бо нават у прозе я пішу паэтычна: з метафарай, дыханнем, пачуццём.

Але не магу адмовіцца ад паэзіі. Кажуць, яна – справа маладосці. Няпраўда. Адчуваю, што цяпер пішу мацней і глыбей, чым калісьці.

## Пакінуць у сабе толькі мёд не магу. Бо чалавек без кіслаты – як верш без рытму

*– Пра вас кажуць: «Кактэйль з кіслаты, вострасці і мёду». Ці бывае, што радок даводзіцца выкрэсліваць не дзеля эстэтыкі, а дзеля этыкі?*

– Вельмі часта. Я чалавек эмацыйны, халерык. Пішу ў парыве, а потым бачу: трэба нешта прыбраць. Не таму, што слаба, наадварот – занадта моцна.

І тады пачынаю падбіраць сябе пад грамадства, цэнзураваць. І ўрэшце шкадую, што не даў сабе быць сабой жа. Так здараецца і ў інтымных вершах, і ў тых, якія пра боль і жах, пра ўласныя правалы. Але з часам вяртаюся: перапісваю, мімікрую, пакідаю галоўнае.

*– А як наконт мёду з кіслатой у характары?*

– Іранізуюць, напэўна, па справе. Добразычлівы, спагадлівы, але ўнутры ёсць смешачкі, сарказм, нават боль. Не магу іх сепарыраваць, пакінуць толькі салодкае ў сабе: ненатуральна. Чалавек без кіслаты або пярчынкі – нібы верш без рытму.

*– А калі з паэзіі – у савецкую журналістыку: што яна адрэдагавала ў творчай натуры?*

– Савецкая прэса – калідор. Ідзі прама, і ўсё будзе добра, толькі не зварочвай управа ці ўлева. У «Гомельскай праўдзе» пісаў эмацыйна, публіцыстычна – не па канонах. Рэдактары ламалі: вучылі пісаць «правільна». Але я шукаў сваю праўду. Напісаў цыкл пра хлопцаў, што загінулі ў Афганістане: сустрэчы з бацькамі, фота, гісторыі. Па-мойму, атрымалася пранізліва, па чалавечы. Але палову выкінулі. Гэта ніякая не журналістыка, а стрымліванне.

*– Афганскія тэмы ў вас, як і ў Алексіевіч, былі пра боль, а не подзвіг?*

– У рэдакцыі хацелі зляпіць з хлопцаў прыгожыя легенды, а я – расказаць пра людзей. З прапагандай нестыкоўка. Дык чырвонае святло.

*– І што дапамагло пераключыць той святлафор на зялёнае?*

– Знаёмства ў Гомелі з Барысам Пятровічам, які працаваў у абласной газеце, а неўзабаве стане адным з кіраўнікоў рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі. Я пачаў рабіць макеты, падбіраць матэрыялы і адначасова весці літаратурную старонку. Вось мая аддушына.

*– Затым праваабарончая журналістыка. Дыстанцыя ад «абмінаць праўду» да «не нашкодзіць праўдай» уразіла?*

– Дзве супрацьлегласці. Сутыкнуўся з абсалютна новым, асобным жанрам. Ён лёг мне на душу і пяро: неўзабаве стаў чытаць лекцыі ў Беларусі і Польшчы, тлумачыў маладым журналістам базавыя прынцыпы. І першы – менавіта «не нашкодзь». Калі факт дакладны, але яго публікацыя можа разбурыць чыёсьці жыццё, не трэба пісаць.

*– Тая сітуацыя, калі самацэнзура не слабасць, а прафесійная норма?*

– І частка грамадзянскай этыкі. Без яе прафесія ператвараецца ў паляванне. А ў Беларусі ніколі не вучылі асновам правоў чалавека – ні ў школах, ні ва ўніверсітэтах. Таму шмат хто і піша без разумення наступстваў.

*– Таму нават стваралі спецыяльную школу для журналістаў?*

– Запусцілі спецыяльны праект для студэнтаў журфака БДУ. Быў сайт, вучылі пісаць пра грамадзянскія тэмы, пра свабоду, годнасць і правы чалавека. Сярод тых маладзёнаў, між іншым, вырас і Франак Вячорка. Мы збіраліся штотыдзень, абмяркоўвалі матэрыялы, асвойвалі навыкі праверкі фактаў. Інакш кажучы – навучанне адказнасці.

*– Праца ў «Вясне» – фактычна пастаянная прысутнасць у чужым болю. Як вытрымліваеце?*

– Вось ужо васямнаццаць гадоў у вядучай праваабарончай арганізацыі. Зараз пішам ананімна, што таксама не лёгка прыняць. Мне прасцей: ніколі не гнаўся за імем. Былі прапановы пісаць пад сваім прозвішчам – адмаўляўся. Гэта не пра славу, а пра тое, каб слова працавала. Для мяне галоўная ўзнагарода, калі матэрыял перадрукаваны «Свабодай», «Нашай Нівай», «Народнай Воляй», іншымі рэдакцыямі.

*– Цяпер, калі ёсць інтэрнэт і асабістыя сайты, кожны можа быць сабе рэдактарам. Што для вас уласная старонка – самвыд ці архіў?*

– Скарбонка. Каб не згубіць тое, што створана. Сёння паток інфармацыі шалёны, усё размываецца. Я збіраю ў адным месцы свае тэксты, каб яны не зніклі. Тут не «прасоўванне», не медыйнасць, а памяць.

Я ўжо страчваў усё. У 2021 годзе, калі падчас вобшуку забралі тэхніку, перастрахаваўся: выдаліў Google-акаўнт без магчымасці аднаўлення. Знікла кніга «Таямніцы беларускага лесу». 400 старонак, пісалася пяць гадоў. Потым жонка выпадкова знайшла флэшку з кавалкамі: шчасце незямное! Таму цяпер усё збіраю нанова.

## Бяляцкі мысліў не эмоцыямі рэвалюцыі, не жаданнем рэваншу, а рацыянальна раскладаў будучыню

*– У свой час Алесь Бяляцкі пісаў пра вас, цяпер вы рыхтуеце кнігу пра яго. Маральны доўг – ці працяг сяброўства?*

– Без Алеся я не быў бы тым, кім стаў. Нас пазнаёміў гомельскі ўніверсітэт, затым два гады ў салдацкіх ботах атрымліваў ад яго з Мінска паветра свабоды. Ён заўсёды быў першым

рэцэнзентам, вельмі шчырым і бескампрамісным: «Гэта дрэнь, а вось тое добра». Фармаваў мяне і як паэта, і як чалавека. Хіба магу не вярнуць доўг? Кніга – мой спосаб сказаць яму дзякуй. Яна пра тое, як сталела нашае пакаленне.

Дарэчы, Бяляцкі шмат зрабіў для беларускай культуры ў цэлым. Яго манаграфія «Літаратура і нацыя» – адна з найглыбейшых у краіне. Гэта яго сапраўдны маніфест: як бачыць Беларусь праз культуру і гісторыю.

*– Сёння Алесь зняволены, у Горках, вы ў Вільні, мы ўсе – раскіданы па цэлым свеце. Ці адэкватна ацаніла гэты подзвіг расцярушаная, але ж нацыя, дзеля якой ён пайшоў на асэнсаваную пасадку?*

– Алесь глабальны чалавек, аднак гэта, баюся, разумеюць далёка не ўсе. Большасць нават не ўяўляе маштабу асобы. Яго дзейнасць не абмяжоўвалася межамі Беларусі – ён быў чалавекам міжнароднай адвакацыі, голасам краіны ў свеце. Праз яго гучала Беларусь. І тое, што ён цяпер у няволі, вялікая страта не толькі для нас, але і для глабальнай супольнасці.

Алесь шырэйшы, чым праваабаронца або апанент рэжыму. Ён чалавек-гарызонт, асоба планетарнага маштабу.

*– Вы маеце на ўвазе і міжнародныя місіі?*

– Ён умеў выходзіць за межы краіны і пры гэтым не губляць яе са зроку. Падтрымліваў іншых, ратаваў чужыя жыцці. Успамінаю, як у Чачні былі на судзе над абвінавачаным па надуманай справе праваабаронцам Тытыевым. Паліцыя дазваляла Алесю падыходзіць і размаўляць нават з падсуднымі – настолькі ўсюды разумелі, хто ён. Нават чачэнскія сілавікі не адважваліся перапыняць яго слова. Нешта неймавернае: павага, якая не патрабуе тлумачэння. Нават сярод тых, хто прывык выключна загадваць і біць.

*– І тым не менш, апошніх словаў Алеся ў судзе многія не зразумелі. Бо гаварыў не пра помсту, а паразуменне. А гэта нібы не ўпісвалася ў рэвалюцыйны настрой.*

– Мысліў не эмоцыямі моманту, не жаданнем рэваншу, а рацыянальным аналізам будучыні. Хацеў не апраўдаць, не замірыцца, а – зберагчы. Ён разумеў, што новы цыкл рэпрэсій можа быць яшчэ страшнейшы. Алесь казаў не з гуманістычных, а з праваабарончых пазіцый: абараняў усю нацыю. Ведаў, што трэба прайсці гэты перыяд з максімальнай годнасцю і мінімумам ахвяр. Вельмі цяжкі пасыл, бо ўразрэз з палітычнымі інстынктамі «змагацца да канца».

*– Гэта прадчуванне – ці аналіз, роздум, халодны разлік?*

– Апошняе. Нейкі час хаваўся ў Лоеве, яго выклікалі ў Мінск, правяралі, сачылі. І ўсё ж заставаўся спакойным. Сказаў мне напаследак: «Нічога не бойся». Гэта былі яго словы, якія я запомніў на ўсё жыццё. «Нічога не бойцеся» – галоўны яго пасыл і грамадству, і кожнаму з нас.

*– Вы часта згадваеце побач з Алесем Бяляцкім яшчэ адну постаць – паэта, свайго земляка Анатоля Сыса. І ў вас ёсць твор пра яго. Кніга-прысвячэнне?*

– Тая асаблівая форма не прэтэндуе на аб'ектыўнасць – дыхае асабістым. Гэта не сухая манаграфія, як у Андрэя Мельнікава, якая, скажам шчыра, не атрымалася. Я згадваў чалавека, які быў не толькі паэтам, але і жывой стыхіяй. Хоць шмат пісаў пра яго ў розныя часы, але кожны раз адчуваю: не ўсё выказаў.

*– Пра яго гавораць як пра геніяльнага, але разбуранага чалавека. Спірт у крыві і ў жыцці?*

– Універсітэцкія гады – зусім іншы Сыс. Не піў, мог гадзінамі гаварыць пра літаратуру. Мы ў бар, ён: «Дурні, бярыце лепш кнігу!» Потым войска, праца ў веткаўскай раёнцы – усё строга, дысцыплінавана. Але калі пераехаў у Мінск і пасябраваў са славай, нешта ў ім пераламалася.

Анатоль не змог перасягнуць самога сябе, застаўся ў палоне ўласнага міфа. І ўсё ж ён быў вельмі сціплы і чалавечны. Калі прыязджаў у нашую вёску, казаў пра маю матулю: «Мая другая

мама». Заўсёды заставаўся хатнім, нягледзячы на легенду вакол сябе.

*– Калі вы сёння азіраецеся на сваё пакаленне – хлопцаў і дзяўчат, што ішлі побач, на іх шлях і справы, кім бачацца з цяперашняй оптыкі? Ідэалістамі – ці палітычнымі рэалістамі?*

– Людзі былі розныя, але большасць – ідэалісты. Якія верылі ў сілу культуры, у магію дзеяння без улады. Але ўсе пры справе, а не збоку: нехта пісаў, хтосьці проста падвозіў дошкі, каб аднавіць храм. Ганарымся: першая «Талака» з'явілася не ў Мінску, а ў Гомелі. Наш горад стаў той глебай, дзе ўсё пачалося. Да старту спрычынілася шмат і вядомых зараз людзей, і тых, каго мала хто згадвае. Сяргей Дубавец, Таццяна Сапач, мае ранейшыя гомельскія сябрукі і сяброўкі – яны ўсе былі побач.

*– Савецкія завядзёнкі яшчэ тармазілі – ці старыя калодкі ўжо пачыналі дыміцца?*

– Гарбачоўская адліга: машыну пачало несці. Талакой прыбіралі занядбаныя цэрквы, аднаўлялі помнікі. Не з дазволу, не па загаду: проста хацелі прывесці ў парадак тое, што развальвалася. У Валатаве альпіністы лазілі па сценах старога храма і нішчылі фрэскі, а мы прыйшлі і зрабілі прыборку. Усталявалі шыльду. Займаліся канкрэтыкай. Нічога гучнага, ніякай палітыкі – проста патрэба дыхаць мовай, быць людзьмі сваёй зямлі.

Мы сустракаліся амаль кожнага дня. «З працы забягу на агеньчык, вып'ем кавы, пагаворым, паплануем, што далей». Так ішло жыццё. Наіўныя, маладыя, з галавой у небе. Дубавец казаў: «Кіну працу, буду жыць творчасцю». І сапраўды кінуў. Праіснаваў так тры месяцы, пакуль пустая кухня не нагадала, што няма чым карміць сям'ю. Але ўсё адно гэта пакаленне, якое хацела быць чыстым.

*– Пасталелі, аднак з будзённасцю размінуліся. Наадварот, сталі асновай грамадзянскай супольнасці, якой Беларусь цяпер трымаецца.*

– Абсалютна дакладна: звычайныя маладзёны выраслі ў асобаў і далі штуршок усёй маладой краіне. Іх ідэі дапамаглі адрадзіцца іншым. Мы былі адзінкамі, цяпер іх сотні. Памятаю, як збіраліся ў Кушлянах, у доме Багушэвіча. Усе з розных гарадоў, але ўжо як каманда. Камандныя каманды, камандныя словы: «крокам руш», «шыхтуйся». Гэта было не проста свята, а школа патрыятызму. Там мы вучыліся быць беларусамі не па дэкрэце, а па крыві, па пачуцці.

## Сёння свой дом будуеш з сяброўства, памяці і надзеі. Збіраеш, як з канструктара

*– Маеце кнігу паэзіі «DOM». Што ён сёння для вас: месца, мова ці людзі?*

– Дом – дзе ўтульна і не страшна. Месца, дзе побач сябры і можна дыхаць вольна. Сутнасць у гэтым, хоць у розных мовах тое слова мае розныя сэнсы: ад турмы да падарунка. І ўсё праўда! Калі няма фізічнага дома – будуеш яго з таго, што маеш: з сяброўства, з памяці, з надзеі. Збіраеш, як з канструктара. І атрымліваецца тваё месца, нават калі яно ўвесь час рухаецца разам з табой.

*– Украіна: Львоў, Чарнігаў, Жытомір, Херсон – гарады, куды вас кідала і ў якіх вы выступалі. Чым былі для вас гэтыя ўрокі міру, вайны і волі?*

– Украіна адкрыла мне іншае дыханне. Я там убачыў свабодных людзей – без рамак, страху і прымусу. Творчасць, слова, жыццё – усё натуральнае, лёгкае. Я ж пасля Расіі трапіў у гэтае святло, і мне здавалася, што ад вольнасці можна ап’янець. У РФ хаваўся: без пашпарта, пад наглядам, пісаў ноччу, як падпольны аўтар. Вершы цёмныя, цяжкія, поўныя роспачы. А ва Украіне –

усё інакш. Неба і зямля. Там пісаць хацелася. І не толькі пра сябе, а пра радзіму, яе культуру і дух.

У Львове я меў трохгадзінны выступ. Людзі слухалі не столькі вершы, колькі Беларусь. Іх цікавіла, хто мы, што з намі. Яны разумелі: паэзія можа быць формай сведчання. Аднак многіх з тых, хто сядзеў у першым шэрагу, ужо няма – маладыя і таленавітыя, яны загінулі на вайне. Дастаю з памяці іх твары і разумею: найлепшыя сыходзяць за свабоду. Гэта для мяне ўрок. Трэба аддаваць сябе цяпер – Беларусі, людзям, жыццю.

*– І ўсё ж украінцы часта іранізуюць: ваш 2020-ы – бяскрыўдная сцэна: шарыкі, лавачкі, кветачкі… Як адбіваліся ад стэрэатыпнай лухты?*

– Кожны народ праходзіць сваю дарогу да свабоды. Мы розныя ў спосабах супраціву. Але аднолькавыя ў сваёй чалавечай годнасці. А пасміхаюцца і нават балюча колюць, бо проста не ў курсе. Не разумеюць гісторыі сваіх суседзяў, што і як было, не ведаюць нашай цаны. Але гэта – зусім не агульны падыход. Стаўленне інтэлігенцыі, культурніцкіх людзей ва Украіне да Беларусі вельмі добрае. Жывучы ў Чарнігаве, я не раз чуў: «Наш беларус ідзе». Не «іхні», не «той з Беларусі», а – наш. Вельмі кранальна.

*– Жыццё ва Украіне яшчэ да вайны для камунікатыўнага чалавека азначае пашырэнне сяброўскага кола. Цяпер тыя цёплыя стасункі падтрымліваюцца?*

– Тады шмат удзельнічаў у фестывалях, выступаў у Жытоміры і Луцку, Львоў ведаў мяне як свайго. Гэта давала адчуванне дому.

А цяпер, калі так любяць дзяліцца на «нашых» і «ворагаў», атрымаў дзіўны досвед. Перакладаў вершы пяці луцкіх паэтаў, з якімі сябраваў шмат гадоў. Хацеў надрукаваць у беларускім часопісе. Звярнуўся да старшыні абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў: «Дайце, калі ласка, кароткія біяграфіі і фотаздымкі аўтараў». Адказвае: «Вось гэты

дазволіць, а яна – ні за якія грошы… Да тых не падступай – яны на вас крыўдзяцца».

*– І што рабіць, калі вакол столькі крыўды, а справа патрабуе даверу?*

– Давялося зняць з сябе карону. Звярнуцца ўсё ж да кожнага і пагаварыць асабіста. Бо ведаюць як чалавека. І ўсё роўна некаторыя адмовілі: «Цябе паважаем, але не хочам, каб нашыя вершы друкаваліся па-беларуску. Вы цяпер ворагі».

Гэта балюча. Але я не крыўдую, а жыву з гэтым. І яны, і мы – людзі, што прайшлі праз боль і яшчэ шукаем свой дом.

*– Што засталося галоўным пасля ўсіх гэтых маршрутаў і выпрабаванняў?*

– Жылі, жывём і будзем жыць. Працавалі і будзем працаваць. Годнымі як былі, так і застанёмся. Беларусы маюць вялікую гісторыю – і не страцім яе. Гляджу ў Вільні на дзяцей, што вучацца ў літоўскіх школах, але па-беларуску спяваюць, ладзяць імпрэзы, збіраюцца разам. Яны не бачылі разгонаў, не сядзелі ў турмах, але ў іх унутры – Беларусь. Гэта парасткі. Маладыя, жывучыя, нязломныя. Веру, што яны дачакаюцца свайго часу. І стараюся рабіць усё, каб гэта здарылася хутчэй. Бо інакш навошта ўсё астатняе?

# ВІКТАР МАРЧУК



Фота з асабістага архіва В. Марчука

*Нарадзіўся 3 красавіка 1959 года ў Брэсце.*

*У 1980 годзе скончыў факультэт архітэктуры Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута.*

*Адразу пасля вучобы служыў у савецкім войску.*

*Працаваў архітэктарам у праектных арганізацыях Брэста да 1997 года. Прайшоў прафесійны шлях да пасады галоўнага архітэктара праектаў.*

*З 1998 года пачалася кар’ера ў журналістыцы: супрацоўнічаў з газетай «Брестский курьер», у 2002 годзе стаў ініцыятарам заснавання незалежнага выдання «Брестская газета». З таго моманту і дагэтуль – галоўны рэдактар.*

*Папяровая версія «БГ» выходзіла з 18 лістапада 2002-га да 30 снежня 2020 года. Улады Беларусі забаранілі ўсім друкарням краіны прымаць штотыднёвік у друк з 1 студзеня 2021 года.*

*За гэты час «Брестская газета» стала адным з самых папулярных выданняў рэгіёна. У 2018 годзе на конкурсе Асацыяцыі выдаўцоў рэгіянальнай прэсы «Аб’яднаныя Масмедыі» была прызнана найлепшым рэгіянальным выданнем года.*

*У 2021 годзе рэдакцыя працягнула працу ў інтэрнэце, вядзе сайт і сацыяльныя сеткі.*

*8 ліпеня 2021 года офіс рэдакцыі быў разгромлены КДБ. Канфіскавалі літаральна ўсё.*

*13 ліпеня Віктар Марчук выехаў з Беларусі ў Грузію, а ў жніўні – у Польшчу. Там у лістападзе зарэгістраваў фонд BGWT Partner Group, стаў яго заснавальнікам і кіраўніком. Каманда з сямі асноўных супрацоўнікаў працуе пад брэндам BGmedia.*

*Усе інфармацыйныя каналы BGmedia (сайт і 10 акаўнтаў у сацыяльных сетках) абвешчаны «экстрэмісцкімі». Аднак аўдыторыя BGmedia працягвае расці, з 47 372 (на 31 снежня 2021 года) – да 775 000 падпісчыкаў (на 1 верасня 2025 года). Сярэднямесячная колькасць праглядаў матэрыялаў на ўсіх платформах дасягае 47 мільёнаў.*

*У Беларусі супраць Віктара Марчука заведзена крымінальная справа.*

*Мае дваіх дзяцей і чацвярых унукаў. Працягвае інтэнсіўна працаваць.*

ВІКТАР МАРЧУК

# ЛІЧБА МОЖА ЗАМЯНІЦЬ ПАПЕРЫ, АЛЕ ДАВЕР НЕ ЗАМЕНІЦЬ НІШТО

## Пайду па Дзяржынскага, звярну на Леніна, а там і Камуністычная

*– Вы архітэктар не толькі паводле адукацыі. Сямнаццаць гадоў у прафесіі. Ці было дойлідства ў савецкім Брэсце адлюстраваннем ідэалогіі? Або горад проста будаваўся «з бетону і цэглы»?*

– Без ідэалогіі ў Савецкім Саюзе нічога не будавалася. Усё мела гэты падтэкст.

*– Але як гэта выглядала? Людзі ішлі па вуліцах, бачылі назвы: Леніна, Камуністычная, Дзяржынскага, Калініна, Горкага... Аднак і самі будынкі, іх планіроўка – таксама праекцыя савецкасці?*

– І так, і гэтак: не ўсё проста ды прамалінейна. З аднаго боку – тыя самыя назвы і сімвалы, чужыя для гараджан. А з іншага – горад ратавала любоў, патрыятызм праектавальнікаў. Бо Брэст меў уласную архітэктурную школу на базе інжынерна-будаўнічага інстытута. Мы ганарыліся сваім факультэтам. Некаторыя працы яго выпускнікоў траплялі нават у часопіс «Архитектура СССР». Брэст мог пахваліцца, напрыклад, аэрапортам, які атрымаў саюзную прэмію, лёгкаатлетычным манежам... Нашы карыфеі: Валер Кіскевіч, Мікалай Пушкоў ды некаторыя іншыя – перамагалі на міжнародных конкурсах. Скажам, у Японіі. Пагадзіцеся, для правінцыі гэта вялікі поспех.

*– Але ўсё ж: горад у цэлым выклікаў захапленне – ці здаваўся шэрым, пастаўленым на паток?*

– Жыллё ў асноўным было аніякім: панэльныя дамы, цэгла, стандартныя схемы. Але для мяне як для чалавека, што тут нарадзіўся і вырас, Брэст ніколі не быў нецікавым, безаблічным. Я ўлюбёны ў яго. Але прафесійна – так, архітэктура несла ў сабе адбітак савецкага часу. Куды там скакаць угару, калі ты абмежаваны матэрыяламі і тэхналогіямі. Трэба было з цэглы і панэляў зрабіць нешта функцыйнае і хаця б крыху прыгожае.

*– А параўноўвалі тады Брэст з суседнімі польскімі гарадамі, якія праз рэчку ды пушчу?*

– Зараз цяжка нават паверыць, але ў савецкія часы я толькі аднойчы быў у Тэрэспалі і Бялай Падлясцы. І адрозненняў асабліва не бачыў, Брэст не саступаў. Але за апошнія трыццаць гадоў Польшча зрабіла проста гіганцкі крок наперад. Калі параўнаць сённяшнюю Варшаву і Брэст, нават Мінск – гэта ўжо адчувальная розніца нават не для спецыяліста, а шарагоўца.

*– Хоць цяпер пачалі выпраўляць сітуацыю з матэрыяламі і базай, ёсць свая школа... У чым тады закавыка?*

– У сістэме, пабудаванай на творчых засцярогах, абмежаваннях ініцыятыўнасці, усёабдымным дзяржаўным кантролі. Хоць там, дзе ёсць прыватныя забудоўшчыкі, заўсёды з'яўляюцца больш смелыя і арыгінальныя праекты. Але ў цэлым і сёння шмат новабудоўляў мала чым адрозніваюцца ад савецкіх дамоў. Так, з'явіліся шкляныя офісы, але ў Варшаве імі ўжо даўно шыкоўна застаўлены цэнтр.

*– А ці хацелася тады, у канцы васьмідзясятых, рабіць нешта сапраўды прарыўное?*

– Канечне. Але сістэма ціснула. Існаваў пэўны савецкі канон. Многія праекты адхілялі як занадта дарагія ці невыканальныя. Таму я і памяняў прафесію: зразумеў, што магчымасцяў мала, а жыццё кіпіць, у горадзе пачынаюцца перамены. Многія мае калегі таксама пакінулі дзяржаўныя арганізацыі і стварылі прыватныя майстэрні. Усе жылі надзеяй, што абмежаванні савецкай сістэмы хутка знікнуць – і мы зможам будаваць тое, што лічым патрэбным.

*– Пагаворым пра Брэст шырэй: ён жа вядомы і мемарыяламі, манументамі, перабудовай цэнтра. Тут таксама ідэалогія адыгрывала галоўную ролю?*

– Безумоўна. Пешаходная вуліца Савецкая сёння амаль на сто працэнтаў новая. Старая забудова знішчалася, зносілі дамы, нават вельмі даўнія і каларытныя помнікі.

Была гісторыя з адным прыватызаваным будынкам у цэнтры, дзе жыў прынцыповы берасцеец, які адмовіўся высяляцца.

Нікога не забаяўся: мой дом – мая крэпасць! Судзіліся, улады абяцалі захаваць аўтэнтычныя сцены. У выніку дом разбурылі, на яго месцы паставілі новы гатэль. Абяцанне аднавіць знесенае ніхто і не збіраўся выконваць. Так руйнавалася ўся Савецкая. Гісторыя падмянялася ідэалагічным навабудам. Развальвалі векавую памяць дзеля таннай прыгажосці, падробкі.

*– А як жа закон, статус гісторыка-архітэктурных каштоўнасцяў?*

– Права? Рацыя ў таго, хто кантралюе Феміду… Ахоўныя граматы з боку дзяржавы нічога не значылі – усё знішчалася і замянялася навабудоўлямі. Але што цікава: расіяне, якія прыязджаюць у Брэст, уражваюцца гэтай новай карцінкай. Вось такая вось гісторыя.

*– Што наконт славутага помніка да тысячагоддзя Брэста: калоны з барэльефамі, статуямі, анёлам на вяршыні? Ідэя нібыта прыгожая, але вынік…*

– Тады гарвыканкамам кіраваў Аляксандр Палышэнкаў. Ён вельмі хацеў пакінуць свой след у гісторыі. І наслядзіў: яшчэ за дзесяць гадоў да святкавання юбілею пачалі ўзводзіць манумент. Тут паўтарылася сітуацыя, падобная да сённяшніх дыскусій пра тое, каго ўвекавечваць у беларускім пантэоне, а каго адхіляць. Умоўна кажучы, Чаргінца замест Быкава. У выніку некаторых яркіх, выбітных постацяў-прэтэндэнтаў, якія маглі быць так ці інакш упісанымі ў помнік, проста выкраслілі. З нейкіх ідэалагічных меркаванняў. Дакладна ведаю: патэнцыйных фігур першапачаткова было больш, чым у выніковым варыянце. Калі не памыляюся, не прайшлі гэты адбор як мінімум двое: святар Афанасій і вялікі князь літоўскі і кароль польскі Ягайла, які дараваў гораду Магдэбургскае права. У выніку: Вітаўт ёсць, Ягайлы няма. Якія яшчэ годныя гістарычныя фігуры абмяркоўваліся, зараз дакладна не магу прыгадаць.

*– І сам манумент атрымаўся спрэчным.*

– Вышыню падлічылі адносна навакольных будынкаў – і гэта было правільна: ён не душыць прастору. Але памылак дапусцілі процьму. Спяшаліся. Праект помніка ўзгаднялі і пераўзгаднялі многа разоў. Хацелі паспець да Дня горада, 28 ліпеня 2009 года. У выніку на дванаццаці барэльефах з тэкстам на беларускай мове зрабілі больш за 70 памылак. Літара «ў» была проста праігнараваная. Мы ў газеце пісалі пра гэта. Дайшло да таго, што прозвішча таго ж Палышэнкава набілі ў сакрэтным месцы з памылкай. Як тады жартавалі – з «ашыпкай». Ён хацеў славы – і атрымаў такім вось камічным чынам. Адкрыццё выглядала даволі кур’ёзна. Памылкі выпраўлялі некалькі месяцаў пасля гэтай гучнай урачыстасці.

## Пэўны досвед быў. Але галоўнае – адсутнічаў страх

*– І вось у нейкі момант вы пакінулі прафесію архітэктара – пайшлі ў журналістыку. Сямнаццаць гадоў узводзілі дамы – а потым сталі будаваць старонкі, тэксты. Што прымусіла зрабіць гэты крок? Расчараванне ў прафесіі? Ці разуменне, што краіне патрэбны ўжо іншы будаўнічы матэрыял, інфармацыйны?*

– Не, у прафесіі я не расчараваўся. Быў маладым, поўным энергіі. Але савецкая шэрасць і застой мяне прыціскалі. Хацелася дыхаць вальней, рабіць тое, што сам лічу патрэбным. Я пакінуў архітэктуру, нейкі час займаўся дробным бізнесам. А потым зразумеў: маю свае думкі, ёсць сваё бачанне – значыць, трэба выказвацца, інакш які ты свабодны чалавек? Тады ў Брэсце ўжо з’явіўся «Брестский курьер», незалежная газета. І ў ёй удала зазямліўся мой даўні калега з «Жылпраекту» Міхаіл Янчук – меў раз на тыдзень аўтарскую калонку. Мяне захапіў гэты досвед. Паспрабаваў пайсці той самай сцежкай – і атрымалася

з першага разу. Так у мяне і пачалося новае жыццё. Думаў, што на пэўны час, але памыліўся, пра што, аднак, не шкадую.

*– Чым прывабіла журналістыка?*

– Яна мне падалася вельмі блізкай да архітэктуры. Тут таксама ёсць творчы элемент, але разам з ім – патрэба ў структуры, у выразнай логіцы. Тэкст як будынак: у ім мусяць быць падмурак, канструкцыя, форма. Таму пераход не быў для мяне ломкай. Наадварот, адчуў сябе на сваім месцы.

*– Але пакінулі «Курьер». Чаму? Канфлікт канцэпцый, расчараванне ў калектыве ці амбітная патрэба стварыць нешта сваё?*

– Вось тут ужо было расчараванне. Калектыў таленавіты, патэнцыял вялікі. Я пісаў, займаўся вёрсткай – паспрабаваў сябе нават некаторы час у ролі адказнага сакратара. Але арганізацыя працы абсалютна не задавальняла. Кладу на стол рэдактару пэўныя рэформы – нуль падтрымкі. Прападаў запал.. Тады і з'явілася думка заняцца ўласным праектам. Дзе сам сабе і камандзір, і начальнік штаба…

*– А яшчэ сам пішу, сам здымаю, праўлю… Брэст не Мінск, дзе шмат выпускнікоў журфака. Дзе браліся людзей, знаходзіліся рэсурсы?*

– Дый у Брэсце былі свае сілы. Тыя ж пазаштатныя аўтары, што друкаваліся ў «Курьеры», моладзь, якая ўжо спрабавала пяро і станавілася на крыло. Да таго ж, у пачатку 2000-х на базе педінстытута адкрылі журфак – кадры з'яўляліся. Што да арганізатарскіх здольнасцяў, то ў свой час я быў старшынём прафкама ў «Жылпраекце», дзе на той час больш за сотню супрацоўнікаў. Пэўны досвед меў. Але галоўнае – адсутнічаў страх.

*– Тады ў Брэсце і так існавала моцная канкурэнцыя: «Заря», «Курьер», «Вечерний Брест», яшчэ некалькі газет. Са шчыльнасцю на тысячу чытачоў ці не большай, чым у сталіцы. У рэдакцыях цэлая плеяда вядомых журналістаў. Не спыняла гэта імпэт? Адчувалі падтрымку ад зорак?*

– Дапамогі не чакаў. Ды і асноўная перашкода нават не ў тым, каб сабраць людзей, а ў рэгістрацыі газеты. Для гэтага трэба было атрымаць дазвол мясцовых уладаў. А чыноўнікі адказвалі: «Чытва ў нас і так хапае, навошта яшчэ нешта»? Гэта амаль непераадольная перашкода. І тым больш дзіўна, што нам урэшце ўдалося яе прайсці.

*– Стасункі паміж выданнямі брэсцкай дзяржаўнай газетнай імперыі былі таксама «імперыялістычныя»? Галоўнае, захапіць як мага больш чытачоў і рэкламадаўцаў?*

– На той час інфармацыйная манаполія дзяржавы ўжо згубіла сваю стэрыльнасць: з’явіўся цалкам прыватны «Курьер», «Вечёрка», толькі на нейкую частку дзяржаўная. Аднак і ад іх падтрымкі не было і быць не магло. Увогуле, у медыйным бізнесе адбывалася тое ж, што і ў архітэктуры: многія галоўныя рэдактары выйшлі з дзяржаўных выданняў, адтуль, з той самай «Зари». Але ўсе адчувалі: часы мяняюцца, з’яўляецца больш свабоды, больш магчымасцяў для самарэалізацыі. І я быў у гэтым руху не адзінокі, проста, можа, трошкі спазніўся.

Каб дагнаць, давялося самому вывучаць Закон аб друку, самому пісаць статут і ўсе дакументы. Патрэбныя грошы – знайшліся сузаснавальнікі. А яшчэ шчасліва склалася, што ўдалося атрымаць важную афіцыйную паперу: «Брестский горисполком не возражает…» Гэта была ключавая даведка. І ўжо з ёй я паехаў у Мінск, у Міністэрства інфармацыі. Па шчырасці, шанцы ацэньваў як пяцьдзясят на пяцьдзясят. Але – зарэгістравалі! І гэта, дарэчы, першая за шмат апошніх гадоў рэгістрацыя грамадска-палітычнага незалежнага выдання.

*– Сапраўднае свята.*

– Так. Калі я вярнуўся ў Брэст са сведчаннем, у гарвыканкаме былі вялікія вочы: ніхто не чакаў. А мы пачалі выпуск.

*– Першы нумар выйшаў 18 лістапада 2002 года. Памятаеце, як яго ўспрынялі?*

– Канкурэнцыя была шалёная: у «Вечёркі» – 40 тысяч накладу, у «Курьера» – 17, у «Зари» – пад 30. А мы выйшлі з нейкімі там дзвюма тысячамі...

Нас ставілі на дапатопны станок: ён не мог збрашураваць нават 12 няшчасных старонак. Я сам гадзінамі сядзеў у друкарні, потым вёз усё ў рэдакцыю, дзе мы складалі газету рукамі. І рабочыя толькі круцілі пальцам ля скроні: «За два-тры месяцы грошы прафукаеце, а далей разбяжыцеся – песеньцы канец». Алемы вытрымалі.

*– Значыць, была нейкая канцэптуальная ідэя, што адрознівала «Брестскую газету» ад астатніх?*

– Канцэпт просты: пісаць праўдзіва і востра. Па падзеях, так, як яны складваюцца. Астатнія выданні мелі даволі гнуткія хрыбетнікі, традыцыйна шукалі, куды і адкуль вецер дуе. Мы ж рабілі стаўку на сумленнасць.

*– І як атрымалася арганізаваць працу?*

– Калектыў невялікі: чалавек пяць у штаце і некалькі пазаштатнікаў. Усяго два камп’ютары: адзін для вёрсткі, другі для набору тэкстаў. Першы офіс быў у гатэлі. Газету я сам развозіў па горадзе.

*– Але ў Брэсце існавала моцная сетка распаўсюднікаў. Яна выручала?*

– Так, і гэта вялікі плюс: тады прэсай гандлявалі больш за 50 прыватных распаўсюднікаў. У прынцыпе, рэальна камерцыйная сістэма. Некаторыя прадавалі па 400-500 асобнікаў і добра ў выніку зараблялі. Як у тым кіно, яны выкрыквалі загалоўкі з першых палос на скрыжаваннях. Напрыклад, бульвара Шаўчэнкі і Машэрава. Калі затрымліваўся паток аўтамабіляў, бегалі паміж машынамі, і людзі куплялі проста праз акно. Гэта быў жывы рынак. У іншых гарадах яго бракавала. А мы ім жылі.

*– Плаціць за новую, невядомую газету пакупнікі не дужа хацелі?*

– Гэта праўда. Па «Вечёрку» і «Курьер» распаўсюднікі самі прыходзілі ў друкарню. Па нашую – не. Даводзілася ўпрошваць, каб бралі на рэалізацыю. Не ўсе пагаджаліся. Але паступова «Брестская» ўвайшла ў абарот.

*– Калі распаўсюднік за вечар прадаваў паўтысячы асобнікаў «Вечёркі», а вашай толькі дзясятак, не было крыўдна? Жаба не душыла? Не хацелася кінуць ручку і здацца?*

– Не. Наадварот, гэта матывавала. Думаў: калі яны прадаюць столькі, то і мы зможам. Так, цяжка, напаўзалі хвіліны слабасці, але адганяў дурное. Больш было жадання дабегчы дыстанцыю да канца.

## Гайда на плошчу, карміць галубоў!

*– Гэта сапраўды як у арміі: тры кіламетры – і можаш, не можаш, аднак з усёй ротай наперад! Добра, а што наконт самога духу газеты? Якімі былі атмасфера ў рэдакцыі і ўзаемадзеянне з горадам?*

– Стаўка на смеласць і сумленнасць падымала дух і нараджала бясстрашнасць. Мы браліся за вострыя тэмы, не хаваліся ад непрыемнасцяў. І чытачы гэта адчувалі.

*– Акумулятарны завод: небяспечная вытворчасць, ваш журналісцкі фронт і пункт адліку для брэсцкай грамадзянскай супольнасці – я дакладна фармулюю сутнасць той сітуацыі?*

– Так. «Курьера» ўжо не было, «Вечёрка» абыходзіла тэму, а мы ў яе ўвайшлі. Рэдакцыя стала пляцоўкай для сустрэч ініцыятыўнай групы. У нас адбываліся жывыя лініі, з рэдакцыі прагучала знакамітая фраза Кабанава: «Пайду на плошчу карміць галубоў». З гэтага ўсё пачалося. Спачатку народу на той заклік адгукнулася малавата, міліцыянераў было больш, чым удзельнікаў. Але паступова акцыі выраслі ў масавыя.

*– Тады сабралі каля 40 тысяч подпісаў супраць завода. Для 300-тысячнага Брэста гэта ўражвае. Што больш матывавала: страх перад свінцом – ці адчуванне, што выключылі з прыняцця рашэнняў?*

– Людзі баяліся не рэпрэсій, а за здароўе дзяцей, за чыстую ваду і паветра. Гэта насамрэч была салідарнасць. Прычым вельмі моцная, прасякнутая высокім грамадзянскім духам і чалавечай годнасцю. Лічу, што вайна акумулятарнага стала пралогам 2020 года: супольнасць адчула ўласную сілу. І нарадзіла новых лідараў: яны паўсталі як бы з ніадкуль, але ўжо ўмелі тлумачыць складанае простымі словамі.

*– Завод у выніку пабудавалі. Гэта параза ці ўсё ж нешта іншае?*

– Грамадства не прайграла. Ні ў гісторыі са шкоднай вытворчасцю, ні ў падзеях 2020-га. Мы набылі досвед: аб’яднання, салідарнасці і супольнай барацьбы супраць таго, што людзям непрымальнае. І гэта нікуды не знікне нават пад сённяшнім жудасным ціскам. Яно перажыве чорную паласу, яшчэ скажа сваё слова.

*– Так, улады маюць інструменты, што пераадольваюць грамадзянскі супраціў. Але ж сам факт, што гэта адбылося, што берасцейцы змаглі аб’яднацца і сказаць «не», можна разглядаць як этап станаўлення грамадзянскай супольнасці.*

– Безумоўна. Немагчыма адразу раз! – і перамагчы. Гэта працэс. І сам вопыт ужо стаў каштоўнасцю. Яна не ўзнікае адразу, а расце праз спробы і памылкі.

*– Дазвольце маю версію: уся гісторыя пачалася раней, яшчэ ў 2016-м, калі прадпрымальнікі паўсталі супраць указу № 222, што фактычна паралізаваў іх працу. У Брэсце пратэсты тады былі масавыя, магчыма, нават найбольшыя ў краіне. Гэта звычайны меркантылізм, змаганне выключна за ўласныя інтарэсы? Ці ўжо прыкмета глыбейшага сацыяльнага зруху, росту самасвядомасці?*

– Тут менавіта апошняе. Брэсцкія грамадзяне заўжды былі больш свабодалюбівыя, самастойныя. І ў гэтым сэнсе наш горад вельмі нагадвае Мінск.

*– Выходзіць, пратэсты прадпрымальнікаў і пазней барацьба супраць акумулятарнага завода – часткі аднаго цэлага. Працэсу нараджэння актыўнай грамадзянскай супольнасці. Напэўна, сваю ролю адыграла блізкасць Польшчы? Туды ездзілі, бачылі жыццё па той бок мяжы, думалі: «Чым я горшы?»*

– Фактар мяжы і адпаведных мажлівасцяў вельмі важны. Мы мелі кароткі калідор у Еўропу і разумелі, як імклівa і ў лепшы бок змяняецца суседняя краіна, абганяе нас. Хаця не ўсе аднолькава гэта ўспрымалі. Хтосьці проста гандляваў і задавольваўся тым, што меў. Але большасць усё ж хацела, каб і дома так, як у Польшчы. Таму і брэсцкія, і гродзенскія пратэсты былі такімі актыўнымі.

*– Але апроч еўрапейскага ветру вялікае значэнне мелі і незалежныя медыя. У Брэсце пачатку 2000-х узнікла моцная журналісцкая школа, і менавіта СМІ сталі каталізатарам росту грамадзянскай тэмпературы.*

– Згодны. Незалежныя газеты дапамагалі гараджанам адчуць сябе супольнасцю. Мы заўсёды падтрымлівалі ініцыятывы, што ішлі ад чытачоў. Калі прыходзілі з цікавымі прапановамі, давалі пляцоўку: круглыя сталы, жывыя лініі, стрымы. І таму нас успрымалі часткай грамадзянскага працэсу. Як улады спынілі газету, яшчэ некалькі месяцаў тэлефанавалі і пыталіся: «Калі зноў выйдзеце?» Гэта сведчыла пра давер.

*– Некаторыя лічаць, што рэгіянальная прэса – другі эшалон у параўнанні са сталічнай. Але, можа, якраз рэгіёны мелі больш паветра, свабоды і, адпаведна, больш рызыкі?*

– Таму і сёння бачым: шмат арыштаў, пераследаў менавіта ў Брэсце, у Баранавічах, у Ганцавічах, у Гродне – выразна медыйных гарадах. Людзі ахвотней давяралі сваім,

чым афіцыйным рэспубліканскім выданням. Мы ўзмацнялі аўдыторыю праўдзівай інфармацыяй, а яна нас – сваёй падтрымкай. Не толькі матэрыяльнай. Душу грэла любоў і адданасць гараджан.

## Сабрацца з сіламі, падняцца – і зноў пачаць з нуля да тысяч

*– Нарэшце, пераход праз мяжу. Пасля забароны друку, ператрусаў і канфіскацый тэхнікі вы мусілі пачынаць наноў. Як на руінах паўстала новая рэдакцыя ў выгнанні?*

– Сапраўды, мы двойчы збіралі сябе з нуля: першы раз у 2002-м, другі – у 2021-м. Выехалі без нічога, засталіся толькі сайт і сацсеткі. Але з'явілася падтрымка – і мы змаглі зноў сфармаваць каманду, наладзіць працу. Сёння нават з гордасцю скажу: выйшлі на іншы, значна вышэйшы ўзровень, чым у Беларусі. Бо цяпер у нас шмат пляцовак, не адна. Жыццё прымусіла стаць сучаснымі – мультымедыйнымі і гнуткімі.

*– Ну, пахваліцеся фактамі, лічбамі!*

– Апроч сайта, маем дзесяць акаўнтаў у сацсетках. Сёння агульная аўдыторыя – каля 780 тысяч падпісчыкаў, а штомесяц нас глядзяць ад 30 да 42 мільёнаў чалавек. Пяць гадоў таму пра такія лічбы нават не марылі. Але гэта і ёсць вынік таго, што мы пашырыліся на розныя каналы. Бо сайт, як паказаў досвед, вельмі ўразлівы: яго блакавалі па некалькі разоў на тыдзень, у нас нават адабралі даменнае імя. Давялося ўсё пераносіць на еўрапейскі хостынг і пастаянна вынаходзіць новыя люстэркі.

*– Гэта патрабавала і асабістай, і каманднай перакваліфікацыі. Цяжкавата? Асабліва для ўжо не дваццаціпяцігадовага галоўнага рэдактара. Адкуль бензінчык, каб цягнуць каманду?*

– Глыбока тэхнічнымі дэталямі займаюцца іншыя калегі, у кожнага персанальная зона адказнасці. Але і я асвойваў шмат

чаго нязвыклага. Калі ў дамашнія 55 гадоў навучыўся катацца на роліках, то ў эміgranцкія 62 – мантаваць відэа. А ў 65 – нават відэа са сваім аватарам, сгенераваным штучным інтэлектам. І гэта нармальна: як няма людзей і грошай, мусіш сам вучыцца новаму.

*– Што трымае ў прафесіі?*

– Напэўна, звычка быць у плыні падзей. Мне сапраўды падабаецца гэтая работа: яна не дае заседжвацца, прымушае думаць, вучыцца, захоўваць форму – і разумовую, і чалавечую. Праца вельмі нават па душы, таму і не стамляе. Нават калі даводзіцца сядзець за кампом па 12, а то і па 16 гадзін у дзень. Такі рытм стаў часткай жыцця. Не магу ўжо інакш. Пакуль здароўе дазваляе, то чаму не? Працаголік невылечны.

*– Чалавек ва ўзросце, мог ужо быць на пенсіі, адпачываць...*

– Вось менавіта: мог быць на пенсіі. Але вымушана з’ехаў з краіны за некалькі месяцаў да яе законнага атрымання. Так што маю і асабістыя рахункі з сённяшнімі ўладамі Беларусі. Спадзяюся ў пэўны час прад’явіць іх.

Хоць гэта і важны, але не галоўны матыватар. Больш істотна другое: бачу, што людзі, якіх многія-многія тысячы, працягваюць чытаць, глядзець, рэагаваць на нашыя тэксты і відэа. Значыць, мы па ранейшаму ім патрэбныя.

Таму хочацца пабачыцца не толькі праз камп’ютар, а вочы ў вочы. Мару, каб Беларусь хутчэй стала вольнай, спакойнай, нармальнай еўрапейскай краінай для жыцця, а не для пакут. І пакуль магу, буду працаваць дзеля той рэальнасці.

*– Калі б сёння пісалі партрэт Брэста разам са штучным інтэлектам, што было б галоўным матывам той творчай працы?*

– Людзі, якія не здаліся. Я бачыў у 2020-м калоны з бел-чырвона-белымі палотнішчамі. І думаю, сцяганосцы

засталіся. Іх прымусілі замаўчаць, але яны не змяніліся. Брэсцкі вулкан проста заснуў. Але ён абавязкова прачнецца.

*– Уявім: Беларусь вольная і спакойная. Шлагбаум з Польшчы падняўся, святло зялёнае! Што значыць асабіста для вас вяртанне дадому?*

– Вельмі рвуся ў горад, дзе нарадзіўся і пражыў амаль усё жыццё. Скончыць яго хачу на радзіме, там, дзе пахаваныя бацькі, родны брат.

Мару прайсціся любімымі вуліцах разам з унукамі. Іх у мяне чацвёра – усе пабачылі свет не ў Беларусі, ніколі не былі ў Брэсце. А мне так хочацца паказаць ім свой цудоўны горад, расказаць, дзе што было, як мы жылі… Вось такое простае чалавечае жаданне.

Спадзяюся, заспею час, калі там ужо не стане ні вуліцы Леніна, ні Камуністычнай, ні Дзяржынскага… Бо ў нас ёсць свае, сапраўды выбітныя, годныя асобы і з далёкай гісторыі, і з цяперашніх дзён.

*– Тры кароткія фінальныя пытанні. Першае: Брэст сёння – горад будучыні ці рэліквія мінулага?*

– Горад будучыні, пабудаваны на фундаменце яркага мінулага.

*– Што забяспечыць жыццё журналістыцы? Учорашняя папера, усё мацнейшая лічба – ці давер тых, з кім і для каго працуеце?*

– Давер. Калі чалавек прымае выданне, ён прыходзіць на спатканне сёння, заўтра і паслязаўтра. Калі бракуе душэўнага кантакту – няма і аўдыторыі.

*– І трэцяе: ці засталося дома зерне супольнасці, здольнае прарасці пасля рэпрэсій наноў?*

– Я ўпэўнены, што так. Проста зерне спіць: цяпер зімовая пара. Але яно абавязкова прарасце.

# ГЕНАДЗЬ ВЕРАЦІНСКІ



Фота з асабістага архіва Г. Верацінскага

*Нарадзіўся 17 снежня 1957 года ў Мінску.*

*З канца 1990-х займаўся вёрсткай выданняў СМІ і фатаграфіяй.*

*Працаваў у палітычна-прававым штотыднёвіку «Фемида-NOVA», часопісе Беларускай асацыяцыі журналістаў «Абажур», друкаваў фотаздымкі (у тым ліку рэпартажы з палітычных акцый) у розных СМІ. З канца 1990 гадоў – сябра БАЖ, з 2004-га – сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі.*

*Дзесяцігоддзямі асвятляў у фотарэпартажах грамадска-палітычныя падзеі ў Беларусі. Шмат разоў*

*затрымліваўся на масавых мерапрыемствах – напрыклад, на пікеце вясной 2014 года, каб нагадаць пра зніклых у Беларусі палітыкаў; зімой 2019-га на мітынгу супраць паглыблення інтэграцыі з РФ; падчас падзей 2020 года. Практычна заўсёды ў такіх сітуацыях атрымліваў пакаранне штрафам.*

*Упершыню быў затрыманы ў траўні 1996-га, калі ратаваў падлетка, з якога здзекаваўся супрацоўнік АМАП. Тады яго збілі так, што страціў прытомнасць. Апошні раз Генадзю Верацінскаму дасталася пры здымках дваровых акцый 13 снежня 2020 года. З турмы на Акрэсціна, куды быў дастаўлены ў той дзень, яго забрала хуткая дапамога. З хранічнымі хваробамі, узмоцненымі стрэсам і ўзростам, у 2021–2023 гадах шмат разоў ляжаў у Мінску ў бальніцы.*

*У ліпені 2023 года пад пагрозай затрымання быў вымушаны з'ехаць з Беларусі – спачатку ў Грузію, пасля ў Польшчу.*

*У траўні 2025-га даведаўся, што яго кватэра ў Мінску апячатана. На прымацаванай паперцы – інфармацыя з подпісам супрацоўніка КДБ Н. Э. Смірнова: «Опечатано. Наложен арест. Вход запрещен». Ёсць падставы меркаваць, што ў Беларусі супраць Генадзя Верацінскага заведзена крымінальная справа.*

*Пасля пераезду ў Польшчу рэгулярна фатаграфуе акцыі беларускай дыяспары. Фотаздымкі размяшчае ў сацыяльных сетках актывістаў дыяспары і некаторых незалежных медыя.*

*Супрацоўнічае з Беларускай асацыяцый палітвязняў «Да Волі».*

ГЕНАДЗЬ
ВЕРАЦІНСКІ

# КАЛІ ФОТАКАДР – ІМГНЕННЕ, ТО ФАТОГРАФ НЕ ЯГО ЦЕНЬ, А СВЕДКА ГІСТОРЫІ

## У маскоўскія магазіны пускалі па пашпартах, а ў Омску нават буханку хлеба не прадалі, бо не мясцовы

*– Спадар Генадзь, ці адчувалася калі-небудзь, што шчаўчок затвора фотаапарата роўны націску курка вінтоўкі, прычым снайперскай?*

– Гэта сёння фотаздымкі, кінахроніка, тэлевізійныя рэпартажы становяцца матывам сур'ёзнага пераследу. Маё разуменне адказнасці за кадр пачалося не адразу. Пашчасціла заняцца здымкай у іншы час: таксама не просты, але непараўнальна больш бяспечны. Бачыў нешта цікавае – шчоўкаў. Усё было прасцей. Як з арэхамі.

*– Уменне назіраць і бачыць таксама не кожнаму дадзена… У вас яно выпрацавана прафесіяй фотажурналіста, калі заданне за заданнем, ці гэта вынік уласнай інтуіцыі на сюжэты?*

– Я – індывідуальны фотапаляўнічы. Шукаў падзеі, адсочваў іх па прынцыпе: што, дзе, калі? З часам зразумеў: камера для многіх людзей служыць свайго роду эмацыйнай падтрымкай, а часам і матывацыяй для пэўнай рашучасці. І стаў кантраляваць сябе, каб у пагоні за класным кадрам не нашкодзіць тым, хто ў ім апынаецца. З пачаткам рэпрэсій прыбраў усё патэнцыйна небяспечнае са сваёй стужкі ў Facebook. Паўсюль, дзе толькі можна, каб не падстаўляць людзей. Абсалютна не разумею тых, хто ігнаруе сённяшнюю палітычную фотагігіену.

*– Калі і чаму прыйшло жаданне выхапіць момант часу ў імгненным кадры?*

– Купіў сваю першую плёначную камеру «Киев-19» у 1988-м. Праца справакавала: пастаянныя раз'езды па СССР. Велічэзная краіна, столькі прыгажосці паўсюль… Таму пачынаў з пейзажаў. Затым аблом 1990-х, стала не да эмоцый – трэба выжываць.

Паміж камандзіроўкамі зарабляў здымкамі малышні ў парку Горкага. Потым пачаў вучыць дзяцей у сваёй фоталабараторыі.

*– Калі не ваенная тайна: што за праца такая? Абкалясіць Саюз рэдка каму ўдавалася. Тады людзі не дужа падарожнічалі. Не ў Еўропу, нават па Савецкім Саюзе. Вільня, Тбілісі, Брацк – ужо эмоцыі на паўжыцця. Гады ў рады выбіраліся некуды. Ці параўноўвалі Беларусь з іншымі рэспублікамі?*

– Занесла на рэфрыжэратарныя цягнікі: мы займаліся перавозкай прадуктаў харчавання, іншых грузаў. Колы грукаюць, прырода за вокнамі мянялася паступова, а вось побыт, лад жыцця рэзка залежаў ад умоўнай адміністрацыйнай мяжы. Дарэчы, у нас традыцыйна «чысценька» стала зусім не пры Лукашэнку: і тады – ці не ўзорны парадак уздоўж дарогі. А толькі ў Расію – адразу смецце, бруд, лужыны па калена… Цягнік спыніцца – ідзём у краму, а там голенька. Пра мяса, каўбасу нават не пыталіся. Дзякуй, што на станцыях былі хлеб, кансервы, танная рыба. Наадварот, прадаўцы ў нас хацелі купіць нешта сабе на стол: «Вы же из Белорусссии!» А ў дзевяностых – пік дэфіцыту: нават у маскоўскія магазіны пускалі па пашпартах, глядзелі прапіску. У Омску неяк нават буханку хлеба не прадалі, бо немясцовы.

*– А перамены ў настроі людзей заўважаліся? Адразу сасісак не купіць, потым нават ліверка знікла… Затым – страх падумаць! – талоны на гарэлку ўвялі… Ці назапашвалася злосць, пратэсная энергія? У балота ж цягнулі!*

– Выбух блакавала моцная грамадская апатыя. Па савецкай завядзёнцы чакалі, што нехта добры прыйдзе – і ўсё за іх зробіць… Фактычна дачакаліся: пасля кароткага маскоўскага выбуху 1990-га на прылаўкі раптам выкінулі тое, чаго чакалі гадамі. Абы грошы ў кішэні. Але вельмі хутка ўсё вярнулася ў ранейшую галечу.

У саюзных рэспубліках трошкі па-іншаму. Паўсюль напаўголаса бурчэлі, што кормяць Расію, Саюз, а самім крошкі толькі дастаюцца… Калі быў у Казахстане ці Узбекістане, там тэмпература яшчэ вышэйшая: «Будзем рускіх рэзаць»… А ў Азербайджане дык наогул: едзем побач з Каспійскім морам, дык пастаянна абстрэльвалі, само сабой, патрабавалі грошы, займаліся рэкетам. Плаці, калі праязджаеш праз іх станцыі.

*– Ці даводзілася выкручвацца ў крызісных сітуацыях: «Хлопцы, ды я, блін, не рускі – беларус!» Спрацоўвала?*

– Здаралася. Але часам сітуацыю накалялі дурні ці правакатары. Ва Узбекістане бачыў аднаго такога – вялікага, з доўгай барадой пад Івана Жахлівага: «Я рускі! Захачу – увайду да любога! Зачыніце дзверы – ботам выб’ю»… У адкрытую неслі дзіч адзінкі, але, мабыць, унутры вось гэта дурное адчуванне сваёй абранасці жыло ў многіх…

*– Але ж нас сто гадоў дзяцінства і юнацтва вучылі: і казахі, і ўзбекі, і рускія, і ўкраінцы, і якуты, і эстонцы, і літоўцы, і татары, і башкіры, і беларусы – роўныя, няма ніякай розніцы. І кніжкі пра новую «супольнасць савецкіх людзей» чыталі, і вуліцы называлі імёнамі герояў з іншых рэспублік, і казкі розных народаў друкавалі… І адначасова жылі ў ізаляцыі адно ад аднаго. Пра гэта думалася?*

– Адразу лічыў, што мы – ахвяры бальшавізму. Усе: і рускія, і астатнія. Але потым, калі пачаў глядзець больш уважліва, пабачыў, што насамрэч адбываецца, то памяняў погляд. Мы ўсе – ахвяры гэтай «вялікай Расіі». Вось з-за яе, з-за гэтых бальшавікоў, і прыйшла бяда. Дзе ні з’явяцца – абавязкова пачынаецца хаос, бруд, змрок.

*– Чаму адбылося развітанне з чыгункай, калі столькі цікавага, ды і зарабіць можна?*

– Па тых часах разам з камандзіровачнымі і прэміямі тысячу, паўтары ў месяц атрымліваў, у канцы ўжо, у дзевяностыя. Але здароўе падвяло: двойчы ледзь не памёр у Сярэдняй Азіі.

## Традыцыю пацёмкінскіх вёсак прыслужлівыя рэдактары не проста вярнулі – у разы пераплюнулі савецкіх папярэднікаў

*– Паступова зацягнула ў фотажурналістыку. У каго вучыліся рамяству? Хто быў узорам?*

– Купляў фатаграфічныя часопісы, разглядаў здымкі, падымаўся па іх. Цягнула да фота, нібы магнітам. Абсталяваў сваю лабараторыю. Да ўсяго даходзіў сам – і тэхнічна, і эстэтычна. Тады якраз у Мінску фармавалася новае кола фатографаў. Нараджаліся свае асяродкі, майстэрні на розныя густы і лады.

*– Фатаграфічнае жыццё не зводзілася да газет і часопісаў? Гэта ж куды шырэйшая супольнасць!*

– Безумоўна. Характэрны штрых: поруч з прафесійнай канкурэнцыяй – чалавечая выручка. Я хадзіў у Дом дружбы народаў – там добрая лабараторыя, у «Беларусьфільме» і «Белпраекце» таксама працавалі людзі, якія заўсёды выручалі. Кола знаёмства: адзін здымаў, другі праяўляў, трэці друкаваў. Нас звязвалі не пасады, а любоў да фота.

*– Урэшце стыхіяй сяброўства мусіла занесці да іншай, складанай працы: рэдакцыйнай, афіцыйнай і больш адказнай.*

– Менавіта так: праз усё тыя ж сувязі трапіў у рэдакцыю газеты публіцыста, вядомага пісьменніка, эколага Васіля Якавенкі. Шмат расказаў мне пра барацьбу супраць меліярацыі Палесся: каб не актыўнасць звычайных людзей, то бяда, зусім бы яго асушылі. Гэта ж факт: пры яго непасрэдным удзеле спынілі праект выпроствання рэчышча Прыпяці. Нельга бяздумна кідацца ў мінулае крыўдным словам «саўкі»: і раней,

і цяпер людзі вакол – самыя розныя. Цімафеевіч якраз з тых, хто шмат здароўя згубіў у змаганні з бяздумнымі ўладамі.

*– Чаго толькі тая яго газета вартая: шмат пісала пра чарнобыльскія болькі. Вось яе і прыдушылі… Але рэдакцыйнае жыццё захапіла?*

– Гэта як у рэчку: ныргуў – і панесла. Чарговай бухтай стала рэкламнае выданне. Там наўпрост пазнаёміўся з працай друкарні, сёе-тое зразумеў у дызайне, падвучыўся вёрстцы. Хутка сам рыхтаваў нумар, ад пачатку да канца. Пасля ўжо – сур'ёзная газета: уладкаваўся ў «Феміду», да Ірыны Сакаловай.

*– Адзін з першых праваабарончых СМІ Беларусі. Якім быў калектыў знутры? Чым асаблівая яго школа?*

– Па-першае, людзі: вельмі цікавыя, па вялікім рахунку, гістарычныя постаці: Андрэй Бастунец, Аляксандр Патупа, Сабіна Брыло, сама Ірына… Прыгажуня ва ўсіх сэнсах: неяк на канцэрце Булат Акуджава прысвяціў ёй свае песні і канчаткова ўразіў усіх тым, што падарыў сваю гітару. Газета пры такім галоўным рэдактары брала такія акорды, што мама не бядуй…

Я прыдаўся таленавітаму калектыву сваім веданнем тэхнічнай часткі, хутка ўцягнуўся ў працэс. У памяці застаўся момант, калі аднойчы мы выйшлі з пустымі палосамі: цэнзура забараніла матэрыялы – і Сакалова пайшла на такі крок. Гэта было моцна.

*– За што вас пераследавалі? Якія тэмы выклікалі раздражненне?*

– Усе, што, на погляд уладаў, былі «занадта» праўдзівыя. Мы пісалі пра рэальныя парушэнні закону – і гэта не ўсім падабалася. Тады таксама галоўным злачынствам была праўда. Іншая рэч – больш лаяльны ўзровень пакарання. Калі аўтарытэтная праваабарончая арганізацыя Беларускі ПЭН на чале з Карласам Шэрманам выдала таўшчэзную «Жоўтую кнігу» пра пераслед СМІ, свабоду слова, то «Феміда» там згадвалася не раз.

*– У новай эпохі крытэрыі і патрабаванні да здымкаў у СМІ мяняліся. Савецкая фоташкола, дзе ўсмешлівыя рабочыя і брыгадзіры з вымпеламі пераможцаў сацспаборніцтва, доўга не пратрымалася.*

– Яна прайграла з-за сваёй пастановачнасці. Што тады было галоўным? Каб усе выглядалі шчаслівымі. У фільме «Москва слезам не верит» ёсць кплівы момант, калі работніца паўтарае на камеру правільныя завучаныя фразы… У жыцці – змрок, у кадры – святло і ўсмешкі.

*– І ўсё ж – выглядала сапраўды прыгожа? Традыцыю пацёмкінскіх вёсак сёння не заўважаеце?*

– Папраўлю: не прыгожа, а – «прыгожанька»: адчуйце розніцу. Што да прыхарошвання натуры, то яно знікла на некалькі гадоў, але праслужлівыя рэдактары афіцыйных органаў неўзабаве вярнулі. Нават удасканалілі: тэхніка і тэхналогіі рэальна паднялі планку прыслугоўвання вышэйшаму начальству. У кожнага фатографа замест партбілета – рэдакцыйны шаблон: здымае так, як патрабуюць.

## Каля Палаца спорту людзі счапіліся з АМАПам: сценка на сценку, крыкі, шум, перакуленыя машыны

*– Памятаеце свае самыя папулярныя здымкі?*

– Так: выклаў серыю ў літоўскую групу Lithuania, дык яны набралі тысячы лайкаў. У Беларусі такога водгуку ўявіць немагчыма. Можа, таму, што для літоўцаў мой погляд здаўся новым, свежым.

*– Даводзілася ўдзельнічаць у фотаальбомах, калектыўных праектах?*

– Не, я – фэйсбучны фатограф.

– *Упершыню чую такое…*

– Дару: мой выраз. Разумееце, фатаграфія – заўсёды публічнасць. Фота «ў стол», як з аповесцю, не існуе. Яно мусіць быць убачаным. Facebook і дае такую магчымасць: паказаць, атрымаць водгук, адчуць сувязь. Каментары, лайкі, простая ўвага да твайго – моцная падтрымка. Калі людзі рэагуюць, хочацца працаваць далей.

– *А ёсць фатографы, за якімі адмыслова сочыце?*

– Я ж не нарцыс! Напрыклад, Дзмітрый Брушко мае вельмі цікавыя працы. А яго бацька, Сяргей Брушко, фотазадакументаваў час галоснасці і перабудовы. Што ні здымак – лёс, гісторыя, эпоха. Без аніякай пафаснасці, праз майстэрства перадаць у здымку характар.

Мяне чапляюць усе майстры, у каго асаблівае вока, кампазіцыя, адчуванне моманту.

– *А Instagram? Ён жа створаны якраз пад фота.*

– Спрабаваў, але не пайшло. Сваім стаў менавіта Facebook. Звыклая платформа, больш камунікацыі.

– *Не хочацца часам зрабіць са свайго нешта большае: выставу, альбом, удзел у конкурсах?*

– Ніколі не вылучаўся. Проста здымаў тое, што бачыў. Мне камфортна за кадрам і славай.

– *Як і нябожчык Уладзімір Кармілкін. Ён фіксаваў, а не вынаходзіў.*

– Чалавек-легенда. Фотахранікёр змагання супраць камунізму і рэжыму Лукашэнкі. Захапляўся майстэрствам гэтага колішняга афіцэра захоўваць гісторыю ў кадрах як ёсць: без гульні са святлом, без кампазіцыйных трукаў… Сёння ягоныя здымкі – праўда эпохі надзеі. І сведчанне: дакументальная фатаграфія не патрабуе эфектаў. Ты можаш зняць двор, дом, людзей – і некалі ўсё яно ператворыцца ў сведчанне часу.

*– Ёсць цяпер тыя, хто працягвае гэтую традыцыю?*

– Хоць у іншым рэчышчы, аднак працуюць людзі, вельмі цікава атрымліваецца. Напрыклад, Дзмітрый Маслій выкладвае ў Facebook фота Мінска 1950–1970-х гадоў. Часткова свае, часткова з архіваў. І яны выклікаюць суперскі водгук.

*– Калі незабыўны спадар Кармілкін быў летапісцам БНФ, то вы – фотахранікёр АГП. Якім ветрам занесла туды?*

– Пасля «Феміды», у 2004-м. Знаёмы прапанаваў нешта зняць для іх. Так і закруцілася: спачатку аматарскія, кароткія дачыненні, потым усё больш сістэмныя. А ў практычную дзейнасць партыі ўцягнуў яе лідар, Анатоль Лябедзька. Мы шмат ездзілі разам.

*– Ён не раз трапляў пад дубінкі. Калі побач, таксама даводзілася трымаць удар?*

– Здаралася. Хоць часцей проста адцягваў увагу АМАПа, калі магчыма. Памятаю выпадак каля Аляксандраўскага сквера: Анатоля акружылі, хацелі скруціць. Я да журналістаў: «Бягом туды! Хочуць затрымаць, здымайце!» – і ўсё рассмакталася. А вось каля «Печак-лавачак» нумар не прайшоў: яго завалаклі ўнутр і збівалі там, за шклом, куды аніяк не прабрацца. А потым вывелі праз чорны ўваход і запхнулі ў аўтазак.

*– Гэта 2006 год, на выбарах прэзідэнта – кандыдат ад дэмакратычнай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч. Шмат працавалі ў разбітым на «плошчы Каліноўскага» намётавым лагеры?*

– Так. Кожную раніцу – туды, як на працу: вітаўся з народам, здымаў, вяртаўся ў офіс на Веры Харужай. Так і фіксаваўся дзень за днём.

*– Як гэта ўсё адбывалася? Што там, ля намётаў, між БЧБ-сцягоў на вудах?*

– Вельмі дзіўнае адчуванне: вакол кола міліцыі, шнырацць падазроныя людзі ў цывільным, гамоняць, чытаюць вершы, спяваюць, прытупваюць на марозе нашыя хлопцы і дзяўчаты… Крок з метро туды – і нібы пераступаеш мяжу. Унутры – тэрыторыя свабоды. Не было страху, хоць яго наганялі пастаяннымі затрыманнямі і валанцёраў, што неслі ежу, і выпадковых мінакоў. Многія тады трапілі на Акрэсціна, у Барысаў… Там аўтаматычна адчуваў сябе чалавекам. А выходзіш – і цені, адсочванне.

*– Фатограф мог прафесійна заўважаць, як у людзей тады мяняліся твары?*

– Момант узрушэння рабіў усіх прыгожымі, узнёслымі. Больш усмешак, адкрытасці, дапамогі. Кола сяброў, без фармалізму, ад душы. Таму процьма проста выдатных здымкаў. Свята вольнага духу.

*– Вы былі сведкам не адной дэманстрацыі з энергіяй космасу.*

– Напрыклад, Чарнобыльскі марш 1996-га. Каля Палаца спорту людзі счапіліся з АМАПам: сценка на сценку, крыкі, шум, перакуленыя машыны. Па тым часе – сапраўдны шок. Але ўсё ж захоўвалася нейкае чалавечае стаўленне з боку сілавікоў і суддзяў.

Мяне ўпершыню затрымалі ў тым жа годзе. Прывезлі на Камсамольскую, у апорны пункт. Міліцыянт па прозвішчы Таўстамонавіч правяраў дакументы і проста забіраў у людзей грошы з кашалькоў… Сабе. Але нават з такімі можна было гаварыць.

З цяперашнімі – бессэнсоўна. Цяпер – робаты. Без розуму, без сораму, без твараў. Ім сказалі – яны бягуць выконваць.

*– Дарэчы, на той «бітве пры Нямізе» здарыўся рэдкі момант міжнароднай салідарнасці: украінцы прыехалі на дапамогу.*

– Дык і нашыя ў даўгу не засталіся. Беларусы падтрымлівалі рэвалюцыі суседзяў. Калі далей нехта папракаў, што з нашай тэрыторыі пачаўся наступ рускіх на Кіеў, я адказваў, што трэба разводзіць пазіцыі ўлады і народа: «Мы былі на ўсіх вашых майданах, побач з вамі. А калі ў Беларусі ў дваццатым здарылася бяда, то дапамогі не дачакаліся». Хоць дакладна ведаю: планаваўся цягнік падтрымкі з Украіны, але ў апошні момант усё рассыпалася. Магчыма, каб па-іншаму, усё пайшло б інакш.

## Ёсць палітычная логіка: публічны чалавек мусіць быць бачным. Гэта частка яго працы

*– Але ж бываюць кадры зусім іншага роду: без масавых акцый, без шумавых гранат, дубінак і газу… Калі стаіць або ідзе толькі адзін чалавек – але ў гэтай нібыта адзіноце ўся нашая нацыя, яе высокая годнасць. Напрыклад, здымкі Ніны Багінскай са сцягам у руках…*

– Так, і гэта, бадай, наймацнейшае. Або ўзяць, напрыклад, Валерыя Шчукіна. Ён адзін мог увасобіць у сабе плошчу. Шмат разоў здымаў таксама. Упершыню ўбачыў па тэлевізары, калі ён быў дэпутатам ад апазіцыйных камуністаў. А пасля пазнаёміўся асабіста – і ўбачыў зусім іншага чалавека. Адкрыты, смелы, шчыры – наросхрыст. Без фальшы.

*– Што асабліва здзіўляла ў ім?*

– Стойкасць, бясстрашша, вера ў справядлівасць насуперак дубіначнай няпраўдзе. Тры палітычныя справы, шматкроць затрымлівалі, давалі тумакоў, дзясяткі штрафаў – а ён на сваім. Неймаверная ўпартасць у адстойванні правоў: чатыры гады змагання за незаконнае пазбаўленне прапіскі ў Полацку… Колькі здымкаў зрабілі мае калегі, калі ён на знак пратэсту начаваў у віцебскім чыгуначным вакзале… Змаганне за сваю годнасць – толькі адзін маленькі эпізод у яго бурнай

праваабарончай, палітычнай дзейнасці. Найперш Валерый Аляксеевіч змагаўся за дэмакратычную Беларусь, пра сябе дбаў у апошнюю чаргу.

*– Адкуль у ім такая бурапенная энергія?*

– З характару. Проста не ўмеў інакш. Можа, і празмерна эмацыйны, але заўсёды сапраўдны.

*– Ён не пазіраваў перад камерай?*

– Не. Звычайна чалавек, калі бачыць аб’ектыў, напружваецца, усміхаецца, робіць позу. А Шчукін паводзіў сябе натуральна. Разумеў, што яго фатаграфую не дзеля яго ж, даруйце за таўталогію, а ў інтарэсах агульнай справы. Ён ведаў: часта фота – гэта наймацнейшае сведчанне. Маю шмат здымкаў, дзе Шчукін увасабляе грамадзянскую мужнасць. Адзін супраць сістэмы. Ён уражваў смеласцю. Загартоўка марскога афіцэра: дваццаць сем гадоў на Ціхаакіянскім флоце. І сапраўдны беларус. Нездарма атрымліваў прэмію з рук Алеся Бяляцкага ў намінацыі з сімвалічнай назвай – «Асоба». Чалавек-перфоманс, чалавек-акцыя…

*– Для фотарэпарцёра людзі без масак, паказнога, наноснага – знаходка. Бо аўдыторыя ловіць на ляту менавіта непадробную шчырасць. Аднак шмат вашых персанажаў з доўгай практыкі адчувалі прысутнасць камеры і аўтаматычна настройваліся на яе. Напрыклад, у вас дзясяткі здымкаў Лябедзькі. Калі шчыра: ці разумеў ён, што і ў тым ліку праз фатаграфіі застанецца ў гісторыі?*

– Думаю, так. Але тое – зусім не самалюбаванне. Анатоль разумеў палітычную логіку: публічны чалавек мусіць быць бачны. Гэта частка яго працы. Тут не пра славу, важнейшая прысутнасць праз цябе тваёй кампаніі, партыі, справы.

*– Каго з аднапартыйцаў давялося здымаць вось з тых самых меркаванняў? Бо дакладна ведалі: гэта смелыя, годныя людзі.*

*Не выпадковыя, таму кожны такі партрэт, ізноў жа, – дакументаванне часу.*

– Цяжка ўсіх назваць, бо многія засталіся ў Беларусі. Не хачу рызыкаваць імі. Але шмат каго вельмі паважаю: смелыя, шчырыя, прафесійныя. Памятаю Уладзіміра Шанцава: сталы, але моцны духам. Марыну Багдановіч: адважную, хоць мы розныя характарам. Людмілу Гразнову: маленькую інтэлігентную жанчыну, але якой з вялікай годнасцю…

## Калі бачыш гвалт і несправядлівасць, то не можаш быць пасярэдзіне

*– Праз аб'ектыў бачна шмат: пратэсты, гвалт, затрыманні. Як заангажаваны ў палітыку фатограф пачуваецца ў вострых сітуацыях?*

– Заўсёды ў напружанні. Кожны раз ішоў з думкай: сёння можаш не вярнуцца дадому. Стаіш паміж людзьмі і АМАПам, сярод крыкаў, дыму, але мусіш мець спакой. Я трымаўся на бяспечнай адлегласці, але для кожнага яна свая. Галоўнае – не паказваць страху.

*– Пачуў некалі ад вас, што фатограф не можа быць нейтральным.*

– І цяпер так лічу. Калі бачыш гвалт і несправядлівасць, то не можаш быць пасярэдзіне. Ты альбо з людзьмі – альбо на баку тых, хто іх б'е.

*– Аб'ектыўнасць і абыякавасць – розныя рэчы?*

– Хто кажа, што ён «над схваткай», альбо падманвае, альбо дурань.

*– Колькі разоў затрымлівалі?*

– Па-сур'ёзнаму – разы чатыры.

*– Што было тады першым жаданнем: схаваць сімку, камеру? Ці, можа, наадварот, паспрабаваць зняць?*

– Я здымаў нават у судзе. Напрыклад, калі слухалася чарговая справа Лябедзькі. Тады гэта ўжо забаранялі, але здолеў дамовіцца з суддзёй. На плёнку трапіў поўны выступ Анатоля: важны дакумент для гісторыі. Дарэчы, яго ў тым эпізодзе апраўдалі.

Або выпадак у Астрашыцкім Гарадку: нас спыніла міліцыя, пачалі агляд. Дастаю камеру, спакойна пачынаю здымаць іх саміх. Ашалелі ад нечаканага нахабства і адпусцілі.

Маё прафесійнае напружанне – не страх, а веданне, што ў любую хвіліну нешта можа здарыцца. Пры ўсім тым хоць знешне спакойны, але ўнутры ўсё роўна трымціць тонкая нітка.

*– Што наконт іншых фотакарэспандэнтаў, якія працавалі на апазіцыйных акцыях, а побач заўсёды сілавікі? Былі ж выпадкі: збівалі, саджалі, разбівалі апаратуру. Ці змагаліся з вамі, блакавалі будучыя кадры?*

– Найперш імкнуліся не дапусціць дакументацыі сваіх злачынстваў. А нам ужо даставалася як носьбітам той фотапраўды. Я ніколі не меў ні камізэлькі з надпісам «Прэса», ні нейкіх там пропускаў. Не паказваў, што журналіст. Проста хадзіў і здымаў. Ёсць прыказка: фатограф мусіць быць як цень, а яшчэ лепш – чалавекам-невідзімкам, каб ні відаць, ні чуваць. Але мусіш быць паўсюль. Калі пачынаеш дэманстраваць нейкую сваю асаблівасць, у тым ліку праз умоўную нейтральнасць, адразу прыцягваеш увагу. І гэта толькі перашкаджае.

*– А тыя, хто рабілі наадварот?*

– Дык нават раней часта атрымлівалі напоўніцу. Першую разбітую камеру я бачыў яшчэ ў 1996-м, калі перакульвалі машыны. «Бэтакам» паляцеў угару і грымнуўся аб асфальт. Дарагая рэч, шкада.

*– Для рэдакцыі страта, але для фатографа, мабыць, нешта большае?*

– Гэта асабістая трагедыя. Бо камера – як працяг рук, частка цябе.

*– А што здарылася ў 2020-м? Як апынуліся ў Польшчы?*

– У снежні былі апошнія мітынгі. У нашым двары, каля Чкалава, праходзілі дваровыя пратэсты. Я па традыцыі пайшоў фатаграфаваць. І раптам міліцыя… Там былі пераапранутыя ў зялёнае курсанты школы міліцыі, з дубінкамі. Здымаў. Падскочылі, забралі камеру – і ў Маскоўскі РАУС. Спрабую супраціўляцца: «Я журналіст, я здымаю» і ўсё такое. «Вы ўсё здымаеце не так, як трэба».

Заходжу з другога боку, прычым не маню, бо ў тыя дні якраз вельмі кепска адчуваў сябе: «Мне дрэнна, высокі ціск!» – «Мне таксама».

Нават хуткую не выклікалі, наадварот – павезлі ў пекла, на Акрэсціна. Там мяне ўжо зусім павяло… А яны ўсё мурыжаць: «Ды па пратаколу ў цябе норма!» Скончылася тым, што проста з Акрэсціна – у шпіталь, там паспелі адкачаць. І цішыня, адчапіліся. Ненадоўга: пачаў тэлефанаваць Следчы камітэт, у паштовай скрыні – позва за позвай. Выбар просты: альбо сесці – альбо з’ехаць. У траўні 2023-га падаўся ў Грузію, аформіў гуманітарную візу і ў ліпені быў ужо ў Варшаве. Зараз мая кватэра ў Мінску апячатана Следчым камітэтам. Значыць, заведзеная справа.

*– Калі падлічыць: колькі акцый, дэманстрацый, дваровых сходаў знята за гэтыя гады?*

– Сотні: кожны год – дзясяткі.

Калі я пачынаў  фатаграфаваць, быў проста інтарэс. Але паступова прыйшло разуменне: пражыць сваё на «нейтральнай тэрыторыі» немагчыма. Нейтральнасці няма. Ты мусіш заняць бок – той, што адпавядае сумленню. У ацэнках

жыцця варта заставацца спакойным, але ў жыцці – альбо за белых, альбо за чырвоных. І бегаць туды-сюды не выпадае…

Гэта дрэнна, калі чалавек думае, што ён па-над усім.

Так бывае толькі тады, калі ўжо нічога не адчуваеш.

## Пра прэмію

Прэмія «Голас пакалення свабоды» заснавана ў 2025 годзе Беларускім ПЭНам у партнёрстве з праваабарончым цэнтрам «Вясна», Беларускай асацыяцыяй журналістаў, Прэс-клубам Беларусь і фондам «Свабодная прэса для Усходняй Еўропы».

Яе мэта – ушанаванне выбітных асобаў беларускай праваабарончай, літаратарскай і журналісцкай супольнасці ва ўзросце 60+, якія пасля 2020 года былі вымушаны з'ехаць з Беларусі ад пераследу і працягваюць сваю працу ў Польшчы, Чэхіі або Літве. Прэмія ўключае фінансавую ўзнагароду і публікацыю матэрыялаў пра лаўрэатаў у зборніку. Кандыдатаў можна было прапаноўваць праз анкету, якую распаўсюджвалі сузаснавальнікі. Пры галасаванні журы ўлічваюцца магчымыя канфлікты інтарэсаў, у такім выпадку сябра журы не можа галасаваць за асобу, якой гэта датычыцца.

## Лаўрэаты прэміі «Голас пакалення свабоды» – 2025:

Зоя Белахвосцік, Генадзь Верацінскі, Уладзімір Вялічкін, Аляксандр Гарцуеў, Алег Груздзіловіч, Наталля Дуліна, Максім Жбанкоў, Андрэй Завадскі, Аляксандр Капуцкі, Валерый Карбалевіч, Аляксандр Класкоўскі, Зося Кустава, Любоў Лунёва, Віктар Марчук, Тамара Мацкевіч, Уладзімір Мацкевіч, Ірына Сухій, Сяргей Сыс.

## Журы «Голас пакалення свабоды» – 2025:

Святлана Алексіевіч (Беларускі ПЭН), Андрэй Бастунец (БАЖ), Надзея Белахвосцік (Прэс-клуб Беларусь), Марыя Садоўская-Камлач (фонд «Свабодная прэса для Усходняй Еўропы»), Павал Сапелка (праваабарончы цэнтр «Вясна»).

Арганізатары:

PEN BELARUS · ВЯСНА праваабарончы цэнтр · Беларуская асацыяцыя журналістаў · Press Club Belarus · Free Press Eastern Europe

Праект «Голас пакалення свабоды» суфінансаваны ў рамках праграмы польскага супрацоўніцтва дзеля развіцця Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча.

польская дапамога · Fundacja Solidarności Międzynarodowej

## БЕЛАРУСКІ ПЭН – абарона свабоды выказвання і развіццё культуры

Беларускі ПЭН заснаваны ў 1989 годзе і з'яўляецца адной з найстарэйшых беларускіх праваабарончых арганізацый, якая адстойвае свабоду выказвання, змагаецца супраць праяў нянавісці і прыцягвае сусветную ўвагу да парушэння правоў чалавека ў Беларусі – у тым ліку культурных правоў. Пасля прымусовай ліквідацыі ў Беларусі (9 жніўня 2021 года) арганізацыя працягвае сваю дзейнасць з замежжа.

Беларускі ПЭН аб'ядноўвае Людзей Слова. Гэта беларускія літаратары, перакладчыкі і даследчыкі літаратуры, публіцысты, інтэлектуалы і тыя, хто стварае і пашырае культуру, бароніць слова і яго майстроў. Абое беларускія нобелеўскія лаўрэаты – Святлана Алексіевіч і палітзняволены праваабаронца Алесь Бяляцкі – з'яўляюцца сябрамі Беларускага ПЭНа.

Мы лічым літаратуру і культуру падмуркам устойлівай дэмакратычнай сістэмы і выкарыстоўваем падыход, заснаваны на правах чалавека.

Наша місія: абараняць Людзей Слова і іншых творцаў, культурныя, грамадзянскія правы і свабоды, гуманістычныя каштоўнасці, ідэнтычнасць, ствараючы і даючы прастору для развіцця беларускай культуры, творчасці і міжкультурнага дыялогу.

Творчы і праваабарончы – два ключавыя кірункі дзейнасці Беларускага ПЭНа.

Творчы кірунак – літаратурныя прэміі, фестывалі, майстар-класы, творчыя рэзідэнцыі і адукацыйныя праекты. Усё тое, што дапамагае зрэалізаваць творцам свой патэнцыял

і сфармаваць супольную прастору, спрыяльную для развіцця культуры.

У межах праваабарончага кірунку Беларускі ПЭН сочыць за сітуацыяй у сферы культуры, публікуе хронікі парушэнняў правоў, а таксама робіць на падставе гэтага маніторынгу аналітычныя справаздачы. Арганізацыя рэгулярна праводзіць кампаніі салідарнасці з Людзьмі Слова ў няволі і рэпрэсаванымі дзеячамі культуры, ажыццяўляе адвакацыйную дзейнасць на міжнародным узроўні і рознымі спосабамі падтрымлівае творцаў, пацярпелых ад рэпрэсій.

Беларускі ПЭН уваходзіць у Міжнародны ПЭН, Беларускі Дом правоў чалавека імя Барыса Звозскага і з'яўляецца часткай Сеткі Дамоў правоў чалавека.

Цяпер Беларускі ПЭН зарэгістраваны ў Польшчы і працягвае сваю дзейнасць як асацыяцыя (stowarzyszenie).

PENBelarus penbelarus.org pen_belarus penbelarus.org

## ДАЛУЧЫСЯ ДА АБАРОНЫ СВАБОДЫ ВЫКАЗВАННЯ!

Дапамажы разавым ахвяраваннем

https://donate.stripe.com/eVadU8gDd0BDfi8eV3

Стань патронам на Патрэоне

www.patreon.com/penbelarusby

POŁACKIJA
ŁABIRYNTY

ISBN 978-83-68460-05-6